ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

КАРОТКІ НАРЫС
(У 5-ЦІ ЧАСТКАХ)

ЧАСТКА V



ІНСТЫТУТ ГІСТОРЫІ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ
УПРАЎЛЕННЕ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ МІНІСТЭРСТВА
АБАРОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Г І С Т О Р Ы Я Б Е Л А Р У С І

Кароткі нарыс
(у 5-ці частках)

Вучэбны дапаможнік для вайскоўцаў
Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь

Частка 5

Мінск 1994.

ТЭМА 23. БЕЛАРУСЬ У ПЕРШЫ ГОД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ.

Вучэбныя пытанні. 1. Пачатак вайны. Катастрофа заходняй Мінска. На рубяжы Бярэзіны і Дняпра. На Гомельскім напрамку. 2. Мабілізацыя і эвакуацыя. 3. Устанаўленне акупацыйнага рэжыму. 4. Зараджэнне партызанскага руху і падпольнай барацьбы.

На досвітку 22 чэрвеня 1941 года войскі фашысцкай Германіі вераломна, без аб'яўлення вайны ўварваліся на тэрыторыю Савецкага Саюза. У адпаведнасці з планам "Барбароса" супраць СССР была кінута магутная ваенная сіла самой Германіі і краін сатэлітаў — Італіі, Фінляндыі, Румыніі і Венгрыі, якая налічвала 190 дывізій (да 5,5 млн. чалавек), якія мелі на ўзбраенні звыш 48 тыс. гармат і мінаметаў, 4300 танкаў і штурмавых гармат, 4980 самалётаў і каля 200 баявых караблёў. Ваенныя дзеянні пачаліся на шырокім фронце ад Баранцава да Чорнага мора.

Галоўная ваенна-палітычная мэта плана "Барбароса" заключалась у поўным разгроме СССР. Яго стратэгічнай асновай была ідэя "маланкавай вайны", каб яшчэ да наступлення зімы разграміць асноўныя сілы Чырвонай Арміі, сканцэнтравання ў заходніх раёнах краіны, пераможна закончыць вайну і тым ліквідаваць галоўную перашкоду на шляху да сусветнага панавання.

Вайна с самага пачатку для Савецкага Саюза склалася вельмі неспрыяльна: на ўсім фронце ад Балтыкі і да Чорнага мора войскі Чырвонай Арміі неслі цяжкія страты і вымушаны былі паўсюдна адступаць. Амаль усе пасляваенныя гады панавала думка, што такое становішча склалася з-за раптоўнасці варожага нападу, вялізнай перавазе нямецкай арміі ў жывой сіле і баявой тэхніцы, у адсутнасці ў камандавання Чырвонай Арміі неабходнага вопыту ў вядзенні буйнамаштабных баявых аперацый і г.д. У той жа час не звярталася ўвагі на куды больш значныя і глыбокія абставіны, такія як панаванне ў краіне камандна-бюракратычнай сістэмы, напружанай маральна-палітычнай абстаноўкі у грамадстве, слабая падрыхтоўкі дзяржавы для адпору наблікаўшаяся агрэсіі, грубыя прамахі на дыпламатычным фронце. Што датычыць сцвярджэння аб раптоўнасці нападу, то ён у святле новых фактаў не вытрымлівае ніякай критыкі: многія савецкія разведчыкі, у тым ліку і Р.Зорге, шматразова паведамлялі савецкае кіраўніцтва аб канкрэтных тэрмінах напа-

ду Германіі на СССР. Аб блізкім пачатку вайны на ўсходзе гаварылі і пісалі многія заходнееўрапейскія палітычныя дзеячы і сродкі масавай інфармацыі. Канцэнтрацыя нямецкіх буйных ваенных сіл каля граніц СССР, актывізацыя шпіёнскай дзейнасці адкрыта сведчылі аб сур'ёзных намерах Гітлера распачаць ваенны паход супраць нашай краіны. Аднак усе гэта савецкімі кіруючымі коламі, і перш за ўсё Сталіным, не прымалася да ўвагі. Больш таго, 14 чэрвеня 1941 г. у цэнтральнай прэсе з'явілася вядомая заява ТАСС, якая абвяргала як безпадстаўныя ўзнікшыя на заходзе чуткі аб намеры Германіі ў хуткім часе напасці на СССР. Заява сур'ёзна дэзарыентавала як насельніцтва краіны, так і камандаванне Чырвонай Арміі, асабліва штабы заходніх ваенных акруг. Сталін, які быў загіпнатызаваны непарушнасцю савецка-германскага дагавору 1939 г., рабіў усё, каб не даць, як ён меркаваў, "справакаваць Германію для нападу на СССР". Не выпадкова, што заходнія ваенныя акругі сустрэлі ворага непадрыхтаванымі: артылерыя была адведзена на вучэбныя палігоны, авіяцыя застоялася на месцах пастаяннай дыслакацыі і з'явілася добрай мішэнню для праціўніка.

Мала таксама падстаў і для існаваўшага меркавання аб сур'ёзнай перавазе агрэсара ў жывой сіле і баявой тэхніцы. Як сведчаць успаміны маршала Г.К.Жукава, размова можа ісці аб якаснай перавазе нямецкіх узброеных сіл, а не аб колькаснай. Напярэдадні вайны ў заходніх ваенных акругах налічвалася 170 дывізій і 2 брыгады. У іх складзе было 13 тыс. танкаў (з іх 8,8 тыс. спраўных, 1475 з якіх былі новымі), 7,4 тыс. спраўных баявых самалётаў (з іх 1540 новых тыпаў), 46830 ствалоў артылерыі і мінамётаў. Супраць 46 дывізій (24 стралковых, 12 танкавых, 6 матарызаваных і 2 кавалерыйскіх) дывізій Заходняй ваеннай акругі вораг мінуў 50 (з іх 15 танкавых) сваіх дывізій, якія былі ўкамплектаваны па штатам ваеннага часу.

Такім чынам, аб неадэкватных суадносінах ў сілах і сродках праціглеглых бакоў можна разважаць толькі ўмоўна. На заходнім фронце перавага была толькі на 4 дывізіі. Абароназдольнасць краіны знізілі і тагачасныя ўяўленні савецкага ваенна-палітычнага кіраўніцтва адносна канкрэтных планаў і тэрміну нападу фашысцкай Германіі на СССР: лічылася, што Гітлер не распачне вайну да таго часу, пакуль не распрабуецца канчаткова за свае імі праціўнікамі на заходзе. Адсюль выцякалі такія памылкі,

як адсутнасць у савецкага камандавання надзейнага плана стратэгічнай абароны, раскіданасць войск прыграничных акруг на вялізнай тэрыторыі -- да 4,5 тыс. кіламетраў па фронту і на 400-600 км у глыбіню. У той жа час сродкі масавай інфармацыі шырока распаўсюджвалі эйфарыю шапказакідвання і сталінскага "прадбачання", што калі вайна і пачнецца, то яна будзе весціся на тэрыторыі агрэсара і малай крывёю , і на ворага ўдар Чырвоная Армія здольна адказаць "сакрушальным трайным ударам". Гэтыя рацэдывы нават знайшлі сваё адлюстраванне ў Палявым уставе РККА, які дзейнічаў у той час.

Вядома, што да сталінскіх пралікаў адносна рэальных гітлераўскіх планаў вайны далучаліся і тыя абставіны, што Германія своечасова перавяла сваю эканоміку на ваенны лад, ажыццявіла мілітарызацыю ўсёй краіны, далучыла да свайго патэнцыялу эканоміку многіх краін заходняй Еўропы. Апрача дэталева распрацаванага плана "Барбароса", германскі вермахт меў двухгадовы вопыт вядзення буйнамаштабных баявых аперацый (савецкае камандаванне належным чынам не ўлічыла свой вопыт, атрыманы ў час савецка-фінскай вайны, баёў у раёне возера Хасан і ракі Халхін-Гол), загадзя правёў мабілізацыю і канцэнтрацыю мабільных ударных груповак на заходніх савецкіх граніцах. Адыграла сваю ролю і добра пастаўленая працаўнікам дэзінфармацыя савецкага ваенна-палітычнага кіраўніцтва.

На боездольнасці Чырвонай Арміі вельмі адмоўна сказваліся масавыя рэпрэсіі супраць ваенных кадраў, што мелі месца у канцы 30--пачатку 40-х гадоў. Іх вынікам з'явілася тое, што ў 1941 г. некамплект камандных кадраў толькі ў сухапутных вайсковых складаў 66900 чалавек. Напярэдадні вайны толькі 7% камандзіраў Чырвонай Арміі мелі вышэйшую ваенную адукацыю, а 37% не прайшлі поўнага курсу навучання нават у сярэдніх ваенных установах. Як падк ліваў маршал А.М.Васілеўскі: "Без 37 года, магчыма, і не было б увогуле вайны ў 1941 г. У тым, што Гітлер вырашыў пачаць вайну ў 1941 годзе, вялікую ролю адыграла ацэнка той ступені разгрому ваенных кадраў, які ў нас адбыўся. Быў шэраг дывізій, якімі камандавалі капітаны, таму што ўсе хто быў вышэй, пагалоўна былі арыштаваны. Усе гэта дало падставы Гітлеру зрабіць вывад, што Чырвоная Армія "ня мае сапраўдных камандзіраў" і

што "калі па такой арміі нанесці магутны ўдар, дык ве разгром будзе непазбежны".

Напад на СССР гітлераўцы пачалі моцным артылерыйскім абстрэлам прыгранічных раёнаў, пасля чаго ў наступленне перайшлі сухапутныя войскі. Адначасова фашысцкая авіяцыя бамбіла месцы размяшчэння савецкіх войск, аэрадромы, казармы, чыгуначныя вузлы, гарады Гродна, Беласток, Брэст, Ваўкавыск, Баранавічы і інш. У першы дзень баявых дзеянняў Ваенна-паветраныя сілы СССР згубілі 1200 баявых самалётаў, 738 з іх было знішчана на Беларусі, прычым 528 з іх непасрэдна на аэрадромах. Тым самым, Ваенна-паветраныя сілы Заходняга фронту страцілі 38% баявых машын.

У першыя дні і месяцы вайны становішча Чырвонай Арміі ўсё больш пагаршалася. Яна несла вялізныя людскія і матэрыяльныя страты, не атрымлівала своечасовых папаўненняў і вымушана была адступаць. У выніку хуткага прасоўвання танкавых і матарызаваных злучэнняў праціўніка вялікая колькасць савецкіх войск трапіла ў акружэнне, здалася ў палон.

Аднак, нягледзячы на няроўныя ўмовы барацьбы, воіны Чырвонай Арміі смела і мужна ўступалі ў бой з ворагам. Гераічна змагаліся пагранічнікі, савецкія летчыкі. У першыя гадзіны вайны летчыкі П.С.Рабцаў, А.С.Данілаў, С.М.Гудзімаў, Д.В. Кокараў таранілі варожыя самалёты. На працягу дня знішчальная авіяцыя Заходняга фронту збіла ў паветраных баях больш за 100 нямецкіх самалётаў.

Усяму свету вядома гераічная абарона легендарнай Брэсцкай крэпасці. Мужнасць і стойкасць не абаронцаў здзіўляла і ворага. Знаходзячыся ў поўным акружэнні, без вады і ежы, пры востраі нястачы боепрыпасаў і медыкаментаў, гарнізон крэпасці амаль месяц мужна змагаўся з ворагам. Да гэтых дзён захаваліся надпісы, што пакінулі на сценах яе абаронцы: "Памром, але з крэпасці не пойдзем", "Я паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма". 20.УП.41 г." Сярод абаронцаў Брэсцкай крэпасці былі прадстаўнікі больш 30 нацыянальнасцей СССР. За бессмяродны подзвіг, які быў здзейснены абаронцамі Брэсцкай крэпасці, ёй присвоена ганаровае званне "Крэпасць-герой".

Планам "Барбароса" прадугледжвалася раптоўнае нанясенне некалькіх магутных удараў буйнымі сіламі танкавых, механі-

заваных войск і авіяцыі з мэтай разгрому і знішчэнь асноўнай сілы Чырвонай Арміі. На напрамку галоўнага удару наступала група армій "Цэнтр", якая перасекла савецкую дзяржаўную граніцу і пачала прасоўвацца на ўсход. "Раптоўнасць нападу на праціўніка была дасягнута на ўсім фронце танкавай групы, -- канстатаваў камандуючы 2-й танкавай групай генерал Г.Гудэрыян. -- Заходнюю Брэст-Літоўска 24-м танкавым корпусам захоплены ўсе масты праз Буг..." На левым становішча склалася ў прысалтыцы, дзе ў напрамку Вільнюса перайшла ў наступленне трэцяя танкавая група. "Для 3-й танкавай групы, -- адзначаў яе камандуючы генерал Г.Гот, -- з'явілася поўнай нечаканасцю тое, што ўсе тры масты праз Неман, захоп якіх уваходзіў у задачу групы, былі захоплены непашкоджанымі..." Авалодаўшы пераправамі праз Буг і Неман, танкавыя арміі Гота і Гудэрыяна, войскі 4-й і 9-й палявых армій рушылі у напрамку Вільнюса і Мінска, пераадольваючы супраціўленне фланговых злучэнняў 4-й і 3-й армій Заходняга фронту. Апошнія, пад націскам пераўзыходзячых сіл праціўніка вымушаны былі адступаць, што вельмі хутка паставіла ў складанае становішча войскі 10-й арміі, якая знаходзілася у Беластоцкім выступе.

У выніку трапных удараў з паветра і мэтанакіраванай дзейнасці дыверсійных груп былі разбураны вузлы сувязі, згублена управленне войскамі. Камандуючы фронтам Д.Р.Паўлаў вымушаны быў 22 чэрвеня накіраваць на самалеце у 10-ю армію свайго намесніка генерала І.В.Болдзіна з мэтай даведацца аб становішчы арміі. У залежнасці ад абстаноўкі яму была паставлена задача падрыхтаваць і нанесці контрудары у Брэсцкім ці Гродненскім напрамку. Але новыя абставіны вымусілі Д.Р.Паўлава дзейнічаць інакш: у канцы дня таго ж 22 чэрвеня ў штаб фронта з Масквы прыйшла дырэктыва наркома абароны С.К.Ціматшэнкі. Не валодаючы звесткамі аб рэальным становішчы на фронце, нарком тым не менш рашуча патрабаваў ад штаба акругі неадкладна распачаць наступальныя дзеянні "з мэтай разгрому нямецкіх груповак у раёнах, дзе яны парушылі дзяржаўную граніцу". У той жа час сухапутныя войскі перасцерагаліся, што у далейшым "да асобнага загаду граніцу не пераходзіць". Што датычыць авіяцыі акругі, то ёй належыла "моцнымі ударамі знішчыць нямецкую авіяцыю на яе аэрадромах", "разбамбіць асноў-

ныя групоўкі яе наземных войск". Патрабавалася таксама разбамбіць Кёнігсберг і Мемель, на тэрыторыю Фінляндыі і Румыніі да особых распараджэнняў налётаў не рабіць.

Заходзячы з гэтага, не ведаючы рэальнай абстаноўкі, генерал Д.Р.Паўлаў перад двума механізаванымі карпусамі (6 і 11-м) і 36-м кавкорпусам паставіў такую ж самую немагчымую задачу: з раёна Беластока нанесці масіраваны ўдар па праціўніку ў напрамку Астралёнка-Сувалкі і знішчыць яго войскі на правым беразе р. Нёман і не дазволіць яму прарвацца ў раён Ваўкавыска.

Распачаты 23 чэрвеня контрудар войск Заходняга фронта ў раёне Гродна, нягледзячы на мужнасць і гераізм байцоў і камандзіраў, не даў адчувальных вынікаў. Праўда, каб спыніць наступленне, камандаванне групы армій "Цэнтр" вымушана было 24 чэрвеня перакінуць скуды яшчэ два армейскія карпусы і павярнуць некаторыя часці 3-й танкавай групы з вільнюскага напрамку.

У той надзвычай складанай абстаноўцы найбольш актыўна дзейнічалі ў сустрэчных баях часці 6-га, 11-га мехкарпусоў і 85-я стралковая дывізія 3-й арміі. Аднак у выніку значных страт ад авіяцыі і артылерыйскага агню праціўніка, вострага недахопу боепрыпасаў і гаручага, яны вымушаны былі адыйсці і спаліць уцалеўшыя баявыя машыны. У баі пад Гродна гераічна загінуў камандзір 6-га мехкорпуса, уражэнец Ляхавіцкага раёна генерал-маёр М.Г.Хацкілевіч, не выйшаў паранеі з бою і камандзір 6-га кавкорпуса генерал-маёр І.С.Нікіцін.

На брэсцкім напрамку раніцай 23 чэрвеня контрудар быў нанесены сіламі 30-й танкавай дывізіі, 14 механізаванага і 28-га стралковага корпусаў. На шэрагу ўчасткаў вораг быў адкінуты на некалькі кіламетраў. Жорсткія баі разгарнуліся на рубяжы Камянец-Жабінка-Вял. Радванічы. У бой кінуты амаль усе танкі і самалёты, што дзейнічалі як з савецкага, так і нямецкага бакоў. Гераічна змагаліся байцы і камандзіры 30-й танкавай дывізіі, якія ў раёне Пружан на працягу дня стрымлівалі націск двух нямецкіх танкавых дывізій.

Аднак і на гэтым напрамку контрудар, нягледзячы на мужнасць і гераізм воінаў, не даў адчувальных вынікаў. У канцы дня 23 чэрвеня войскі 4-й арміі пакінулі Пружаны, Кобрын, Баразу, адышлі на рубеж р. Ясельда. На наступны дзень яны зноў вымушаны былі адступаць на ўсход. Тое ж самае рабілі астат-

кі часцей і злучэнняў 3-й і 10-й армій. Панесцы сур'ёзныя страты ў прыгранічных баях, яны ў беспарадку адыходзілі на ўсход, дзе-ні-дзе затрымліваючыся на больш зручных рубяжах, каб даць бой насядаўшаму ворагу.

Праз некалькі дзён жорсткія баі разгарнуліся ў Мінскім умацаваным раёне. Над сталіцай Беларусі навісла сур'ёзная пагроза захопу ворагам. Справа ўскладнялася тым, што Мінскі ўмацаваны раён (УР) фактычна не быў падрыхтаваны да абароны. Абарона горада ўскладалася на войскі 44-га стралковага корпуса. Пад вечар 25 чэрвеня часці 64-й і 108-й дывізій гэтага корпуса занялі рубяжы на заходніх подступах да горада. З паўночнага напрамку сталіцу прыкрывалі часці 161-й і 100-й стралковых дывізій 2-га стралковага корпуса. Баі за Мінск насілі кароткатэрміновы, але вельмі жорсткі характар.

У баях пад Мінскам салдаты і камандзіры 100-й стралковай дывізіі, якая ўжо набыла баявы вопыт у савецка-фінскай вайне, умела выкарыстоўвалі для барацьбы з варожымі танкамі звязкі гранат, а таксама бутэлькі з гаручай сумессю. 27 чэрвеня часці 100-й дывізіі і іры падтрымцы часцей 161-й стралковай дывізіі перайшлі ў наступленне і адкінулі праціўніка на 10-18 км назад.

Асабліва напружаныя баі ішлі 26 і 27 чэрвеня ў раёнах Дзяржынска, Старога Сяла, Заслаўя. У ходзе баёў пад Мінскам гітлераўцы страцілі толькі спаленымі звыш 100 танкаў і больш за 200 падбітымі, шмат іншай баявой тэхнікі. У другой палове дня 28 чэрвеня нямецка-фашысцкія войскі ўварваліся ў горад і захапілі яго.

У гіганцкім катле заходней Мінска ў акружэнні апынуліся амаль цалкам часці і злучэнні 3-й і 10-й армій, а таксама частка сіл 4-й арміі, 64-я і 108-я дывізіі 13-й арміі. Некаторыя з іх прабіліся з акружэння, частка засталася ў лясах і потым перайшла да партызанскай барацьбы, але значная колькасць трапіла ў палон. Як сведчаць заходнія даследчыкі, у ходзе баёў заходней Мінска немцы ўзялі ў палон звыш 330 тыс. савецкіх байцоў і камандзіраў. Вораг захапіў шмат баявой тэхнікі, зброі і вайсковай маёмасці. Усе гэта вельмі адмоўна паўплывала на стан войск Заходняга фронту, ускладніла яго задачы ў далейшай барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

У канцы чэрвеня напружанне баі пачаліся на баруцкім і барысаўскім напрамках. Гітлераўцы імкнуліся фарсіраваць Бярэзіну і рушыць да Дняпра. Штаб Заходняга фронту прыкладаў шматлікія намаганні, каб як мага больш затрымаць праціўніка на Бярэзіне. Аднак сілы фронту былі вельмі аслаблены. Па дадзеных на 30 чэрвеня 1941 г. у склад фронту ўваходзіла 16 значна аслабленых дывізій і 150 самалётаў (у т.л. 52 знішчальнікі). Паўночней Барунска абарону заняў 4-ы павятрадэсантны корпус генерал-маёра А.С.Жадава. У раёне Барысава абарону трымалі часці маскоўскай мотастралковай дывізіі палкоўніка Н.Г.Кройзера, якая прыбыла з рэзерва Стаўкі, курсанты Барысаўскага танкавага вучылішча і зводная стралковая дывізія, сфарміраваная з воінаў адступаўшых ад граніцы часцей. Тры дні пад Барысавам ішлі цяжкія бої. 30 чэрвеня у другой палове дня праціўнік уварваўся на заходнюю ўскраіну Нова-Барысава. Пасля магутных бомбавых удараў і артпадрыхтоўкі гітлераўцам удалося захапіць барысаўскую пераправу і на наступны дзень прарвацца на ўсходні бераг Бярэзіны.

У сувязі з адыходам рэшткаў 4-й арміі за Бярэзіну і прарывам праціўніка ў міжрэчча Бярэзіны і Дняпра становішча Заходняга фронту стала надзвычайна цяжкім. За некалькі дзён да гэтага, калі стала відавочным, што Чырвоная Армія не ў стане контрударамі разграміць укліняўшыхся на нашу тэрыторыю груповак праціўніка і аднавіць становішча, Стаўка Галоўнага камандавання прыйшла да заключэння аб неабходнасці пераходу да стратэгічнай абароны. У гэтых мэтах на рубеж Заходняя Дзвіна-Дняпр высоўваўся другі стратэгічны эшалон савецкіх войск у складзе 19-й, 20-й і 22-й армій, аб'яднаных у групу армій рэзерва, якая з 2 ліпеня была перададзена ў склад Заходняга фронту (фактычна гэта быў другі склад Заходняга фронту).

Заходняму фронту трэба было любымі сродкамі выйграць час для арганізацыі абароны на рубяжы Заходняй Дзвіны і Дняпра, на якую ускладалася надзея спыніць ворага. Аднак у фронта для гэтага ні хапала ні сіл, ні сродкаў. У росшчы Сталін вырашыў знайсці кіраўніцтва Заходнім фронтам, адначасова ўмацаваўшы фронт новымі сіламі. 1 ліпеня камандуючым Заходнім фронтам быў прызначаны першы абароны маршал С.М.Цімашэнка.

Былое кіраўніцтва фронту — камандуючы генерал арміі Д.Г. Паўлаў, начальнік штаба фронта генерал В.Е.Клімаўскіх, камандуючы ваенна-паветранымі сіламі генерал А.І.Таюрскі, начальнік сувязі фронта генерал А.Т.Грыгор'еў, камандуючы 4-й арміяй генерал А.А.Карабкоў, камандзір 14-га механізаванага корпуса генерал С.І.Аборын і інш. за быццам бы "бяздзейнасць" і "баязлівасць" былі асуджаны і растраляны. Камандуючы артылерыяй М.А.Кліч быў прыгаворан да растрэлу, аднак прыгавор быў заменены высылкай на Калыму, дзе ён і памёр. На самай справе за тое, што адбылося на Заходнім фронце ў першыя дні вайны адказнасць павінна было несці Вярхоўнае ваеннае камандаванне, і у першую чаргу Сталін.

4 ліпеня Стаўка Галоўнага Камандавання аддала загад Заходняму фронту абараняць лініі Полацкага ўмацаванага раёна, рубеж р. Заходняй Дзвіны, Сенна, Орша і далей па р. Дняпр з мэтай не дапусціць прарыву ворага на поўнач і ўсход. Для ліквідацыі пагрозы на гэты напрамак тэрмінова перакідвалася 19-я армія пад камандаваннем І.С.Конева. Каб даць ёй магчымасць сканцэнтравацца, раніцай 6 ліпеня 1941 г. войскі 20-й арміі пад камандаваннем П.А.Курачкіна нанеслі контрудар у агульным напрамку Сянно і Лепель, сіламі 5-га і 7-га механізаваных корпусоў. Пачалося адно з буйнейшых у пачатковым перыядзе вайны танкавых сражэнняў, у якім з абодвух бакоў дзейнічала больш 1500 танкаў. Да 8 ліпеня вораг быў адкінуты ў напрамку Лепеля на 30-40 км. Аднак паспяховае распачатае контрнаступленне закончылася правалам. 5-ы і 7-ы мехкарпусы 8-9 ліпеня вялі цяжкія кравапралітныя баі амаль у поўным акружэнні. Толькі аставіўшы большую частку ўцалеўшай тэхнікі, асобныя групы сумелі пазней прабіцца ў раён Оршы. Многія папалі ў варожы палон. У тым ліку сын Сталіна Якаў Джугашвілі.

Тым не менш савецкія войскі на працягу 4-х дзённых нанеслі ворагу значныя страты, аб чым яскрава сведчыць загад камандзіра 18-й танкавай дывізіі генерала Нярынга, у якім адзначалася, што "страты амуніцыі, зброі і машын незвычайна вялікія і значна перавышаюць закладзеныя тарыфы. Такое становішча нецярпіма, інакш мы наперамагаемся да сваёй асабістай пагібелі".

Напружанымі былі баі на рубяжы Дняпра, асабліва ў раёне Оршы і Магілёва. Войскі Чырвонай Арміі, што высоўваліся

з глыбінных раёнаў, вымушаны былі ўступаць у бой без належнай падрыхтоўкі. Чырвонаармейцы гераічна адбівалі атакі нямецкіх войск, якія рваліся да Смаленска. Пад Оршай 14 ліпеня 1941 г. упершыню наносла магутны аналамляльны ўдар па ворагу батарэя рэактыўных установак ("катюш") пад камандаваннем капітана І.А.Флёрава.

Вельмі напружаныя баі ішлі ў раёне Магілёва, дзе абарону трымалі злучэнні 61-га корпуса пад камандаваннем генерала Ф.А.Бакуніна. Непасрэдная абарона горада ўскладалася на 172-ю стралковую дывізію (генерал-маёр М.Ц.Раманаў) з прыданымі ёй часцямі і асобнымі падраздзяленнямі. Горад быў аб'яўлены на асадным становішчы. З 3 па 9 ліпеня падраздзяленні дывізіі вялі кароткія баі з ворагам на рубяжы ракі Друць, каля г.п. Бялынічы. Тут асабліва вызначылася батарэя капітана Б.Л.Хігрына, якая 4 і 5 ліпеня вяла кравапралітныя баі з танкамі Гудэрыяна. Замяніўшы забітага наводчыка, камбат асабіста падбіў 6 варожых танкаў. Пасмяротна яму прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Не маючы магчымасці ўзяць Магілёў лабавым ударам з захаду, гітлераўцы распачалі ўмоцненыя атакі на флангах дывізіі, фарсіравалі Дняпро ў раёне Шклова і Быхава і рушылі на Смаленск і Рослаў. 16 ліпеня, злучыўшыся ў Чавусах, яны акружылі Магілёў. Амаль дзесяць дзён мужна змагаліся абаронцы ў акружэнні, адцягваючы на сябе 6 пяхотных і танкавых дывізій. У ноч з 25 на 26 ліпеня на апошнім пасяджанні кіраўнікоў абароны генерал М.Ц.Раманаў аддаў загад на прарыў з асаджанага горада. У час прарыву ён быў цяжка паранены, загінулі палкоўнікі С.Ф.Куцепаў, І.С.Мазалёў і інш. Гераічная, 23-дзённая абарона Магілёва — адна з яскравых старонак гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Намнога мацней, чым разлічваў вораг, было супраціўленне савецкіх войск і ў паўднёва-усходніх раёнах Беларусі. Асабліва востры і кароткі характар набылі баі ў раёне Бабруйска-Рагачова-Жлобіна, а таксама за Гомель. Тут абараняліся злучэнні 21-й арміі, якой камандаваў генерал-лейтэнант В.П.Герасімэнка. Прыкрываючы гомельскі напрамак, войскі знаходзіліся як бы ў баку ад галоўнага удару гітлераўцаў. У разгар бітвы за Смаленск і Магілёў Стаўка і камандаванне Заходняга фронту паставілі задачу войскам левафланговай 21-й арміі

весці актыўную абарону і нанесці контрудар у агульным напрамку на Бабруйск, выйсці ў тыл магілёўскай групоўцы ворага і актыўнымі дзеяннямі адцягнуць на сябе сілы ворага.

18 ліпеня войскі арміі перайшлі ў контрнаступленне. 63-ці корпус (камкор Д.П.Пятроўскі) фарсіраваў Дняпро, вызвалiў Жлобін, Рагачоў і пачаў развіваць наступленне на Бабруйск. Германскае камандаванне, занепакоенае гэтым контрнаступленнем, вымушана было накіраваць супраць 21-й арміі два армейскія корпусы з рэзерва групы арміі "Цэнтр", а потым яшчэ дзве пяхотныя дывізіі, якія спынілі наступленне савецкіх войск.

У гэты перыяд адчайны рэйд па тылах ворага правяла кавалерыйская група ў складзе частак 32-й, 48-й і 47-й кавалерыйскіх дывізій.

22 ліпеня кавалерысты групы фарсіравалі раку Пціч і імклівым ударам прарваліся ў раён на захад ад Бабруйска. Яны перарэзалі камунікацыі 2-й танкавай групы і 2-й арміі, захапілі Глуск, Старыя Дарогі, нанеслі рашучы ўдар на Асіповічы. Фельдмаршал Бок вымушаны быў звярнуцца за дапамогай ў Берлін. З рэзерва галоўнага камандавання супраць кавалерыстаў былі кінуты тры дывізіі.

Баявыя дзеянні ў паўднёва-усходняй Беларусі выклікалі трывогу гітлераўскага камандавання і яно прыняло рашэнне ліквідаваць пагрозу з боку савецкіх войск, якія дзейнічалі на флангах групы армій "Цэнтр" і "поўдзень". Для гэтага 2-я танкавая група і 2-я палявая армія з галоўнага ўсходняга напрамку былі павернуты на поўдзень, каб нанесці ўдар савецкім войскам у раёне Гомеля і ў фланг асноўным сілам Паўднёва-заходняга фронту, якія абаранялі Кіеў. Канчатковае рашэнне па гэтаму пытанню, відаць, было прынята пасля наведвання 4 чэрвеня 1941 г. Гітлерам штаба Ф.Бока ў Барысаве.

Гомельскі напрамак абаранялі войскі Цэнтральнага фронту (створаны 24 ліпеня 1941 г.), у склад якога ўваходзілі 13-я і 21-я арміі.

Войскі Цэнтральнага фронту не толькі мужна абаранялiся, але і пераходзілі ў контрнаступленне. Раніцай 30 ліпеня часці 18-й арміі нанеслі контрудар у раёне Крычава, разгромілі абараняўшыя яго часці праціўніка і вызвалілі горад. Але раніцай 1 чэрвеня 1941 г. танкавыя злучэнні Гудэрыяна пры падтрымцы 2-га паветранага флоту рушылі на Рослаў і Крычаў. Войскі Цэн-

тральнага фронту апынуліся ў вельмі складаных умовах. Супраць іх дзейнічалі 25 дывізій ворага, галоўным чынам танкавых і матарызаваных. Нечматлікія, стомленыя працягламі актыўнымі абарончымі баямі часці не змаглі стрымаць моцных танкавых удараў і пачалі адступаць.

У баях за Гомель самаадданасць і мужнасць праявілі байцы Гомельскага народнага апалчэння. Пры абароне горада гераічна загінуў камісар батальёна народнага апалчэння Н.М.Кунцэвіч, ён смяротна паранены камандзір палка апалчэнцаў Ф.Я. Уткін і многія іншыя героі. 19 кастрычніка, прарваўшы абарону ў раёне Добруша, гітлераўцы ўварваліся на ўскраіну Гомеля. У ноч на 20 кастрычніка апошнія абаронцы пакінулі правабярэжную частку горада. Да пачатку верасня 1941 г. уся тэрыторыя Беларусі была поўнасцю акупавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Абарончыя баі савецкіх войск на тэрыторыі Беларусі летам 1941 г. з'явіліся важнай падзеяй пачатковага перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Часці Чырвонай Арміі аказвалі ўпартае супраціўленне моцнай гітлераўскай групоўцы і сваімі самаадданымі дзеяннямі ў поўнай меры сарвалі планы агрэсара. Гераізм і самаадданасць савецкіх воінаў і насельніцтва Беларусі адыгралі вялікую ролю ў зрыве фашысцкага плана "маланкавай вайны", у поўнай меры спрыялі таму, што Стаўка ВГК змагла сканцэнтраваць рэзервы і ўмацаваць абарону на маскоўскім напрамку.

Хуткім прасоўваннем у глыб савецкай тэрыторыі вораг паставіў пад пагрозу жыццёва важныя цэнтры краіны, у тым ліку Беларусь. Абстаноўка ўскладнялася тым, што ў прыфрантавых раёнах была дэзарганізавана праца транспартных камунікацый. У такіх умовах вельмі ўскладнілася дзейнасць па мабілізацыі людскіх і матэрыяльных рэсурсаў на патрэбы вайны, забеспячэнню і перадыслакацыі войск.

У раёнах, аб'яўленых на ваенным становішчы, усе функцыі дзяржаўнай улады па пытаннях абароны, забеспячэнню грамадскага парадку і дзяржаўнай бяспекі перадаваліся ваенным уладам. Выключна складаныя абставіны, у якіх апынулася краіна, вымусілі пайсці на жорсткую цэнтралізацыю палітычнага, дзяржаўнага і ваеннага кіраўніцтва. Надзвычайным органам, які сканцэнтраваў у сваіх руках усю паўнату улады стаў Дзяржаў-

пры Камітэце Абароны (ДКА) пад кіраўніцтвам Сталіна, які быў створаны 30 чэрвеня. Нашмат раней, 23 чэрвеня была створана Стаўка Галоўнага Камандавання.

У складаных абставінах першых дзён вайны адной з галоўных задач была мабілізацыя ваеннаабавязаных у рады Чырвонай Арміі.

Аднак хуткае наступленне ворага па сутнасці сарвала правядзенне мабілізацыі ў заходніх абласцях БССР, дзе былі прызваны толькі асобныя катэгорыі камандна-палітычнага і радавога саставу. Не ўдалося поўнасцю правесці мабілізацыю і ў Мінскай вобласці. У асноўным арганізавана прайшла мабілізацыя толькі ў 4 з 10 абласцей БССР -- Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай і Палескай. На працягу чэрвеня-жніўня 1941 г у Чырвоную Армію з рэспублікі было мабілізавана больш 500 тысяч чалавек, арміі было перададзена 2,5 тыс. аўтамашын, больш за 35 тыс. коней. Па агульнай і партыйнай мабілізацыі ў дзеючую армію было накіравана 26,5 тыс. камуністаў (больш 24% усяго складу КП(б)Б)і больш за 130 тыс. камсамольцаў.

Другой не менш значнай задачай была эвакуацыя людзей і матэрыяльных каштоўнасцей ва ўсходнія раёны краіны. У адносна кароткі перыяд на ўсход было эвакуіравана звыш 1,5 млн. чалавек, болей 190 дзіцячых устаноў з 16,5 тыс. дзяцей. Праводзіліся дэмантаж і эвакуацыя абсталявання прадпрыемстваў. Усяго з Беларусі было эвакуіравана звыш 120 прадпрыемстваў, дэманціравана і адпраўлена на усход 3200 металапрацоўчых станкоў, 8933 тэкстыльныя, швейныя, скураабутковыя і трыкатажныя машыны, 8664 маторы, 3866 вагонаў гатовай прадукцыі і сыравіны. З пяці ўсходніх абласцей было эвакуіравана 5 тыс. трактараў, 228 камбайны, 136 малатарняў, вывезена і перагнана звыш 674 тысяч галоў жывёлы (без коней), 93,6 тыс. тон зерня.

Насельніцтва Беларусі прымала масавы ўдзел у будаўніцтве абарончых аб'ектаў і рубяжоў, дзе было занята каля 2 млн. чалавек.

З добраахвотнікаў, якія не падлягалі прызыву ў армію, было створана 78 знішчальных батальёнаў (звыш 13 тыс. чалавек) і больш за 200 фарміраванняў народнага апалчэння (больш 33 тыс. чалавек), якія вялі барацьбу з дэсантамі праціўніка, шпіёнамі, ахоўвалі прамысловыя аб'екты, дзяржаўныя ўстановы, лініі сувязі і г.д. Акрамя таго, яны дапамага-

лі праводзіць эвакуацыю насельніцтва і матэрыяльных каштоўнасцей, прымалі ўдзел у знішчэнні важных аб'ектаў, каб не дасталіся ворагу.

Трэба адзначыць, што ўсе гэтыя мерапрыемствы праводзіліся ў вельмі сціслыя тэрміны, ў складанай прыфрантавой абстаноўцы, кароткага ваеннага працістаяння, пад сістэматычнымі артылерыйскімі абстрэламі, налётамі варожай авіацыі. У гэтых абставінах цяжка было пазбегнуць неразбярыхі, з'яўлення шматлікіх пэнічных слухаў, настрояў, чаму ў значнай меры садзейнічала амаль поўная адсутнасць аб'ектыўнай інфармацыі аб падзеях на фронце, канкрэтных і ясных установак як паводзіць сябе насельніцтву.

У выніку праведзеных эвакуацыйных мерапрыемстваў грамадскае і эканамічнае жыццё ва ўсходніх абласцях Беларусі было ў значнай ступені паралізавана, што цяжкім грузам лягло потым на плечы тых, хто не змог эвакуявацца на ўсход.

Акупаваўшы Беларусь, гітлераўцы устанавілі на яе тэрыторыі так званы "новы парадак"-- акупацыйны рэжым, які з'яўляўся сродкам правядзення ў жыццё злачыннай палітыкі германскага фашызму ў адносінах заваяваных тэрыторый і народаў. Ідэалагічнай асновай гэтай палітыкі былі чалавеканенавісніцкія тэорыі нацыстаў аб "расавай перавазе" нямецкай нацыі над іншымі народамі, неабходнасці панырэння "жыццёвай прасторы" для немцаў, "права" на сусветнае панаванне "трэцяга Рэйха" і г.д.

Беларусь за сваю шматвяковую гісторыю не адзін раз станавілася ахвярай іншаземных захопнікаў. Але такой кароткай акупацыі, як гэта было ў апошнюю вайну, яна яшчэ не ведала. 16 ліпеня 1941 г. Гітлер заявіў, што савецкія тэрыторыі павінны быць навечна далучаны да Рэйха. "У асноўным справа зводзіцца да таго, -- цынічна гаварыў ён, -- каб асвоіць велізарны пірог з тым, каб мы, па-першае, авалодалі ім, па-другое, кіравалі і, па-трэцяе, эксплуатавалі". Гітлераўцы перш за ўсё ліквідавалі савецкі дзяржаўны лад, перакрэслілі тэрытарыяльную цэласнасць рэспублікі, увялі свой адміністрацыйны падзел. Так, тэрыторыя Віцебскай, Магілёўскай, амаль усёй Гомельскай, усходнія раёны Мінскай і некалькі раёнаў Палескай абласцей былі аднесены да так званай "вобласці армейскага тылу групы армій "Цэнтр". Улада на гэтай тэрыторыі знаходзілася ў руках ваенных. Вышэйшым органам перыяхта на гэтай

тэрыторыі быў штаб тыла групы армій "Цэнтр".

Паўднёвыя раёны Палескай, Пінскай і Брэсцкай абласцей з абласнымі цэнтрамі Мазыр, Пінск і Брэст былі далучаны да так званага "рэйхскамісарыята Украіна", граніца якога праходзіла прыкладна за 20 км на поўнач ад чыгункі Брэст-Гомель.

Беластоцкую, паўночныя раёны Брэсцкай, частку раёнаў Баранавіцкай абласцей гітлераўцы ўключылі ў склад Усходняй Прусіі. Паўночна-заходнія раёны Вілейскай вобласці былі далучаны да генеральнай акругі "Літва".

У склад уласна Беларусі, ці як яе акупанты называлі "генеральбэцырк Беларутэнія" — генеральная акруга Беларусь", было ўключана 68 раёнаў з агульнага ліку 192, якія ўваходзілі ў склад БССР напярэдадні вайны. Агульная плошча яе складала прыкладна трэцюю частку тэрыторыі Беларусі з насельніцтвам 3138256 чалавек (на 4.XII.1941 г.). Гетая тэрыторыя была ўключана ў склад рэйхскамісарыята "Остланд" з рэзідэнцыяй у Рызе і падзелена на 11 акруг (гебітаў): Баранавіцкую, Барысаўскую, Вілейскую, Ганцавіцкую, Глыбоцкую, Лідскую, Мінскую, Навагрудскую, Слонімскую, Слуцкую і г. Мінск. Вышэйшым органам тут з'яўляўся "генеральны камісарыят Беларусі", якому падпарадкоўваліся гебітскамісарыяты, штатскамісарыяты (гарады) і артскамісарыяты (раёны). Генеральным камісарам быў прызначаны гаўляйтэр В.Кубе.

Адміністрацыйны апарат у асноўным складаўся з нямецкіх грамадзянскіх служачых. У якасці дапаможных мясцовых устаноў акупанты стваралі гарадскія і раённыя управы на чале з начальнікам раёна або бургамістрам горада.

Ва ўсходняй частцы Беларусі ваенна-адміністрацыйныя функцыі выконвалі створаныя вермахтам палявыя і мясцовыя камендатуры, якія надзяляліся ўсёй паўнатой улады ў зоне сваёй дзейнасці.

Следам за перадавымі часцямі вермахта рухаліся аператыўныя групы рэйхсфюрэра СС Гімлера — айнзатц групы "Б" і "А", якія учынялі крывавыя акцыі, шляхам масавага забойства савецкіх людзей імкнуліся паралізаваць волю насельніцтва да барацьбы. Толькі аператыўная група "Б" за кастрычнік 1941 г. знішчыла ў Беларусі 37180 чалавек. Да канца 1941 г. на яе тэрыторыі былі створаны пастаянныя акупацыйныя органы паліцыі бяспекі і СД.

Увогуле, каб утрымліваць у сваіх руках тэрыторыю захопленай Беларусі, гітлераўцы вымушаны былі трымаць тут ваенна-паліцэйскія сілы колькасцю да 160 тыс. чалавек, не лічачы франтавых частак, якія таксама выкарыстоўваліся ў барацьбе супраць партызан. Але і гэтага было недастаткова. Так, у канцы лета--восенню 1941 года гітлераўцы стварылі і накіравалі ў Беларусь некалькі ўзброеных прафашысцкіх т.зв. "украінскіх" фарміраванняў і літоўскі батальён, якія выкарыстоўваліся для аховы камунікацый, барацьбы з партызанамі, а таксама ўдзельнічалі ў масавым знішчэнні яўрэйскага насельніцтва. Як сведчыць справаздача 12-га літоўскага батальёна, толькі за перыяд з 5 кастрычніка па 7 лістапада 1941 г. ім знішчана на тэрыторыі Беларусі звыш 48 тыс. чалавек. Стварэннем фашысцка-нацыналістычных фарміраванняў, акупанты мелі не толькі ваенныя, але і палітычныя мэты. Яны разлічвалі ўбіць клін паміж народамі Савецкага Саюза.

Каб надаць больш арганізаваны і эфектыўны характар катаванням і знішчэнню савецкіх людзей, гітлераўцы стварылі на тэрыторыі Беларусі сістэму канцэнтрацыйных лагераў і турмаў, дзе без суда і вызначэння тэрмінаў зняволення знаходзіліся дзесяткі тысяч савецкіх людзей.

На афіцыйным прызначэнні яны падзяляліся на лагеры смерці для ваеннапалонных (дулагі, шталагі, афлагі), для цывільнага насельніцтва (працоўныя лагеры СД, жаночыя лагеры, перасыльныя лагеры СС, штрафныя гета) і інш. Усяго на тэрыторыі Беларусі было больш 260 лагераў смерці, іх філіялаў і аддзяленняў. Самым буйным на часова акупаванай тэрыторыі не толькі Беларусі, але і ўсяго СССР з'яўляўся Трасцянецкі лагер смерці, дзе было знішчана 206500 чалавек. Гэта трэці ад колькасці загінуўшых ад рук гітлераўцаў ахвяр лагер пасля Асвенцыма і Майданэка.

Зразумела, што пры правядзенні акупацыйнай палітыкі гітлераўцы павінны былі стварыць на месцах дапаможны адміністрацыйны і паліцэйскі апарат. Для гэтай мэты яны выкарыстоўвалі калабарантаў з ліку тых, хто з'яўляўся працаўнікам савецкага ладу, асоб былой польскай адміністрацыі, а таксама памагатых з ліку грамадзян, здрадзіўшых сваёй Радзіме.

Адным з галоўных напрамкаў у дзейнасці КП(б)Б у першыя дні вайны была арганізацыя падпольнай і партызанскай барацьбы на акупіраванай ворагам тэрыторыі рэспублікі, арганізаванай дзейнасць у гэтым напрамку пачалася пасля таго, як была атрымана дырэктыва СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 29 чэрвеня 1941 г. "У занятых ворагам раёнах, -- гаварылася ў дырэктыве, -- стварацъ партызанскія атрады і дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай вайны усюду і скрозь, для ўзрыву мастоў, дарог, псавання тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, падпалу складоў і г.д. У захопленых раёнах стварацъ невыносныя ўмовы для ворага і ўсіх яго памагатых, праследаваць і знішчаць іх на кожным кроку, зрываць усе іх мерапрыемствы!"

Трэба адзначыць, што на час прыняцця дырэктывы значная частка тэрыторыі Беларусі, у тым ліку Брэст, Гродна, Беласток, Баранавічы, Мінск, ужо былі заняты захопнікамі. Зразумела таксама, што ва ўмовах існуючых ў той час парадкаў, калі кожны крок рэгламентаваўся зверху, ініцыятыва нізоў у гэтым напрамку магла быць пакаральнай. Таму камуністы, камсамольцы, усё насельніцтва раёнаў Заходняй Беларусі ў гэтых абставінах засталіся не толькі без неабходнай інфармацыі і ўказанняў аб далейшых паводзінах, але і з рызыкай быць абвінавачанымі ў тым, што свядома засталіся на акупіраванай тэрыторыі.

Нараўне з працай па своечасоваму фарміраванню сеткі падпольных партыйных органаў і арганізацый у раёнах, якім пагражала акупацыя, на працягу ліпеня-кастрычніка партыйныя камітэты падабралі і накіравалі на акупіраваную тэрыторыю рэспублікі сотні арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху. Усяго летам 1941 года для барацьбы ў тыле ворага было астаўлена каля 8 тысяч камуністаў са складу партыйнай арганізацыі рэспублікі. Адначасова партыйныя органы рэспублікі займаліся фарміраваннем і накіроўвалі ў тыл ворага арганізатарскія і дыверсійныя групы, невялікія партызанскія атрады. Усяго у 1941 годзе ў тыл ворага было накіравана 437 груп і атрадаў, якія налічвалі больш 7,2 тысяч чалавек. Трэба адзначыць, што не ўсім групам і атрадам удалося выканаць пастаўленныя перад імі задачы. Наперадзе была нялегкая, шматгадовая барацьба, поўная суровага драматызму, высокага выпрабавання сілы і моцы чалавечага духу. Не ўсім атра-

дам і групам пасчасціла прарвацца праз вавіную віхуру фронта, замацавацца ў зададзеных раёнах. Шмат патрыётаў загінула ў няроўных баях. Многія групы былі рассеяны ў баях з карацелямі. Некаторыя, не вытрымаў цяжару і складанасцей партызанскага суровага жыцця, спрабавалі вярнуцца назад, каб змагацца на фронце.

У літаратуры аб партызанскай вайне шырока ўсталявалася думка, што адбор для працы ў тыле ворага будаваўся на строга дабраволінай аснове. У агульным цэлым так яно і было, але ж не трэба закрываць вочы і на тое, што рэцыдывы камандна-адміністрацыйнай сістэмы праяўляліся і ў гэтай глыбока патрыятычнай справе. Нельга не заўважыць, што адбор, інструктаж і падрыхтоўка людзей для выканання задання ў тыле ворага ў тых складаных умовах насіла павярхоўны і больш за ўсё фармальны характар, што ў значнай ступені тлумачыцца адсутнасцю ў перадваенны перыяд якой-небудзь праграмы па гэтым пытанням, а таксама жаданнем органаў, якія займаліся арганізацыяй барацьбы ў тыле ворага, як мага хутчэй адрапартаваць аб разультатах сваёй працы. Ужо на трэці дзень пасля дырэктывы ад 29 чэрвеня і на другі дзень пасля прыняцця дырэктывы ЦК КП(б)Б ад 1 ліпеня 1941 г. першы сакратар ЦК КП(б)Б П.К.Панамарэнка ў тэлеграме І.В.Сталіну дакладваў, што "у Беларусі разгарнуўся партызанскі рух, напрыклад,у Палескай вобласці кожная вёска, калгас маюць партызанскі атрад. Камуністы астаўлены намі для арганізацыі і кіраўніцтва. Астаўлена, атабрана і адпраўлена ў захопленыя раёны каля 1500 чалавек атборных людзей. Сёння мною адпраўлена 50 атрадаў у занятыя раёны з асоба важным заданнем, сэнс якога не даверяю паперы".

Акрамя партыйных органаў, арганізацыяй барацьбы ў тыле ворага займаліся таксама і савецкія органы, да партызанскіх метадаў барацьбы самастойна пераходзілі воіны савецкай арміі, якія апынуліся ў акружэнні і не змаглі прабіцца на ўсход.

Верныя вайсковаму абавязку абавязку і прысязе, многія савецкія воіны-камандзіры, палітработнікі, радавыя знаходзілі шляхі для працягу барацьбы. Пры гэтым яны апіраліся на дапамогу насельніцтва і мясцовага актыву -- камуністаў, камсамольцаў, беспартыйных.

Ужо на другі дзень вайны на тэрыторыі Жабінкаўскага раёна каля вёскі Старое Сяло быў створаны партызанскі атрад, які атрымаў назву Старасельскі. У яго складзе знаходзіліся жыхары сель-

савета, пагранічнікі і воіны 125-га і 84-га стралковых палкоў. Кіраваў атрадам маёр В.Ц.Даро;чых, а яго намеснікам быў старшыня сельсавета М.Н.Чарнак. Шмат такіх атрадаў было створана і ў другіх раёнах і абласцях Заходняй Беларусі. Побач з атрадамі ў заходніх абласцях летам-восенню 1941 г. аперыравалі шматлікія партызанскія групы.

Не ўсе яны ведалі аб тым, што ёсць дырэктыўныя ўказанні аб стварэнні партызанскага руху, аб прамове Сталіна ад 3 ліпеня і таму асноўнай сваёй мэтай на першым часе ставілі задачу прабівацца на ўсход для злучэння з Чырвонай Арміяй. Тыя ж з іх, хто ў няроўнай і заняцай барацьбе змог захаваць сябе арганізацыйна, умацаваліся і акрэпліі, сталі трывалай асновай стварэння баяздольных партызанскіх атрадаў. Усяго, па няпоўных звестках, у 1941 г. на Беларусі дзейнічалі 99 партызанскіх атрадаў і амаль столькі ж груп. Дзейнасць партызан у Беларусі дастаўляла шмат турбот гітлераўскаму кіраўніцтву. Так, начальнік вярхоўнага галоўнакамандавання вермахта Кейтэль 16 верасня 1941 г. вымушаны быў адзначыць, што "з самага пачатку ваеннай кампаніі супраць Савецкай Расіі ва ўсіх акупаваных Германіяй абласцях узнік камуністычны паўстанцкі рух... Высветлена, што гаворка ідзе ў дадзеным выпадку пра масавы рух, які накіроўваецца ў цэнтралізаваным парадку з Масквы, ва ўсе ўзрастаючай ступені ствараецца небяспека для нямецкага ваеннага кіраўніцтва..."

Адначасова са стварэннем партызанскіх фарміраванняў ішоў актыўны працэс узнікнення падпольных груп і арганізацый у гарадах і населеных пунктах рэспублікі.

У арганізацыі барацьбы супраць акупантаў у гарадах і населеных пунктах рашаючую ролю сыгралі кадравыя рабочыя, камуністы, камсамольцы, беспартыйныя, прадстаўнікі савецкай інтэлігенцыі, ваеннаслужачыя і другія патрыёты.

У першыя месяцы акупацыі ўзнікла патрыятычнае падполле ў Мінску, у стварэнні якога вялікую ролю адыгралі старыя камуністы А.Ф.Арндт, Е.М.Баранаў, М.І.Думбра, І.І.Матусевіч, Л.Н.Адзінцоў, С.К.Амельянюк, А.Ф.Орсік, С.В.Сержановіч, М.І.Талкачоў і інш. Да канца 1941 г. па няпоўных звестках у горадзе і навакольлі дзейнічала больш за 50 арганізацый і груп, якія ўзніклі самастойна ў розных частках горада. На ініцыятыве прыбыўшага па заданню ЦК КП(б)Б даваеннага сакратара Заслаўскага РК КП(б)Б І.К.Кавалёва, які аб'яднаў падпольныя групы і арганізацыі, быў створаны Мінскі падпольны гарком КП(б)Б — кіруючы орган пад-

подпля. Мінскія патрыёты вялі палітычную работу сярод насельніцтва, ратавалі ад фашысцкага палону воінаў Чырвонай Арміі, арганізоўвалі сабатаж, дыверсіі, стваралі ўзброеныя групы, здабывалі зброю. Падпольшчыкі Мінска падтрымлівалі сувязі з падполлем другіх гарадоў і вёсак рэспублікі, з партызанскімі атрадамі.

У адрозненне ад Мінска ў Магілёве, Віцебску і Гомелі партыйныя органы паспелі загадзя аставіць для падпольнай работы частку камуністаў і беспартыйных, больш арганізавана прайшоў пераход на нелегальнае становішча ў другіх гарадах і населеных пунктах гэтых абласцей, а таксама Палессі. Слаўнай старонкай ў гісторыю патрыятычнага падполля ўпісала дзейнасць К.С.Заслонава і яго сяброў на чыгуначным вузле г. Оршы. Актыўную ролю ў арганізацыі падпольнай барацьбы ў Магілёве адыграў пакінуты для нелегальнай працы настаўнік К.Ю.Жэтэ. Вядучую ролю ў арганізацыі Бабруйскага падполля адыгралі прыбыўшы па заданню ЦК КП(б)Б Д.М.Лемяшонак, ваеннаслужачыя В.І.Лівенцаў, С.З.Крамараў І.М.Сцяпанаў і інш. Шмат было зроблена па стварэнню ў 1941 г. падполля ў Мазыры, Калінкавічах, Гураве, Ельску.

Трэба адзначыць, што партызанскі рух і падпольная барацьба разгортваліся ў суровых выпрабаваннях першых месяцаў вайны. Патрыётам вельмі замінала адсутнасць вопыту барацьбы, неабходнай падрыхтоўкі і тэхнічных сродкаў, што прыводзіла да неапраўдальных страт.

Партызаны і падпольшчыкі супрацьпаставілі ворагу палымяны патрыятызм, гарачую любоў да Радзімы, свае заданне да канца выканаць свой абавязак. Дзякуючы гэтаму цвёрдаму падмурку сіла і мощ партызанскай барацьбы пастаянна ўзрастала.

ТЭМА 24. БЕЛАРУСЬ У ПЕРШЫЯ ДВА ГАДЫ АКУПАЦЫІ

Вучэбныя пытанні: 1. Развіццё партызанскага руху. Актывізацыя баявых дзеянняў партызан. 2. Умацаванне падпольнай барацьбы. 3. Палітычныя, эканамічныя і ваенныя захады акупантаў. Палітыка генацыду. 4. Калабаранты. Беларуская народная самапомач. Беларуская самаахова.

Пасля акупацыі нямецкімі войскамі тэрыторыі рэспублікі ў многіх яе раёнах пачалася барацьба насельніцтва супраць захопнікаў. Вялася яна ў самых розначастайных формах — ад невыканання мерапрыемстваў акупацыйных улад да ўзброенага супраціўлення. Найбольш адчувальнымі для вермахта і паліцэйскіх сіл былі дзеянні ўзброеных партызанскіх атрадаў і груп. Яны сведчылі аб натуральным імкненні беларускага народа бачыць сваю Радзіму свабоднай ад іншаземных захопнікаў. Нельга не адзначыць, што на Беларусі мелося даволі багаты вопыт партызанскіх дзеянняў, накоплены ў далёкім і блізкім мінулым. Да таго ж многія вайскоўцы, што трапілі ў акружэнне ў пачатку вайны, альбо вырваліся з варожага палону, таксама станавіліся на шлях узброенай партызанскай барацьбы.

У ліку першых, самастойна ўзніклых, быў Пінскі партызанскі атрад пад камандаваннем В.З.Карка, які налічваў каля 60 чалавек. На тэрыторыі Кастрычніцкага раёна Палескай вобласці актыўна дзейнічаў атрад "Чырвоны Кастрычнік". Яго дырэктыўнікі Ц.П. Бумаккоў і Ф.І.Паўлоўскі 6 жніўня 1941 г. сталі першымі партызанамі-Героямі Савецкага Саюза перыяду Вялікай Айчыннай вайны. На Міншчыне, у вёсцы Загалле (Любанскі раён) баявую партызанскую групу стварыў Дз. Хаміцэвіч. У Чашніцкім раёне узброенную барацьбу супраць акупантаў узначаліў Ц.Я.Ермаковіч. З ліку рабочых і служачых Пудацкай картоннай фабрыкі ў Сураскім раёне быў створаны атрад, на чале якога стаў М.П. Шмыроў, любоўна названы ў народзе "бацькам Мінаем". На аснове былых знішчальных батальёнаў партызанскія атрады ўзніклі ў Парычцкім, Лельчыцкім, Ельскім, Лоеўскім, Рагачоўскім, Мазырскім і іншых раёнах Беларусі. Усяго ў другой палове 1941 г. самастойна ўзнікла каля 60 партызанскіх адзінак. Як паказаў далейшы вопыт барацьбы, яны аказаліся самымі трывалымі і баяздольнымі.

Большую частку партызанскіх фарміраванняў склалі тыя, што былі арганізаваны па лініі партыйна-савецкіх устаноў. Пад іх

кіраўніцтвам на ўсходніх раёнах рэспублікі праводзіліся спецыяльныя інструктажы-настаўленні, ствараліся кароткатэрміновыя курсы і падрыхтоўчыя цэнтры. Яны дзейнічалі ў Магілёве, Лёзна, Віцебску, Гомелі, Мазыры, Полацку, Браншку і іншых населеных пунктах. Вынікам гэтай работы было тое, што за ліпень-верасень у цэнтралізаваным парадку было сфарміравана звыш 430 партызанскіх атрадаў і арганізацыйных груп, у якіх налічвалася больш 8300 чалавек. І хоць не ўсе з іх змаглі выканаць пастаўленыя задачы, усё ж значная частка адолела прыйсці на месца дыслакацыі і стаць арганізацыйным ядром для многіх боездольных партызанскіх фарміраванняў.

Характэрна, што адначасова з працэсам узнікнення ўзброеных атрадаў і груп разгортвалася ўзброеная барацьба супраць ворага сваёй актыўнасцю ў другой палове 1941 г. асабліва вызначалі ся атрады і групы (апрача пералічаных вышэй), на чале якіх стаялі М.П.Ганчароў (Беласточчына), М.М.Бяляўскі (Тураўскі раён), І.С.Федасеянка (Гомельскі раён), М.І.Жукоўскі (Красная Слабада), А.К.Стэльмах-П.П.Макарэнка (Багушэўскі раён), І.А. Ярош (Барысаўскі раён), І.З.Ізох (Клічаўскі раён), В.І.Нічыпаровіч, М.Ф.Каралёў, Р.М.Сталяроў — на Міншчыне і інш.

Дзейнасць партызан выклікала ў праціўніка сур'ёзную заклапочанасць. Генерал Вагнер, напрыклад, паведамляў начальніку генеральнага штаба сухапутных сіл Германіі Ф.Гальдэру, што група армій "Цэнтр" не можа быць належным чынам забяспечана ўсім неабходным "непасрэдна праз свой раён з выпадку разбурэння партызанамі чыгуначных шляхоў". Каб пакончыць з дзейнасцю "лясных бандытаў", як называлі партызан гітлераўцы, у ліпені-кастрычніку 1941 г. была здзейснена першая буйнамаштабная карная аперацыя пад назвай "Прыпяцкія балоты". У выніку яе правядзення карнікі знішчылі 13788 чалавек у асноўным мірных жыхароў, акружэнцаў, усіх тых, хто быў западозраны ў падтрымцы партызан. Нягледзячы на размах аперацыі і яе кароткасць, карнікі не дасягнулі пэўнага поспеху.

З наступленнем зімовых сцюж і ў сувязі з адсутнасцю неабходнай колькасці зброі, боезапасаў, прадуктаў харчавання, цёплай вопраткі і медыкаментаў, шэраг атрадаў і груп часова самаліквідаваўся, ці перайшоў на пазалегальнае становішча, каб потым з прыходам вясновай цяплыні зноў узяцца за зброю. Але калі 200 партызанскіх атрадаў і груп працягвалі ўзброеную

барацьбу з захопнікамі. З дягам часу яны выраслі ў буйныя партызанскія фарміраванні, якія наносілі значныя страты ворагу ў жывой сіле і тэхніцы.

Станоўчы ўплыў на развіццё партызанскай барацьбы мела Маскоўская бітва. Разгром немцаў у сцен сталіцы СССР яскрава сведчыў, што планы "маланкавай вайны" пахаваны, што вайна будзе працягвацца і агрэсар урэшце будзе разгромлены. А гэта ўзмацняла ў сваю чаргу ўсяляла аптымізм тым патрыётам, што змагаліся на акупаванай фашыстамі тэрыторыі, у тым ліку і ў Беларусі: рады ўзброеных змагароў шырыліся і умацоўваліся, іх удары па ворагу станавіліся усе больш адчувальнымі і значнымі.

Новы ўздым партызанскага руху ў Беларусі прыпадае на вясну лета 1942 г.: расце колькасць атрадаў і груп, якія аб'ядноўваюцца ў брыгады, "гарнізоны", ваенна-аператыўныя групы; значна паляпшаецца ўзбраенне "лясных" байцоў, удасканальваецца структура партызанскіх сіл. Яны усё больш набываюць войскавую падбудову. Брыгады складваліся з атрадаў, якія ў сваю чаргу дзяліліся на батальёны, роты, узводы, аддзяленні. Узрастала майстэрства камандных кадраў і штабоў усіх узроўняў, наладжваліся цесныя сувязі з мясцовым насельніцтвам.

Характэрнай рысай партызанскага руху ў 1942 г. становіцца вызваленне ад акупантаў значных тэрыторый і утварэнне там партызанскіх зон, дзе гаспадарамі становішча былі самі патрыёты. Першая такая зона з'явілася ў студзені-лютым 1942 г. на тэрыторыі Кастрычніцкага раёна былой Палескай вобласці. Кантралюючы яе так званы "гарнізон Ф.І.Паўлоўскага" у сваім складзе налічваў 18 атрадаў (звыш 1.300 чал.), узброеных, апрача вінтовак, 70 станковымі і ручнымі кулямётамі, 33 аўтаматамі, 5 гарматамі і 8 мінамётамі. "Гарнізон" распаўсюджваў свой уплыў і на частку населеных пунктаў суседніх раёнаў -- Глускага, Любаньскага, Старадарожскага, Капаткевіцкага.

Цэнтрам партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці з вясны 1942 г. стаў Клічаўскі раён, дзе базіравалася даволі буйная групоўка партызан. 20 сакавіка 1942 г. партызанскія атрады А.С. Юркаўца, В.П.Сліўтунова, В.І.Лівенцава, В.М. Сырцова пасля напружанага 12-гадзіннага бою авалодалі раённым цэнтрам Клічаў і завяршылі поўнае вызваленне раёна ад акупантаў. Да красавіка ўказанні вышэй атрады ва ўзаемадзеянні з шэрагам партызанскіх груп выгналі захопнікаў таксама з многіх населеных пунктаў

суседніх Асіповіцкага і Кіраўскага раёнаў.

Прыкметную ролю ў далейшым развіцці партызанскага руху ў гэтай зоне адыграў 208-м партызанскі атрад, які ў пачатку красавіка прыбыў у Клічаўскія лясы з Мінскай вобласці. Камандзір атрада палкоўнік В.І.Нічыпаровіч (быў камандзір 208-й стралковай дывізіі) устанавіў сувязь с камандаваннем мясцовых атрадаў. Тады ж на яго ініцыятыве была праведзена нарада камандзіраў саставаў гэтых атрадаў, якая прыняла рашэнне аб'яднаць партызанскія сілы Клічаўскай зоны з мэтай павышэння каардынацыі, баявога ўзаемадзеяння, умацнення актыўнасці і мэтанакіраванасці іх дзеянняў. Камандаванне атрада ўзяло на сябе аператыўнае кіраўніцтва аб'яднанымі фарміраваннямі зоны (быў створаны аператыўны цэнтр) і паспяхова спраўлялася з гэтым.

Клічаўскае партызанскае злучэнне было самай буйной групоўкай партызанскіх сіл у Магілёўскай вобласці. У падпарадкаванні яго аператыўнага цэнтра ў пачатку верасня 1942 г. знаходзілася 17 партызанскіх атрадаў, якія налічвалі ў сваім складзе каля 3 тыс. чалавек. Атрады злучэння распаўсюджвалі свае баявыя дзеянні на Клічаўскі, Магілёўскі, Бялыніцкі, Бярэзінскі, Асіповіцкі, Кіраўскі, Быхаўскі раёны Магілёўскай, а таксама Рагачоўскі і Журавіцкі раёны Гомельскай абласцей.

Амаль такім жа шляхам аб'яднанне партызанскіх атрадаў ішло і ў іншых месцах Беларусі. Тэндэнцыя да ўтварэння розных аддалучэнняў партызанскіх сіл і стварэння штабоў для каардынацыі іх баявых дзеянняў назіраецца ў гэты час паўсюдна. Пры гэтым атрады, якія ўваходзілі ў партызанскія аб'яднанні, не трацілі сваёй самастойнасці. Плануючы баявыя дзеянні, яны з дапамогай аператыўных штабоў ажыццяўлялі іх каардынацыю, праводзілі сумесныя баявыя аперацыі.

Некаторую асаблівасць мела арганізацыя партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі Віцебскай вобласці, якая з пачатку 1942 г. з'яўлялася прыфрантавой. Многія партызанскія атрады там падтрымлівалі трывалую сувязь с Віцебскім абкомам і ЦК КП(б)Б, што дазваляла ім лініяй фронту, а таксама з ваеннымі саветамі 3-й і 4-й ударных армій. Велізарнае значэнне мела таксама існаванне "Суражскіх (Віцебскіх) варот", праз якія з "Вялікай зямлі" у тыл ворага накіроўваліся арганізатарскія і дыверсійныя групы, зброя, боепрыпасы, медыкаменты і інш. Яны дзейнічалі з лютага да верасня 1942 г.

На пачатак студзеня 1943 г. колькасць партызан у Беларусі перавысіла 56 тысяч чалавек. Узброеную барацьбу супраць захопнікаў вялі 56 брыгад, якія аб'ядноўвалі 220 атрадаў. Акрамя таго, налічвалася 292 самастойна дзеючых атрады. Партызанскі рэзерв складаў на гэты час звыш 150 тыс. чалавек.

Станоўчую ролю ва ўдасканаленні пабудовы і кіраўніцтва, а таксама забеспячэнні патрыётаў зброяй, узрыўчаткай, радыёсувязю і камандным кадрамі адыгралі Цэнтральны (створаны ў маі 1942 г.) і Беларускі (верасень 1942 г.) штабы партызанскага руху. Яны адпаведна ўзначальваліся сакратарамі ЦК Кампартыі Беларусі П.К.Панамарэнка і П.З.Калініным. З дапамогай штабоў арганізацыя партызанскіх сіл Беларусі набыла ў 1942 г. якасна новы рысы. Шырокае распаўсюджванне атрымала атрадная форма арганізацыі партызан. Атрад стаў асноўнай баявой адзінкай узброенных патрыётаў. Вопыт барацьбы нарадзіў і больш высокія формы арганізацыі партызанскіх сіл, у першую чаргу брыгады. Яны сталі паўсюдна дамініруючымі. Усе гэта азначала пачатак разгортвання масавага партызанскага руху. У яго нетрах з'явіліся ўмовы для ўтварэння вышэйшых форм аб'яднання — занальных і абласных партызанскіх злучэнняў, першыя з якіх на тэрыторыі Беларусі з'явіліся ў другой палове 1942 г. Гэты працэс завяршыўся ў 1943 годзе.

З ростам партызанскіх сіл памнажалася і баявая актыўнасць патрыётаў. Партызаны ўсё часцей праводзілі буйныя наступальныя аперацыі, множылі ўдары па камунікацыях, гарнізонах, апорных пунктах і іншых аб'ектах захопнікаў. У выніку ад ворага вызваляліся цэлыя раёны, дзе ўлада пераходзіла да партызан і адноўленых органаў савецкай улады. 17 студзеня 1942 г. партызанскія атрады Ф.І.Паўлоўскага і А.І.Далідовіча разграмілі моцны нямецкі гарнізон у райцэнтры Капаткевічы. Яны захапілі шмат зброі і сотні тон збожжа, якое было падрыхтавана для адпраўкі ў Германію. У лютым гэтага ж года фарміраваннямі Ф.І.Паўлоўскага, І.Р.Жулегі, А.Ц.Міхайлоўскага, А.Ф.Каваленкі былі разгромлены гарнізоны ў мястэчку Азарычы, а таксама на станцыі Муляроўка. У выніку значна пашыралася Акцябрская партызанская зона.

У сакавіку 1942 г. Мінскі падпольны абком партыі арганізаваў баявы рэйд на тэрыторыі Любанскага, Жыткавіцкага, Лагойскага, Старобінскага, Чырвонаслабодскага і Слуцкага раёнаў. У ім удзельнічалі даволі значныя сілы — атрады А.Далідовіча, М.Розава, А.Шатрына, Г.Сталярова, А.Мілевіча, М.Лукашэвіча, В.Кар-

ка — усяго каля 600 чалавек. Партызаны рухаліся двума паралельнымі напрамкамі, праходзячы за ноч па 25-30 км. Іх нечаканае з'яўленне наводзіла паніку на фашыстаў і іх памагатых. Па шляху яны знішчалі гарнізоны, сельскія і валасныя ўправы, узрывалі масты, праводзілі шырокую агітацыйную работу сярод насельніцтва. Вынікам актывізацыі баявых дзеянняў мінскіх і палескіх партызан стала стварэнне даволі абшырнай Любанскай партызанскай зоны, якая ў спалучэнні з Акцябрскай зонай ахоплівала значную тэрыторыю Любанскага, Старобінскага, Старадарожскага, Глускага і Кыткавіцкага раёнаў. Цеснае ўзаемадзеянне партызан Любанскай і Акцябрскай зон у красавіку 1942 г. прывяло да іх канчатковага зліцця. Утварылася буйное злучэнне партызанскіх атрадаў Мінскай і Палескай абласцей, якое панавала ў міжрэччы Случы і Пцічы. Узначальвалі злучэнне сакратары Мінскага падпольнага абкома КП(б)Б — спачатку В.І.Казлоў, а потым (пасля яго ад'езду ў Маскву) — Р.Н.Мачульскі.

Накшталт Любанска-Акцябрскай партызанскай зоны на акупаванай тэрыторыі Беларусі ў розны час дзейнічала некалькі дзесяткаў іншых зон. Яны таксама канцэнтраваліся буйнымі злучэннямі партызан. Найбольш значныя з іх — Баранавіцкае, Беластоцкае, Брэсцкае, Віцебскае, Гомельскае, Магілёўскае, Мінскае і Пінскае абласныя злучэнні.

Важнае значэнне ў барацьбе з акупантамі мелі ўдары партызан па камунікацыях праціўніка, у першую чаргу па чыгунках, мастах і буйных вузлах. Летам 1942 г. калі Чырвоная Армія вяла цяжкія абарончыя баі ля Сталінграда, ЦШПД звярнуўся да партызан Беларусі з заклікам як мага актыўней зрываць перакідку да месца баёў рэзервы праціўніка, дабівацца поўнага знішчэння вайсковых эшалонаў на іх шляху да фронту. Партызаны Беларусі адказалі на гэты заклік шэрагам буйных аперацый, у тым ліку і на камунікацыях праціўніка. У пачатку жніўня 1942 г. дывэрсійная група брыгады "За Савецкую Беларусь" Віцебскай вобласці ўзарвала чатырохпралётны мост праз раку Дрыса магістралі Полацк-Даўгаўпілс. Рух на ім быў адноўлены толькі праз 16 сутак. 25 жніўня партызаны атрада імя М.Ц.Каліна Пінскай вобласці разгромілі гарнізон у Бастыні на чыгунцы Баранавічы-Лунінец. У канцы жніўня партызанскія атрады пад кіраўніцтвам С.Г.Жуніна, Д.А.Кулікова, Т.С.Мысніка зрабілі ўдалы налёт на станцыю Слаўнае на лініі Мінск-Орша. Яны разбілі варожы гарнізон, спалілі будынак станцыі, склады з ваеннай маёмасцю і прадуктамі, разбурылі шляхі,

падарвалі дзве вадакачкі і вадонапорную вежу.

Масавыя аперацыі па разбурэнню чыгуначнага палатна моці мэсца на тэрыторыі многіх раёнаў. Удзел у іх разам з партызанамі прымалі і мясцовыя жыхары, якія складалі скрытыя партызанскія рэзервы. Так, брыгада С.М.Кяротkіна пры ўдзеле 250 мясцовых жыхароў 29 мінуня 1942 г. разбурыла чыгуначнае палатно на ўчастку Сіроціна-Язвіна. За ноч было разабрана некалькі кіламетраў чыгункі, зроблены перакопы насыпу, спілены тэлефонна-тэлеграфныя слупы. У выніку чыгунка Полацк-Віцебск не дзейнічала шэсць сутак. Такія ж аперацыі праводзіліся і іншымі брыгадамі.

Рост партызанскага руху выклікаў хвалю карных варожых экспедыцый. За май-лістапад 1942 г. немцы правялі больш 40 карных аперацый у розных раёнах Беларусі. У ходзе іх ворагу часам удавалася на некаторы час адцясніць патрыётаў з раёнаў іх пастаяннай дыслакацыі, але ліквідаваць партызанскі рух ён не здолеў. Па меры таго, як нарошчвала ўдары па ворагу Чырвоная Армія, рос і мацнеў партызанскі рух, пырылася супрацьўленне насельніцтва эканамічным, ваенным і палітычным мерапрыемствам захопнікаў.

Пасля пасляховага заканчэння Сталінградскай бітвы і іншых франтавых аперацый 1943 г. у першую чаргу бітвы пад Курскам, партызанскія сілы сталі множыцца яшчэ хутчэй. Толькі ў Мінскай вобласці за 1943 год у партызанскія атрады ўступіла звыш 22 тыс. чалавек. Характэрна, што партызанскі рух рос не толькі на ўсходніх і цэнтральных, але і заходніх абласцях Беларусі. Гэтаму садзейнічала перадыслакацыя шэрагу партызанскіх злучэнняў з усходніх у заходнія вобласці, а таксама іх перамяшчэнне ў межах асобных абласцей. Да зімы 1943-1944 гг. баявымі рэйдамі на захад былі перакінуты 12 брыгад і 14 асобных атрадаў, агульнай колькасцю каля 7 тысяч чалавек. У выніку гэтай акцыі колькасць партызанскіх сіл у заходніх абласцях павялічылася да 37 тыс. чалавек, а колькасць атрадаў узрасла з 60 да 282. Разам з мясцовымі партызанамі яны ўтварылі амаль суцэльны партызанскі фронт.

У выніку дзейнасці падпольных партыйных камітэтаў і пад уплывам перамог Чырвонай Арміі ў рады партызан Беларусі на працягу 1943 года ўступіла больш за 96 тыс. чалавек, асабовы склад партызанскай арміі вырас з 56724 да 153488 байцоў, г. зн. у 2,7 раза. У гэтым ка годзе з розных варожых фарміраванняў у партызанскія атрады ўлілося каля 12 тысяч чалавек.

Важнае значэнне для развіцця партызанскага руху мела матэрыяльна-тэхнічная дапамога "Вялікай зямлі". Толькі ў 1943 г. авіяцыяй партызанам Беларусі было дастаўлена 20,5 тыс. вінтовак, больш 11 тысяч аўтаматаў, 978 ПТР, 1285 кулямётаў і мінамётаў, звыш 2,6 тыс. пісталетаў, 49038 тыс. патронаў, звыш 120 тыс. ручных гранат, 890,5 тон тола, 97,8 тысяч дывершійных мін. Але асноўнымі крыніцамі ўзбраення усё ж заставаліся мясцовыя рэсурсы. Таму ў 1943 г. не было, бадай, буйнага партызанскага атрада, ці брыгады, якія б не мелі сваёй майстэрні па вырабу і рамонту зброі, вытворчасці мін, гранат і г.д.

Паказчыкам узросшага майстэрства партызан і іх штабоў з'яўлялася правядзенне ў адзін і той жа тэрмін буйнамаштабных аперацый у межах усёй акупаванай тэрыторыі Беларусі. Асабліва вядомымі з іх сталі аперацыі "Рэйкавая вайна" і "Канцэрт", у якіх удзельнічалі фактычна ўсе партызанскія злучэнні Беларусі. Аперацыі ажыццяўляліся з мэтай зрыву летня-восеньскіх 1943 г. асенніх перавозак праціўніка і максімальнага садзейнічання наступленню Чырвонай Арміі. На працягу "рэйкавай вайны" партызаны ўзарвалі звыш 200 тыс. рэек. Былі разбураны чыгуначныя лініі Цімкавічы-Асіповічы, Бабруйск-Старушкі, Жлобін-Калінкавічы. На многіх участках чыгуначных магістраляў рух быў перапынены ад 4 да 15 сутак, а ўчасткі Магілёў-Крычаў, Полацк-Дзвінск, Магілёў-Жлобін, Баранавічы-Лунінец былі выведзены са строю на яшчэ больш тэрмін. Адначасова партызаны пускалі пад адхон эшалоны, узрывалі масты, вадакачкі, чыгуначныя станцыі. Яскравым паказчыкам баявых поспехаў партызан у 1943 г. з'яўляецца тое, што пад іх кантролем знаходзілася 60% акупаванай тэрыторыі, значная частка якой была цалкам вызвалена ад захопнікаў. Сур'ёзна занепакоены такім становішчам фашысты на працягу 1943 г. правялі звыш 60 буйных карных аперацый супраць партызан і насельніцтва. У шматдзённых баях супраць ахоўных і паліцэйскіх сіл прымалі таксама ўдзел многія тысячы кадравых салдат і афіцэраў вермахта. На іх узбраенні былі танкі, артылерыя, самалёты.

У час правядзення карных аперацый ворагі катавалі не толькі супраць партызан, але сотнямі, тысячамі знішчалі цывільнае насельніцтва, не шкадуючы нават старых, дзяцей і жанчын. Усяго за гады акупацыі Беларусі захопнікі правялі звыш 140 карных аперацый. У іх удзельнічалі 5 ахоўных, 1 пяхотная, 1 спецыяль-

нарэ прыкладнога, 2 [illegible] партызанскай ОТ, 2 вучэбна-падрыўныя дывізіі, а таксама часці 8-й танкавай, 2-й, 4-й і 9-й паветрана-армій вермахта, шматлікія паліцэйска-вышукальныя сілы і падраздзяленні войск сатэлітаў. Мэтай гэтых аперацый было не толькі жаданне праціўніка расправіцца з партызанамі, але і больш важкі намер — выканаць гітлераўскія планы па рэзкаму скарачэнню людскога патэнцыялу Беларусі (на 75 працэнтаў). Гэты кудасны план захопнікі старанна і метадычна выконвалі на працягу ўсіх трох гадоў сваёго панавання на беларускай зямлі. Безумоўна, яны не цураліся таго, каб барацьбу партызан і падпольшчыкаў выкарыстаць у якасці падставы для рэалізацыі сваёй мэты, аб чым адкрыта заяўляла кіраўніцтва гітлераўскага рэйха. Таму і гінулі ў полымі беларускія гарады і вёскі. Усяму свету вядома, што трагічны лёс Хатыні раздзялілі 627 вёсак рэспублікі, 158 з якіх і па сённяшні дзень не здолелі паўстаць з руін і попелу, паколькі былі знішчаны разам з іх жыхарамі.

Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што каб не шырокае народнае супраціўленне, то вынікі злачынстваў ворага былі б куды больш значнымі і кудаснымі. У гады акупацыі партызаны вызвалялі і кантралявалі звыш 60 працантаў тэрыторыі Беларусі, знішчылі і паранілі больш 50 тыс. варожых салдат, афіцэраў і іх памагатых. Сваёй важнейшай мэтай яны лічылі выратаванне мірнага насельніцтва, абарону населеных пунктаў, захаванне маёмасці людзей.

Адначасова з узброенай партызанскай барацьбой у гарадах і іншых населеных пунктах разгортвалася падпольная антыфашысцкая дзейнасць. Патрыёты, якія там заставаліся, нягледзячы на тэрор і іншыя захады акупантаў, не скарыліся ворагу. Яны сабатыравалі гаспадарча-эканамічныя, палітычныя і ваенныя мерапрыемствы захопнікаў, здзяйснялі шматлікія дывэрсіі. Гэты напрамак барацьбы з ворагам абумоўліваўся і тымі прычынамі, што з выпадку розных акалічнасцей, не ўсе жадаючыя процідзейнічаць агрэсару маглі пакінуць сваё жыллё і пайсці ў лясы, каб уключыцца ў партызанскія сілы. Да таго ж яны ўсведамлялі ролю палітычнага і сацыяльна-эканамічнага фактару ў распачатай вайне: гарады і населеныя пункты — гэта варожыя гарнізоны, пушчаныя ў ход акупантамі, ушчэльныя прадпрыемствы, чыгуначныя вузлы, гаспадарчыя ўстановы, ствараемая новая адміністрацыя і г.д. Між іншым і трымаўшая ў сваіх руках паўнату ўлады і грамадска-палітычнага жыцця рэспубліканская партарганізацыя таксама

добра разумела гэта. Падрыхтаванні акупанты Беларусі яны пачынаюцілася аб тым, каб былі пакінуты законспіраваныя партыйныя структуры, арганізаваны ячэйкі, размнажальная і капіравальная тэхніка, распрацаваны метады сувязі. Менавіта на гэта арыентавала спецыяльная дырэктыва ЦК КП(б)Б ад 30 чэрвеня 1941 г. "Аб пераходзе на падпольную работу партарганізацый раёнаў, занятых ворагам". Звярталася ўвага на тое, што і партызанская барацьба павінна знаходзіцца ў полі зроку і вясціся пад непасрэдным кіраўніцтвам законспіраваных падпольных партыйных структур.

Выконваючы гэтыя ўказанні, мясцовыя парторганы ў сцісліяя тэрміны правялі работу па ўтварэнню на тэрыторыі Беларусі кіруючага партыйна-камсамольскага падполля. Да поўнай акупацыі рэспублікі ў 89 раёнах Мінскай, Віцебскай, Магілёўскай, Гомельскай, Палескай і Пінскай абласцей былі арганізацыйна афармлены раённыя падпольныя парторганы (райкамы, тройкі) на чале з сакратарамі або членамі былых парторганаў. У чатырох абласцях -- Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай і Пінскай заставаліся абласныя парторганы. Увогуле толькі для арганізацыйна-кіруючай дзейнасці было пакінута звыш 1200 камуністаў, у тым ліку 8 сакратароў абкомаў і 120 сакратароў гаркомаў і райкомаў партыі. Усяго ж для нелегальнай работы ў Беларусі заставалася звыш 8500 камуністаў. Кіраўніцтва камсамолам рэспублікі ў сваю чаргу на акупаванай тэрыторыі засяродзіла 78 сваіх кіруючых работніка, больш 1400 ячэек, у якіх у агульнай колькасці налічвалася звыш 5 тыс. чалавек. На задумцы партыйнага і камсамольскага кіраўніцтва, пакінутыя ў тыле ворага камуністы і камсамольцы павінны былі з'явіцца тым палітычным ядром, вакол якога належыла згуртавацца ўсім свядомым і патрыятычна натхнёным сілам, каб стварыць нявыносныя для акупантаў умовы, паўсюдна распальваць агонь народнай барацьбы супраць прышэльцаў і іх памагатых. Трэба зазначыць, што з пастаўленай мэтай пакінутыя на акупаванай тэрыторыі партыйныя і камсамольскія работнікі, радавыя камуністы і камсамольцы справіліся даволі паспяхова, аб чым сведчаць размах, глыбіня і агульныя выпікі супрацьулення захопнікам.

Як і партызанскія фарміраванні, загадзя створаныя і самастойна ўзнікшае падполле адразу ж прыступіла да дыверсійна-баявой і палітычнай дзейнасці. У Мінску ўжо ў другой палове 1941 г падпольшчыкі ўзрывалі склады са зброяй і ваеннай маёмасцю, цэхі і майстэрні па рамонту баявой тэхнікі, вырабу харчавання,

знішчалі варожых чыноўнікаў, салдат і афіцэраў.

У снежні, у час напружаных баёў пад Масквой, яны ажыццявілі паспяховую дыверсію (Ф.Жывалёў) на чыгуначным вузле: вынікам яе з'явілася тое, што замест 90-100 эшалонаў у суткі з Мінскага вузла на фронт адпраўлялася толькі 5-6.

Акупацыйная адміністрацыя ў Мінску атрымлівала звесткі аб актыўнай дыверсійна-баявой дзейнасці падпольшчыкаў Брэста, Гродна, Мазыра, Віцебска і іншых гарадоў Беларусі. За верасень-кастрычнік у Беластоку было спалена тры вайсковыя склады, у Брэсце -- адзін харчовы, у Вілейцы -- склад са зброяй і боепрыпасамі. У пачатку лістапада гомельскія падпольшчыкі на чале з Ц.С.Барадзіным, Р.І.Цімафеенка і Я.Б.Шылавым устанавілі ў рэстаране куфар з узрыўчаткай і мінай з часовай наводкай. Калі там сабраліся нямецкія афіцэры, каб ушанаваць поспехі войск вермахта пад Масквой, грымнуў магутны выбух, які знішчыў дзесяткі афіцэраў і аднаго генерала.

На аршанскім чыгуначным вузле эфектыўна дзейнічала група К.С.Заслонава. У снежні 1941 г. брыкетна-вугальнымі мінамі яна вывела са строю некалькі дзесяткаў паравозаў: частка з іх была ўзарвана і замарожана на станцыі, іншыя ўзарваліся на шляху да фронту. Скардзячыся з гэтага выпадку аршанская група бяспекі і СД паведамляла свайму кіраўніцтву: "Дыверсіі на чыгуначнай лініі Мінск-Орша сталі такімі частымі, што кожную з іх пасобку не апішаш. Не праходзіць ніводнага дня, каб не было здзейснена адной альбо некалькі дыверсій".

Небяспечную для свайго жыцця дзейнасць у акупаваным Магілёве праводзіла група медыкаў-падпольшчыкаў. У яе склад уваходзілі урачы У.П.Кузняцоў, А.І.Паршын, Ф.І.Пашанін (усе загінулі), сярэдні і малодшы медперсанал. Знішчыўшы сапраўдныя медыцынскія карткі і сфабрыкаваўшы падстаўныя, яны здолелі пасяхова адправіць за межы горада сотні стаўшых на ногі байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі, а таксама цывільных асоб.

Апрача дыверсій і баявой дзейнасці (знішчэнне жывой сілы і баявой тэхнікі ворага) падпольшчыкі ўжо ў першыя месяцы акупацыі сабаціравалі розныя мерапрыемствы захопнікаў. Метады дзейнасці ў гэтым напрамку былі самымі рознымі: сакрыццё сваіх прафесій, псаванне абсталявання і інструменту, несвоечасовы выхад на працу, хаванне сабранага ўраджаю і сельскагаспадарчага інвентару і г.д. Акты сабатажу наносілі значныя страты ворагу, яны аслабляла яго сілу, аблягчала становішча Чырвонай Арміі на

фронце.

Пасля яе перамогі ў Маскоўскай бітве падпольная барацьба ў гарадах і населеных пунктах Беларусі шырылася і паглыблялася. Відавочную ролю ў гэтым адыграў той фактар, што была праведзена работа па ўстанаўленню сувязі кіруючага падполля з "Вялікай зямлёй", адкуль праз аэрадромы партызанскіх фарміраванняў падпольшчыкам паступалі не толькі неабходныя звесткі, але і значная дапамога зброяй, мінна-узрыўной тэхнікай, лекамі. Значна умацавалася сувязь падполля з насельніцтвам, партызанскімі атрадамі і групамі. Усё гэта ў спалучэнні самым станоўчым чынам адбілася на дзейнасці падполля.

Мінскія падпольшчыкі ў 1942 г. сваю ўвагу засяродзілі на масава-агітацыйнай рабоце сярод жыхароў горада, сістэматычных дыверсіях на розных аб'ектах, зборы для партызан разведвальных звестках, вызваленні ваеннапалонных і патаемнай адпраўкі іх у лес да партызан. Не абыходзілася і без значных страт. У сакавіку-красавіку 1942 г. гітлераўцам удалося нанесці сур'ёзны ўдар па мінскім падполлі, калі за турэмныя краты трапіла больш за 400 чалавек, у тым ліку члены падпольнага ГК КП(б)Б С.Г.Заяц (Зайцаў), І.П.Казінец, Р.М.Сямёнаў. 7 мая яны, ў ліку 28 іншых патрыётаў, былі павешаны. У гэты ж дзень быў растраляны яшчэ 251 чалавек.

Нягледзячы на цяжкія страты, мінскае падполле знайшло ў сябе сілы не толькі выстаяць, але і ўзняцца на новую, больш высокую ступень змагання. Члены гаркома і актывісты, што пазбеглі арышту, у маі 1942 г. правялі нараду, дзе прааналізавалі прычыны правалу, абагулілі дзесяцімесячны вопыт барацьбы, вызначылі меры па далейшаму разгортванню падполля. У гаркоме былі створаны 4 аддзелы: разведкі, агітацыі і прапаганды, ваенны і арганізацыйны дыверсій, сфарміраваны пяць падпольных райкомаў партыі, а таксама шэраг падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый на прадпрыемствах і ўстановах. Падпольшчыкі выпускалі газету "Звязда", лістоўкі, мелі сувязі з падполлем Асіповічаў, Оршы, Бабруйска, Дзяржынска, Узды, Калодзішчаў, Смалявіч, іншых гарадоў і населеных месц Беларусі.

Але ў верасні-кастрычніку 1942 г. па мінскаму падполлю быў нанесены другі цяжкі ўдар. У ноч на 26 верасня пачаліся арышты яго ўдзельнікаў. У засценкі СД былі кінуты сотні змагароў. Большасць арыштаваных загінула ў "душагубках", на шыбеніцах, былі растраляны, ці закатаваны ў лагерах смерці. Сярод іх сакратар

падпольнага гаркома І.К.Кавалёў, члены камітэта Дз.А.Караткевіч, В.К.Нікіфараў, К.І.Хмялеўскі, сакратары райкомаў Н.Я.Герасіменка (з сям'ёй), М.К. Карэнеўскі, І.І.Матусевіч, Л.А.Шугаеў, кіраўнікі падпольных арганізацый і груп, актыўныя падпольшчыкі Л.Я.Адзінцоў, М.А.Багданаў, Е.М.Баранаў і іншыя.

Страшэнны ўдар, нанесены акупантамі мінскаму падполлю, восенню 1942 г., быў вельмі цяжкім, але і ён прымусіў патрыётаў скарыцца. Сведчаннем таму былі расклееныя 21 кастрычніка больш чым у 300 месцах горада лістоўкі-плакаты з заклікам яшчэ мацней біць акупантаў. Не маючы магчымасці знішчыць падполле метадам жудаснага тэрору, гітлераўскія спецслужбы выкарыстоўвалі розныя сродкі, каб пранікнуць яго знутры. З гэтай мэтай была распрацавана аперацыя па дыскрэдытацыі кіраўніцтва ГК КП(б)Б, у першую чаргу яго сакратара І.К.Кавалёва. На карысць гэтай фальшыўцы гітлераўскіх спецслужб паверылі ў ЦК КП(б)Б і на доўгія гады над мінскім падполлем павісла чорная хмара недавер, якая была зачыстка адкінута зусім нядаўна.

Мінскае падполле і пасля другога правалу працягвала сваё жыццё і дзейнасць. Цесную сувязь з ім мелі штабы шэрагу партызанскіх брыгад. У горадзе практычна не было ніводнага прадпрыемства, ці ўстановы, дзе б ні дзейнічалі прадстаўнікі камандавання партызан. Дзесяткі дыверсійных груп былі створаны на мінскім чыгуначным вузле. У другой палове 1943 г. тут было праведзена больш за 50 дыверсій. На ўдакладненых дадзеных у складзе Мінскага падполля самаадданна змагалася звыш 9 тыс. чалавек, прадстаўнікоў 25 нацыянальнасцей былога СССР, больш тысячы кадуністаў, і звыш 2 тысяч камсамольцаў, антыфашысты замежных краін. За час акупацыі ў Мінску было праведзена звыш 1500 дыверсій. Тут нашлі сваю пагібель многія высокапастаўленыя асобы, у тым ліку генеральны камісар Беларусі В.Кубэ.

У Віцебску у 1941--1942 гг. дзейнічала 56 падпольных груп. Адной з іх з кастрычніка 1942 г. кіравала В.З.Харужая, якая была накіравана скіды Беларускім штабам партызанскага руху. 13 лістапада 1942 г. фашысты схапілі і пасля доўгіх допытаў закатавалі яе, а таксама С.С.Панкову, Е.С.Суранаву, К.Д.Болдачову, сям'ю Вераб'ёвых. Пасмяротна В.З.Харужай прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Шырокі размах набыў падпольны рух у Асіповічах, Барысаве, Бабруйску, Оршы, Жлобіне, Петрыкаве, Полацку, Браціне, Добру-

шы, Калінкавічах, Мазыры, іншых населеных пунктах. Асабліва актыўна дзейнічалі падпольшчыкі на чыгуначным транспарце. На тэрыторыі Беларусі фактычна не было ніводнай колькі-небудзь значнай станцыі, дзе б не дзейнічалі патрыёты. Шырокую вядомасць набылі баявыя подзвігі обальскіх падпольшчыкаў. Падпольная камсамольская арганізацыя "Юныя мсціўцы" на чыгуначнай станцыі Обаль Віцебскай вобласці была створана вясной 1942 г. Узначальвала гэту арганізацыю былая работніца віцебскай фабрыкі "Сцяг індустрыялізацыі" камсамолка Ефрасіння Зянькова. У склад яе уваходзіла каля 40 чалавек. Усяго маладыя падпольшчыкі зрабілі 21 дыверсію: спалілі лыназавод, піларраму, электрастанцыю, некалькі мастоў, здабывалі і перадавалі партызанам зброю, медыкаменты, карысныя разведданныя, распаўсюджвалі лістоўкі, зводкі Саўінформбюро і інш. Варожыя разведслужбы вышукалі патрыётаў. Былі арыштаваны і закатаваны да смерці Н.А.Азоліна, М.Аляксеева, Н.М.Давыдава, У.І. і Я.Я.Езавітавы, маці Ефрасінні Зянькоўай — Марфа Аляксандраўна, Ф.Ф.Слышанкова і іншыя. Пасля вайны Ефрасінні Зянькоўай і Зінаідзе Партноўай (пасмяротна) прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У заходніх абласцях Беларусі таксама дзейнічалі масавыя антыфашысцкія арганізацыі, што ствараліся па ініцыятыве камуністаў, былых актывістаў КПЗБ, камсамольцаў, іншых патрыётаў. У маі 1942 г. на базе антыфашысцкіх груп Васілішкаўскага, Шчучынскага, Радунскага, Скідзельскага раёнаў быў створаны "Акруговы беларускі антыфашысцкі камітэт Баранавіцкай вобласці". Арганізатарам камітэта з'яўляліся Г.М.Картухін, А.І.Іваноў, А.Ф.Манковіч і Б.І.Гардзейчык. Камітэт правёў значную работу па стварэнню новых і актывізацыі дзейнасці існуючых груп і арганізацый. Восенню 1942 г. пад кіраўніцтвам Акруговага камітэта барацьбу з акупантамі вялі больш за 260 падпольшчыкаў.

Важная роля ў разгортванні антыфашысцкага руху ў Брэсцкай вобласці належала створанаму ў маі 1942 г. па ініцыятыве былых членаў КПЗБ І.П.Урбановіча, М.Е.Крыштафовіча, І.І.Жыжкі "Камітэту барацьбы з нямецкімі акупантамі". Камітэт не абмяжоўваў сваю дзейнасць толькі раёнамі Брэсцкай вобласці, а распаўсюджваў уплыў на шэраг раёнаў Баранавіцкай і Беластоцкай абласцей.

У Гомелі актыўную барацьбу з ворагам вялі падпольныя групы на чыгуначным вузле, паравозавагонарамонтным заводзе, лесакам-

бінаце, гарадской электрастанцыі, іншых прадпрыемстваў горада — усяго больш за 400 чалавек. Іх дзейнасцю кіраваў аператыўны цэнтр у складзе Ц.С.Барадзіна, І.Б.Шылава, Г.І. Цімафеенкі. 8 мая 1942 г. у час падрыхтоўкі падрыву гарадской электрастанцыі Ц.С. Барадзін, І.Б.Шылаў, дзесяткі іншых актыўных падпольшчыкаў былі схоплены разведвальна-карнай службай ворага. Усе яны загінулі ў фашысцкіх засценках.

Ні на адзін дзень не спынялася антыфашысцкая барацьба ў акупаваным Магілёве. Вясной 1942 г. каля 40 груп (больш за 400 чалавек) аб'ядналіся ў падпольную арганізацыю "Камітэт садзейнічання Чырвонай Арміі", якую ўзначальваў мясцовы настаўнік К.Ю. Мэтэ. Камітэт каардынаваў дзейнасць групы чыгуначнікаў, настаўнікаў, рабочых хлебазавода, аўтарамонтнага завода, фабрыкі штучнага шоўку, работнікаў абласной бальніцы, былых ваеннаслужбоўцаў і іншых. Дзякуючы пільнасці, надзейнай канспірацыі і ўдалай структуры арганізацыі Магілёўскаму падполлю доўгі час удавалася пазбягаць масавых правалаў і арыштаў.

Смела і рашуча дзейнічалі падпольшчыкі на чыгуначным вузле Асіповічаў. У ноч на 30 ліпеня 1943 г. яны здзейснілі адну з самых буйных дыверсій другой сусветнай вайны. Адзін з кіраўнікоў падполля камсамолец Фёдар Крыловіч, працуючы на чыгуначнай станцыі ў начную змену, падклаў дзве магнітныя міны пад эшалон з гаручым, які павінен быў адысці ў бок Гомеля. Але здарылася нечаканае. Партызаны пашкодзілі чыгунку і эшалон быў пераведзены ў т.зв. Магілёўскі парк, дзе ў гэты час знаходзілася яшчэ тры эшалоны з вогненебяспечнымі грузамі. Праз некаторы час раздаліся выбухі: гіганцкі вогненны слуп падняўся над станцыяй. Патушыць пажар гітлераўцы свечасова не змаглі. Пажар перакінуўся на іншыя эшалоны, нагружаныя ваеннай тэхнікай, боепрыпасамі і авіябомбамі. Амаль 10 гадзін бушаваў пажар, які суправаджаўся выбухамі авіябомб, снарадаў і мін. У выніку аперацыі былі поўнасцю знішчаны 4 эшалоны, у тым ліку адзін з танкамі "тыгр", 31 цыстэрна з гаручым, 63 вагоны з снарадамі, авіябомбамі, мінамі. "Буйнога поспеху дабіліся партызаны таксама ў ліпені 1943 года, калі імі на станцыі Асіповічы, — пісаў пасля вайны былы афіцэр генеральнага штаба сухапутных сіл Германіі Эйке Міддэльдорф, — быў знішчаны эшалон з гаруча-змазачнымі матэрыяламі, два эшалоны з боепрыпасамі і надзвычай каштоўны эшалон з танкамі "тыгр".

Неадназначны аналіз такой гістарычнай з'явы перыяду Вялікай Айчыннай вайны, як дзейнасць антыфашысцкага падполля на часова акупаванай немцамі тэрыторыі Беларусі сведчыць, што падполле з пачатку і да канца свайго існавання (а праз яго за гады вайны прайшло звыш 70 тыс. чалавек), было цесна звязана з народнымі масамі, абапіралася на іх пастаянную падтрымку і канкрэтную дапамогу. У яго ўзнікненні і дзейнасці вялікую ролю адыгралі камуністы, што знаходзіліся ў варожым тыле і карысталіся даверам мясцовага насельніцтва. Сведчаннем апошняга з'яўляецца і той факт, што за тры гады варожай акупацыі ў партыю непасрэдна на акупаванай тэрыторыі Беларусі ўступіла звыш 12,5 тыс. патрыётаў. Прыналежнасць да партыі камуністаў у той час абяцала, як вядома, толькі адны "прывілеі"--быць у першых шэрагах барацьбітоў, альбо быць растралянымі, закатаванымі, хто трапляў у рукі фашыстаў. Дзесяткі тысяч з іх аддалі сваё жыццё ў гады змагання з германскай агрэсіяй.

Правал гітлераўскага плана "бліцкрыга" выкшталаны пераход да вядзення зацяжной вайны паглыбляў ваенна-палітычны і эканамічны крызіс Германіі, патрабаваў ад фашысцкага кіраўніцтва ўнясення пэўных карэктыў у планы выкарыстання патэнцыялу захопленых тэрыторый, у тым ліку Беларусі. У першую чаргу было выражана адмовіцца ад прынятых летам 1941 г. мэр па частковай гаспадарчай дэмабілізацыі і накіраваць прамысловасць Германіі і захопленых ёю тэрыторый на хуткае нарошчванне вытворчасці ўзбраенняў. Вялікая ўвага пры гэтым надавалася выкарыстанню матэрыяльных і людскіх рэсурсаў акупаваных тэрыторый. Актывізацыя дзейнасці партызан прымушала немцаў узмацняць ахову камунікацый і важных аб'ектаў, на што патрабавалася вялікая колькасць людзей.

У сувязі з гэтым у кіруючых колах Германіі, асабліва сярод ваенных, усё больш расло перакананне аб неабходнасці адмовы ад першапачатковых метадаў адносін да мясцовага насельніцтва з пазіцый грубай сілы, неабходнасці вядзення вайны пад палітычнымі лозунгамі, стварэння з ліку ваеннапалонных і мясцовага насельніцтва дапаможных вайсковых фарміраванняў. З заявай па гэтаму пытанню выступіў камандуючы групай армій "Цэнтр" фельдмаршал Бок, а фельдмаршал Браўхіч прызнаў такое рашэнне як выратавальнае лёс вайны. 13 снежня 1941 г. апошні пісаў міністру рэйха А.Розенбергу, што ваенныя абставіны патрабуюць схілення

насельніцтва на бок немцаў і стварэння антысавецкага руху.

Аднак Гітлер лічыў паражэнне пад Масквой часовай з'явай і разлічваючы на рэванш у летнім наступленні 1942 г. не прыняў гатых прапаноў. 14 снежня 1941 г. ён аб'явіў Розенбергу, што не лічыць неабходным заклікаць іншыя народы да супрацоўніцтва, каб не даваць падстаў для будучых патрабаванняў.

Тым не менш, як сведчыў камандуючы войскамі тылу групы армій "Цэнтр" Шэнкендорф у сваім паведамленні камандуючаму групы армій "Цэнтр" ад 5 жніўня 1942 г. "...Прапановы рускіх афіцэраў і меркаванні аб тым, што вялікай рускай тэрыторыяй нельга кіраваць без прыцягнення рускіх, прымусілі камандуючага генерала, яшчэ ў верасні мінулага года стварыць мясцовыя фарміраванні і актыўна выкарыстоўваць іх для барацьбы супраць партызан. Стварэнне такіх фарміраванняў спачатку было абмежаваным, так як, з аднаго боку, не было вопыту з такімі фарміраваннямі, а з другога боку, вышэйшыя інстанцыі не давалі санкцыі на фарміраванне буйных злучэнняў. Пад уздзеяннем зімняй кампаніі значна пашыралася думка аб неабходнасці выкарыстання рускіх фарміраванняў". Спачатку, як сведчыць Шэнкендорф, быў дадзены дазвол на фарміраванне казацкіх злучэнняў, а затым атрымана санкцыя на павялічэнне існуючых невялікіх падраздзяленняў да батальёна.

У верасні 1942 г. у распараджэнні Шэнкендорфа знаходзіліся 102-гі казацкі батальён, баявыя батальёны "Бярэзіна", "Волга", "Дняпро", "Дзвіна", "Прыпяць", усходні запасны полк "Цэнтр", а таксама 201-я, 221-я, 286-я, 339-я рускія кавалерыйскія сотні і 2 украінскія каравульныя роты (Бабруйск і Гомель). У кастрычніку 1942 г. быў дадзены дазвол на фарміраванне грузінскіх, армянскіх, туркестанскіх, каўказскіх, мусульманскіх і іншых фарміраванняў.

У канцы кастрычніка 1942 г. кіраўнік аддзела палітыкі ў Міністэрстве Розенберга падрыхтаваў спецыяльны мемарыял, у якім сцвярджаў, што мерапрыемствы, якія былі разлічаны на прыхільнасць насельніцтва ўсходніх тэрыторый у вобласці палітыкі і эканомікі, пацярпелі банкруцтва. Ён прапанаваў праграму дзеяння акупацыйнага апарату ў новых умовах. Галоўныя ідэі праграмы заключаліся ў неабходнасці охаваць сапраўдныя мэты вайны, правядзення шэрагу палітычных мерапрыемстваў, якія станоўча ўздзейнічалі б на паводзіны насельніцтва. Да такіх мерапрыемстваў ён адносіў агульнае паляпшэнне адносін, прыняцце законаў аб вяртанні прыватнай уласнасці ранейшым гаспадарам, надзяленне сялян

зямлёй, аб свабодзе вераваначэння, прапавадванне насельніцтву пазітыўнай палітычнай праграмы.

Гэта ж пытанне разглядалася ў снежні 1942 г. на палітычнай нарадзе ў Розенберга, на якім прысутнічалі зацікаўленыя прадстаўнікі вермахта, у тым ліку Шэнкендорф. На нарадзе прагучала катэгарычнае патрабаванне далейшага выкарыстання мясцовых сіл ("Расія можа быць пераможана толькі расіянамі"), вызначэння палітычнай мэты супрацоўніцтва, далейшых уступак насельніцтву ў гаспадарчай і культурна-асветніцкай справе. 15 лютага 1948 г. Гебельс накіраваў інструкцыю, у якой гаварылася, што ўсе краіны Еўропы, не выключаючы ўсходніх, павінны бачыць у вайне свае інтарэсы, таму забаранялася надалей гаварыць і пісаць аб каланізацыі і эксплуатацыі ўсходніх тэрыторый, усяляк прапагандаваць іх будучае пад нямецкім кіраўніцтвам.

Агульным палітычным мэтам нямецкіх захопнікаў адпавядала іх эканамічная праграма на часова акупаванай савецкай зямлі. Яна праводзілася ў адпаведнасці з загадзя распрацаваным кіраўніцтвам рэйха дырэктывамі па кіраўніцтву эканомікай у новаакупіруемых усходніх абласцях (т.зв. "Зялёная папка"). У дырэктывах адзначалася, што зусім недарэчна думка аб тым, быццам акупіраваныя вобласці павінны быць магчыма хутчэй прыведзены ў парадак, а эканоміка адноўлена. Аднаўленне парадку павінна праводзіцца толькі ў тых абласцях, у якіх мы можам здабыць значныя рэзервы сельскагаспадарчых прадуктаў і нафты.

Аднак абставіны прымусілі акупантаў шукаць розных шляхоў для больш эфектыўнага рабавання і эксплуатацыі захопленых тэрыторый. Спярша акупанты вырашылі выкарыстаць у сваіх інтарэсах існуючую калгасна-саўгасную сістэму, але вельмі хутка зразумелі яе малую эфектыўнасць. 15 лютага 1942 г. быў выдадзены загад Розенберга аб знішчэнні калгаснага ладу і аднаўленні на акупаванай тэрыторыі прыватнай уласнасці. Гэты закон аб "Новым парадку землекарыстання" шырока рэкламаваўся як "зямельная рэформа". Згодна з ім устанаўліваліся тры формы землекарыстання сялян: абшчынныя (былы калгас), земляробчыя кардарацыі і індывідуальныя гаспадаркі. На сутнасці, гэты закон нічога не мяняў. Былыя калгасы афіцыяльна заставаліся абшчыннымі гаспадаркамі, а саўгасы і МТС па-ранейшаму заставаліся дзяржаўнымі маёнткамі. У заходніх абласцях узаконьваліся аднаасобныя гаспадаркі. Ва ўсходніх абласцях перадача зямлі ў індывідуальнае карыстанне практыкавалася як мера заахвочвання памататых і адрадзіўшу. Як прызнава-

лі самі немцы гэты закон не стаў папулярным сярод насельніцтва.

У лютым 1943 г. міністэрства Розенберга выдала загад аб вяртанні нацыяналізаванай савецкай уладай маёмасці былым уладальнікам, дазвалялася прыватнае валоданне кустарнымі майстэрнямі, крамамі і г.д.

3 чэрвеня 1943 г. была выдадзена дэкларацыя аб прыватнай уласнасці сялян, паводле якой сялянін замест "права ўладання" зямельным надзелам атрымліваў права ўласнасці на яго. Аднак, як паказала практыка, немцы не спяшаліся перадаваць зямлю сялянам. У якасці прылажэння да "дэкларацыі" на месцы рассылалася распараджэнне аб надзяленні зямлёй толькі пасля вызначэння заслуг перад уладамі.

Дэкларацыя ад 3 чэрвеня 1943 г. па шэрагу прычын не адыграла той ролі, якая ёй адводзілася. Беларускі народ, у агульнай сваёй масе, не верыў акупантам, справядліва разумеючы ва ўсіх гэтых мерапрыемствах нямецкую карысць.

Не надта спадзеючыся на слаё прапагандысцкія заклады, немцы паўсюдна ўзмацнялі кароткі акупацыйны рэдым. Пры гэтым шырока выкарыстоўваліся метады неабмежаванага тэрору, фізічнага знішчэння насельніцтва у адпаведнасці з планам "Ост". На акупаванай тэрыторыі Беларусі немцы стварылі цэлую сістэму масавага знішчэння савецкіх людзей у шматлікіх турмах, канцэнтрацыйных лагерах і лагерах смерці. У лагеры смерці каля вёскі М.Трасцянец у ваколіцах Мінска, за гады акупацыі было знішчана 206500 чалавек пераважна жыхароў Мінска і Беларусі. З другога боку Мінска, у Маскоўшчыне гітлераўцы знішчылі 80 тыс. чалавек, у раёне Полацка -- 150 тыс., Гомелі -- каля 100 тыс., Віцебску -- больш за 90 тыс., Пінску -- 59 тыс., Бабруйску -- больш як 44 тыс., Магілёве -- 40 тыс., у Броннай Гары Брэсцкай вобласці -- 50 тыс., Маладзечна -- больш як 33 тыс., Баранавічах -- 31 тыс., Брэсце -- 27 тыс. чалавек і так далей.

Масавае знішчэнне мірнага насельніцтва практыкавалася акупантамі з першых дзён вайны. Асабліва шырока яно праяўлялася ў час правядзення карных экспедыцый, калі разам з людзьмі знішчаліся цэлыя вёскі.

У кожнай вайне былі людзі, якія пераходзілі на бок ворага. Звычайна такіх людзей называлі здраднікамі, супольнікамі, ці памагатымі ворага.

У гады другой сусветнай вайны цэлыя партыі, рухі, гаспадарчыя кругі, сродкі прапаганды (газеты, выдавецтва), кіраўніцтва асо-

бных краін (Нарвегія, Францыя, Бельгія, Данія, Чэхаславакія і г.д.) сталі супрацоўнічаць з гітлераўцамі. Гэтая з'ява пазней атрымала назву "калабарацыя". Тэрмін гэты характарызаваў рух французаў, якія пад час акупацыі хацелі працаваць над адраджэннем Францыі пры супрацоўніцтве з немцамі.

У калабарацыі на Беларусі выразна бачны тры састаўляючыя: Тыя сілы нацыянальна свядомых беларусаў, якія былі ў апазіцыі да бальшавізму (да 1939 года пражывалі ў Заходняй Беларусі, Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі і г.д.). І у свой час зрабілі стаўку на гітлераўскую Германію, лічачы з яе дапамогай тварыць адраджэнне Беларусі.

Тыя, хто ішоў да вайны на тэрыторыі БССР і хто паверыў немцам ці іх супольнікам, свядома пайшоў да іх на службу.

Людзі, якія абставінамі лёсу апынуліся ў адной звязцы з першай і другой групай ці на службе у акупантаў і былі павабраўлены іншага выбару.

Першая група валодала пэўным эмацыянальна-ідэалагічным зарадам і з'яўлялася своеасаблівым касцяком, вакол якога групіраваліся апошнія. Прадстаўнікі гэтай групы з дапамогай мясцовых кадраў выдавалі ў Мінску і ў іншых гарадах розныя прафашысцкія газеты і часопісы, супрацоўнічалі з прапагандысцкім апаратам генеральнага і акруговых камісарыятаў. Галоўнай мэтай іх дзейнасці было стварэнне з дапамогай захопнікаў "самастойнай Беларусі", пад эгідай гітлераўскай Германіі.

У кастрычніку 1941 г. была створана так званая "Беларуская народная самадомач" , на чале якой стаў кіраўнік пражскага філіяла "Беларускага камітэта сама помочы" І.Ермачэнка. Рэйхскамісар генеральнай акругі Беларусі В.Кубэ зацвердзіў склад кіраўніцтва БНС, а таксама праграму яе дзейнасці. Галоўнай мэтай БНС рэкламавалася "дапамога пацярдэўшым беларусам ад ваенных дзеянняў, бальшавіцкага і польскага праследавання, памагаць адбудаваць зруйнаваны чужынцамі беларускі край, ляшыраць і развіваць беларускую культуру. Пры кіраўніцтве "БНС" быў створаны цэнтральны савет ("Цэнтраль" з 10 чалавек). Членаў савета прызначаў і звальняў гаўляйтэр Кубэ. У акругах (гебітскамісарыятах) ствараліся акруговыя аддзелы "БНС", на чале якіх сталі асобы, якія прызначаліся акруговымі камісарамі і зацвярджаліся Кубэ. Раённыя і валасныя аддзелы "БНС" узначальвалі старшыні.

Гітлераўцы цвёрда трымалі ў сваіх руках кантроль над "БНС" не дазваляючы ёй хаця б якой-небудзь самастойнасці, што было, аднак, не да спадобы кіраўнікам, якія марылі ператварыць арганізацыю ў орган беларускага дзяржаўнага кіравання. З гэтай мэтай кіраўнікі "БНС" настойвалі на стварэнні беларускіх узброеных ваенных атрадаў для барацьбы з партызанамі і на фронце, аб стварэнні пры акупацыйных органах аддзелаў з ліку беларусаў і г.д. Аднак, нямецкая палітыка, пакуль захопнікі атрымлівалі перамогі над савецкімі войскамі, не прадугледжвала стварэння на акупаваных тэрыторыях якіх-небудзь нацыянальных дзяржаўных мясцовых структур.

І ўсё ж, ідучы насустрач патрабаванням калабарантаў, В.Кубе 29 чэрвеня 1942 г. надаў Ермачэнку, шэфу БНС, званне дарадчыка і муж даверу "беларускага народу", прадстаўніком якога з'яўляецца "БНС". Адначасова ён абвясціў аб стварэнні беларускага "Вольнага корпусу самааховы", а таксама дазволіў стварыць галоўную раду БНС у складзе 12 чалавек. Пры галоўнай радзе былі створаны 13 недамасных аддзелаў: адміністрацыйны, палітычны, вайсковы, школьны, аховы здароўя і інш., з адпаведнымі падраздзяленнямі ў акругах. Фактычна быў створаны цэлы апарат, які мог у адпаведны час перанаць з нямецкіх рук кіраўніцтва. Акрамя гэтага былі арганізаваны Беларускае навуковае таварыства, прафсаюзы, беларускі судовы апарат.

Асаблівая ўвага надавалася корпусу беларускай самааховы. Планавалася стварыць у кожным раёне адзінкі БСА ад роты да батальёну, усяго 3 дывізіі. Камандуючым БСА быў назначаны І.Ермачэнка. Ён і створаны ім штаб распачалі кіпучую дзейнасць па стварэнню БСА, бачачы ў ёй прабобраз будучага беларускага войска. Былі арганізаваны курсы па перападрыхтоўцы афіцэраў-беларусаў, праводзілася актыўная прапагандысцкая кампанія ў акругах. Немцы не спяшаліся узброіваць гэтыя фарміраванні, у выніку яны лёгка разганяліся партызанамі. Восенню 1942 г. інтарэс акупантаў да гэтага мерапрыемства стаў слабець. Замест БСА яны выраілі стварыць беларускія паліцэйскія батальёны на чале з немцамі.

Вясной 1943 г. гітлераўцы адмовіліся ад Беларускай самааховы.

Актыўныя намаганні калабаранты праводзілі па рабоце сярод моладзі Беларусі. 22 чэрвеня 1943 г. В.Кубе аб'явіў аб дазволе стварыць антысавецкую маладзежную арганізацыю па тыпу гітлерюгенда, якая атрымала назву "Саюза беларускай моладзі" (СБМ).

Уступіць у яго мог любы беларус ад 10 да 20 гадоў, які даваў пісьмовыя доказы аб арыйскім паходжанні і жаданні служыць фашызму. Мэтай СБМ было аб'яднанне беларускай моладзі, выхаванне ў ёй нацыянальнай свядомасці, гатоўнасці змагацца за Беларусь, якая будзе "адноўлена" з дапамогай Германіі. У выніку розных сродкаў уздзеяння на моладзь, сярод якіх адной з галоўных была пагроза вываду на прымусовую працу ў Германію і прыняцця розных рэпрэсіўных мер да бацькоў, у гэты "саюз" было залічана некалькі тысяч юнакоў і дзяўчат, галоўным чынам з заходніх абласцей Беларусі.

Поспехі Чырвонай Арміі на франтах вайны, узмацненне дзейнасці партызан, актыўная прапагандысцкая работа падпольных партыйных і камсамольскіх органаў сярод насельніцтва спрыялі таму, што беларускі народ у цэлым адмоўна ставіўся да мераприемстваў акупантаў і іх памагатых.

Тэма 25. БЕЛАРУСЬ У АПОШНІ ПЕРЫЯД ВАЙНЫ. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ. УКЛАД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА У РАЗГРОМ ВОРАГА.

Пытанні. Пачатак вызвалення. Агонія акупацыйнага рэжыму. Армія Краева на Беларусі. Аперацыя "Багратыён". Дапамога партызан. Беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны, у еўрапейскім руху супраціўлення, на працоўным фронце ў савецкім тыле. Страты Беларусі за час вайны.

Працэс карэннага пералому ў вайне, абазначаны пад Сталінградам, быў канчаткова замацаваны летам 1943 года ў час бітвы на Курскай дузе (5.07--23.08.1943 г.). Яе выход адзначаў для немцаў страту апошняй надзеі пераламаць ход падзей у свой бок. Контрнаступленне савецкіх войск перарасло ў агульнае стратэгічнае наступленне ад Вялікіх Лукаў да Чорнага мора, у рыніку чаго быў фарсіраваны Днепр і на яго правым беразе захоплены важныя плацдармы. Панесла паражэнне групоўка ворага ў раёне Смаленска-Спас-Дзямянска-Бранска. Пачалося вызваленне шматпакутнай беларускай зямлі. 22 верасня быў вызвалены першы раённы цэнтр рэспублікі Камарын, 26 верасня -- Хоцімск, 28 верасня -- Клімавічы, 30 верасня -- Крычаў. Адступаючы, гітлераўцы чапляліся за кожны рубеж, імкнуліся затрымаць наступленне савецкіх войскаў. Улічваючы, што страта Беларусі адкрые Чырвонай Арміі прамы шлях на Усходнюю Прусію, Прыбалтыку і Польшчу, праціўнік трымаў тут вялікія сілы і умацоўваў абарончыя рубяжы: у пачатку кастрычніка беларускі напрамак прыкрывала да 70 гітлераўскіх дывізій.

У баях за вызваленне Беларусі прыняла ўдзел і 1-я польская пяхотная дывізія імя Касцюшкі пад камандаваннем палкоўніка З. Берлінга, сфарміраваная на тэрыторыі СССР. Першае баявое хрышчэнне яна атрымала 12 кастрычніка 1943 г. пад мястэчкам Леніна, на Магілёўшчыне. 26 лістапада войскі Беларускага фронту вызвалілі першы абласны цэнтр Беларусі -- горад Гомель, куды адразу ж пераехала тагачаснае кіраўніцтва рэспублікі.

Зімою 1943--1944 гг. савецкія войскі па меры магчымасці працягвалі вызваленне ўсходніх раёнаў Беларусі. Так, на цэнтральным участку савецка-германскага фронту галоўныя падзеі разгарнуліся на віцебскім і бабруйскім напрамках. У снежні 1943 г. была праведзена наступальная аперацыя войск правага крыла 1-га Прыбалтыйскага фронту (камандуючы генерал арміі І.Х.Баграмян)

з мэтай ліквідацыі Гарадоцкага выступа. Войскі Беларускага фронту з 8 студзеня па 8 сакавіка 1944 г. правялі Калінкавіцка-Мазырскую аперацыю. У яе падрыхтоўцы і правядзенні прымалі таксама ўдзел партызаны Гомельскага, Палескага і Мінскага абласных партызанскіх злучэнняў. З іх дапамогай 14 студзеня былі вызвалены абласны цэнтр Мазыр і чыгуначны вузел Калінкавічы. У раёне Азарычаў войскамі Чырвонай Арміі выратавалі вязняў 3-х канцлагераў, дзе мардаваліся і гінулі больш 33 тысяч мірных грамадзян.

Поспехі савецкіх войск на франтах вайны, масавае супраціўленне насельніцтва ў тыле вымушала праціўніка ліхаманкава шукаць шляхі выйсця з вельмі небяспечнага становішча. Агнём і мячом, шыбеніцамі і турмамі, гвалтам і кароткай эксплуатацыяй яны імкнуліся аслабіць супраціўленне нескароннага народа. Разам з тым вораг усё часцей і часцей прыбягаў да разнастайных палітычных манеўраў з мэтай увесці ў зман насельніцтва, яшчэ больш замаскіраваць мэты сваёй сапраўднай палітыкі. А тыя сілы, што супрацоўнічалі з немцамі, усё больш грунтоўна задумваліся над сваім будучым лёсам. Усе іх спробы дабіцца ад акупантаў дазволу на стварэнне хаця б бачнасці існавання нейкіх інстытутаў дзяржаўнасці натыкаліся на поўнае непаразуменне Берліна. Ідучы насустрач гэтым патрабаванням, В.Кубэ, з дазволу Розенберга і Лозэ, 27 чэрвеня 1943 г. аб'явіў аб стварэнні з прадстаўнікоў калабарацыі пастаяннага дзеючага дарадчага органа -- Беларускага даверанага бюро, ці інакш "Рады даверу". У склад апошняй увайшлі па аднаму з назначаных акруговымі камісарамі прадстаўнікоў акруг, а таксама шэсць чалавек ад цэнтра: В.Іваноўскі - бургамістр Мінска, К.Сабалеўскі - ад Беларускай самаломачы , К.Рабушка - ад прафсаюзаў, М.Ганько, Н.Абрамава - ад Саюза беларускай моладзі.

21 верасня 1943 г. у Мінску падпольшчыкамі быў знішчаны В.Кубэ. Яго пераемнік на пасадзе Генеральнага камісара генерал-лейтэнант фон Готберг у новых умовах пачаў інтэнсіўна шукаць сродкі дзеля дзейснай барацьбы з партызанскім рухам. Было вырашана перш за ўсё выкарыстоўваць мясцовыя сілы, а таксама тых, хто разам з немцамі адступіў з усходу на тэрыторыю Беларусі. У канцы 1943 г. тут размясціліся шматлікія паліцэйскія і ваенныя фарміраванні: рускія, украінскія, татарскія, грузінскія, армянскія, літоўскія, эстонскія і іншыя. У іх ліку былі таксама польскія і французскія батальёны, супрацоўнікі слу-

жбы бяспекі і ГФП Смаленска, Бранска і г.д.

У верасні-лістападзе 1943 г. акупацыйныя ўлады распачалі фарміраванне беларускіх паліцэйскіх батальёнаў пад поўным нямецкім кіраўніцтвам, прыбягаючы пры гэтым да метаду прымусовых мабілізацый. У кожны батальён планавалася назначыць 74 чал. з немцаў. Да канца 1943 г. было створана тры такіх батальёны: у Мінску, Слоніме і Снове агульнай колькасцю 1481 чалавек. На канец лютага 1944 г. было арганізавана яшчэ 4 батальёны: у Глыбокім, Навагрудку, Слуцку і Лідзе, у якіх налічвалася 2167 чалавек.

Адначасова з імкненнем стварыць прымусова батальёны беларускай паліцыі, Готберг у лістападзе 1943 года распачаў стварэнне так званых абаронных вёсак, у якіх паселяліся сем'і паліцэйскіх, эвакуіраваных жыхароў Каўказа і казакоў, што супрацоўнічалі з немцамі і інш.

Больш шырокія памеры гэтая акцыя мела на тэрыторыі заходніх раёнаў Беларусі. У значнай ступені для гэтага выкарыстоўвалі і эвакуіраваных з усходу жыхароў Каўказа, казакоў, вайскоўцаў брыгады Камінскага з сем'ямі. Аднак і гэтая акцыя (усяго было створана некалькі дзесяткаў такіх вёсак) арганізуючага рэжыму акупантаў была асуджана на правал. Як сведчыць заходнегерманскі гісторык Э.Хасэ, на Беларусі "...паўсюдна не было неабходнай падставы для ажыццяўлення гэтага намеру... Часам мясцовыя жыхары вёскі разбягаліся, як толькі заўважалі нямецкія войскі, якім было даручана ...стварыць "абаронную вёску".

Насельніцтва Беларусі за ўсімі гэтымі мітуслівымі мерапрыемствамі бачыла агонію ворага, яно разумела, што нямецкай акупацыі хутка наступіць канец і таму рабіла ўсё магчымае, каб зберагчы сваё жыццё, маёмасць, перашкодзіць захопнікам ажыццявіць іх злавесныя планы.

У снежні 1943 г. у Мінску было аб'яўлена аб стварэнні дапаможнага дарадчага органа -- Беларускай цэнтральнай рады (БЦР). Стварэнне гэтую бачнасць беларускага нацыянальнага ўраду, акупанты мелі свае адпаведныя мэты. Яны бачылі ў ім сродак для мабілізацыі пэўнай часткі застаўшыхся рэсурсаў Беларусі ў сваіх інтарэсах. Беларускія калабаранты, з свайго боку, разлічвалі выкарыстаць прадстаўленную магчымасць для ажыццяўлення сваёй даўняй мары -- стварэння беларускай дзяржаўнасці пад нямецкім пратэктарам. У склад БЦР увайшлі 14 чалавек, у т.л. Р.Астроўскі (прэзідэнт), М.Шкяленак (1-ы віцэ-прэзідэнт), Ю.Сабалеўскі (2-гі віцэ-прэзідэнт). Былі створаны 13 аддзелаў: фінансавы, культурны, сельскай

і лясной гаспадаркі, прафесійных спраў, рэлігіі і судовых спраў, ваенковы і інш. У падпарадкаванне БЦР акупанты перадалі раней створаныя арганізацыі — Беларускую самапомач, Беларускае навуковае таварыства, Саюз беларускай моладзі і інш.

Аднак, на практыцы акупацыйныя ўлады перадалі БЦР толькі кіраўніцтва школьнай справай, культурай, сацыяльнай адекай і вайсковымі пытаннямі. На месцах яна адпаведныя аддзелы і надалей заставаліся пад кантролем нямецкіх акруговых камісараў. І ўсё ж, нягледзячы на гэта, БЦР развіла кіпучую дзейнасць. У акругах ствараліся намесніцтвы, ці аддзелы БЦР, якія павінны былі ўсяляк дапамагаць захопнікам весці барацьбу супраць партызан, спраўна выконваць пастаўкі для арміі.

Асабліва актыўную дзейнасць калабаранты разгарнулі па стварэнню Беларускай краёвай абароны, прадбачачы ў ёй будучае нацыянальнае беларускае войска. Кіраўнікі БЦР дамагліся ад немцаў дазволу на правядзенне прымусовай мабілізацыі. У адпаведнасці з загадам Р.Астроўскага яна распачалася 6 сакавіка 1944 г. Мабілізацыі падлягалі ўсе мужчыны 1908–1924 гадоў нараджэння. За неяўку ў вызначаны тэрмін на прызыўны пункт пагражалася смяротная кара.

Абвяшчаючы мабілізацыю, гітлераўцы і іх памагатыя дамагаліся шэрагу мэт і перш за ўсё разлічвалі стварыць мясцовыя ўзброеныя сілы з мясцовага насельніцтва для барацьбы з партызанамі. У далейшым, па меры набыцця вопыту, намячалася іх выкарыстанне і супраць Чырвонай Арміі. Не выключалася таксама і магчымасць накіроўваць часці БКА у краіны Заходняй Еўропы на змену і папаўненне нямецкіх ахоўным войскам для барацьбы з рухам супраціўлення. Мабілізацыя ў БКА шырока выкарыстоўвалася і ў мэтах угону моладзі ў Германію, фізічнай расправы з нескаронным насельніцтвам. Да канца сакавіка 1944 г. удалося насільна мабілізаваць у БКА 24–25 тыс. чалавек. Было створана галоўнае камандаванне Беларускай краявой абароны на чале з маёрам Ф.Кушалем. Для афіцэраў і падафіцэраў былі арганізаваны трохтыднёвыя курсы перападрыхтоўкі. Да сярэдзіны красавіка было створана 36 пяхотных і 6 саперных батальёнаў. Аднак гэтыя батальёны не апраўдалі надзей акупантаў. Пад уплывам агітацыі партызан і падпольшчыкаў, баявых дзеянняў Чырвонай Арміі назіралася масавае дэзертырства вайскоўцаў БКА і пераход іх са зброяй на бок партызан. Пасля вызвалення Беларусі некаторая частка тых фарміраванняў БКА апынулася ў Германіі.

27 чэрвеня 1944 г., калі Чырвоная Армія ўжо падыходзіла да Мінска, у гарадскім тэатры было праведзена апошняе афіцыйнае мерапрыемства БЦР -- сход бургамістраў, начальнікаў паліцыі, членаў БЦР і іншых "народных дэлегатаў", якія тытулавалі сябе другім Усебеларускім кангрэсам. "Кангрэс" абвясціў сябе "поўнаправным і найвышэйшым прадстаўніком беларускага народа", абраў Р.Астроўскага прэзідэнтам БЦР, выказаў непрызнанне БССР як формы беларускай дзяржаўнасці, аб'явіў неправамоцнымі ўсе польска-савецкія пагадненні, што датычыліся Беларусі. Не закончыўшы работы, "кангрэсмены" збеглі ў Кенігсберг, а затым у Берлін. Там яны праводзілі антысавецкую работу сярод эмігрантаў беларускага паходжання, а таксама насільна загнаных у Германію з мэтай стварэння так званай беларускай арміі. Але і гэта задума, як сведчыў былы ваенны міністр БЦР К.Езавітаў, пацярпела крах.

На пераломе 1943-1944 гг. у некаторых раёнах Заходняй Беларусі пашырылася дзейнасць польскага падполля і асабліва -- польскай Арміі Краёвай, якія кіраваліся ўказаннямі польскага эмігрантскага ўраду генерала Сікорскага ў Лондане. Апошні ставіў сваёй мэтай адраджэнне Польшчы ў межах да верасня 1939 г. Разрыў савецкім урадам адносін з польскім кіраўніцтвам у Лондане (красавік 1943 г.) прывёў да пагаршэння адносін паміж АК і партызанскім кіраўніцтвам у Беларусі. 22 чэрвеня 1943 г. ЦК КП(б)Б разаслаў усім падпольным партыйным цэнтрам закрытае пісьмо "Аб ваенна-палітычных задачах работы ў заходніх абласцях БССР". Яно ўтрымлівала прынцыповыя ўстаноўкі ў адносінах да польскіх нацыянальных атрадаў і груп. У прыватнасці, ставілася задача ўсімі сродкамі весці барацьбу з імі, і ў той жа час ствараць савецкія партызанскія атрады і групы з удзелам прасавецкі настроеных палякаў.

Неабходна адзначыць, што нягледзячы на тое, што лонданскае кіраўніцтва не спяшалася са стварэннем шырокай сеткі партызанскіх атрадаў для барацьбы з немцамі, першыя фарміраванні з ліку палякаў пачалі ўзнікаць ужо ў 1942 г. На пачатку 1944 г. на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі 9 партызанскіх атрадаў, агульнай колькасцю 1266 чалавек.

Трэба заўважыць, што да вясны 1944 г. дзейнасць АК у асноўным абмяжоўвалася арганізацыйнай і палітычнай работай, фарміраваннем сеткі падпольных арганізацый, назапашваннем зброі, арганізацыяй ваеннага абучэння, стварэннем штабоў і іншых органаў. У выпадку краху акупацыйнага рэжыму яны павінны былі забяспе-

чыць прыход да ўлады эміграцыйнага ўрада, аднаўленне мясцовых улад і граніц даваенных Польшчы. У шэрагу выпадкаў такая пазіцыя кіраўніцтва АК выклікала недавер польскага насельніцтва, якое імкнулася весці барацьбу з акупантамі і, нягледзячы на забарону, ішло да партызан. Так, вясной 1943 г. у брыгаду імя В.П.Чкалава Баранавіцкай вобласці ўлілася група капітана запасу польскай арміі А.Свентаржыцкага, якая пазней была пераўтворана ў асобную роту.

Вясной 1944 г. на тэрыторыі Навагрудскай акругі АК (былое Навагрудскае ваяводства) дзейнічалі чатыры злучэнні АК: Паднеманскае, "Поўнач", "Усход", "Захад", у якіх налічвалася каля 7 тыс. чалавек.

У час набліжэння лініі фронту да польска-савецкай граніцы 1939 г. атрады Арміі Краёвай павінны былі прысутнічаць у рэалізацыі плана "Бура", які быў зацверджаны загадам камандуючага АК ад 20 лістапада 1943 г. Гэтым планам прадугледжвалася падняць паўстанне і захапіць тэрыторыю Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі сіламі польскага падполля і атрадаў АК у момант адступлення нямецкіх войск. У гэтых мэтах атрады АК збіралі сілы, зброю, боепрыпасы, праводзілі падрыхтоўку кадраў.

У той жа час немцы выкарыстоўвалі іншыя магчымасці для актывізацыі мясцовых сіл для барацьбы супраць партызан. У інтарэсах гэтага яны скарыстоўвалі, у прыватнасці, абвастрэнне адносін паміж савецкімі партызанамі і атрадамі Арміі Краёвай. З некаторымі злучэннямі АК акупанты заключалі дагаворы аб тэкім супрацоўніцтве. Узамен гітлераўцы абавязаліся паставіць ім зброю, амуніцыю, боепрыпасы. Такі дагавор быў заключаны камандаваннем батальёна "Стоўбцы", а крыху пазней камандуючым Паднеманскім злучэннем АК. Адпаведныя дамоўленасці мелі таксама атрады АК, што падпарадкоўваліся каменданту Віленскай акругі АК.

У час летняга наступлення Чырвонай Арміі частка атрадаў Арміі Краёвай прыняла ўдзел у аперацыі "Бура", у аперацыі па вызваленню Вільні. Пасля выгнання немцаў з тэрыторыі Заходняй Беларусі частка атрадаў Арміі Краёвай была абязброена. Жадаючыя працягваць барацьбу на баку Чырвонай Арміі, уступалі ў польскае войска, астатнія былі інтэрніраваны. Асобныя атрады перадыслакаваліся на тэрыторыю Польшчы, ці працягвалі барацьбу ў тыле савецкіх войск.

Аперацыя "Баграціён". Вызваленне Беларусі. Да лета 1944 г. на савецка-германскім фронце склалася спрыяльнае становішча

для наступальных дзеянняў Чырвонай Арміі, якая ўстойліва ўтрымлівала стратэгічную ініцыятыву.

План разгрому групы нямецка-фашысцкіх армій "Цэнтр" быў абмеркаваны ў Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання і зацверджаны у канцы мая 1944 г. Гэта аперацыя увайшла ў гісторыю пад назвай "Баграціён". Планам аперацыі прадугледжвалася нанесці магутныя наступальныя удары сіламі 4-х франтоў -- 1-га Прыбалтыйскага, 1-га, 2-га і 3-га Беларускіх (камандуючыя -- адпаведна генералы І.Х.Баграмян, К.К.Ракасоўскі, Г.Ф.Захараў, І.Д.Чарняхоўскі), Дняпроўскай ваеннай флатыліі, Першай арміі Войска Польскага і авіяцыі далёкага дзеяння. Важная роля надавалася непасрэднаму ўдзелу ў бітве беларускіх партызан. Перад пачаткам Беларускай аперацыі сілы чатырох франтоў налічвалі звыш 1430 тыс. чалавек баявога складу, каля 52 тыс. гармат і мінамётаў, 20 тыс. танкаў і самаходных гармат, каля 5 тыс. самалётаў. У тыле групы армій "Цэнтр" знаходзілася 150 партызанскіх брыгад і 49 асобных атрадаў, якія добра ведалі паводзіны ворага, мелі багаты вопыт барацьбы, надзейнае ваенна-палітычнае кіраўніцтва, адладжаную двухбаковую радыёсувязь з савецкім тылам.

Імкнучыся любой цаной утрымаць "беларускі выступ", выкарыстоўваючы перасечаны рэльеф мясцовасці, немцы пабудавалі тут магутную, глыбокаэшаланіраваную абарону. Тут яны сканцэнтравалі 63 дывізіі і тры брыгады, якія налічвалі з тылавымі часцямі звыш 1200 тыс. чалавек. Яны мелі на ўзбраенні 9,5 тыс. гармат і мінамётаў, 900 танкаў і штурмавых гармат. Наземныя войскі падтрымлівала каля 1350 самалётаў.

Аперацыя пачалася раніцай 28 чэрвеня 1944 г. Галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі перайшлі ў агульнае наступленне на Віцебскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках. На другі дзень на варожыя пазіцыі абрушылі удар войскі 1-га Беларускага фронту. Дзеянні франтоў каардынавалі прадстаўнікі Стаўкі маршалы А.М.Васілеўскі і Г.К.Жукаў, баявыя аперацыі ваенна-паветраных сіл -- маршалы авіяцыі Ф.Я.Фалалеяў і А.А.Новікаў.

Вялікае значэнне для поспеху наступальнай аперацыі мелі удары па нямецкім тылам, якія наносілі ў тыя дні партызаны Беларусі. Масавы партызанскі удар па камунікацыях і лініях сувязі захопнікаў быў зроблены перад самым наступленнем нашых войск.

Так, у ноч на 20 чэрвеня партызаны атакавалі апорныя пункты ворага на чыгунцы Мінск-Барысаў. Лінія была разбурана больш чым у 200 месцах. Усяго за тую ноч партызаны Беларусі ўзарвалі звыш 40 тыс. рэек. Гэтая аперацыя паклала пачатак трэцяму этапу "рэйкавай вайны" у Беларусі. У выніку магутнага ўдару многія чыгуначныя магістралі вораг не здолеў аднавіць да канца аперацыі "Баграціён". Поўнасцю спыніўся рух на лініях Орша-Барысаў, Орша-Магілёў, Маладзечна-Полацк, Ліда-Маладзечна, Брэст-Баранавічы-Мінск, Баранавічы-Лунінец і інш.

Наступленне Чырвонай Арміі і баявыя дзеянні партызан у працэсе аперацыі "Баграціён" зліліся ў адзіны моцны ўдар. Асабліва актыўна дзейнічалі партызаны на дарогах, па якіх адступалі войскі праціўніка.

Шмат населеных пунктаў , у тым ліку райцэнтры Капыль, Узда, Старобін, Чырвоная Слабада, Астравец, Карэлічы, Свір, Відзы было вызвалена партызанамі самастойна яшчэ да прыходу савецкіх войск.

Да 25 чэрвеня войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту на ўзаемадзеянні з 3-м Беларускім фронтам завяршылі акружэнне віцебскай групоўкі ворага ў складзе пяці дывізій. Праз некалькі дзён яна была поўнасцю ліквідавана. Праціўнік страціў 20 тыс. чалавек забітымі і больш 10 тыс. раненымі і палоннымі. Войскі 3-га Беларускага фронту 27 чэрвеня вызвалілі Оршу, ліквідавалі групоўку, якая прыкрывала Мінскі напрамак. Злучэнні фронта за 6 дзён наступлення прасунуліся на 140 кіламетраў і дайшлі да ракі Бярэзіны паўночней Барысава. Войскі 1-га Беларускага фронту акружылі і да 29 чэрвеня поўнасцю разгромілі Бабруйскую групоўку ворага, якая налічвала больш 6 дывізій. Праціўнік страціў тут 50 тыс. чалавек забітымі і каля 24 тыс. салдат і афіцэраў здаліся ў палон.

За тыдзень наступлення войскі чатырох франтоў узламалі магутную абарону ворага на ўсёй прасторы паміж Заходняй Дзвіной і Прыпяццю, вызвалілі сотні населеных пунктаў, сарвалі спробы ворага замацавацца на Бярэзіне. З паветра наступленне савецкіх войск надзейна прыкрывала 16-я паветраная армія. На меры набліжэння да Мінска звужаўся фронт праследавання, становішча праціўніка рабілася катастрафічным. Імкліва рухаючыся наперад, войскі левага крыла 3-га Беларускага фронта фарсіравалі Бярэзіну, першага ліпеня вызвалілі Барысаў і выйшлі на паўночна-усходнія подступы да Мінска. Другога ліпеня яны авалодалі Вілейкай, перарэзалі чыгунку Мінск-Вільня, а войскі 1-га Беларускага фронту --

дарогу Мінск-Баранавічы. Другога ліпеня злучэнні 5-й гвардзейскай танкавай арміі (камандуючы маршал бронетанкавых войск П.А. Ротмістраў) выйшлі ў раён Астрашыцкага гарадка і завязалі бой на паўночнай і паўночна-ўсходняй ускраінах Мінска. З усходу ў Мінск уварваўся другі гвардзейскі танкавы корпус генерал-маёра А.С.Бурдзейнага. У яго авангардзе наступалі воіны 4-й танкавай брыгады пад камандаваннем палкоўніка А.А.Лосіка і 25-й танкавай брыгады, якой камандаваў палкоўнік С.М. Булыгін. Паспяховыя баявыя дзеянні вялі і іншыя злучэнні танкістаў. Разам з імі ў горад увайшлі падраздзяленні 11-й гвардзейскай, 31-й і 3-й арміі. З выхадам злучэнняў 3-га і 1-га Беларускіх франтоў да Мінска было завершана акружэнне 4-й нямецкай арміі і некаторых іншых часцей ворага. У Мінскім "катле", які знаходзіўся ў раёне Смалявічы-Волма, апынулася 150-тысячная варожая групоўка. У другой палове дня 3 ліпеня 1944 года сталіца Беларусі была поўнасцю ачышчана ад ворага. 58 злучэнням і часцям, якія вызначыліся ў Мінскай аперацыі, былі нададзены ганаровыя найменні "Мінскіх", 13 - "Барысаўскіх", 8 - "Слуцкіх".

Савецкія войскі на ўсім працягу лініі фронту працягвалі імклівае наступленне на захад. 4 ліпеня быў вызвалены Полацк, 5 ліпеня -- Маладзечна, а яшчэ праз дзень - Баранавічы. 14 ліпеня вораг быў выбіты з Пінска, 16 ліпеня -- з Гродна, 28 -- з Брэста. Вызваленнем Брэста завяршылася выгнанне акупантаў з беларускай зямлі. 21 ліпеня савецкія войскі перайшлі дзяржаўную граніцу ў раёне Белавежскай пушчы і пры актыўным удзеле 1-й Польскай арміі пачалі вызваленне Польшчы.

Грандыёзнае наступленне, распачатае войскамі чатырох франтоў у Беларусі 23 чэрвеня, закончылася 28 ліпеня 1944 г. поўным вызваленнем тэрыторыі рэспублікі ад ворага. У далейшым камандаванню праціўніка ў выніку перадыслакацыі сіл з іншых франтоў і з Германіі удалося на некаторы час стабілізаваць сваю абарону на блізкіх падыходах да Усходняй Прусіі і на Вісле. Войскі Чырвонай Арміі, якія наступалі больш двух месяцаў, адчувалі патрэбу ў папаўненні адпачынку, асабовым складам, узбраенні і ўсім неабходным. 29 жніўня ўсе чатыры фронты атрымалі дырэктыву Стаўкі аб пераходзе да абароны. Закончылася Беларуская аперацыя, якая па сваіх памерах, стратэгічных выніках і ваенным майстэрстве з'яўляецца адной з буйнейшых у Вялікай Айчыннай і другой сусветнай вайне. У бітве на беларускай зямлі Чырвоная Армія знішчыла і ўзяла ў палон больш за 500 тыс. варожых салдат і афіцэраў. Фактычна пе-

растала існаваць адна з мацнейшых групоўак нямецкай арміі — група армій "Цэнтр", што ў 1941 годзе распачала захопніцкае наступленне на Усход. Перамогі, атрыманыя ў 1944 г., на тэрыторыі Беларусі і іншых франтах, кардынальна змянілі стратэгічнае становішча Чырвонай Арміі, спрыялі яе далейшаму паспяховаму наступленню, наблізілі поўны крах фашысцкай Германіі.

Радзіма высока ацаніла гераізм воінаў Чырвонай Арміі ў баях за вызваленне Беларусі: больш як 1500 генералаў, афіцэраў і салдат атрымалі званне Героя Савецкага Саюза, ордэнамі і медалямі ўзнагароджана больш за 402 тысячы чалавек.

У час бітвы за Беларусь самую актыўную дапамогу і падтрымку наступаўшым войскам аказалі мясцовыя жыхары. Разам з партызанамі яны разбуралі варожыя камунікацыі, перакопвалі дарогі, рабілі лясныя завалы, паказвалі варожыя засады, мінныя палі, перапраўвы, з'яўляліся праваднікамі, выконвалі іншыя даручэнні. Так, жыхар вёскі Бочы Жыткавіцкага раёна Палескай вобласці А.А.Ярмоленка правёў батальён ба оў праз забалочаную мясцовасць у тыл нямцаў, дзякуючы чаму быў разбіты гарнізон ворага, захоплены важныя дакументы, палонныя. Мужны патрыёт быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

Жыхары некаторых вёсак са зброяй у руках прымалі ўдзел у баявых аперацыях пры выгнанні захопнікаў. Шмат дзе ствараліся атрады самаабароны, якія мужна баранілі свае вёскі ад нямецкіх факельшчыкаў, ці адступаючых груп марадзёраў. Мясцовае насельніцтва дапамагала часцям Чырвонай Арміі вылаўліваць салдат і афіцэраў разбітых нямецкіх часцей.

З дапамогай мясцовых жыхароў толькі на тэрыторыі Віцебскай вобласці было ўзята ў палон, ці знішчана пры аказанні супраціўлення каля 9 тыс. салдат і афіцэраў. Маршал Г.К.Жукаў у сувязі з гэтым адзначыў: "Вялікую дапамогу ў ачышчэнні тэрыторыі ад праціўніка аказалі нам мясцовыя жыхары і партызаны — сапраўдныя гаспадары беларускіх лясоў".

Працоўныя Беларусі не толькі непасрэдным удзелам у барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, але і самаадданай працай дапамагалі ўсімі сіламі і сродкамі фронту. Яшчэ грумела ваенная кананада, а людзі ўжо наладжвалі прамысловыя прадпрыемствы, якія забяспечвалі патрэбы фронту, адбудоўвалі чыгунку, шашэйныя масты, пасадачныя пляцоўкі для палявых аэрадромаў, прыступалі да будаўніцтва разбуранага жытла. За тры дні працоўныя Мінска аднавілі мост праз раку Свіслач, перашылі чыгуначнае палатно. Ужо 9 ліпе-

ня ў Мінск прыбыў першы цягнік. У Брэст першы цягнік прыбыў ужо на трэці дзень пасля вызвалення. За кароткі час з дапамогай насельніцтва Беларусі было адноўлена больш як 10 тыс. км чыгуначнага палатна і 1735 чыгуначных мастоў, пабудавана 2950 новых мастоў.

Шырокі размах атрымалі шэфства над ваенковымі шпіталямі, патрыятычны рух донараў. Фактычна ўсе шпіталі, якія размяшчаліся на тэрыторыі рэспублікі, былі забяспечаны донарскай крывёю, акрамя таго значная частка яе накіроўвалася ў палявыя шпіталі на фронт.

Адной з важнейшых задач з'яўлялася мабілізацыя людзей у Чырвоную Армію. За перыяд з пачатку вызвалення Беларусі да сярэдзіны студзеня 1945 г. у армію было мабілізавана звыш 500 тыс. чалавек. Акрамя таго, у час расфарміравання партызанскіх фарміраванняў у дзеючую армію было накіравана 146938 партызан.

У 185 знішчальных батальёнах, якія былі створаны ў адпаведнасці з пастановай ЦК КП(б)Б ад 14 чэрвеня 1944 г., налічвалася 16640 байцоў. Ім дапамагалі 7 тыс. груп садзейнічання, якія налічвалі 42730 чалавек. Толькі за ліпень 1944 г. знішчальныя батальёны і групы садзейнічання затрымалі і ўзялі ў палон звыш 22 тыс. варожых салдат і афіцэраў, 2262 гітлераўца былі забіты ў час перастрэлак.

Вогненны смерч вайны прайшоўся не толькі па тэрыторыі Беларусі, але і адгук[illegible] на лёсах мільёнаў яе жыхароў, якіх вогненны віхор вайны з родных месц і раскідаў па палях вайны. Звыш мільёна чалавек было мабілізавана ў дзеючую армію, сотні тысяч людзей працавалі ў глыбокім тыле. І дзе б выхадцы з Беларусі не знаходзіліся -- у франтавым акопе, за штурвалам самалёта, рычагамі танка або каля станка -- усюды яны праяўлялі вытрымку, адвагу, працавітасць. На фронт нярэдка накіроўваліся цэлымі сем'ямі. З сям'і Сцяпана Пляца, жыхара в. Азяркі Талачынскага раёна супраць захопнікаў змагаліся чатыры сыны -- Дзмітрый, Леанід, Міхаіл і Іван і дзве нявесткі -- Раіса і Руфіма. Усе яны служылі ў авіяцыі. За перыяд вайны зрабілі 2640 баявых вылетаў, былі ўзнагароджаны 50 ордэнамі і медалямі, а Руфіма і Раіса сталі Героямі Савецкага Саюза. Астатнія члены гэтай сям'і прымалі ўдзел у партызанскім руху.

Жыхарка гарнасёлка Белынічы Гадора Храбрая адправіла на фронт шэсць сваіх сыноў. Столькі ж сыноў паслаў у Чырвоную

Армію і быхаўскі калгаснік Акім Красоўскі. Двое з іх загінулі смерцю храбрых пад Масквой, а старэйшы Сцяпан, які дайшоў на штурмавіку, стаў Героем Савецкага Саюза, маршалам авіяцыі. Анастасія Фамінічна Купрыянава з г. Жодзіна на фронт паслала пяць сваіх сыноў, адзін з іх -- малодшы Пётр, праславіўся пры ліквідацыі акружанай групоўкі ворага на тэрыторыі Латвіі ў Кулдыгінскім раёне, паўтарыўшы подзвіг А.Матросава. Маці-патрыёткі і 5 яе сынам у Жодзіна устаноўлены помнік, у хаце, дзе яна жыла, створаны музей.

У бітве пад Масквой праславіўся конны корпус, якім камандаваў ураджэнец Бешанковіцкага раёна генерал Л.М.Даватар. Мужныя коннікі пад яго кіраўніцтвам прасачваліся ў глыбокі тыл і нечакана з'яўляліся там, дзе іх вораг не чакаў. Яны грамілі штабы і гарнізоны праціўніка, падрывалі масты, разбуралі лініі сувязі, што спрыяла вызваленню многіх населеных пунктаў Падмаскоўя. Адважны камкор загінуў смерцю храбрых у снежні 1941 г. каля вёскі Палашкіна, на падыходзе да горада Руза.

На заснежаных палях Падмаскоўя праславіліся таксама гомельчане, браты А.І. і П.І.Лізюковы. Палкоўнік А.І.Лізюкоў удзельнічаў першапачаткова у чэрвеньскіх баях на рубяжах Беразіны, затым было пакутлівае адступленне, баі пад Масквой, у якіх ён камандаваў 1-й гвардэйскай мотастралковай дывізіяй. Пазней яна была ўзмоцнена рэзервовымі часткамі і пераўтворана ў 20-ю армію. Дывізія дапамагала 16-й і 30-й арміям спыніць варожыя войскі за 30-40 км. на паўночным захадзе Масквы. За мужнасць і гераізм, умелае кіраўніцтва войскамі ў выключна складаных умовах яму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Талена-віты ваеначальнік, аўтар кніг і артыкулаў па ваеннай справе, генерал-маёр А.І.Лізюкоў не дажыў да дня перамогі. Ён загінуў 5 ліпеня 1942 г. у баі каля вёскі Мядвеж'е Варонежскай вобласці. Гераічна змагаўся з ворагам і яго брат, палкоўнік П.І. Лізюкоў. У 1945 г. яму пасмяротна было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Танкіст Г.А.Палаўчэня -- ураджэнец Слуцкага раёна, камандаваў асобым танкавым батальёнам. Яго падначаленыя праславіліся пры вызваленні г. Андрэапаля, за што камбат быў увенчаны Залатой Зоркай. Другі ураджэнец Міншчыны Д.У.Гліцэвіч, праславіўся пад Масквой, камандуючы стралковым палком. Яго ўмелыя дзеянні былі адзначаны баявым ордэнам Чырвонага Сцягу і медаллю "За абарону Масквы".

Выхадцы з Беларусі геаічна змагаліся не толькі на зямлі, але і ў паветры. Першы ў гісторыі авіяцыі паветраны таран здзейсніў у маскоўскім небе беларус А.М.Катрыч, лётчык 12-га знішчальнага авіяпалка. Званне Героя атрымалі таксама і яго землякі -- мінчанін І.І.Казлоўскі і віцебчанін П.Ф.Сычэнка. У паветраных баях пад Ленінградам праславілі сябе А.К.Антоненка, Г.К.Аксанаў, І.М.Габрынец, П.С.Жучкоў, І.А.Каўшараў, Б.І.Коузан, П.А.Пілютаў, Г.С.Пінчук, на Каўказе -- Д.І.Лугаўскі, М.І. Семянцоў, М.К.Навумчык, пад Сталінградам -- А.А.Алюхновіч, М.А. Карначонак, І.Ф.Казакоў, І.П.Мілет, А.Р.Івашка. У баях пад Сталінградам праславілася 40-я гвардзейская авіядывізія, якой камандаваў ураджэнец Магілёўскай вобласці А.І.Пастравіч. Тысячы воінаў з Беларусі прымалі ўдзел у баях пад Курскам. Сын селяніна в. Машканы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці А.К.Гаравец з паветра прыкрываў наземныя войскі ў раёне Уладзіміраўка-Альхаватка. 6 ліпеня 1943 г., вяртаючыся на свой аэрадром, уступіў у бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў 9 самалётаў праціўніка. Гаравец -- адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў ворага. Загінуў у тым жа баі, пасмяротна яму прысвоена званне Героя. Яго імем названы вуліцы ў Віцебску, Мінску, Полацку, Сенно, г.п. Багушэўску, Машканская сярэдняя школа, саўгас у Сенненскім раёне.

На марскіх прасторах Балтыкі праславіўся віцэ-адмірал В.П. Дрозд, ураджэнец Буда-Кашалёва. Пад яго камандаваннем восенню 1941 г. караблі Балтыйскага флоту зрабілі смелы прарыў з Таліна ў Кранштад, выратавалі і пераправілі на Ленінградскі фронт абаронцаў паўвострава Ханка. Адважны адмірал загінуў у студзені 1943 г. на лядовай трасе пад Кранштадтам.

На Балтыцы праславіўся таксама ўраджэнец Віцебшчыны, капітан 3-га ранга С.Н.Багарад, камандзір падводнай лодкі. За час вайны яго лодка патапіла 7 варожых караблёў. Старшыня 2-й стацці П.С.Байцоў, родам з магілёўшчыны, плаваў на легендарнай падводнай лодцы "С-13", (камандзір Маринеску), удзельнічаў у патапленні 3-х варожых транспартаў, узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

У абароне Ленінграда ўдзельнічалі і многія іншыя воіны-беларусы. У іх ліку -- танкіст А.М.Усаў, артылерысты А.І.Шпакоў, В.Л.Цітоў, Н.В.Нікіцін, снайперы Ф.А.Смалічкоў, кулямётчыкі Р.А.Мацкевіч і П.Х.Кузьмянкоў. На ліку кожнага з іх сотні знішчаных варожых салдат і афіцэраў.

Мужнасць і адвагу праяўлялі не толькі воіны-мужчыны, але і жанчыны. Пад Ленінградам ў радах снайпераў знішчала фашыстаў беларуская дзяўчына В.І.Лукашэнка, у заломе Волгі і Дона — баб руйчанка А.К.Стампкоўская, на Крымскім паўвостраве — лётчыцы-гомельчанкі Г.І.Дакутовіч і П.У.Гельман. Апошняя за час вайны зрабіла 850 баявых вылетаў, ёй прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, мае многа іншых ордэнаў і медалёў. Шырока вядома імя ўраджэнкі в. Шаўцова Расонскага раёна З.М.Тусналобавай. На фронт яна пайшла ў красавіку 1942 г., дзе асабіста вынесла з поля бою 128 параненых. У лютым 1943 г. на тэрыторыі Курскай вобласці патрыётка была цяжка паранена, абмарозіла рукі і ногі, якія прыйшлося ампутаваць. Але Зіна не выйшла са строю, выступала па радыё, у друку, прызывала землякоў змагацца з ворагам да поўнай перамогі. На фронце былі самалёты, танкі, гарматы і мінамёты з надпісам "За Зіну Тусналобаву". Удастоена звання Героя Савецкага Саюза. Міжнародны Камітэт Чырвонага Крыжа ўзнагародзіў З.М.Тусналобаву медалём Фларэнс Найцінгейл.

Пры вызваленні акупіраванай тэрыторыі таксама было здзейснена нямала подзвігаў ураджэнцамі Беларусі. Пры ліквідацыі Корсунь-Шаўчэнкаўскай групоўкі ворага гераічна праявіла сябе танкавая брыгада пад камандаваннем брэстчаніна палкоўніка М.В. Хоцімскага: "За незвычайную вернасць і выключныя заслугі, праяўленыя пры вядзенні баявых аперацый" прэзідэнт ЗША Ф.Рузвельт узнагародзіў М.В.Хоцімскага ордэнам "Легіён гонару афіцэрскай ступені". Пры фарсіраванні ракі Жыжын, прыток Прута, праславіўся клімаўчанін, кулямётчык Д.П.Журоўскі. Калі яго кулямёт быў выведзены са строю, адважны сталок гранатамі падавіў разлік праціўніка і захопленым у яго кулямётам забяспечыў поспех наступлення сваёй роты, за што быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. Выхадцы з магілёўскай вобласці танкісты, палкоўнікі С.Ф.Шутаў, І.І.Гусакоўскі і І.І.Якубоўскі за праяўленыя імі мужнасць і адвагу, умелае кіраўніцтва баявымі дзеяннямі падначаленых палкоў атрымалі высокае званне Героя Савецкага Саюза двойчы. Двойчы гэтага гонару ўдастоіўся таксама і былы столяр Гомельскага дрэваапрацоўчага камбіната лётчык П.І.Рэлавічоў.

За межамі Радзімы, на завяршальных этапах вайны яскрава вызначыліся воіны-беларусы А.А.Жук, А.М.Дулеба - родам з міншчыны, А.Я.Ліпуноў і Д.Н.Піньзікоў - з гомельшчыны; А.А.Мінін -

з полаччыны, З.Р.Лішчэня – з любаньшчыны, А.К.Шмыгун – з Бабруйска, М.А.Барысевіч – з Беразіно. Пры фарсіраванні рэк Нэйсе, Шпрэе, штурме Берліна і вызваленні Прагі праславіліся танкісты роты старшага лейтэнанта А.А.Філімонава, ураджэнца в. Кучын Кармянскага раёна, якому таксама было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

У штурме рэйхстага таксама ўдзельнічала шмат воінаў-беларусаў. Першым праз дэпутацкія вароты з чырвоным сцягам да будынка рэйхстага прарваўся малодшы сяржант Петр Пятніцкі, родам з Мазыра. На шляху да заветнай мэты ён быў забіты варожай куляй. У ліку першых уварваўся ў рэйхстаг старшы сяржант Л.І.Прыгожы, былы рабочы з г.п. Багушэўск. У самым будынку ён знішчыў 8 салдат праціўніка і гранатамі вывеў са строю 6 ручных кулямётаў. Сувязны 756-га с тралковага палка радавы К.Я.Кугач, селянін Друянскага раёна, разам з радавым Ф.К.Яршом, ураджэнцам Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці, аператыўна наладзілі сувязь штурмуючай групы з камандаваннем палка, што станоўча адбілася на хуткасці націска атакуючых. Разам яны былі ўзнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені.

На заключным этапе другой сусветнай вайны, калі баі вяліся на Далёкім Усходзе, сыны Беларусі таксама праявілі мужнасць і адвагу. 12-м марскім штурмавым авіядывізіёнам камандаваў ураджэнец Жлобіна палкоўнік М.У.Барташоў. Лётчыкі яго авіядывізіі патапілі 12 японскіх караблёў. Атрадам марской пяхоты камандаваў гомельчанін Ц.А.Пачтароў. У ліку дэсантнікаў быў і яго зямляк капітан В.А.Конт, які ў баі замяніў параненага камандзіра і сваім прыкладам натхніў байцоў на штурм варожых умацаванняў. Усе трое сталі Героямі Савецкага Саюза.

Залатой Зоркай Героя быў адзначаны подзвіг намесніка начальніка аператыўнага аддзела штаба 15-й арміі падпалкоўніка М.А.Ласкунова, былога селяніна Сіраціпскага раёна Віцебскай вобласці. Коштам свайго жыцця ён забяспечыў своечасовую дастаўку загада войскам, якія падрыхтаваліся да штурму горада Фучжаін. 208-й стралковай дывізіі, якая здзейсніла па бездарожжы пераход па манжурскаму плато і вялікаму Хінгангу камандаваў генерал-маёр Г.С.Зданович, ураджэнец Навагрудскага раёна. Яму таксама было прысвоена звание Героя Савецкага Саюза.

Як зазначалася вышэй, беларускі народ у гады мінулай вайны пад ружжо паставіў амаль мільёна сваіх сыноў і дачок. Сярод іх былі

і такія славутыя палкаводцы, стаўшыя потым маршаламі, Б.Д.Сакалоўскі, І.І.Якубоўскі, С.А.Красоўскі, генераламі арміі – А.У.Антонаў, І.І.Гусакоўскі, генерал-палкоўнікамі – А.Р.Бацюня, У.Н. Камера, Ф.І.Кузняцоў, контр- і віце-адміраламі – В.Е.Ананіч, В.М.Дрозд, усяго 217 генералаў і адміралаў. У складзе важнейшых радоў войск, напрыклад, авіяцыі, з ворагам змагалася 5805, у бронетанкавых і механізаваных войсках – 2490 афіцэраў-беларусаў.

За гераізм і мужнасць, праяўленыя ў гады Вялікай Айчыннай вайны, звыш 300 тыс. воінаў-беларусаў і ўраджэнцаў рэспублікі узнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі, 441 з іх прысуджана высокае званне Героя Савецкага Саюза. 65 чалавек сталі поўнымі кавалерамі ордэна Славы.

У той жа час на беларускай зямлі, і у суровым 1941 годзе, а таксама і ў час вызвалення, ў радах партызан і падпольшчыкаў самааддана змагаліся тысячы прадстаўнікоў шматлікіх нацый і народнасцей былога Савецкага Саюза. Сярод камандзіраў партызанскіх атрадаў і брыгад былі рускія В.Т.Варанянскі, А.Ф.Данукалаў, К.С. Заслонаў, В.І.Лівенцаў, У.І.Нічыпаровіч, Н.Ф.Філіпскіх, украінцы М.Х.Балан, А.Н.Брынскі, С.С.Бычок, Ф.Ф.Калуста, грузіны І.Г. Шубітыдзе, В.М.Талаквадзе, армянін В.В.Агаджанян, карачаевец А. Касаеў, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцей. За ўдзел у партызанскай і падпольнай барацьбе на тэрыторыі Беларусі званне Героя Савецкага Саюза было прысвоена 46 беларусам, 34 рускім, 3 украінцам і іншым.

Беларускі народ на сенняшні дзень добра памятае і ўшаноўвае тых, хто аддаў сваё жыццё за вызваленне Беларусі. Як сімвал вечнай славы воінам Савецкай Арміі, партызанам і падпольшчыкам узвышаецца ў цэнтры Мінска велічны помнік-абеліск. На 21-м кіламетры Маскоўскай шашы сімвалам вечнай удзячнасці беларускага народа воінам-вызваліцелям узнімуся Курган Славы.

Фронт барацьбы з ворагам праля гаў і за межамі Радзімы. Плячо ў плячо з замежнымі антыфашыстамі змагалася 40 тыс. грамадзян СССР, якія ўцяклі з канцэнтрацыйных лагераў і фашысцкай катаргі. Сярод іх былі і прадстаўнікі Беларусі -- ваеннаслужачыя, партызаны і падпольшчыкі, што трапілі ў палон, а таксама мірныя грамадзяне, прымусова вывезеныя ў варожую няволю.

Былі і байцы нябачнага фронту. Далёка за межамі Бацькаўшчыны шырока імя савецкага разведчыка ўраджэнца Чавусаў магілёўскай вобласці Л.Я.Маневіча. Ён шмат зрабіў для перамогі. Пасля арышту ўначальваў услед за легендарным А.М.Карбышавым падпольную ар-

ганізацыю ў гітлераўскім лагеры смерці Маўтхаўзене.

Цяжка параненым у варожым палоне апынуўся генерал Д.Ф.Цумараў, ураджэнец Бельнічскага раёна. Немцы вывезлі яго ў Рэгенсбурскі канцлагер, дзе ён уключыўся ў падпольную барацьбу. За арганізацыю пабегаў і антыфашысцкую агітацыю Цумараў вясной 1944 г. быў перапраўлены ў канцлагер Маўтхаузен і там растраляны.

Актыўным антыфашыстам, рэдактарам рукапіснай газеты падпольнай арганізацыі "Іскра" у Маўтхаўзене быў селянін пасёлка Высачаны П.Д.Шаўраў. У гэтай жа арганізацыі знаходзіўся і брэсчанін, былы пагранічнік У.Мураў'ёў. Устанавіўшы сувязь з немцамі-антыфашыстамі, патрыёты арганізавалі пабегі з канцлагера, дабытай ежай дзяліліся з хворымі і знясіленымі.

У фашысцкі канцлагер, які быў размешчаны ў прыгарадзе Мюнхена, у 1943 г. прывезлі групу беларусаў. У іх ліку знаходзіўся і былы партызан Васіль Грынь. Хутка ён уключыўся ў падпольную барацьбу. Разам з немцам антыфашыстам Зенам ён дабываў зброю, медыкаменты, харчаванне і рыхтавау вялікую групу вязняў для уцёку ў лес. Але здзейсніць задуманае не удалося: падасланы правакатар выведаў план і выдаў патрыётаў: Грынь і Зенан загінулі пакутнай смерцю, але нікога з сваіх таварышаў не выдалі ворагу.

Сыны Беларусі змагаліся з праціўнікам і ў радах італьянскіх партызан. У правінцыі Александрыя адным з лепшых памочнікаў камандзіра 16-й гарыбальдыйскай дывізіі "Загано" быў 19-гадовы студэнт з Мінска Аляксандр. У памяці партызан засталося толькі яго імя. Сам Аляксандр загінуў у снежні 1944 г. На італьянскай зямлі загінуў таксама А.К.Кісялёў, ураджэнец в. Стары Стан Клімавіцкага раёна, які змагаўся ў гарыбальдзійскай партызанскай брыгадзе "Маттэоці". 16-гадовым юнаком быў адпраўлены на прымусовыя работы М.С.Фралоў з вёскі Сідаровічы Магілёўскага раёна. Апынуўшыся ў Італіі, ён уцёк да партызан. Пасля вызвалення Італіі атрымаў "Пасведчанне патрыёта". Інжынер з Дзяржынска А.В.Варанкоў, уцёкшы ў 1943 г. з фашысцкага канцлагера, быў начальнікам штаба партызанскага атрада, а потым брыгады, якая дзейнічала на тэрыторыі Бельгіі. Пасля выгнання немцаў ён у ліку 30 іншых савецкіх грамадзян быў узнагароджаны вышэйшым ваенным ордэнам Бельгіі.

Шмат працоўных Беларусі прымала удзел у французскім руху супраціўлення. Ураджэнец Смаргоні Ф.К.Варанішча быў удзельнікам барацьбы ў Бардо. На заданні французскіх камуністаў ён аргані-

завяў уцёкі савецкіх ваеннапалонных з лагераў. 47 чалавек накіраваў патрыёт у партызанскія атрады Францыі.

На Бацькаўшчыне і ва яе межамі добра вядома імя лейтэнанта Савецкай Арміі В.В.Порыка, які стварыў лагерны камітэт у адным з раёнаў Падэ-Кале. Яго сувязнымі былі мінская падпольшчыца Т. В.Чахоўская і Вольга Барбук з Жодзіна. Дапамогу аказвалі таксама выхадцы з Маладзечанскага раёна У.Я. і С.І.Ліхота-Кісель і ўраджэнец Міёрскага раёна А.Д.Панізнік.

У дэпартаменце Марбіллы вясной 1944 г. у рух Супраціўлення ўлілася група ваеннапалонных, якой кіраваў лейтэнант Ф.Ф.Кажэмякін, ураджэнец Магілёўскай вобласці. У адным з баёў у верасні 1943 г. ён загінуў смерцю героя. Пас яротна быў узнагароджаны вышэйшай узнагародай Францыі — Ордэнам Ганаровага легіёна. У Эльзас-Латарынгіі гераічна змагаўся атрад "Смерць фашызму", створаны былымі мінскімі падпольшчыкамі. У ліку яго кіраўнікоў былі Ф.Ліхавец, У.Руткоўскі, байцы У.Бялько, П.Цінкевіч, Р.Карапанаў і іншыя.

У руху Супраціўлення прымалі актыўны ўдзел і дочкі Беларусі. З уцёкшых у маі 1944 г. з канцлагера Эрувіль жанчын быў створаны жаночы партызанскі атрад "Радзіма", якім кіравала жыхарка Мінска Н.І.Лісавец. Атрад прымаў удзел у шматлікіх баявых аперацыях. Пазней камандзіру атрада, а таксама Р.З.Сімёнавай-Фрыдзон было прысвоена званне лейтэнанта французскай арміі.

На зямлі Чэхаславакіі дзейнічала брыгада імя Готвальда, якую ўзначальваў ураджэнец Лепельскага раёна В.А.Квіцінскі. Толькі ў верасні 1944 г. брыгада ажыццявіла 158 баявых аперацый. Савецкі ўрад прысвоіў яе камандзіру званне Героя Савецкага Саюза.

Значны ўклад у перамогу над ворагам унеслі працоўныя Беларусі, эвакуіраваныя на ўсход краіны. Размясціліся эвакуіраваныя прадпрыемствы, рабочыя і іх сем'і галоўным чынам у Паволжы, на Урале, ў сярэдняй паласе РСФСР і ў Заходняй Сібіры. У асноўнай масе эвакуіраваныя прадпрыемствы зліваліся з мясцовымі, аднароднымі па спецыялізацыі. Аднак каля 20 пераважна буйных прадпрыемстваў захавалі сваю ранейшую самастойнасць. Ужо ў жніўні-верасні 1941 г. пачалі даваць прадукцыю 15 эвакуіраваных прадпрыемстваў, у кастрычніку-лістападзе — яшчэ 20. Да лета 1942 г. на абарону працавалі больш за 60 беларускіх прадпрыемстваў. У цяжкіх умовах ваеннага часу рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі паказвалі ўзоры працоўнага гераізму. Так, завод "Гомсельмаш" быў поўнасцю адноўлены ў Кургане за адзін месяц. За такі кароткі час стаў

даваць ваенную прадукцыю і калектыў Гомельскага станкабудаўнічага завода. У верасні далі прадукцыю гомельскі паравозавагонарамонтны і сударамонтны заводы, віцебскія станкабудаўнічы, фабрыка імя КІМ і імя К.Цэткін, у кастрычніку-лістападзе -- гомельскі завод "Рухавік рэвалюцыі", віцебскі іголкавы, фабрыка "Сцяг індустрыялізацыі" і іншыя.

Адвагу і стойкасць праявілі ў гады вайны эвакуіраваныя беларускія чыгуначнікі. Часта з небяспекай для жыцця яны вадзілі паязды ў прыфрантавой і франтавой паласе, падвяргаліся налётам варожай авіяцыі. Першай сярод работнікаў чыгункі з апярэджэннем графіка, без дадатковага набору паліва правяла цяжкавагавы састаў А.М.Чухнюк. Яе працоўны пачын быў падтрыманы іншымі чыгуначнікамі. За высокія паказчыкі ў рабоце яна была ўдастоена высокага звання Героя Сацыялістычнай Працы. Такую ж узнагароду атрымалі беларускія чыгуначнікі А.В.Глебаў, М.А.Макараў, І.П.Перцукевіч, А.А.Янкоўскі.

Частка эвакуіраванага насельніцтва працавала ў сельскай гаспадарцы трактарыстамі, камбайнёрамі, жывёлаводамі і паляводамі, брыгадзірамі і старшынямі калгасаў.

У савецкім тыле знаходзілася шмат прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі. На усход былі эвакуіраваны 60 навукова-даследчых інстытутаў і лабараторый, 6 тэатраў, больш 20 вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў. Вучоныя БССР вялі даследаванні, скіраваныя на ўдасканальванне тэхналогіі вытворчых працэсаў у прамысловасці, ажыццяўлялі пошук каштоўнай сыравіны для ваенных прадпрыемстваў, вырашалі праблемы павышэння ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, распрацоўвалі эфектыўныя метады лячэння параненых і г.д. У 1943 г. на станцыі Сходня пад Масквой аднавіў сваю работу Белдзяржуніверсітэт, у Яраслаўлі -- Мінскі медыцынскі інстытут.

Свой уклад у агульнук справу дасягнення перамогі над ворагам уносілі дзеячы беларускай культуры. Яны ствараді новыя мастацкія творы, выступалі перад воінамі Чырвонай Арміі, прымалі ўдзел у зборы грошай на патрэбы абароны.

Змагаючыся супраць нямецкіх захопнікаў у партызанскіх атрадах і ў падполлі, на франтах Вялікай Айчыннай вайны, здзейсняючы працоўныя подзвігі ў савецкім тыле, прымаючы актыўны ўдзел у еўрапейскім руху Супраціўлення, працоўныя Беларусі ўнеслі важкі уклад у агульную барацьбу народа супраць фашызма, наблізілі дзень вялікай перамогі, усталяванне міру на зямлі.

Перамога ў мінулай вайне была дасягнута вельмі вялікай цаной. У памяці кожнага дарослага жыхара Беларусі трывала замацавалася лічба 2 млн.200 тысяч. Столькі людзей было знішчана нямецкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі. Гэтая лічба адчыняе мемарыяльны комплекс "Хатынь", яна трывала ўвайшла ва ўсе энцыклапедыі і кнігі па Вялікай Айчыннай вайне. Упершыню яна ўзнікла ў 1945 годзе ў выніку абагульнення звестак Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі (НДК) па устанаўленню і расследаванню злачынстваў нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У сувязі з тым, што апошнім часам асобнымі аўтарамі робіцца спроба паставіць пад сумненне гэтую лічбу, крыху падрабязней раскажам як яна ўзнікла. У снежні 1945 г. па дадзеных абласных і раённых камісій садзейнічання НДК, і па пратаколах НДК была складзена даведка аб ахвярах нямецка-фашысцкіх злачынстваў на Беларусі, у якой былі дадзены наступныя звесткі:

№	Вобласць	Знішчана ўсяго: грамадзянскага насельніцтва	Забіта і загінула ваеннапалонных	Вывезена ў нямецкае рабства
1.	Мінская	317515	101590	29815
2.	Магілёўская	71602	59134	21486
3.	Віцебская	151421	92891	68434
4.	Гомельская	53630	114476	16745
5.	Бабруйская	82194	54013	15275
6.	Полацкая	105211	157007	52599
7.	Палеская	37981	3120	23047
8.	Гродненская	111208	41530	53965
9.	Брэсцкая	159526	38858	20008
10.	Баранавіцкая	181179	88407	33773
11.	Пінская	95385	24613	30861
12.	Маладзечанская	42373	34652	8828
		1409225	810091	377776

Усяго знішчана грамадзянскага насельніцтва і ваеннапалонных 2219316 чалавек. Як бачым, у агульную лічбу не ўключаны тыя, хто быў вывезены ў Германію і загінуў там. Вядома, што па розных прычынах звыш 260 тысяч не вярнуліся на Радзіму.

У гэтую статыстыку не ўключаны жыхары Беларусі, якія змагаліся ў Чырвонай Арміі (а гэта каля 1 млн. 300 тысяч), прапалі без

вестак, ці загінулі ў палоне, а таксама беларусы, загінуўшыя ў партызанскіх атрадах.

Больш таго, у працоўе падрыхтоўкі кніг серыі "Памяць" выяўляецца, што дадзеныя Надзвычайнай Дзяржаўнай Камісіі пэўнаму раёну значна заніжаны. Так, па афіцыйных звестках у Талачынскім раёне лічылась загінуўшымі 2500 чалавек. У выніку пераправеркі і апублікавання спісу загінуўшых было устаноўлена 10 тысяч прозвішчаў загінуўшых. Не выключана, што такая сітуацыя магчыма і на другіх раёнах.

Да гэтага трэба дабавіць, што дадзеныя НДК не зусім дакладныя і па шэрагу лагераў ваеннапалонных. Так, у лагеры ваеннапалонных Масюкоўшчына было зафіксавана звыш 80 тысяч загінуўшых. Дзякуючы даследванням беларускіх вучоных, знойдзены яшчэ рад братскіх магіл, у выніку лічба ахвяр павялічылася да 110 тысяч. Ужо пасля роспуску камісіі дадаткова былі знойдзены пахаванні 150 тысяч чалавек, якія раней не былі вядомыя. Такім чынам, колькасць загінуўшага насельніцтва Беларусі была значна большай чым да гэтага было вядома.

Вайна нанесла народнай гаспадарцы і культуры рэспублікі буйныя нявыртальныя страты: было спалена і разбурана 209 гарадоў і раённых цэнтраў, 9200 вёсак, амаль усе прамысловыя предпрыемствы, саўгасы і калгасы, школы, установы навукі і культуры, бальніцы і г.д. Агульныя страты рэспублікі склалі 75 млрд. рублей (у цэнах 1941 г.), што складала 85 бюджэтаў 1940 г. Насяўныя плошчы скараціліся амаль напалову. Каля 3 млн. чалавек засталося без прытулку і доўгі час вымушаны былі жыць у зямлянках.

Аднак, нягледзячы ні на што, беларускі народ верыў у лепшае будучае і знайшоў у сабе сілы, каб пераадолець з цягам часу страшэнныя ахвяры і страты вайны.

Тэма 26. ПАСЛЯВАЕННАЕ АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ. ЦЯЖКАСЦІ І НАБЫТКІ.

Вучэбныя пытанні. 1. Вынікі нямецка-фашысцкай акупацыі, разруха. 2. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі. 3. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларусі. 4. Грамадска-палітычнае жыццё ва умовах культу асобы. 5. Матэрыяльнае становішча народа, цяжкасці жыцця. 6. Культурнае будаўніцтва, навука.

Мінулая вайна вогненным смерчам пракацілася па тэрыторыі Беларусі. За трохгадовы перыяд акупацыі нямецка-фашысцкія захопнікі учынілі на беларускай зямлі страшэнныя злачынствы, загубілі звыш 2,2 млн. савецкіх грамадзян, або кожнага чацвертага жыхара рэспублікі, спалілі, разбурылі і разграбілі 209 гарадоў і пасёлкаў гарадскога тыпу, 9200 вёсак. Шмат населеных пунктаў было знішчана разам з жыхарамі, у тым ліку вёска Хатынь, трагічны лёс якой вядомы далёка за межамі Беларусі. Сотні тысяч жыхароў рэспублікі загінулі у барацьбе з ворагам на франтах Вялікай Айчыннай вайны і у партызанскім руху.

У выніку акупацыі у катастрафічным становішчы апынулася народная гаспадарка Беларусі. Захопнікі разбурылі 10 388 прамысловых прадпрыемстваў, што склала 85% іх даваеннай колькасці, ліквідавалі усе 10 тыс. калгасаў, 92 саўгасы і 316 МТС, вывезлі у Германію 8896 трактараў, больш за 11000 камбайнаў, шмат іншай тэхнікі. Вялізныя страты былі нанесены транспарту, жыллёва-камунальнай гаспадарцы, прадпрыемствам гандлю, сістэме аховы здароўя. Амаль 3 млн. чалавек, каля 34% даваеннага насельніцтва, было пазбаўлена жылля. З небывалай жорсткасцю вораг знішчыў тысячы устаноў асветы, навукі, культуры. За гады акупацыі рэспубліка страціла звыш паловы свайго нацыянальнага багацця, пры гэтым толькі прамы матэрыяльны ушчэрб БССР склаў 75 млрд. руб. (у цэнах 1941 г.).

Адразу пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў працоўныя Беларусі прыступілі да адраджэння народнай гаспадаркі і ліквідацыі вынікаў акупацыі. Гэта была надзвычайна цяжкая і складаная задача. Яе выкананне даводзілася пачынаць у экстрэмальных умовах, калі ішчэ працягвалася крывапралітная вайна з фашызмам, якая забірала шмат сіл народа, вялізных выдаткаў ма-

тэрыяльных рэсурсаў. Але наступова аднаўленчыя работы ў рэспубліцы пашыраліся, да стваральнай працы прыступілі тысячы калектываў работнікаў прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарту. Дзякуючы намаганням працоўных у Гомелі на пачатак 1945 г. былі часткова адноўлены і прыступілі да выпуску прадукцыі 37 прамысловых прадпрыемстваў, у Мінску за 7 месяцаў пасля вызвалення ўвайшлі у строй поўнасцю 36 і часткова 14 прадпрыемстваў, у Гродне — 17 фабрык і заводаў і г. д.

У першую чаргу аднаўляліся прадпрыемствы, якія выконвалі заданні ваеннага камандавання, выраблялі тавары народнага спажывання, аказвалі насельніцтву першачарговыя бытавыя паслугі. Калі у 1944 г. вытворчасць прамысловай прадукцыі Беларусі складала толькі 5,3% даваеннага ўзроўню, то ў наступным годзе яна дасягнула 20%. Адной з важнейшых задач было аднаўленне транспарту, асабліва ўвод у строй чыгуначных ліній і вузлоў, рамонт дарог і будаўніцтва мастоў, па якіх ішло забеспячэнне фронту. У правядзенні гэтых работ разам з ваенна-аднаўленчымі арганізацыямі, рабочымі-чыгуначнікамі ўдзельнічала звыш 100 тыс. чалавек мясцовага насельніцтва.

Савецкі ўрад, улічваючы цяжкае матэрыяльнае і фінансавае становішча Беларусі, выдзеліў ёй у дзяржаўны бюджэт у 1944—1945 гг. датацый на суму каля 1,7 млрд. руб. Ліквідацыі вынікаў акупацыі і аднаўленню нацыянальнай эканомікі БССР спрыяла значная матэрыяльна-тэхнічная дапамога ёй з боку іншых савецкіх рэспублік. Ад Расійскай Федэрацыі, Украіны, рэспублік Сярэдняй Азіі у Беларусь адразу пасля яе вызвалення пачалі паступаць абсталяванне і машыны, метал, вугаль, нафта, будаўнічыя матэрыялы і інш. Да верасня 1946 г. было завезена энергетычнага абсталявання на агульную магутнасць каля 160 тыс. кВт, фабрычна-заводскага абсталявання больш за 36 тыс. адзінак, у тым ліку каля 12 тыс. металарэзных станкоў.

Нягледзячы на цяжкасці эканамічнага становішча былі зроблены першыя станоўчыя заходы па паляпшэнню ўмоў жыцця і працы насельніцтва. На працягу 1944—1945 гг. за кошт дзяржавы было адноўлена і здадзена у эксплуатацыю звыш 1 млн. кв. м жылой плошчы. Апрача таго насельніцтва гарадоў за асабістыя сродкі і з дапамогай крэдытаў пабудавала 513 тыс. кв. м жылля, 171 тыс. дамоў узвялі калгаснікі і вясковая інтэлігенцыя. Канкрэтныя меры акцыяўляліся па змякчэнню вострай харчовай праблe-

мы, забеспячэнню мірнаму гарадоу і вёсак таварамі першай неабходнасці, арганізацыі медыцынскага абслугоўвання.

Разам з тым эканоміка рэспублікі яшчэ знаходзілася у стане разрухі і глыбокага заняпаду, патрабаваліся вялізныя намаганні народа, каб ліквідаваць вынікі вайны, вярнуць да мірнакроунага жыцця разбурэнні гарады і вёскі. Як адзначалася вышэй, у 1945 г. аб'ём прамысловай прадукцыі Беларусі склаў толькі пятую частку даваеннага узроуню. Нялепшым было становішча сельскай гаспадаркі, асабліва ва усходніх абласцях рэспублікі, дзе ішлі жорсткія баі у час вызвалення.

У пасляваенны гады працэс адраджэння эканомікі Беларусі набыу больш шырокі і маштабны характар. Заканчэнне вайны і пераход краіны да мірнага жыцця дазволілі значна павялічыць сродкі на аднаулення гаспадаркі, паўней выкарыстаць у гэтых мэтах наяўныя матэрыяльныя і чалавечыя рэсурсы. УШ сесія Вярхоунага Савета БССР першага склікання (верасень 1946 г.) прыняла Закон аб пяцігадовым плане аднаулення і развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1946--1950 гг., які ставіу мэту не толькі дасягнуць даваенны узровень эканомікі, але і перавышці яго у значных памерах.

У галіне прамысловасці першарадная ўвага надавалася аднауленню і умацаванню паліўна-энергетычнай базы рэспублікі, развіццю машынабудавання, нарошчванню металургічнай будматэрыялаў. Характэрнай асаблівасцю адраджэння беларускай індустрыі было тое, што адначасова з аднауленнем разбуоаных прадпрыемстваў уводзіўся шэраг новых фабрык і заводаў, аснашаных сучаснай тэхнікай, спецыялізаваных на выпуску новых відаў прадукцыі. Найбольш буйнымі новабудоўлямі таго часу былі мінскія аутамабільны, трактарны, мотавеласпедны і інструментальны заводы, Магілеускі лакамабільны, Віцебскі домабудаунічы камбінат, Мінскі і Гродзенскі тонкасуконныя камбінаты, Віцебскі дываноза-плюшавы, Скідзельскі цукровы завод і іншыя прадпрыемствы. Але яны будаваліся як агульнадзяржаунныя прадпрыемствы і пераважная большасць іх прадукцыі вывозілася за межы рэспублікі.

На шляху аднаулення і развіцця прамысловасці Беларусі у пасляваенны гады было шмат цяжкасцей і складаных праблем, вырашэнне якіх патрабавала далейшых намаганняў рабочага класа, усяго беларускага народа. Дзякуючы іх самаадданай працы аднауленне

прамысловасці у цэлым было завершана да канца 40-х гадоў у выніку выканання чацвертага пяцігадовага плана. У 1950 г. аб'ем вытворчасці прамысловай прадукцыі Беларусі перасягнуў даваенны узровень на 15%. Аднак аднаўленне некаторых галін ішло са значным адставаннем, асабліва лёгкай і харчовай прамысловасці, а таксама паліўнай, лясной, драваапрацоўчай і папяровай. Узровень іх вытворчасці ячэ значна адставаў ад даваеннага. Вялікая колькасць адноўленых прадпрыемстваў працавала на зношанай і састарэлай матэрыяльна-тэхнічнай базе, якая не давала магчымасці хутка павышаць эфектыўнасць працы, знізіць сабекошт прадукцыі і паляпшаць яе якасць.

Пасля аднаўлення прамысловасці Беларусі працягваўся не рост, пашыралася матэрыяльна-тэхнічная база, умацоўваліся кадры. За 1951--55 гг. было пабудавана і уведзена у дзеянне 147 буйных прамысловых прадпрыемстваў. У 1955 г. прамысловасць налічвала 8,5 тыс. дзяржаўных фабрык і заводаў, на долю якіх прыпадала 84,6% валавой прадукцыі усёй прамысловасці рэспублікі. Развіццё прамысловасці суправаджалася не толькі колькаснымі, але і пэўнымі якаснымі зменамі: на фабрыках і заводах укаранялася новая тэхніка і тэхналогія, пашыралася механізацыя вытворчых працэсаў, спецыялізацыя і вытворчае кааперараванне. Электраузброенасць рабочага прамысловасці у 1955 г. перавышыла даваенны узровень у 2,5 разы. Дзякуючы тэхнічнаму росту прамысловасці павышалася прадукцыйнасць працы, але у гэтых адносінах Беларусь адставала ад шэрагу рэспублік СССР, не кажучы ужо аб перадавых замежных краінах.

І усе ж вынікі індустрыяльнага развіцця БССР за першае пасляваеннае дзесяцігоддзе уражвалі: прамысловасць не толькі была адноўлена, узнята з руін і папялішч, але і значна прасунулася на шляху далейшага росту. Аб'ем яе валавой прадукцыі за гэты перыяд павялічыўся у 12 разоў, а супраць 1940 г. -- у 2,4 разы. Нераўнамернымі тэмпамі развівалася машынабудаванне, а таксама выпрацоўка электраэнергіі і цеплаэнергіі, будаўнічых матэрыялаў. Машынабудаванне і металаапрацоўка сярод іншых галін прамысловасці перайшлі з 6-га месца у 1913 г. і 4-га у 1940 г. на першае месца у 1955 г. На іх долю прыпадала 24,1% кошту валавой прадукцыі, 25,1 -- колькасці працуючых, 30,1% вартасці асноўных фондаў усёй прамысловасці. Па указаным вышэй годзе машынабудаўнікі выраблілі ужо 18,3 тыс. трактараў, 12,9 тыс. грузавых

аутамабіляў, каля 6 тыс. металарэзных станкоў, тысячы адзінак сельскагаспадарчай і будаўнічай тэхнікі, шмат іншых неабходных машын і абсталявання.

Аднак курс на фарсіраванае і пераважнае развіццё ў Беларусі машынабудавання і металаапрацоўкі быў супярэчлівым і недальнабачным. Стварэнне на яе тэрыторыі пры адсутнасці неабходных сыравінных рэсурсаў шэрагу буйных машынабудаўнічых заводаў паставіла Беларусь у вялікую эканамічную залежнасць ад іншых рэгіёнаў краіны. Акрамя таго, яно запатрабавала вялізных выдаткаў фінансавых сродкаў, матэрыяльных і людскіх рэсурсаў, што не магло адмоўна не адбіцца на тэмпах развіцця некаторых іншых жыццёва важных галін народнай гаспадаркі, не стварала зацікаўленасці ў распрацоўцы мясцовых багаццяў сыравіны. Маруцна, са значным адставаннем ад намечаных планаў нарошчвалі вытворчасць паліўная прамысловасць, лясная, дрэваапрацоўчая і папяровая, лёгкая і харчовая, у тым ліку перапрацоўка сельскагаспадарчай прадукцыі. Сур'ёзныя недахопы мелі месца ў планаванні прамысловага развіцця, капітальным будаўніцтве, арганізацыі вытворчасці і працы. Слаба выкарыстоўваліся дасягненні навукова-тэхнічнага прагрэсу, унутраныя рэзервы вытворчасці.

У пасляваенныя гады вырашалася важная праблема індустрыялізацыі заходніх абласцей БССР, пераадолення іх эканамічнага адставання, якое было вынікам 20-гадовага знаходжання ў складзе буржуазна-памешчыцкай Польшчы. Тут былі пабудаваны, адноўлены і рэканструяваны на новай тэхнічнай аснове сотні прамысловых прадпрыемстваў. Па сутнасці стварыліся новыя галіны прамысловасці: сельскагаспадарчае машынабудаванне, тэкстыльная, развівалася прамысловасць будаўнічых матэрыялаў, торфаздабывачая, цукровая, мясная і малочная. За 1945--1949 гг. толькі ў Гродзенскай вобласці было адноўлена і пабудавана каля 500 заводаў і фабрык, у тым ліку 68 буйных. Увайшлі ў строй 26 электрастанцый. Выпрацоўка электраэнергіі ў Брэсцкай, Гродзенскай і Маладзечанскай абласцях у 1955 г. перавышла даваенны ўзровень у 6,2 разы супраць 3,7 у цэлым па рэспубліцы. Разам з тым працэс ліквідацыі адставання прамысловасці заходніх абласцей Беларусі ад усходніх яшчэ не быў завершаны: у 1955 г. іх удзельная вага у вытворчасці прамысловай прадукцыі БССР складала толькі 16,9%, хоць і павялічылася амаль удвая у параўнанні з 1940 г. У сувязі з гэтым паскарэнне тэмпаў індустрыяльнага развіцця заходне-

беларускіх абласцей, стварэнне на іх тэрыторыі новых заводаў і фабрык, вывучэнне і шырокае выкарыстанне мясцовых справаздачных рэсурсаў працягвала заставацца адной з важнейшых сацыяльна-эканамічных задач рэспублікі.

Разам з прамысловасцю паступова аднаўлялася сельская гаспадарка Беларусі, якая пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў знаходзілася у крытычным становішчы. Але тэмпы адраджэння сельскагаспадарчай вытворчасці былі невысокімі, востра адчувалася недастатковае фінансаванне калгасаў і саўгасаў. Не-ставала машын і інвентару, угнаенняў, насення. Нягледзячы на гэта працаўнікі беларускай вёскі самаадана змагаліся за адраджэнне гаспадаркі, аднаўлялі жывелагадоўчыя фермы, вытворчыя памяшканні, залушчаныя за гады акупацыі лалі і лугі. Працоўная актыўнасць вясковцаў, іх настойлівае імкненне як мага хутчэй залячыць раны вайны дазволілі шэрагу калгасаў і саўгасаў за параўнаўча кароткі тэрмін не толькі пераадолець разруху, выйсці на даваенны ўзровень сельскагаспадарчай вытворчасці, але і перавысіць яго. Адным з першых у рэспубліцы гэтую цяжкую і складаную задачу вырашылі працаўнікі калгасаў імя Гастэлы Мінскага раёна, "17 верасня" Давыд-Гарадоцкага, "Камінтэрна" Магілеўскага, імя Тэльмана і "Чырвоная ніва" Брагінскага, "За Радзіму" Гомельскага, "Чырвоная змена" і саўгаса "10 год БССР" Любанскага раёнаў.

У гэтых і некаторых іншых гаспадарках ужо даволі шырока выкарыстоўваліся сродкі механізацыі працы, сартавое насенне, забяспечвалася трывалая кармавая база для грамадскай жывёлы, дзякуючы чаму развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці тут набывала устойлівы і стабільны характар. Асаблівую вядомасць у рэспубліцы набылі вытворчыя поспехі калгаса "Рассвет" Кіраўскага раёна, якім з 1944 г. кіраваў Герой Савецкага Саюза К. П. Арлоўскі. Тысячы вясковцаў Беларусі паказвалі прыклад добрасумленнай і высокапрадукцыйнай працы, пры гэтым навацтары вытворчасці Г. С. Гарэцкая, П. Л. Калыска, Е. А. Кухарава, Ф. А. Саўчык, К. І. Шаплыка, Т. І. Шкурко, А. Р. Юркевіч і іншыя беларускія земляробы былі ўдастоены звання Героя Сацыялістычнай працы.

Да сярэдзіны 50-х гадоў па асноўных вытворчых паказчыках сельская гаспадарка Беларусі дасягнула даваеннага ўзроўню: у 1955 г. ва ўсіх катэгорыях гаспадарак пасяўныя плошчы дасягнулі

5453,3 тыс. га, налічвалася 2848,1 тыс. галоў буйнай рагатай жывёлы, 2249,1 тыс. свіней. Гаспадаркі мелі 21,2 тыс. трактараў (фізічных адзінак), 8,1 тыс. зерневых камбайнаў, 16,5 тыс. грузавых аўтамабіляў і шмат іншай тэхнікі. Працавала 388 машына-трактарных станцый, але ручная праца у калгасах і саўгасах яшчэ шырока выкарыстоўвалася. Прыкметны станоўчы зрухі у сельскагаспадарчай вытворчасці абумовілі рашэнні верасноўскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС, які выявіў сур'ёзныя недахопы у развіцці сельскай гаспадаркі і вызначыў меры, накіраваныя на іх пераадоленне.

Пасля вайны значныя сацыяльна-эканамічныя змены адбыліся у заходнебелорускай вёсцы. Тут пачаўся працэс калектывізацыі сельскай гаспадаркі, які у першыя пасляваенныя гады праводзіўся павольна. Да канца 1946 г. было аднаўлена і арганізавана усяго 133 калгасы, якія аб'ядноўвалі 8253 сялянскія гаспадаркі, што складала 9,5% ад іх агульнай колькасці. Многія сяляне адмаўляліся ад уступлення у калгасы, таму на месцах усё большую моц набывалі прымусовыя метады ўцягнення сялян у калгасы. XIX з'езд КП(б)Б (люты 1949 г.) паставіў задачу завяршыць калгаснае будаўніцтва у заходніх абласцях. З гэтага часу пачалася масавая калектывізацыя, якая праводзілася прымусова, як і у даваенныя гады у БССР. Пры гэтым ігнараваўся прынцып добраахвотнасці, сялянства гвалтоўна пазбаўлялася зямлі і сродкаў вытворчасці, адзяржаўленых у форме калгаснай уласнасці. Многія сем'і заможных сялян, так званых "кулакоў" падвяргаліся рэпрэсіям, высланы у аддаленыя раёны Савецкага Саюза. У верасні 1951 г. Савет Міністраў СССР прыняў спецыяльную пастанову "Аб высяленні кулакоў з Беларускай ССР", у выніку ажыццяўлення якой толькі у 1952 г. за межы рэспублікі была выслана 4431 "кулацкая" сям'я. Сасланых рассялялі у Казахстане, Якуціі, Кіргізіі, іншых аддаленых раёнах краіны, дзе людзі былі аддадзены на пакуты, голад і выміранне. Толькі пасля смерці Сталіна большасць з іх былі рэабілітаваны і вярнуліся на радзіму.

Створаным калгасам і саўгасам выдзяляліся крэдыты на развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці, паставляліся мінеральныя угнаенні, будаўнічыя матэрыялы, сельскагаспадарчая тэхніка, насенне. Да канца 1949 г. у заходніх абласцях рэспублікі налічвалася 78 МТС, якія мелі 858 трактараў, іншую тэхніку. Яна ады-

грала істотную ролю ў рэканструкцыі сельскай гаспадаркі заходніх абласцей.

Да канца 1952 г. было калектывізавана 540,3 тыс. сялянскіх гаспадарак, што складала 95% ад іх агульнай колькасці. Былі ліквідаваны заможныя гаспадаркі, сселены хутары, узмацніўся эканамічны націск на адназособнікаў. Усё гэта садзейнічала рассяляванню вёскі, разбурэнню жыццёвага ўклада яе жыхароў.

У цэлым тэмпы развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі заставаліся нізкімі, фінансавыя і матэрыяльна-тэхнічныя рэсурсы, што выдзялялі дзяржава, былі недастатковымі для карэннага палепшання сацыяльна-эканамічнага становішча вёскі. У калгасах і саўгасах марудна расла прадукцыйнасць працы, значная іх частка з"яўлялася нерэнтабельнымі, атрымлівала нізкія ўраджаі асноўных сельскагаспадарчых культур. Так, у першай палове 50-х гадоў валавы збор зернявых у рэспубліцы складаў менш за 70% ад даваеннага, амаль прыпыніўся прырост пагалоўя жывёлы.

Такім чынам, пасляваеннае адраджэнне нацыянальнай эканомікі Беларусі было складаным і супярэчлівым. Панаваўшая ў краіне камандна-адміністрацыйная сістэма стрымлівала ініцыятыву і творчую актыўнасць народа, не стварала належных умоў для роста прадукцыйных сіл грамадства. І ўсё ж нягледзячы на велікія цяжкасці і перашкоды гераічнымі намаганнямі працоўных Беларусь узнялася з руін і папялішчаў, былі адноўлены гарады і вёскі, ліквідаваны спустошальныя вынікі вайны і трохгадовай нямецка-фашысцкай акупацыі.

Пасля перамогі над фашызмам у грамадстве пачаўся працэс пераасэнсавання шляхоў далейшага развіцця краіны. Сярод розных слаёў насельніцтва ўзмацнялася імкненне да перамен, пашырэння дэмакратычных свабод і правоў, якія па-ранейшаму жорстка абмяжоўваліся таталітарным рэжымам. Крытычныя настроі часцей за ўсё праяўляліся ў франтавікоў, удзельнікаў партызанскага руху, а таксама моладзі, якая звязвала з пераменамі свае спадзяванні на лепшую будучыню. У 1946--1947 гг. у некаторых абласцях рэспублікі (пераважна заходніх) узніклі маладзёжныя падпольныя патрыятычныя арганізацыі. Яны ставілі сваёй мэтай фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці людзей, вывучэнне гісторыі і культуры беларускага народа. Праз некаторы час члены гэтых арганізацый былі арыштаваны і асуджаны. Гэта сведчыла аб тым, што

таталітарны рэжым стаяў на ахове сваіх інтарэсаў, не жадаў пайсці на перагляд склаўшайся палітыкі. Таму узмацнілася ідэалагічная апрацоўка свядомасці людзей, а таксама рэпрэсіўныя меры супраць інакадумцаў.

Разгортванню новай хвалі рэпрэсій у краіне спрыяла сфабрыкаваная у пачатку 1949 г. "ленінградская справа", па якой каля 200 партыйных і савецкіх работнікаў былі асуджаны, многія з іх прыгавораны да растрэлу. Пасля гэтага актывізаваліся рэпрэсіі у Беларусі, якія ажыццяўляў міністр дзяржаўнай бяспекі Цанава. У лістападзе 1951 г. ён быў пераведзены у Маскву на пасаду аднаго з намеснікаў міністра дзяржаўнай бяспекі СССР. Вынікам злачыннай дзейнасці Цанавы з'явіліся рэпрэсіі ні у чым не павінных людзей, у тым ліку кіруючых савецкіх, партыйных работнікаў. У 1951 г. быў беспадстаўна выключаны з партыі, зняты з пасады міністра асветы БССР і прыгаворан да турэмнага зняволення тэрмінам да 25 гадоў П. В. Саевіч. У 1956 г. ён быў рэабілітаваны. Арышты партыйных, савецкіх, гаспадарчых работнікаў усіх узроўняў прыводзілі да таго, што многія з іх працавалі з аглядкай, баяліся новага, не праяўлялі ініцыятывы. Гэта не магло не адбіцца на сацыяльна-эканамічным і грамадска-палітычным развіцці рэспублікі.

Акрамя рэпрэсій, таталітарны рэжым праводзіў палітыку удушэння усялякага інакадумства, што галоўным чынам выходзіла з боку інтэлігенцыі. З гэтай мэтай адна за другой праводзіліся палітычныя кампаніі, якія трымалі у напружанні грамадства, ствараліі вобраз ворага, усхваляліі Сталіна. У студзені 1947 г. ЦК УКП(б) у пастанове "Аб рабоце КП(б) Беларусі" падвергнуў крытыцы "бязідэйную" п'есу К. Крапівы "Мілы чалавек", у якой на думку афіцыйнай крытыкі у карыкатурным выглядзе паказваліся партыйныя і савецкія работнікі. Памылковай лічылася п'есаАКучара "Заложнікі" за неаб'ектыўны паказ партызанскага руху на Беларусі. Гэта быў сігнал да таго, каб як і у даваенны час абвінаваціць творчую інтэлігенцыю у буржуазным нацыяналізме, весці палітыку на яе фізічнае знішчэнне.

У сакавіку 1947 г. ЦК УКП(б) прыняў пастанову "Аб судах гонару у міністэрствах СССР і цэнтральных ведамствах", згодна з якой там ствараліся асобныя выбарныя органы для барацьбы з учынкамі, якія губляюць гонар і вартасць савецкага работніка. "Суды гонару" адыгралі ганебную ролю у пасляваенным грамадстве.

У пачатку чэрвеня 1947 г. суд гонару Міністэрства аховы здароуя СССР разгледзіу "справу" прафэсараў Клюевай і Роскіна, аутараў навуковай працы "Шляхі біятэрапіі рака", якія абвінавачваліся у антыпатрыятызме і супрацоуніцтве з замежнымі фірмамі. Нягледзячы на тое, што ім была вынесена грамадская вымова, у ліпені 1947 г. ЦК УКП(б) разаслаў у партыйныя арганізацыі краіны закрытае пісьмо. У абстаноуцы "выкрыцця" вучоных, якія пракланяюцца перад Захадам, прайшлі закрытыя партыйныя сходы у ВНУ і навукова-даследчых інстытутах Беларусі. Адбыліся таксама гарадскія сходы партыйнага актыву абласных цэнтраў і абласныя сходы камсамольскага актыву. Так, на сходзе партыйнага актыву Мінска крытыкаваўся артыкул прэзідэнта АН БССР А. Р. Жэбрака, надрукаваны у амерыканскім часопісе "Навука". У ім аутар выступіу супраць імкнення некаторых амерыканскіх біблагау атаясамліваць памылковыя погляды Лысенкі з усёй савецкай біялагічнай навукай. Артыкул А. Р. Жэбрака кваліфікаваўся як антыпатрыятычны учынак "зганьбіушы дасягненні савецкай біялагічнай навукі і вядомага савецкага вучонага-наватара акадэміка Т. Д. Лысенкі". За **бязлітаснай** крытыкай пачаліся адміністрацыйныя меры. У лістападзе 1947 г. А. Р. Жэбрака вызвалілі ад пасады прэзідэнта АН БССР.

Распрацоуляючыся з іншадумствам, таталітарны рэжым узхваляу Сталіна. У пасляваенны перыяд культ яго асобы дасягнуў свайго апагея, што звязвалася з перамогай у вайне, да якой, як адзначала афіцыйная прапаганда, прывёў вялікі Сталін. Усімі сродкамі яму надаваўся арэол непагрэшнасці і геніяльнасці. Вялікае значэнне надавалася выпуску і пропагандзе прац "правадыра". У 1947 г. пачалося выданне на беларускай мове 13-томнага збору твораў, якое завяршылася у 1951 г. Вялізарнымі тыражамі выходзіла "Кароткая біяграфія І. В. Сталіна", у адпаведным рэдагаванні якой ён прыняу асабісты удзел. На вывучэнні біяграфіі будавалася палітычная вучоба. У 1947 г. у рэспубліцы працавала 7250 гурткоу па вывучэнню і растлумачэнню біяграфіі Сталіна.

Асаблівых памераў узхваленне Сталіна дасягнула у снежні 1947 г., калі краіна адзначала 70-годдзе. З гэтай нагоды ЦК УКП(б) прыняу спецыяльную пастанову. Акрамя правядзення лекцый, гутарак, тэарэтычных канферэнцый партыйнае кіраунніцтва рэспублікі прыняло рашэнне аб падпісанні "Пісьма вялікаму Сталіну у слаунае 70-годдзе" з дня нараджэння ад беларускага наро-

да." Лепшыя творчыя сілы былі задзейнічаны у яго складанні. Іх намаганні скіроўваліся на тое, каб праславіць тырана, які прынёс беларускаму народу незлічоныя ахвяры і пакуты. На падпісанне пісьма у рэспубліцы адгукнулася 31,5 тыс. мітынгаў і сходаў з ахопам 3 млн. працоўных. На іх выступіла амаль 100 тыс. чалавек, якія прыпісвалі усе поспехі у адраджэнні народнай гаспадаркі толькі Сталіну, старанна замоўчвалі яго памылкі, а тым больш злачынствы. Многія рабілі гэта пад прымусам, але шмат народа шчыра верыла "сонейку любімаму правадыру, бацьку і настаўніку".

Культ асобы Сталіна, а таксама цяжкія умовы адраджэння народнай гаспадаркі рэспублікі садзейнічалі поўнаму пераходу кіруючых функцый партыйным структурам. Яны цалкам падмянялі савецкія, гаспадарчыя органы, адзіналічна вызначалі напрамак палітычнага жыцця, якое характарызавалася крайняй ідэалагізацыяй. Паслявоеннае дзесяцігоддзе характарызавалася правядзеннем фарсіраванага росту партыйных радоў. Многія працаўнікі рабочага класа і сялянства не спяшаліся звязваць свой лёс з партыяй. Гэта асабліва тычылася сялянства, якое знаходзілася у цяжкім матэрыяльным становішчы, не адчувала на сябе клопатаў аб паляпшэнні жыцця з боку мясцовых партыйных структур. Таму многія сельскія райкомы на працягу шэрагу гадоў вельмі слаба раслі за кошт прыёму калгаснікаў. Пытанні роста рэдка не выходзілі з павесткі дня пярвічных партыйных арганізацый, бюро і пленумаў раённых, абласных камітэтаў, нават з'ездаў КПБ. Гэта давала некаторыя вынікі. Калі на I студзеня 1946 г. у радах Кампартыі Беларусі налічвалася 48,2 тыс. камуністаў, то на I студзеня 1956 г. — 145 тыс.

Сканцэнтраваўшы у сваіх руках усе ключавыя улады, партыйныя структуры абмяжоўвалі паўнамоцтвы Саветаў як працоўных органаў. Многія з іх займалі пасіўную пазіцыю у вырашэнні пытанняў, якія ўваходзілі у іх кампетэнцыю, чакаючы указанняў партыйных органаў. На сесіях адсутнічалі умовы для канструктыўнага аналізу стану спраў і прыняцця канкрэтных рашэнняў. У сакавіку 1947 г. прайшлі выбары у Вярхоўны Савет БССР. У студзені 1948 г. і снежні 1950 г. адбыліся выбары у мясцовыя Саветы. Доля рабочых і калгаснікаў, занятых непасрэдна на вытворчасці [illegible] складала у 1948 г. толькі 5,6%, а у 1950 г. — 4,6%.

Культ асобы строга рэгламентаваў і стрымліваў дзейнасць прафсаюзаў. Важную ролю у актывізацыі іх дзейнасці адыграла ства-

рэнне у лістападзе 1948 г. Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў. У 1956 г. яны аб'ядноўвалі 1173 тыс. чалавек, што складала 98,7% усіх працаўных у вытворчасці (акрамя калгаснікаў).

Пасля смерці у сакавіку 1953 г. Сталіна Старшынёй Савета Міністраў СССР быў заверджаны Г. М. Маленкоў. Сакратарыят ЦК, апарат Цэнтральнага Камітэта узначаліў М. С. Хрушчоў. Але гэтыя прызначэнні не задавальнялі Берыя, які дабіваўся ажыццяўлення кантролю над партыяй, рихтаваўся да захопу улады. Па ініцыятыве М. С. Хрушчова 26 чэрвеня 1953 г. у час пасяджэння Прэзідыума ЦК КПСС Берыя быў арыштаваны. Гэта ажыццявіла група ваенных на чале з першым намеснікам міністра абароны краіны, маршалам Савецкага Саюза Г. К. Жукавым. Затым над Берыя адбыўся суд. За шматлікія злачынствы перад народам ён быў растраляны.

Пасля смерці Сталіна пачалося некаторае ажыццяўленне калектыўнага вырашэння партыйных, дзяржаўных, народнагаспадарчых пытанняў. На новы узровень узнялася работа мясцовых Саветаў, пашыраліся іх правы. Пабіліся спробы па скарачэнню адміністрацыйнага апарату, змяншэнню валакіты, бюракратызма. У 1954 г. у рэспубліцы было скасавана пяць абласцей, астатнія ўзбуйнены. Прайшло таксама ўзбуйненне сельскіх Саветаў, колькасць якіх зменшылася з 2520 да 1922. Здзейсненыя меры дазволілі некалькі спрасціць структуру апарата управлення і наблізіць яго да кіраўніцтва народнай гаспадаркай і культурным будаўніцтвам.

Прымаліся меры па умацаванню законнасці і правапарадку. Гэтаму спрыяла скасаванне у верасні 1953 г. сумна вядомай Асобай нарады пры міністэрстве унутраных спраў СССР, якая фактычна без суда выносіла у масавым парадку такія пакаранні, як высылка, зняволенне, растрэл. Былі ліквідаваны ваенныя пракуратуры і трыбуналы войск МДБ. Аднаўлівся парадак, паводле якога грамадзяне пазбаўляліся волі толькі у адпаведнасці з прыгаворам суда, пашыраліся правы пракуратуры па кантролю за захаваннем нормаў законнасці.

Такім чынам, дэмакратычныя тэндэнцыі у грамадстве у пасляваенны час былі блакіраваны дыктатарскім рэжымам. Ён абрушыў ідэалагічны і рэпрэсіўны механізм супраць народа, каб трымаць яго у руках. Цяжкія умовы пасляваеннага аднаўлення гаспадаркі садзейнічалі таму, што партыйныя структуры у гэты час узмацнілі сваю ролю галоўнага звяна камандна-адміністрацыйнай сістэмы.

Безпраўнымі з'яўляліся Саветы, прафсаюзныя і камсамольскія камітэты і арганізацыі. Таму адразу пасля смерці Сталіна пачалі ажыццяўляцца першыя спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця.

Пасля вызвалення Беларусі вельмі матэрыяльнымі патрэбамі, у тым ліку востра стаяў і пытанні забеспячэння насельніцтва жыллём. Акупанты знішчылі 70 тыс. жылых дамоў, якія належалі дзяржаве, і звыш 891 тыс. дамоў, што знаходзіліся ў асабістай уласнасці грамадзян. За гады вайны дах над галавой страцілі каля 3 млн. чалавек. У гарадах і пасёлках амаль нічога не засталося ад камунальна-бытавых устаноў, быў знішчаны гарадскі транспарт.

З першых дзён вызвалення у рэспубліцы разгарнулася работа па аднаўленню жыллёвага фонда. Толькі у Мінску з мая 1945 г. да студзеня 1950 г. ён павялічыўся з 408 тыс. да 1105,9 тыс. кв. м. З дапамогай гараджан да пачатку 50-х гадоў удалося у асноўным завяршыць перасяленне з зямлянак ва уласныя дамы сельскіх жыхароў. За чатыры гады пасля вызвалення на вёсцы было пабудавана больш як 369 тыс. дамоў, у якія перасялілася звыш 2 млн. чалавек, страціўшых свае жыллё у гады вайны. У далейшым намаганні скіроўваліся на інтэнсіфікацыю жыллёвага будаўніцтва. За 10 пасляваенных гадоў дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы і арганізацыі, калгасы, саўгасы і асобныя сем'і пабудавалі жылыя дамы агульнай плошчай каля 22 млн. кв.м. Аднак жыллёвая праблема заставалася вострай: у 1955 г. на аднаго жыхара БССР прыпадала толькі 4,6 кв. м жылой плошчы, што было менш, чым да вайны. Шмат сем'яў рабочых і служачых яшчэ жылі у памяшканнях, якія падлягалі зносу ці капітальнаму рамонту, у бараках і інтэрнатах, дзе адсутнічалі неабходныя бытавыя ўмовы.

Некатораму паляпшэнню умоў жыцця насельніцтва спрыяла аднаўленне сеткі камунальна-бытавых прадпрыемстваў. З кожным годам у гарадах павялічвалася працягласць вадаправоднай і каналізацыйнай сістэм, наладжвалася работа транспарту, пераважна аўтобуснага. У пятай пяцігодцы колькасць гарадоў, якія мелі унутрыгарадскія і прыгарадныя аўтобусныя зносіны, вырасла з 19 да 28, колькасць міжгародніх аўтобусных ліній — з 128 да 140. У 1952 г. у Мінску пайшоў першы у рэспубліцы тралейбус. Аднак развіццё камунальнай гаспадаркі значна адставала ад запатрабаванняў на-

сельніцтва. У 1950 г. толькі 26% гарадскога грамадскага жыллёвага фонду было аснашчана вадаправодам, 16 — каналізацыяй, 11% — цэнтральным ацяпленнем. Вельмі слаба было забяспечана камунальнымі паслугамі насельніцтва вёсак. У дрэнным становішчы знаходзілася дарожная гаспадарка, дарогі з асфальтавым пакрыццём у сельскай мясцовасці былі рэдкай з'явай.

Да першачарговых задач пасляваеннага часу адносілася вырашэнне харчовай праблемы, забеспячэнне насельніцтва прамысловымі таварамі першага ўжытку. Таму асаблівая ўвага удзялялася аднаўленню галін прамысловасці, якія спецыялізаваліся на вырабу тавараў народнага спажывання. Да ліпеня 1945 г. пачалі працаваць 68 прадпрыемстваў харчовай прамысловасці з 405, што мелася да вайны. Іх вытворчая магутнасць дасягнула 39% даваеннага узроўню. У першую чаргу аднаўляліся хлебапякарні, малаказаводы, мясакамбінаты, якія выкарыстоўвалі мясцовыя рэсурсы сыравіны. Горшым было становішча у лёгкай прамысловасці, дзе нямногім прадпрыемствам адразу удалося распачаць вытворчасць прадукцыі. У 1945 г. супраць 1940 г. у рэспубліцы было выраблена толькі 5% скуранога абутку, 0,2 — льняных тканін, 4% — верхняга трыкатажу.

Рэзкае скарачэнне сельскагаспадарчай і прамысловай вытворчасці за гады вайны прымусіла ўвесці у рэспубліцы адразу пасля выгнання акупантаў нарміраванае размеркаванне важнейшых харчовых і прамысловых тавараў. Ва усіх гарадах і рабочых пасёлках насельніцтва забяспечвалася па картках хлебам і іншымі прадуктамі, самыя неабходныя прамысловыя тавары выдаваліся па спецыяльных талонах і ардэрах. Нарміраваная сістэма размеркавання прадуктаў і тавараў дазволіла у цяжкіх умовах ваеннага часу і першых пасляваенных гадоў больш-менш рацыянальна выкарыстаць наяўныя рэсурсы харчавання і прадметаў першай неабходнасці. Але устаноўленыя па картках нормы прадуктаў былі вельмі сціплымі, а высокія цэны на іх на калгасных рынках былі недаступныя для большай часткі насельніцтва. У выніку шмат гаражан вялі паўгалоднае існаванне, адчувалі вострую патрэбу у самых неабходных прадуктах харчавання. Каб змякчыць харчовую праблему, у рэспубліцы рабіліся канкрэтныя захады па развіццю калектыўнага і індывідуальнага агародніцтва, якое садзейнічала лепшаму забеспячэнню гарадскога насельніцтва бульбай і гародніной. У 1948 г., напрыклад, агароды мелі 360 тыс. сем'яў рабочых і служачых,

плошча іх пасеваў, пераважна бульбай, склала звыш 50 тыс. га.

Значную матэрыяльную дапамогу насельніцтву Беларусі у той час аказалі урад СССР і народы Савецкага Саюза. У рэспубліку завозіліся мука і крупы, жиры, цукар, соль, кандытарскія вырабы, а таксама адзенне, абутак, бялізна, тканіна, лякарствы. Усяго за першыя гады пасля вызвалення рэспубліка атрымала з саюзных рэсурсаў звыш 1406 тыс. пудоў прадуктаў харчавання, 4 млн. прадметаў адзення, 300 тыс. пар абутку і інш. З гэтых і іншых крыніц матэрыяльная дапамога у першую чаргу аказвалася дзецям сіротам, інвалідам Вялікай Айчыннай вайны, сям'ям ваеннаслужачых і партызан.

У снежні 1947 г. была адменена картачная сістэма і нарміраванае размеркаванне прадуктаў замянялася разгорнутым дзяржаўным і кааператыўным гандлем па зніжаных цэнах на асноўныя харчовыя прадукты. Адначасова была праведзена грашовая рэформа, што дазволіла у значнай ступені стабілізаваць фінансавае становішча краіны. У выніку пакупная здольнасць рубля узрасла у два разы, а рэальная зарплата больш чым удвая. Савецкі урад у наступныя гады працягваў палітыку зніжэння дзяржаўных рознічных цэн на прамысловыя і харчовыя таварыі. Павышалася заработная плата рабочих і служачых. Іх сярэднемесячны заробак у 1955 г. перасягнуў даваенны ўзровень у два разы, але у колькасных адносінах ён быў невысокім (59,1 руб.) і забяспечваў толькі самыя сціплыя патрэбы у пераважнай частцы працоўных. Але і з гэтага заробка дзяржава забірала значную частку у выглядзе падатку і іншых грашовых збораў (падатак на халасцякоў, адзінокіх і маласямейных грамадзян, штогадовы дзяржаўны пазыкі і інш.)

У разглядаемы перыяд некаторыя станоўчыя зрухі мелі месца у развіцці гандлю і грамадскага харчавання, сеткі бытавых паслуг. За 10 пасляваенных гадоў колькасць прадпрыемстваў рознічнага гандлю павялічилася у 2,5 раза, грамадскага харчавання — амаль утрая, умацоўваліся іх кадры і матэрыяльна-тэхнічная база. Фізічны аб'ем рознічнага і кааператыўнага гандлю перавысіў у 1955 г. даваенны паказчык на 78%. У параўненні з першымі пасляваеннымі гадамі на гандлёвых прылаўках павялічилася колькасць тавараў, стаў больш разнастайным іх асартымент. Але паранейшаму многія таварыі адсутнічалі, невысокай была іх якасць, нізкай заставалася культура абслугоўвання.

Асабліва цяжкімі былі умовы жыцця сялянства. На яго не рас-

паўсюджвалася сістэма нарміраванага размеркавання харчовых і прамысловых тавараў, адноўлялася на вёсцы сацыяльная сфера. Асноўнай крыніцай матэрыяльнага забеспячэння калгаснікаў была іх асабістая гаспадарка, але яе прадукцыйнасць была нізкай. Напачатак 1946 г. больш паловы двароў не мелі кароў і свіней. Мізэрнай была аплата працы у калгасах і саўгасах, грамадская гаспадарка якіх знаходзілася у стане глыбокага заняпаду. Напрыклад, у 1947 г. трэцяя частка калгасаў не выдавала збожжа на працадні, за асобнымі выключэннямі сярод вясковага насельніцтва панавала галеча, востра адчуваўся дэфіцыт харчовых прадуктаў, адзення і абутку. Становішча сялянства ускладнялася таксама высокімі падаткамі і рознымі абмежаваннямі дзяржавы, якія знясільвалі калгасы і асабістыя гаспадаркі калгаснікаў, работнікаў саўгасаў, прымушалі моладзь пакідаць вёску і ісці у горады.

Пэўны станоўчы уплыў на сацыяльнае становішча вёскі аказалі рашэнні верасневскага (1953 г.) Пленума ЦК КПСС, які ўскрыў сур'ёзныя недахопы у развіцці сельскай гаспадаркі і вызначыў шэраг мер па іх пераадоленню. У прыватнасці, былі зменшаны нормы абавязковых паставак з асабістых гаспадарак калгаснікаў, з калгасаў і сялян скасаваны нядоімкі мінулых гадоў па падатках і абавязковых паставах жывёлагадоўчай прадукцыі, павышаны нарыхтоўчыя і закупачныя цэны на сельгаспрадукцыю і г. д.

У пасляваенныя гады прымаліся меры па забеспячэнню насельніцтва неабходнай медыцынскай дапамогай. Хоць і марудна, але умацоўвалася сістэма аховы здароўя, яе установы асналчаліся новым медыцынскім абсталяваннем, папаўняліся кваліфікаванымі кадрамі. Расходы дзяржаўнага бюджэта БССР на ахову здароўя і фізкультуру узраслі з 28,9 млн. руб. у 1945 г. да 79,9 млн. руб. у 1955, або у 2,8 раза. Сетка бальнічных устаноў павялічылася у 1,5 раза, урачоў стала больш у 3, сярэдніх медыцынскіх работнікаў — у 2,3 раза. Але у цэлым органы аховы здароўя, калектывы лячэбных устаноў не забяспечвалі належнага узроўню медыцынскага абслугоўвання насельніцтва. Прычынай таму быў недахоп неабходных лякарстваў, дыягнастычнага абсталявання, шэрагу участковых бальніц, сельскіх амбулаторый вымушаны быў працаваць у малапрыстасаваных, арэндаваных памяшканнях.

Такім чынам, у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе матэрыяльнае становішча беларускага народа было цяжкім. Гэта звязвалася

з тым, што магчымасці дзяржавы былі абмежаванымі. Пераважная частка сродкаў накіроўвалася на аднаўленне народнай гаспадаркі. Таму на сацыяльнае развіццё, паляпшэнне добрабыту людзей спраўдзіўся астатковы прынцып фінансавання. Хаця у асноўным і быў дасягнуты даваенны узровень жыцця народа, але заставалася шмат складаных праблем у забеспячэнні насельніцтва жыллём, прадметамі шырокага ужытку, бытавымі паслугамі.

У пасляваенныя гады у Беларусі разгарнулася работа па аднаўленню у галіне культуры, якой фашысцкія захопнікі нанеслі непапраўны урон. Адразу пасля вызвалення рэспублікі пачалося будаўніцтва школьных памяшканняў, выраб школьнага абсталявання. З гэтай мэтай паўсюдна праводзіліся суботнікі, нядзельнікі, многія школьныя аб'екты узводзіліся за кошт калгасаў і прадпрыемстваў. Ужо у 1945/46 навучальным годзе працавалі 10 915 школ, з ахопам 1836,7 тыс. вучняў, у 1950/51 навучальным годзе колькасць школ павялічылася да 11 767, у якіх налічвалася 1 498,6 тыс. чалавек. У сувязі з ажыццяўленнем сямігадовай і пашырэннем сярэдняй адукацыі павялічвалася сетка сямігадовых і сярэдніх школ. Калі у 1945/46 навучальным годзе працавала 1641 сямігодка, то у 1950/51 навучальным годзе іх стала 2904. За гэтыя гады колькасць сярэдніх школ вырасла з 353 да 761.

У гады пасляваеннага разбурэння, калі патрабавалася напружанне ўсіх матэрыяльных і духоўных сіл, дзяржавай рабіліся новыя крокі па удасканаленню школьнай адукацыі. Быў ажыццёўлены пераход да навучання з сямігадовага узросту, уведзена абавязковая здача у IУ і УП класах экзаменаў, а у X класе — экзаменаў на атэстат сталасці. За поспехі для лепшых вучняў быў заснаваны залаты і сярэбраны медалі. Але з пасляваенных новаўвядзенняў не апраўдала сябе раздзельнае навучанне дзяўчынак і хлопчыкаў, якое пачало ажыццяўляцца у Мінску і абласных цэнтрах. Гэта не толькі не садзейнічала паляпшэнню выхаваўчага працэсу, але яшчэ больш ускладніла умовы работы школ, таму раздзельнае навучанне было адменена.

Да сярэдзіны 50-х гадоў у асноўным было завершана усеагульнае сямігадовае навучанне, пашыралася сярэдняя адукацыя. Але усе гэта рабілася ва умовах наступлення на беларускую нацыянальную школу, яе актыўнай русіфікацыі. Так, калі у Мінску у 1945/46 навучальным годзе з 28 школ 14 былі беларускамоўнымі, то ужо у

1952/53 навучальным годзе з 46 школ беларускіх налічвалася толькі 9. У гэты час у Брэсце з 14 школ толькі адна з'яўлялася беларускамоўнай, дзе і у ёй не быў зроблены набор у першы клас. Набірала моц і такая трывожная тэндэнцыя, як скарачэнне колькасці беларускамоўных школ у раёнах і нават у сельскай мясцовасці. У 1952/53 навучальным годзе, напрыклад, 29 раённых цэнтраў Заходняй Беларусі не мелі беларускіх школ.

Значная увага надавалася аднаўленню і развіццю сярэдняй спецыяльнай школы, якая павінна была забяспечыць гаспадарку і культуру Беларусі кадрамі сярэдняга звяна. Ужо у 1944/45 навучальным годзе аднавілі работу 66 тэхнікумаў і вучылішч, а праз год іх колькасць дасягнула 94. У 1955 г. у БССР налічваліся 128 сярэднія спецыяльныя установы. Нягледзячы на тое, што не удалося дасягнуць іх даваеннай колькасці (128), ужо у 1950 г. была перавышана даваенная колькасць навучэнцаў. За 1946—1955 гг. тэхнікумы і вучылішчы падрыхтавалі 89,2 тыс. спецыялістаў, што значна перавышала даваенны узровень. Калі у 1941 г. у БССР працавалі 59,8 тыс. работнікаў з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй, то у 1955 г. — 99,2 тыс.

Праводзілася праца па аднаўленню сістэмы вышэйшай адукацыі. Ужо у 1944/45 навучальным годзе пачалі работу 22 вышэйшыя навучальныя установы з 25, якія былі да вайны. Наладжвалася падрыхтоўка па спецыяльнасцях, якіх не было раней. Так, у 1945 г. пачаў працаваць Беларускі тэатральны інстытут, які у 1953 г. перайменаваўся у тэатральна-мастацкі. У 1948 г. быў адкрыты Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў. У наступныя гады пачалася падрыхтоўка кадраў вышэйшай адукацыі неабходных для далейшага развіцця народнай гаспадаркі рэспублікі Быў адчынены Гродзенскі сельскагаспадарчы інстытут (1951), Беларускі інстытут інжынераў чыгуначнага транспарту у Гомелі (1953), Полацкі педагагічны інстытут (1958), Беларускі інстытут механізацыі і электрафікацыі сельскай гаспадаркі (1954).

Ніводзін ВНУ не мог даць выпускнікам неабходную падрыхтоўку для практычнай дзейнасці, таму што іх работа праходзіла у складаных умовах. Не хапала спецыяльнай і дапаможнай літаратуры, лабараторый, вучэбных аўдыторый. На ўзровень падрыхтоўкі спецыялістаў уплывала нездавальняючая забяспечанасць вышэйшай школы выкладчыцкімі кадрамі. У 1950/51 навучальным годзе з 1388 выкладчыкаў толькі 74 мелі ступень доктара навук, з іх 37 з'яўля-

ліся дактарамі медыцынскіх навук. Вучэбна-выхаваўчая работа набыла сапалітызаваны характар. Скарачалася вывучэнне нацыянальнай гісторыі і культуры. За пасляваеннае дзесяцігоддзе было цалкам згорнута выкладанне на беларускай мове. Тым не менш, за 1946--1955 гг. вышэйшая школа Беларусі падрыхтавала 47,5 тыс. спецыялістаў. Да сярэдзіны 1955 г. у розных галінах народнай гаспадаркі працавала 166,5 тыс. спецыялістаў супраць 87,6 тыс. да вайны, у тым ліку з вышэйшай адукацыяй адпаведна 67,2 і 27,7 тыс. чалавек.

Развівалася літаратура і мастацтва Беларусі. За 1946--1952 гг. у рэспубліцы было выдана 180 назваў твораў беларускіх пісьменнікаў агульным тыражом 1433 тыс. экземпляраў. Лепшыя з іх атрымалі прызнанне не толькі у рэспубліцы, але і за яе межамі. У сярэдзіне 50-х гадоў каля 80 кніг пісьменнікаў Беларусі былі выдадзены на мовах народаў СССР, пераведзены на польскую, венгерскую, кітайскую, балгарскую, чэшскую, нямецкую мовы.

Разгортвалі дзейнасць тэатральныя калектывы Беларусі, якія вярнуліся з эвакуацыі, ці аднаўлялі спыненую у сувязі з вайной работу. Ужо у 1945 г. у рэспубліцы працавалі 12 тэатраў. У першыя пасляваенныя гады у тэатральнай сферы разгарнулася кампанія за "чысціню" рэпертуара, пазбаўленне яго ад замежных твораў, якія на думку вышэйшага партыйнага кіраўніцтва давалі магчымасць для буржуазнага ўплыву на савецкага гледача, не адпавядалі задачам пасляваеннага выхавання працоўных. Нягледзячы на партыйны ўціск у 1950 г. тэатральныя калектывы ажыццявілі 59 новых спектакляў, што на 28 больш, чым у 1947 г. Усяго было дадзена 2669 пастановак супраць 1233 у 1947 г. Пашыраліся выезды тэатральных калектываў у калгасы, саўгасы, на прадпрыемствы. Калі у 1947 г. было зроблена 368 выездаў, то у 1950 -- 1187.

Аднаўленне навуковага патэнцыялу было адной з важнейшых задач сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі у пасляваенныя гады. У пачатку вайны частка навуковых устаноў рэспублікі эвакуіравалася у савецкі тыл, астатнія ж былі фактычна поўнасцю знішчаны у перыяд нямецка-фашысцкай акупацыі. Пасля вызвалення Беларусі за непрацяглы час была праведзена рээвакуацыя гэтых устаноў, адначасова аднаўлялася дзейнасць ліквідаваных у гады акупацыі навукова-даследчых інстытутаў і ВНУ. На канец 1945 г. ужо працавала 28 навуковых устаноў, а у 1955 г. іх налічвалася 76, што было значна больш, чым да вайны. У Мінск з эвакуацыі вярну-

лася Акадэмія навук БССР, у якой на першы час было 8 інстытутаў. Навукова-даследчая работа пачыналася на кафедрах 24 ВНУ. Але у першыя пасляваенныя гады навуковыя установы працавалі у цяжкіх умовах. Яны мелі слабую матэрыяльную і эксперыментальную базу, адчувалі вострую патрэбу у вытворчых плошчах, вопытным абсталяванні, высокакваліфікаваных кадрах. У час вайны загінулі матэрыялы многіх навуковых даследаванняў і іх даводзілася пачынаць нанава.

Вырашэнню кадравай праблемы спрыяла вяртанне у Беларусь з эвакуацыі шэрагу вядомых вучоных, у тым ліку удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны. У падрыхтоўцы маладых навукоўцаў важную ролю адыграла узнаўленне работы аспірантуры: колькасць аспірантаў павялічылася з 100 у 1945 г. да 583 у 1955 г. Толькі за гэты год аспірантуру закончыла 147 чалавек, з іх 65 у навуковых установах. На 1 кастрычніка 1955 г. колькасць навуковых работнікаў у рэспубліцы дасягнула 4,1 тыс. чалавек, што амаль у два разы перавысіла даваенны узровень. Сярод іх значна больш стала высокакваліфікаваных навуковых кадраў -- дактароў і кандыдатаў навук.

З кожным годам умацоўваўся кадравы патэнцыял, павялічваўся аб'ём навуковых даследаванняў Акадэміі навук БССР. На пачатак 50-х гадоў у яе склад уваходзілі 20 навуковых устаноў, 34 акадэмікі і 27 членаў-карэспандэнтаў АН БССР, налічвалася 500 супрацоўнікаў. Плённую навуковую работу вялі Ц. М. Годнеў, К. В. Горай, М. Ф. Ярмоленка, А. Р. Жэбрак, А. К. Кедрай-Зіхман, В. Ф. Купрэвіч, І. С. Лупіновіч, М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў і інш. Установы Акадэміі распрацоўвалі шэраг важных навуковых праблем, звязаных з эканамічным, сацыяльным і грамадска-палітычным жыццём рэспублікі. Так, было праведзена далейшае вывучэнне прыродных рэсурсаў рэспублікі, адкрыты новыя месцанараджэнні карысных выкапняў. Калектывам вучоных была падрыхтавана і выдадзена буйная абагульняючая праца аб торфяным фондзе Беларускай ССР, распрацаваны тэхналогія і метады механізацыі здабычы, сушкі і брыкетавання торфу. Вучоныя Акадэміі прыступілі да вырашэння буйных тэарэтычных і практычных праблем у галіне машынабудавання, распрацавалі канструкцыю магнітных дэфектаскопаў, удасканалілі тэхналогію электраіскравой апрацоўкі металаў і інш. Значныя навуковыя сілы былі сканцэнтраваны на даследаванні пытанняў біялагічнай і сельскагаспадарчай навукі. Але у

распрацоўцы актуальных праблем біялагічнага профілю мела месца сур'ёзнае адставанне. Не удзялялася належнай увагі вывучэнню буйных тэарэтычных праблем, у прыватнасці генетыкі, і у той жа час прапагандаваліся памылковыя ўказанні Т. Д. Лысенкі.

Шырокі круг праблем ахоплівала навуковая работа вышэйшых вучэбных устаноў рэспублікі. У Беларускім дзяржаўным універсітэце пачалася распрацоўка тэарэтычных пытанняў у галіне фізіка-матэматычных, біялагічных і грамадазнаўчых навук, вынікі некаторых даследаванняў былі апублікаваны на старонках друку. Канкрэтныя захады па ўмацаванню сувязі з вытворчасцю рабілі Беларуская сельскагаспадарчая акадэмія і палітэхнічны інстытут. Апошні толькі за 1949--1953 гг. па дагаворам творчага супрацоўніцтва аказаў дапамогу 257 прамысловым прадпрыемствам, будоўлям і ведамствам, закончыў і ўкараніў у вытворчасць 240 навукова-даследчых і інжынерна-тэхнічных работ, правёў звыш I тыс. тэхнічных экспертыз і кансультацый. Аднак пытанні ўкаранянння навуковых распрацовак у вытворчасць вырашаліся марудна і непасля-доўна.

У складаным становішчы знаходзіліся грамадскія навукі. За пасляваенны перыяд інстытуты грамадскага профілю АН БССР, кафедры ВНУ прыкметна пашырылі іх вывучэнне, але культ асобы Сталіна, дагматычны падыход да асвятлення жыцця народа адмоўна уплывалі на якасць даследаванняў.

Як бачна, за 1946--1955 гг. нягледзячы на цяжкасці, памылкі, няўдачы была адноўлена гаспадарка Беларусі і атрымау некаторае далейшае развіцце яе эканамічны, навукова-тэхнічны патэнцыял. У гэтым вялікая заслуга належыць тагачаснаму пакаленню рабочага класа, сялянства, інтэлігенцыі. К сярэдзіне 50-х гадоў крыху палепшылася матэрыяльнае становішча народа. Але на вялікі жаль значных змяненняў у яго жыцці не адбылося. Аставаліся значныя цяжкасці у забеспячэнні насельніцтва харчаваннем, жыллём, тавара-мі шырокага ўжытку, паслугамі. Вырашэнне гэтых пытанняў стрымлівалася нізкімі тэмпамі эканамічнага развіцця, бюракратычнымі адносінамі партыйных і дзяржаўных устаноў да правядзення сацыяльнай палітыкі.

Тэма 27. АД РЭФОРМ ДА КРЫЗІСУ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КАМАНДНАЙ СІСТЭМЫ.

Вучэбныя пытанні. 1. Палітычная адліга і адыход ад яе. 2. Зрухі і распаўсюджванне застойных з'яў у народнай гаспадарцы. 3. Сацыяльнае становішча працоўных: планы і рэчаіснасць. 4. Праблемы дэмаграфіі. 5. Супярэчлівасці культурнага жыцця. Узмацненне русіфікацыі.

Новы этап жыцця савецкага грамадства, які пачаўся з другой палавіны 50-х гадоў, быў складаным і супярэчлівым. З аднаго боку ён характарызаваўся адносным пацяпленнем палітычнага клімату, ажыўленнем грамадска-палітычнага і культурнага жыцця, з другога — новымі дэфармацыямі у эканоміцы, сацыяльна-палітычнай і духоўнай сферы. Пры гэтым захоўвалася ўсеўладдзе партыйна-дзяржаўнай бюракратыі.

XX з'езд КПСС, які адбыўся 14—25 лютага 1956 г., прыняў рашэнні, скіраваныя на паляпшэнне спраў у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, навуцы і культуры. 25 лютага на закрытым пасяджанні з'езда М. С. Хрушчоў прачытаў даклад "Аб культе асобы і яго выніках". Рашэнні з'езда азначалі радыкальны паварот у жыцці партыі і дзяржавы, стварылі магчымасці для ажыццяўлення значных сацыяльных і палітычных рэформ, выклікалі вялікі рэзананс у краіне і за мяжой.

Пасля з'езда на Беларусі пачалася рэабілітацыя ахвяр сталінскіх рэпрэсій, якая адыграла станоўчую ролю у грамадска-палітычным жыцці. З 1956 па 1962 гг. у рэспубліцы у грамадскіх адносінах было рэабілітавана 29 012 чалавек, а у партыйным парадку — каля 200. Застаўшыяся у жывых ахвяры сталінскага дыктатарскага рэжыму выходзілі на свабоду. У сустрэчах з людзьмі яны расказвалі праўду аб здзеках над зняволенымі у лагерах, турмах, спецпасяленнях. Двойчы у 1936—1944 і 1949—1956 гг. у турэмным і лагерным зняволенні знаходзіўся беларускі паэт С. П. Шушкевіч. Але несправядлівасць, цяжкі лес не зламалі вязня. Пасля вызвалення ён плённа працаваў у рэдакцыях газет, займаўся творчай дзейнасцю. Рашэнні XX з'езда КПСС спрыялі далейшаму развіццю ўнутрыпартыйнага жыцця, росту і ажыўленню дзейнасці Кампартыі Беларусі. Калі на 1 студзеня 1956 г. у КПБ налічвалася 145 тыс. камуністаў, то на 1 студзеня 1964 г. іх колькасць павялічылася да 292,2 тыс. Але засталіся ўсеўладдзе

партыйнага апарата і яго прывілеі — дадатковыя грашовыя выплаты, лепшае медыцынскае абслугоўванне, харчовыя пайкі, шырокае карыстанне персанальнымі службовымі аўтамабілямі і г. д. З ліпеня 1956г. па сакавік 1965 г. партыйную арганізацыю Беларусі узначальваў К. Т. Мазураў. Гэта быў буйны дзяржаўны і палітычны дзеяч, які нярэдка меў сваю пазіцыю і не ва ўсіх нововядзенных падтрымліваў М. С. Хрушчова, але ён быў асобай свайго часу.

У другой палове 50-х гадоў былі прыняты меры па далейшаму пашырэнню правоў саюзных рэспублік. Пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР, прынятай у маі 1956 г., у распараджэнне саюзных рэспублік перадаваліся многія прадпрыемствы і арганізацыі, якія раней непасрэдна падпарадкоўваліся саюзным міністэрствам. Толькі у 1956 г. у распараджэнне БССР было перадана 356 такіх прадпрыемстваў, у 1957 г. — больш 500. У выніку удзельная вага прадукцыі, выпушчанай прадпрыемствамі рэспубліканскага падпарадкавання, у агульным аб'ёме усёй прамысловай прадукцыі Беларусі, павялічылася з 67% у 1953 г. да 82% у 1956 г.

II сакавіка 1957 г. Вярхоўны Савет СССР прыняў закон, паводле якога рэспублікі самі маглі вырашаць пытанні абласнога і краявога адміністрацыйна-тэрытарыяльнага будаўніцтва. Пашыраліся заканадаўчыя правы саюзных рэспублік, у іх кампетэнцыю увайшло прыняцце грамадзянскага, крымінальнага і працэсуальнага кодэксаў. Але гэтыя меры па расшырэнню правоў і кампетэнцыі рэспублік не зрабілі глыбокага уплыву на іх рэальны эканамічны і палітычны суверэнітэт у складзе СССР.

XXI з'езд КПСС (студзень — люты 1959 г.), адарваўшыся ад жыццёвых рэалій, абвясціў аб уступленні краіны у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізму, а XXII з'езд (кастрычнік 1961 г.) прыняў праграму партыі, у якой змяшчалася шмат непрадуманых палажэнняў і прагнозаў. Прыкладам палітычнага пражэкцёрства з'яўлялася зробленая у праграме заява аб пабудове камунізму у СССР на працягу жыцця аднаго пакалення.

У сувязі з гэтым праводзіліся надуманыя кампаніі па фармальнаму прыцягненню працоўных да кіравання дзяржаўнымі справамі, узмацненню правапарадку (народныя дружыны, таварыскія суды і інш.). Рэальных спробаў зламаць загадна-адміністрацыйную сістэму не было. Якасна новыя задачы развіцця грамадства вырашаліся валюнтарыстскімі метадамі, з дапамогай старога палітычнага

і эканамічнага механізму.

Адміністраванне і перагібы усе больш праяўляліся у дзейнасці М. С. Хрушчова. Вялікая колькасць партыйна-дзяржаўных функцыянераў была незадаволена усялякімі рэарганізацыямі, што не давалі ім спакойнага жыцця. У вышэйшых сферах улады склалася змова з мэтай яго адхілення з палітычнай арэны. 14 кастрычніка 1964 г. адбыўся пленум ЦК КПСС, які вызваліў яго "па ўласнаму жаданню" ад абавязкаў першага сакратара ЦК КПСС і старшыні Савета Міністраў СССР. З палітычнай арэны сышоў неардынарны палітычны дзеяч. З адстаўкай М. С. Хрушчова завяршыўся перыяд рэформ другой паловы 50-х -- першай паловы 60-х гадоў.

У выніку закулісных манеўраў і кампрамісаў пленум абраў першым сакратаром ЦК КПСС Л. І. Брэжнева. Чалавек пасрэдных здольнасцей, ён пачаў сябе акружаць такімі ж людзьмі, якіх ведаў па сумеснай працы. Так быў пакладзены пачатак клановага кіраўніцтва партыяй і дзяржавай, які прынес у далейшым непапраўныя страты у развіцці грамадства. З узнаўленнем брэжнеўскай каманды быў узяты курс на рэабілітацыю Сталіна. Зроблення XXIII з'ездам КПСС (1966 г.) змены у статуце партыі здымалі палажэнне аб магчымасці выбрання адных асоб на кіруючыя пасады не больш трох тэрмінаў, якое зацвердзіў XXII з'езд. Замест гэтага з'явілася палажэнне аб абнаўленні і аналажэнні кіруючых кадраў. Гарантыя на бестэрміновае знаходжанне на кіруючых пасадах была адной з прычын, якая прыводзіла да пратэкцыянізму, карупцыі сярод часткі кіраўнікоў. Партыя умацоўвала сябе як вядучае звяно загадна-адміністрацыйнай сістэмы. Вянчала гэту палітыку замацаванне у 6 артыкуле Канстытуцыі СССР, прынятай у 1977 г. кіруючай ролі партыі у грамадстве.

Сур'ёзныя праліхі мелі месца у галіне тэарэтычнай думкі. У грамадскіх навуках пашыраўся дагматызм, стэрэатыпы, якія перашкаджалі творчаму пошуку. Афіцыйная прапаганда абыходзіла маўчаннем правалы у сацыяльнай сферы, штурмаўшчыну, нізкую якасць прадукцыі. Любая форма прызнання вострых супярэчнасцей і тым больш магчымасць паглыблення дэмакратыі разглядалася як замах на асновы сацыялізму, зланамернае адмаўленне яго гістарычных пераваг перад капіталізмам. Многія вядомыя навукоўцы, дзеячы мастацтва вымушаны былі пакінуць Радзіму, некаторыя трапілі у лагеры. У той жа час афіцыйная прапаганда усяляк узвышала асобу Л. І. Брэжнева, які па стану здароўя усе менш увагі удзяляў ды-

таннем кіравання партыяй і дзяржавай. Чым тоўсцей станавіліся справы, тым больш упанаванняў адцягвалася яму. За гэты час "Верны ленінец" чатыры разы ўвянчаў сябе залатымі зоркамі гэроя. За напісанне групай журналістаў "успамінаў" "Малая зямля", "Адраджэнне", "Цаліна" атрымаў Ленінскую прэмію. У апошнія гады жыцця Брэжнеў пазбавіўся ўсякай павагі у народа, але акружэнне ўсё рабіла для таго, каб працоўныць яго палітычнае жыццё.

Негатыўныя з'явы нарасталі у дзейнасці Кампартыі Беларусі. Зноў стаў вацвярджацца аўтарытарна-бюракратычны стыль узаемаадносін паміж апаратам і радавымі камуністамі. З улікам таго, што самую маленькую кіруючую пасаду мог заняць толькі член КПСС, у партыю часта пранікалі несумленныя, карыслалюбівыя людзі, якія імкнуліся мець выгоду ад партыйнага білета. Штучна завышалася доля рабочых у КПБ. Калі у 1965 г. сярод прынятых рабочыя саставлялі 40,9%, то у 1985 -- 57,8%. На I студзеня 1986 г. КПБ аб'ядноўвала 667 930 камуністаў, супраць 319 196 на I студзеня 1965 г.

У 1965--1980 гг. Кампартыю Беларусі узначальваў П. М. Машэраў. Ён вялікую працу для развіцця народнай гаспадаркі і культуры рэспублікі. Але і на яго аказваў уплыў час, у якім ён працаваў. Тое ж самае можна сказаць і пра Ц. Я. Кісялёва, які пасля гібелі П. М. Машэрава быў абраны першым сакратаром ЦК КПБ, а да гэтага на працягу амаль дваццаці гадоў узначальваў Савет Міністраў БССР.

Загадна-адміністрацыйная сістэма скоўвала ініцыятыву Саветаў, прафсаюзаў, камсамола, не спрыяла павышэнню прадукцыйнасці сумленнай працы. Усё больш заяўляла аб сабе тэндэнцыя "абязлічвання" грамадскай уласнасці, чым у значнай меры тлумачыліся абыякавасць, а нярэдка спажывецкія адносіны да яе, нерацыянальнае выкарыстанне матэрыяльных рэсурсаў, крадзёж народнага багацця, марнатраўства і бесгаспадарчасць.

Лепшыя сілы партыі і дзяржавы усе вастрэй адчувалі жыццёвую неабходнасць пераадолення негатыўных з'яў. Пачатак пошукам выхаду быў зроблены пасля лістападаўскага (1982 г.) пленума ЦК КПСС, які выбрау Ю. У. Андропава генеральным сакратаром ЦК КПСС. За кароткі час яго дзейнасці на гэтай пасадзе па-новаму быў пастаўлены мэтаг пышнаваў сацыяльна-эканамічнага развіцця, пераадолення негатыўных з'яў у жыцці грамадства. Пачалася барацьба з карупцыяй, за навядзенне парадку і дысцыпліны. Былі

у гэтай справе і перагібы, калі людзей праваралі на вуліцах, магазінах, кінатэатрах. Пасля смерці Ю. У. Андропава у лютым 1984 г. генеральным сакратаром ЦК КПСС быў абраны К. У. Чарненка, бліжэйшы паплечнік Брэжнева. Цяжка было прадугледзець на гэтай пасадзе больш неадпаведную фігуру. Але на яе зрабілі стаўку кансерватыўныя сілы. На другую ролю ў партыі выйшаў М. С. Гарбачоў. Яго час наступіў у канцы 1985 г. пасля смерці К. У. Чарненкі.

Такім чынам, грамадска-палітычнае жыццё Беларусі у другой палове 50 -- першай палове 80-х гадоў было неадназначным і супярэчлівым. Пасля XX з'езда КПСС пачаліся прагрэсіўныя працэсы, аднак з другой паловы 60-х гадоў становішча змянілася. У грамадскім жыцці сталі узмацняцца негатыўныя працэсы, звязаныя з ычэ больш цесным зрастаннем партыйнага і дзяржаўнага апарату. Распаўсюджваліся абыякавыя адносіны да працы, безініцыятыўнасць, сацыяльная апатыя. У гэтых умовах перад здаровымі сіламі грамадства паўстала задача пошуку выхаду са склаўшагося становішча.

Аднаўляцца народную гаспадарку працаўнікі Беларусі у другой палове 50-х гадоў дамагліся яе далейшага развіцця, асабліва у галіне прамысловасці. Прадпрыемствы больш сталі вырабляць электраэнергіі, металарэзных станкоў, аўтамабіляў і трактараў, сельскагаспадарчых машын, будаўнічых матэрыялаў, абутку, адзення, льняных тканін і іншай прадукцыі. У гэты час у рэспубліцы быў пакладзены пачатак стварэнню буйной хімічнай прамысловасці. Аднак у параўнанні з папярэднім пяцігоддзем тэмпы росту прамысловай вытворчасці і прадукцыйнасці працы знізіліся. Шмат якія прадпрыемствы працавалі нерытмічна, не спраўляліся з выкананнем даведзеных заданняў, слаба выкарыстоўвалі дасягненні навуковага прагрэсу і перадавы вопыт.

У грамадстве усе больш адчувалася неабходнасць эканамічных рэформ, якія ўнеслі б істотныя змены у гаспадарчае жыццё краіны, паскорылі тэмпы яе сацыяльна-эканамічнага развіцця, палепшылі умовы жыцця працоўных. Такія спробы мелі месца, але іх ажыццяўленне ішло у межах камандна-адміністрацыйнай сістэмы, у рамках старых поглядаў і падыходаў, якія ўжо не адпавядалі запатрабаванням часу. Не дала станоўчых вынікаў і была ліквідавана у 1965 г. саўнаргасаўская сістэма тэрытарыяльнага кіравання прамысловасцю. Адначасова былі адноўлены міністэрствы і іх колькасць няспынна павялічвалася.

У верасні 1965 г. было прынята рашэнне аб пачатку эканамічнай рэформы, ініцыятарам якой быў старшыня Савета Міністраў СССР А. М. Касыгін. 2 кастрычніка гэтага года Вярхоўны Савет СССР прыняў закон "Аб змяненні сістэмы органаў кіравання прамысловасцю і неабходных некаторых іншых органаў дзяржаўнага кіравання", дзе гаварылася аб недахопах існуючай эканамічнай мадэлі і вызначаліся новыя шляхі гаспадарання. У пачатку ажыццяўлення рэформа падавала надзеі на змяненні да лепшага. Паскорыўся эканамічны рост СССР і рэспублік, у тым ліку Беларусі. Асабліва гэта праявілася у выніках восьмай пяцігодкі (1966--1970 гг.). За гэты час аб'ем прамысловай прадукцыі БССР павялічыўся амаль у 1,8 раза. Сярэднегадавыя тэмпы прыросту прамысловай прадукцыі склалі 12,4% супраць 10,4% у папярэднім пяцігодцы. Нарошчванне вытворчасці садзейнічала некаторае удасканаленне арганізацыі працы, сістэмы матэрыяльнага стымулявання, павышэнне творчай актыўнасці рабочых.

Аднак эканамічная рэформа не была завершана і у пачатку 70-х гадоў фактычна перастала дзейнічаць. Асноўнай прычынай не нядбала была існуючая, як і раней, практыка звышцэнтралізаванага кіравання, адсутнасць самастойнасці прадпрыемстваў, планаванне дасягнікіх паказчыкаў, вынікам чаго была незацікаўленасць вытворцаў у паскарэнні навукова-тэхнічнага прагрэсу, фармальнае выкананне і перавыкананне планаў многімі прадпрыемствамі і галінамі.

У 70-х — пачатку 80-х гадоў працягвалася нарошчванне матэрыяльна-тэхнічнай базы прамысловасці, адбыліся змены ва галіновай структуры і спецыялізацыі, павышалася канцэнтрацыя вытворчасці. За 1971--1985 гг. у рэспубліцы на развіццё прамысловасці было выкарыстана звыш 28,5 млрд. рублёў капіталаўкладанняў, або у тры разы больш у параўнанні з папярэднімі пятнаццаць гадамі. Штогод павялічваліся выпуск прадукцыі мінскія аўтамабільны і трактарны заводы-флагманы беларускай індустрыі. У пачатку 50-х гадоў трактарны завод асвоіў серыйную вытворчасць універсальных прапашных трактараў "Беларусь", якія у далейшым усё больш удасканальваліся і набылі шырокую вядомасць не толькі у рэспубліках СССР, але і многіх замежных краінах. У 1985 г. завод дасягнуў гадавой вытворчасці у 96 тыс. трактараў. Масавы выпуск буйнагрузных аўтамабіляў, аўтацягачоў і аўтасамазвалаў наладзіў камбінат у Жодзіне (1975 г.— 25,4 тыс.).

Далейшаму нарошчванню прамысловага патэнцыяла рэспублікі асабліва садзейнічала увядзенне у строй мэрагу новых фабрык і заводаў, а таксама рэканструкцыя і палепшэнне дзейнічаўшых прадпрыемстваў. За тры дзесяцігоддзі (1956--1985) было пабудавана і уведзона у дзеянне 511 новых дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў. У асноўным гэта былі буйныя і сярэднія прадпрыемствы, аснашчаныя перадавой тэхнікай і спецыялізаваныя на выпуску прадукцыі машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай, лёгкай, харчовай прамысловасці. Сярод іх найбольш буйнымі былі Лукомская ГЭС, калійныя камбінаты у Салігорску, Навапалацкі і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы, мінскія заводы электронных вылічальных машын, халадзільнікаў, маторны, завод аўтаматычных ліній у Баранавічах, Брэсцкі электралямпавы, заводы сельскагаспадарчага машынабудавання у Бабруйску і Лідзе, Бабруйскі шынны камбінат, Магілёўскі камбінат сінтэтычнага валакна, Барысаўскі бавоўняны камбінат і іншыя.

У гэты перыяд на прадпрыемствах Беларусі праводзілася шмат мэрапрыемстваў, накіраваных на развіццё сацыялістычнага спаборніцтва, якое лічылася важнейшым сродкам узняцця працоўнай актыўнасці рабочых і служачых. Аднак у арганізацыі спаборніцтва мелі месца сур'ёзныя недахопы, праяўляўся фармалізм, дагматызм, заарганізаванасць. Як паказала далейшае жыццё, ідэя сацыялістычнага спаборніцтва сябе не апраўдала.

І усё ж напружаная праца рабочага класа, як і ўсіх працоўных Беларусі, давала станоўчыя вынікі. У 1985 г. супраць 1960 г. агульны аб'ём прамысловай прадукцыі павялічыўся амаль у 8,9 раза і у 28 разоў перасягнуў даваенны узровень. Найбольш хуткае нарошчванне вытворчасці машынабудаванне, прадпрыемствы паліўна-энергетычнага комплексу, а таксама хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Развіццё апошняй азначала стварэнне у рэспубліцы па-сутнасці новай буйной галіны індустрыі. У 1963 г. пачаў працаваць Навапалацкі, а затым і Мазырскі нафтаперапрацоўчыя заводы, забяспечаныя рэгулярнымі пастаўкамі справінай[3] нафты, сталі вырабляць больш за 50 відаў нафтапрадуктаў, у тым ліку мазута, бензіна, дызельнага паліва, змазачных матэрыялаў і інш. Калі першы гэтай прадукцыі вывозілася у іншыя рэспублікі, а таксама за мяжу. У 1965 г. пачалася прамысловая распрацоўка перакага на Беларусі Рэчыцкага радовішча нафты. За дзесяць гадоў было здабыта 45,8 мільёна тон нафты, у тым ліку 8 мільёнаў у 1975 г.

але у наступныя гады не здабыча пачала скарачацца.

Ва умовах адзінай дзяржавы прамысловасць і уся эканоміка Беларусі ажыццяўляла цесныя і шматбаковыя эканамічныя сувязі з іншымі рэгіёнамі краіны, якія станоўча уплывалі на развіццё і умацаванне індустрыяльнага патэнцыяла Беларусі. З Расіі, другіх рэгіёнаў яна атрымлівала розныя віды машын, дэталяў і вузлоў, прамысловага абсталявання, а таксама сталь, чугун, каштоўныя металы і многае іншае. Асабліва у вялікай залежнасці знаходзілася Беларусь ад паставак энерганосьбітаў -- нафты, вугалю, газу. Са свайго боку Беларусь пасылала за межы рэспублікі д 80% сваёй прамысловай прадукцыі, у тым ліку грузавыя аутамабілі і трактары, станкі і аутаматычныя лініі, маторы і падшыпнікі, сельскагаспадарчыя, дарожныя і меліярацыйныя машыны, будаўнічыя матэрыялы. Беларусь унесла значны уклад у асваенне прыродных багаццяў Сібіры і Далекага Усходу. Яе пасланцы удзельнічалі у будаўніцтве БАМа, распрацоўцы радовішчаў нафты і газу у заходнесібірскім рэгіёне, узводзілі аб'екты прамысловага і сацыльна-культурнага прызначэння ва ўсіх рэгіёнах краіны.

Поспехі беларускай індустрыі дазволілі рэспубліцы заняць вядучае месца у агульнадзяржаўнай вытворчасці па выпуску важных відаў прамысловай прадукцыі. У 1976 г. яе удзельная вага па вытворчасці мінеральных угнаенняў склала 12,4%, у тым ліку калійных -- 42,8, хімічных валокнаў і нітак -- 15,7, металарэзных станкоў -- 14,1, трактараў -- 15,4, падшыпнікаў -- 13,9, наручных гадзіннікаў -- 12,6, тэлевізараў -- 7,6, матацыклаў -- 22,3%.

Разам з тым не былі зроблены належныя захады для паскарэння тэмпаў развіцця галін прамысловасці, якія выраблялі тавары народнага спажывання. Пераважная ўвага удзялялася прадпрыемствам, якія уваходзілі у склад ваенна-прамысловага комплекса. Адмоўнай з'явай у развіцці прамысловасці была адсутнасць належнай увагі да пытанняў экалогіі, аховы навакольнага асяроддзя, што нярэдка лічылася другараднай справай.

Існуючы гаспадарчы механізм мела спрыяў стварэнню умоў для зацікаўленасці людзей у павышэнні высокаэфектыўнай працы, развіцці іх творчай актыўнасці і ініцыятывы. Слаба выкарыстоўваліся рэзервы вытворчасці, частымі з'явамі былі бязгаспадарчасць, парушэнні працоўнай і тэхналагічнай дысцыпліны. За кошт навукова-тэхнічных мерапрыемстваў забяспечвалася толькі палавіна прыросту прадукцыйнасці працы. Усе гэта прывяло да таго, што сярэдне-

гадавы тэмп прыросту прамысловай прадукцыі у 1981—1985 гг. супраць 1961—1965 гг. панізіліся амаль удвая. Марудна паляпшалася якасць прадукцыі. Ежэйшую яе катэгорыю выпускала толькі трэць прадпрыемстваў. З асвоеных у першай палове 80-х гадоў новых вырабаў толькі 12% былі атэставаны на знак якасці, а ён раздаваўся даволі шчодра.

Шмат нявыкарыстаных магчымасцяў і рэзерваў мелася у тэхнічнай творчасці рабочых і спецыялістаў, дзейнасці вынаходнікаў і рацыяналізатараў, хаця ўдзельнікі гэтага руху настойліва і з поўным поспехам змагаліся за павышэнне прадукцыйнасці працы, паляпшэнне якасці прадукцыі, эканомію сыравіны і матэрыялаў. Актыўныя творчыя пошукі былі насычаны працоўнай доблесцю Герояў Сацыялістычнай працы М. Я. Баркуна, Дз. І. Барашкіна, Е. С. Белавусавай, А. Ф. Віташкевіча, І. Р. Калабука, Р. Ч.Кезловай, П. Дз. Клімкова, Я. І. Клімчанкі, заслужаных рацыяналізатараў БССР П. А. Журава, І. Д. Забарчыка, Л. І. Патаповіча, А. А. Усава і многіх іншых. За 1971—1980 гг. у прамысловасці рэспублікі было выкарыстана 792,2 тыс. вынаходніцтваў і рацыяналізатарскіх прапаноў, эканамічны эфект ад іх у разліку на год складаў 483,7 млн. руб.

У эканамічным і сацыяльным развіцці Беларусі узрасла роля транспарту. У цэлым нямала рабілася для яго развіцця і тэхнічнага пераўзбраення. Так, на Беларускай чыгунцы быў завершаны пераход руху на цеплавозную цягу, некалькі участкаў былі электрыфікаваны, працягвалася ўкараненне сродкаў аўтаматыкі і тэлемеханікі. Умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база аўтамабільнага, рачнога і паветранага транспарту. У выніку з 1960 па 1985 гг. грузаабарот усіх відаў транспарту павялічыўся амаль у тры, а пасажыраперавозкі — у шэсць разоў. Першае месца у агульным грузаабароце трывала займала чыгунка.

Аднак транспарт цалкам не задавальняў патрэбы гаспадаркі і насельніцтва у перавозках. На ім мелі месца зрывы графіка руху паяздоў, дапускаліся вялікія прастоі рухомага саставу пад пагрузачна-разгрузачнымі аперацыямі, парожнія прабегі, марудна паляпшалася работа лакаматыўнага парку. Слаба вырашаліся пытанні умацавання, мадэрнізацыі і рэканструкцыі матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Становішча сельскай гаспадаркі Беларусі у сярэдзіне 50-х гадоў заставалася складаным. Створаны адміністрацыйна-каманд-

най сістэмы калгасна-саўгасны лад не забяспечваў належных умоў для хуткага развіцця аграрнай вытворчасці. Нізкай была прадукцыйнасць працы, сельская гаспадарка па асноўных паказчыках яшчэ значна адставала ад дасягнутага ўзроўню. Пачынае станоўчае значэнне у паляпшэнні работы аграрнага сектара адыгралі рашэнні верасневскага (1953 г.) пленума ЦК КПСС. Так, валавы збор зерневых культур у 1960 г. павялічыўся ва усіх катэгорыях гаспадарак БССР супраць 1953 г. больш чым на 47%, а колькасць буйной рагатай жывёлы -- на 33%. Аднавіўшы разбураную вайной гаспадарку, некаторы калгасы і саўгасы забяспечвалі яе далейшае умацаванне, дабіваліся добрых паказчыкаў у развіцці раслінаводства і жывёлагадоўлі.

У развіцці сельскай гаспадаркі немалую ролю адыгрывалі машынна-трактарныя станцыі. Але пасля таго, як былі дасягнуты пэўныя поспехі ва умацаванні калгасаў, іх тэхнічнае абслугоўванне з боку МТС пачало адставаць ад прад'яўляемых запатрабаванняў. Да таго ж існаванне на зямлі аднра саўгасаў двух гаспадароў -- калгасаў і МТС параджала абязлічку і безадказнасць, стварала ненармальныя умовы для выкарыстання тэхнікі і зямлі. Улічваючы гэта, сесія Вярхоўнага Савета СССР (сакавік 1958 г.) прыняла рашэнне аб рэарганізацыі машынна-трактарных станцый. У адпаведнасці з ім да канца 1958 г. у рэспубліцы замест МТС было створана 156 рамонтна-тэхнічных станцый і 80 іх аддзяленняў. Значную колькасць тэхнікі, што належала МТС, набылі калгасы. Гэта умацавала матэрыяльна-тэхнічную базу гаспадарак, стварыла лепшыя умовы для паляпшэння іх вытворчай дзейнасці. Адначасова частка выдаткаў калгасаў на набыцце тэхнікі была кампенсавана дзяржавай. З калгасаў спісвалася уся запазычанасць мінулых гадоў за работы МТС і спецыялізаваных станцый.

Спробай выпрацаваць эфектыўную аграрную палітыку з'явіліся рашэнні сакавіцкага (1965 г.) Пленума ЦК КПСС. Яны прадугледжвалі павелічэнне капіталаўкладанняў у сельскагаспадарчую вытворчасць, паставак тэхнікі калгасам і саўгасам, павышэнне закупачных цэн на сельгаспрадукцыю, больш хуткае вырашэнне сацыяльных праблем вёскі. Гэтыя меры некалькі аднавілі гаспадарчую дзейнасць і сацыяльнае развіццё вёскі, зрабілі станоўчы уплыў на харчовае забеспячэнне насельніцтва. Найбольш прыкметна гэта праявілася у другой палове 60-х гадоў. Разам з тым, шмат з таго, што задумвалася і планавалася не было рэалізавана, засталося на паперы. Новыя падыходы гаспадарання часта не ўспрымаліся

у старую сістэму кіраўніцтва сельскай гаспадаркай. Урэшце рэшт кансерватызм партыйна-дзяржаўных структур узяў верх над прыхільнікамі рэформ. Таму працягвалася адміністрацыйнае, часта некампетэнтнае умяшанне у справы калгасаў і саўгасаў, асабліва шкодным было неапраўданае абмежаванне іх правоў у гаспадарчай дзейнасці.

У 70-х -- пачатку 80-х гадоў сельская гаспадарка СССР, у тым ліку і Беларусі, развівалася на экстэнсіўнай аснове, запаволь-валіся тэмпы прыросту прадукцыі асноўных галін вытворчасці -- раслінаводства і жывелагадоўлі. Не прынеслі жаданых вынікаў і даволі значныя фінансавыя сродкі, якія дзяржава выдаткоўвала на патрэбы агрэпрамысловага комплексу. У рэспубліцы ва ўказаны перыяд толькі капіталаўкладанні у сельскую гаспадарку па аб'ектах вытворчага прызначэння склалі амаль 18 млрд. рублёў.

Гэта дазволіла калгасам і саўгасам дадаткова набыць значную колькасць тэхнікі, павысіць узровень механізацыі працы. У сельскай гаспадарцы рэспублікі на канец 1985 г. налічвалася 87,8 тыс. грузавых аўтамабіляў, 131,2 тыс. трактараў, 34,9 тыс. зернеуборачных камбайнаў. Яе энергетычная магутнасць у параўнанні з 1960 г. узрасла у 6,7 раза. Аднак належнай аддачы ад іх усё ж не было. Узровень тэхнічнай аснашчанасці не адпавядаў задачам інтэнсіфікацыі сельскагаспадарчай вытворчасці і павышэння тэмпаў росту прадукцыйнасці працы. Найбольш слаба вырашаліся пытанні комплекснай механізацыі у жывёлагадоўлі, уборцы бульбы, агародніны.

Ажыццяўляліся меры па спецыялізацыі, меліярацыі і хімізацыі сельскай гаспадаркі. Плошча асушаных зямель у рэспубліцы дасягнула 2,5 мільёна гектараў. Аднак меліярацыя у шэрагу выпадкаў праводзілася некампетэнтна, не улічвала запатрабаванняў аховы навакольнага асяроддзя, што вяло да абвастрэння экалагічных праблем. Не заўсёды прадумана ажыццяўлялася і хімізацыя сельскагаспадарчай вытворчасці: у імкненні мець больш валавы збор прадукцыі знікалася яе якасць. Яна утрымлівала шмат нітратаў і іншых шкодных рэчываў для чалавека.

Праўда, асобныя калгасы і саўгасы Беларусі, дзякуючы працоўнай актыўнасці калектываў, умеламу выкарыстанню тэхнікі і дасягненняў навукі і у гэтых умовах паляпшалі паказчыкі вытворчай дзейнасці, атрымлівалі даволі устойлівыя ўраджаі сельскагаспадарчых культур, павышалі прадукцыйнасць жывелагадоўлі. У рэс-

публіцы і за яе межамі добра вядомымі сталі дасягненні калгасаў "Рассвет" Кіраўскага раена, "Аснежыцкі" Пінскага і "Савецкая Беларусь" Камянецкага раенаў, старшынямі якіх з'яўляліся Героі Сацыялістычнай працы В. К. Старавойтаў, У. А. Ралько, У. Л. Бядуля. У 1983 г. 49 калгасаў і саўгасаў атрымалі ўраджай збожжавых звыш 35 ц з аднаго гектара. У першай палове 80-х гадоў сярэднегадавы збор зернявых культур дасягнуў у Беларусі 21,5 ц, бульбы — 154 ц з аднаго гектара. Высокапрадуктыўная жывелагадоўля забяспечвалася у саўгасах-камбінатах "Мір" Баранавіцкага раена, "Лучаса" Віцебскага, імя 60-годдзя БССР Барысаўскага, калгасах імя Чырвонай Арміі Віцебскага, "Перамога" Гомельскага раенаў ды іншых гаспадарак.

У цэлым на забяспечыць стабілізацыю аграрнапрамысловага комплексу і тым больш яго дынамічнае, устойлівае развіццё не удалося. За 1965—1985 гг. аб'ем валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі БССР узрос толькі у 1,6 раза, што не забяспечвала належнага узроўню патрэб насельніцтва у прадуктах харчавання, а прамысловасці у сыравіне. Звыш чвэрці прадукцыі страчвалася у выніку безгаспадарчасці і неарганізаванасці у перыяд уборкі ураджаю, яго транспартыроўкі і захоўвання. Эканамічнае становішча калгасаў і саўгасаў цярпела з-за неэквівалентнага абмену паміж горадам і вескай. Падаражанне сельскагаспадарчай тэхнікі, значны разрыў паміж закупачнымі і рознічнымі цэнамі на сельгаспрадукцыю, "рабаўніцтва" з боку дзесяткаў абслугоўваючых арганізацый прывялі да таго, што многія гаспадаркі аказаліся стратнымі, мелі вялікую крэдытную запазычанасць.

Вынікі эканамічнага развіцця БССР у другой палове 50-х — першай палове 80-х гадоў сводчаць, што працоўныя рэспублікі прыкладалі няма[illegible] намаганняў, каб палепшыць становішча гаспадаркі, павысіць эфектыўнасць вытворчасці, увесці у дзеянне нявыкарыстаныя рэзервы і магчымасці. Пэўныя станоўчыя зрухі былі дасягнуты. Дзякуючы пабудове новых прадпрыемстваў, рэканструкцыі шэрагу заводаў і фабрык умацоўваўся прамысловы патэнцыял рэспублікі. Далейшае развіццё атрымалі будаўнічы комплекс, транспарт. У цэлым нарошчвалася вытворчасць сельскагаспадарчай прадукцыі. Аднак становішча гаспадаркі заставалася супярэчлівым. Тэмпы яе росту запавольваліся, узмацняліся крызісныя з'явы. Існуючая сацыяльна-эканамічная адносіны, камандна-адміністрацыйная сістэма скоўвалі творчыя сілы народа, прыводзілі да за-

тарможанасці і застою у развіцці прадукцыйных сіл грамадства.

Узровень матэрыяльнага дабрабыту беларускага народа залежыў у першую чаргу ад развіцця грамадскай вытворчасці, роста нацыянальнага даходу. Афіцыйная статыстыка сведчыць, што у 1985 г. супраць 1970 г. аптовыя павялічыліся у 2,5 раза, а рэальныя даходы на душу насельніцтва -- у 1,7 раза. Ажыццяўляліся меры, скіраваныя на павышэнне заработнай платы рабочых і служачых у адпаведнасці з зменамі ў характары іх працы, кваліфікацыйнага ўзроўню кадраў. Так, у 1972--1975 гг. была уведзена новая сістэма ставак і акладаў ва усіх галінах матэрыяльнай вытворчасці, у выніку чаго узрасла зарплата прыкладна у 2,4 млн. работнікаў. У 1979 г. завяршылася павышэнне ставак і акладаў работнікаў галін сферы матэрыяльнай вытворчасці, што дазволіла яшчэ узняць заробак больш чым у 1 млн. рабочых і служачых рэспублікі. Павышалася заработная плата і у работнікаў іншых галін народнай гаспадаркі. Па данным за 1980 г. яна складала у сярэднім па рэспубліцы у рабочых і служачых 149,9 руб., у калгаснікаў -- 92 руб. Нельга аднак не адзначыць, што нават пры адносна невысокіх цэнах на тавары і паслугі, што існавалі у той час, гэта быў вельмі сціплы заробак, а у вялікай колькасці насельніцтва ён быў яшчэ ніжэйшы.

Пэўную ролю у павелічэнні даходаў прапоўных адыгрывалі грамадскія фонды спажывання. Яны ўключалі сродкі на утрыманне сферы бязвыплатнага і льготнага абслугоўвання насельніцтва, а таксама выплаты стыпендый навучэнцам, пенсій і дапамог. У 1985 г. гэтыя фонды складалі звыш 5 млрд. руб., з іх больш 40% прыпадала на сацыяльнае забеспячэнне і страхаванне. Супраць 1970 г. аб'ем фондаў павялічыўся у 2,4 раза, але удзельная вага выдаткаў на такія важныя патрэбы, як ахова здароўя і фізічная культура, санаторна-курортнае абслугоўванне, стыпендыі была невялікай.

Адказныя задачы стаялі перад гандлевай сеткай Беларусі, якая на канец 1980 г. налічвала 24,6 тыс. магазінаў і палаткаў, працавала 11,3 тыс. прадпрыемстваў грамадскага харчавання. За 10 папярэдніх гадоў розничны тавараабарот павялічыўся больш чым у 1,8 раза, умацоўвалася матэрыяльна-тэхнічная база гандлевых прадпрыемстваў, пашыралася іх спецыялізацыя. Насычэнню таварнага рынку спрыяла пэўнае павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання, паляпшэнне іх асартыментнай структуры. За вышэйказанае дзесяцігоддзе душавое спажыванне харчовых тавараў насельніцтвам Бе-

ларусі ўзрасло у 1,8 раза, нехарчовых -- амаль удвая. Павялічылася колькасць і разнастайнасць бытавых паслуг, што аказваліся жыхарам гарадоў і вёсак.

Разам з тым у гандлёвым абслугоўванні насельніцтва было шмат праблем і цяжкасцей, з канца 80-х гадоў пачалі запавольвацца тэмпы прыросту тавараабароту. Нярэдка мелі месца выпадкі парушэння прадпрыемствамі дагавораў аб пастаўцы тавараў у гандлёвую сетку, продажу іх па завышаных рознічных цэнах, узнікла праблема "вигаднай" і "нявыгаднай" прадукцыі. Па шэрагу відаў тавараў узнік дэфіцыт, востра стаяла праблема іх якасці.

Да ліку першачарговых сацыяльных задач разглядаемага перыяду адносілася вырашэнне жыллёвай праблемы, паляпшэнне камунальна-бытавога абслугоўвання насельніцтва. Трэба сказаць, што гэтым пытанням у рэспубліцы удзялялася нямала увагі, прымаліся адпаведныя пастановы партыйных і дзяржаўных органаў, хаця не заўседы быў наладжаны дзейсны кантроль за іх выкананнем і намечаныя мерапрыемствы нярэдка заставаліся не рэалізаванымі. Дзяржаўныя сродкі, што выдаткаваліся на будаўніцтва жылля у шэрагу выпадкаў распыляліся, поўнасю не асвойваліся, парушаліся нарматыўныя тэрміны ўзвядзення аб'ектаў сацыяльнага прызначэння. У гарадах, дзе хутка павялічвалася колькасць насельніцтва, практычна не змяншаліся чэргі на атрыманне жылля. Яшчэ цяжэй жыллёвая праблема вырашалася на вёсцы. Слабая эканоміка у большасці калгасаў і саўгасаў, адсутнасць значных сродкаў у насельніцтва не давала ім магчымасці для шырокага развіцця сацыяльнай сферы. А выдзяленыя сельскай гаспадарцы дзяржаўныя сродкі выкарыстоўваліся пераважна на ўзвядзенне вытворчых аб'ектаў.

Разам з тым жыллёвым будаўніцтве, развіцці камунальнай гаспадаркі мелі месца і значныя станоўчыя зрухі. За тры дзесяцігоддзі (1956--1985) было пабудавана 2866,6 тыс. кватэр, з якіх больш за 60% прыпадала на дзяржаўныя і кааператыўныя прадпрыемствы, астатнія ўзяло насельніцтва і калгасы. За гэты час звыш 11 млн. чалавек атрымалі жылую плошчу ці пабудавалі сабе уласныя кватэры. У шэрагу гарадоў Беларусі узніклі новыя добраўпарадкаваныя масівы жылля (мікрараёны). Ажыццяўлялася комплекснае развіццё сацыяльнай сферы: колькасць газіфікаваных кватэр узрасла з 313,3 тыс. у 1965 г. да 2704,4 тыс. у 1985 г. Прыкметна павялічылася колькасць жылфонду, які быў аснашчаны вадаправодам, каналізацыяй, цэнтральным ацяпленнем, гарачым водазабеспячэн-

нем, ваннамі, аднак тут захоўвалася вялікае адставанне вескі ад горада. Насельніцтва лепш стала забяспечвацца сродкамі транспарту, бытавымі паслугамі, напрыклад, аб'ем апошніх узрос амаль у 8 разоў. У гэты ж перыяд далейшае развіцце атрымала сістэма аховы здароўя насельніцтва.

Была пашырана і у значнай ступені мадэрнізавана яе матэрыяльна-тэхнічная база: толькі за 1971--1985 гг. уведзена у дзеянне бальнічных устаноў на 37,5 тыс. ложкаў, пабудавана шмат паліклінік і іншых лячэбных устаноў, спартыўных збудаванняў. Ажыццяўлялася канцэнтрацыя і спецыялізацыя ва усёй сістэме аховы здароўя, будаваліся буйныя абласныя, раённыя, гарадскія і спецыялізаваныя лячэбныя установы, ліквідаваліся дробныя здраўпункты і бальніцы. Так, у Мінску былі пабудаваны і аснашчаны найноўшым абсталяваннем гарадская бальніца, бальніца хуткай дапамогі, дзве дзіцячыя бальніцы, два радзільныя дамы. Ва усіх абласцях уведзены у дзеянне супрацьсухотныя дыспансеры, на усіх буйных прадпрыемствах створаны сучасныя медыцынскія санчасткі ды інш.

На канец 1985 г. медыцынскія паслугі насельніцтву Беларусі аказвалі 880 бальнічных устаноў, 1,4 тыс. бальніц і паліклінік, 678 жаночых кансультацыі, дзіцячыя паліклінікі і амбулаторыі. Калі на канец 1940 г. на 10 тыс. чалавек насельніцтва рэспублікі прыпадала 5,7 урачоў і 19,7 сярэдняга медыцынскага персаналу, то у 1985 г. -- адпаведна 37,3 і 108,4. Адначасова пашырылася сетка санаторыяў і устаноў адпачынку, іх колькасць павялічылася са 180 у 1970 г. да 392 у 1985 г. Кантынгент грамадзян, што адпачывалі і лячыліся у здраўніцах, узрос у пяць разоў. Разам з тым медыцынскае абслугоўванне насельніцтва, асабліва у сельскай мясцовасці, у якасных адносінах яшчэ не дасягнула належнага узроўню. Нярэдка лячэбныя установы слаба забяспечваліся сучасным медыцынскім абсталяваннем, марудна укаранялася новыя, больш эфектыўныя метады дыягностыкі і лячэння хворых.

Пасляваенны перыяд характарызаваўся істотнымі зменамі дэмаграфічнай сітуацыі у Беларусі, звязанай у першую чаргу з сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным развіццем рэспублікі. Пасля вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у БССР пачало узнаўляцца і паступова расці насельніцтва, пры гэтым даволі хутка павялічвалася колькасць гараджан і скарачалася жыхарства вёсак. Да сярэдзіны 50-х гадоў колькасць гарадскога на-

сельніцтва, нягледзячы на вялізныя яго страты у гады вайны і акупацыі, ужо перавысіла даваенны рубеж, склаўшы больш за 2 млн. чалавек. Хаця усіх жыхароў рэспублікі у той час налічвалася 7,9 млн. чалавек, або 85% даваеннага.

У наступныя гады насельніцтва Беларусі, хоць і марудна, але працягвала расці і у 1972 г. дасягнула даваеннага узроўню. Разам з тым захоўваліся высокія тэмпы яго урбанізацыі. Інтэнсіўнае развіццё прамысловасці выклікала масавую міграцыю вясковага насельніцтва у гарады, асабліва у Мінск, Гомель, Віцебск, Магілеў, Гродна, Брэст і інш. У 60—70-я гады узніклі і пачалі хутка расці новыя гарады: Светлагорск, Наваполацк, Жодзіна, Новалукомль, Белаазерск. Калі у 1939 г. Беларусь мела 15 гарадоў з насельніцтвам звыш 50 тыс. чалавек, то на 1 студзеня 1985 г. -- 20.

На пачатак 1986 г. агульная колькасць насельніцтва у рэспубліцы перавысіла 10 млн. чалавек, з якіх 63% складалі гараджане і 37% -- сяльчане. Колькасць гараджан супраць 1940 г. узрасла у тры разы, вясковых жыхароў стала менш амаль удвая. Рэзкае скарачэнне апошніх прывяло да рассяляньвання вескі, з'явілася адной з галоўных прычын адставання сельскай гаспадаркі.

Разам з развіццём народнай гаспадаркі і культуры адбыўся колькасны і якасны рост працоўных рэсурсаў БССР: у 1985 г. сярэднегадавая колькасць рабочых, служачых і калгаснікаў перавысіла 5 млн. чалавек. Супраць 1940 г. іх стала больш у 2,2 раза. Удзельная вага жанчын сярод рабочых і служачых узрасла з 40 да 53%. Самымі буйнымі прафесійнымі атрадамі працоўных былі работнікі прамысловасці і будаўніцтва (39,3%), сельскай і лясной гаспадаркі (23,6), аховы здароўя, фізкультуры і сацыяльнага забеспячэння, народнай адукацыі, культуры і мастацтва, навукі (15,5%) Навукова-тэхнічная рэвалюцыя выклікала сур'ёзныя змяненні ва умовах працы насельніцтва, палепшыўся яго прафесійна-кваліфікацыйны склад, больш высокім стаў агульнаадукацыйны і культурна-тэхнічны узровень працоўных.

На тэрыторыі Беларусі пражывала больш за 80 нацый і народнасцяў. Згодна перапісу 1979 г. на карэнную нацыю -- беларусаў прыпадала 89% агульнай колькасці насельніцтва, другое месца належала рускім. Аднак за пасляваенныя гады удзельная вага беларусаў зменшылася. Па тым жа даным 1,9 млн. беларусаў жыло у іншых рэспубліках СССР.

Неспрыяльныя ўмовы працы і дабрабыту насельніцтва адмоўна адбіваліся на стане здароўя насельніцтва, працягласці яго жыцця, натуральным прыросце. Калі у 1960 г. гэты прырост (на 1000 чалавек) складаў 17,8 чалавек, то у 1970 г. — 8,6, у 1975 г.— 7,1, у 1980 г. — 6,1, у 1985 г. — 5,9. Усе гэта сведчыла аб тым, што дэмаграфічная сітуацыя у рэспубліцы заставалася складанай і супярэчлівай, патрабавала шмат намаганняў у вырашэнні важных праблем жыццядзейнасці беларускага народа.

З сярэдзіны 50-х гадоў пачаўся перыяд палітычнай "адлігі". Духоўнае жыццё у гэты час адлюстроўвала складаны і супярэчлівы працэс барацьбы двух тэндэнцый: дэмакратычнай, якая імкнулася да наступоўнага вызвалення усіх сферау жыцця ад скажэнняў сталінскай эпохі і кансерватыўнай, выражаўшайся у спробах зберагчы і пристасаваць старыя рычагі да новых рэалій грамадскай свядомасці. Актыўным правадніком ідэй аднаўлення грамадства з'яўлялася мастацкая культура, якая больш акрэслена, чым другія формы грамадскай свядомасці, асэнсоўвала прычыны і маштабы грамадска-палітычных і маральных дэфармацый эпохі культу асобы, шляхі дэмакратызацыі жыцця.

Актывізавалася літаратурнае жыццё Беларусі. Гэтаму спрыяла вяртанне у літаратурны працэс выпушчаных з сталінскіх засценкаў А. Александровіча, С. Грахоўскага, Ю. Гаўрука, Р. Бярозкіна, У. Дубоўкі, А. Звонака, А. Пальчэўскага, Я. Скрыгана, М. Хведаровіча, С. Шушкевіча і інш. Убачылі свет творы рэпрэсіраваных літаратараў Ц. Гартнага, С. Баранавых, П. Галавача, А. Дудара, В. Каваля, Б. Мікуліча, М. Чарота і іншых.

Крытычнае пераасэнсаванне вострых праблем гісторыі і сучаснасці прынесла з сабой новае пакаленне літаратараў. За 1959—1965 гг. у Саюз пісьменнікаў Беларусі было прынята 88 чалавек. У гэты перыяд заявіла аб сабе плеяда таленавітых імён — А. Адамовіча, В. Адамчыка, А. Асіпенкі, В. Быкава, Д. Бічэль-Загнетавай, Р. Барадуліна, Г. Бураўкіна, А. Вярцінскага, Н. Гілевіча, У. Дамашэвіча, В. Зуенка, У. Караткевіча, А. Кудраўца, П. Місько, І. Навуменкі, І. Пташнікава, Б. Сачанкі, М. Стральцова, І. Чыгрынава, многіх іншых. Першыя творы гэтых аўтараў знаходзілі мноства сваіх прыхільнікаў не толькі за высокі мастацкі узровень, але і за праўдзівасць, пастаноўку вострых і надзённых праблем. Творчасць беларускіх "шасцідзесятнікаў" з'явілася важ-

ным фактарам актывізацыі духоўнага жыцця грамадства, фарміравання яго самасвядомасці.

Значнай падзеяй у літаратурным жыцці з'явілася аднаўленне у 1956 г. Ленінскіх прэмій за найбольш выдатныя работы у галіне навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва. У 1962 г. ей быў адзначаны зборнік вершаў "А дні ідуць..." П. Броўкі. Гэтую узнагароду атрымалі у 1972 г. І. Мележ за раманы "Людзі на балоце" і "Подых навальніцы" з трылогіі "Палеская хроніка", у 1978 г. М. Танк (Я. І. Скурко) за зборнік вершаў "Нарачанскія сосны".

Па прапанове Саюза савецкіх пісьменнікаў і міністэрства культуры БССР у снежні 1957 г. былі устаноўлены дзве рэспубліканскія прэміі: імя Якуба Коласа за лепшыя творы прозы і літаратурнай крытыкі і і[illegible] Купалы за лепшыя творы паэзіі і драматургіі. У 1965 г. [illegible]адзены статус Дзяржаўных прэмій БССР у галіне літара[illegible]

Нягледзячы на некаторую дэмакратызацыю творчага жыцця, партыйны кантроль у сферы мастацтва заставаўся. Умяшанне ў літаратурны працэс з боку партыйных структур узмацнілася у пачатку 60-х гадоў. Аб гэтым сведчылі сустрэчы М. Хрушчова з творчай інтэлігенцыяй 17 снежня 1962 г. і 7--8 сакавіка 1963 г. Ен.зняважу А. Вазнясенскага, Я. Яўтушэнку, Э. Неізвеснага, М. Хуцыева, іншых прадстаўнікоў мастацкай інтэлігенцыі, якія стараліся адыйсці у сваёй творчасці ад догм і канонаў. Такая палітыка сведчыла аб тым, што палітычная "адліга" падыйшла да свайго завяршэння.

Сістэма "праработак" была характэрна і для дзейнасці ЦК КПБ. 19 сакавіка 1963 г. адбылася рэспубліканская нарада актыва творчай інтэлігенцыі, якая абмяркавала вынікі маскоўскай сустрэчы. На ей крытыкаваліся творы, у якіх намеціліся новыя падыходы да асмыслення грамадскіх працэсаў, узмацніўся рэалістычны паказ жыцця. Так, напрыклад, малады празаік І. Чыгрынаў папракаўся у прапаведаванні "варожай творы уседаравальнасці". У аповесці "Маці" ен паказаў, як жонка кулака і маці здрадніка -- паліцая старая Рэйдзіха прыйшла у веску, якую у свой час падпаліў яе муж, зацяты вораг калектывізацыі і людзі прынялі яе. Аутар спачувае пакутам жанчыны на магіле растралянага партызанамі сына, што ішло у разрэз з афіцыйнай прапагандай, не укладвалася у нормы "класавай" маралі.

Ідэалагічны дыктат у адносінах да творчай інтэлігенцыі з яш-

чэ большай сілай узмацніўся з прыходам да вышэйшай палітычнай улады у кастрычніку 1964 г. Л. Брэжнева. Асуджэнне валюнтарызму М. Хрушчова паклала забарону на пазітыўныя працэсы ў культуры, якія пачаліся пасля XX з'езда КПСС. Усе пазнейшыя, трэлікі мінулага новае кіраўніцтва звязвала з былой далучанай свабодай. Таму рэзка узмацніліся цэнзурныя абмежаванні, асабліва пасля прыняцця пастановы ЦК КПСС "Аб павышэнні адказнасці кіраўнікоў органаў друку, радыё, тэлебачання, кінематаграфіі, установ культуры і мастацтва за ідэйна-палітычны ўзровень публікуемых матэрыялаў і рэпертуара" (студзень 1969 г.). Меры па выкананні гэтай пастановы зацвердзіла у сакавіку 1969 г. бюро ЦК КПБ.

Прадстаўнікі літаратуры, якія выступалі супраць афіцыйнай лініі, за вызваленне творчасці ад партыйна-дзяржаўнага кантролю падвяргаліся ўціску, ганенням, жорсткаму кантролю з боку органаў КДБ. Пяглецзячы на гэта, былі дасягнуты значныя поспехі у развіцці літаратуры. У гэты час расквітнеў талент У. Караткевіча, у творах якога распрацоўвалася гісторыя беларускага народа. Вялікую цікавасць у чытача выклікалі яго творы "Дзікае паляванне караля Стаха" (1964 г.), "Хрыстос прызямліўся у Гародні" (1966 г.) "Каласы пад сярпом тваім" (1968 г.) і інш.

Плённа працаваў В. Быкаў. У аповесцях "Трэцяя ракета" (1962г.) "Круглянскі мост" (1969 г.), "Сотнікаў" (1970 г.), "Абеліск" (1971 г.), "Пайсці і не вярнуцца" (1978 г.), іншых творах пісьменнік паказаў суровую праўду вайны, мужнасць і гераізм воінаў і партызан у экстрэмальных умовах. Талент пісьменніка быў адзначаны прысуджэннем у 1986 г. за аповесць "Знак бяды" Ленінскай прэміі. Ён таксама лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1974 г.), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Я. Коласа (1964 і 1978 гг.), у 1980 г. яму прысвоена званне народнага пісьменніка БССР, а у 1984 г. — Героя Сацыялістычнай працы.

Цікавасць айчыннага і замежнага чытача выклікалі раманы І. Шамякіна "Сэрца на далоні" (1963 г.), "Атланты і карыятыды" (1974 г.), "Петраград — Брэст" (1983 г.) і інш. У 1981 г. яму было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай працы. Такую ж узнагароду атрымаў у 1975 г. драматург і байкапісец, вучоны-мовазнаўца К. Крапіва (К. К. Атраховіч), а таксама народныя паэты БССР Пятрусь Броўка і Максім Танк.

У 70-я — пачатку 80-х гг. у літаратуру прыйшло новае пакаленне літаратараў, сярод якіх былі Г. Далідовіч, Л. Дайнека,

А. Дударау, А. Жук, С. Законнікаў, В. Іпатава, В. Казько, У. Някляеў, Г. Пашкоў, А. Разанаў, Я. Янішчыц і многія інш.

Прымаліся меры па узмацненню матэрыяльнай базы літаратуры. У сакавіку 1972 г. было заснавана выдавецтва "Мастацкая літаратура", у студзені 1981 г.— выдавецтва "Юнацтва". Але у выніку русіфікатарскай палітыкі многія творы нацыянальнай літаратуры не даходзілі да чытача на роднай мове. З выдадзеных у 1985 г. 3431 кнігі і брашуры тыражом 58,8 млн. пасобнікаў колькасць беларускамоўных складала 893 назвы з тыражом 5 млн. пасобнікаў.

Палітыка русіфікацыі накладвала адбітак на развіцце тэатральнага мастацтва. Хоць колькасць тэатраў павялічылася з 11 у 1960 г. да 17 у 1985 г., але толькі тры тэатральныя калектывы з'яўляліся беларускамоўнымі. Значнай падзеяй у культурным жыцці рэспублікі з'явілася адкрыцце Магілеўскага абласнога тэатра драмы і камедыі у Бабруйску (1970 г.), дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР у Мінску (1971 г.), Тэатра-студыі кінаакцёра (1982 г.).

Гэты перыяд адзначаны пэўнымі поспехамі у развіцці музычнага мастацтва. Былі напісаны і пастаўлены оперы Ю. Семянякі "Калючая рука" (1960 г.), "Калі ападае лісце" (1968 г.), "Зорка Венера" (1970 г.), "Новая зямля (1982 г.), Г. Вагнера "Сцежкаю жыцця" (1980 г.), Дз. Смольскага "Сівая легенда" (1978 г.) і "Францыск Скарына" (1980 г.), С. Картэса "Джардж Бруна" (1977 г.) і "Матухна Кураж" (1982 г.). Шэраг балетаў стварылі Я. Глебаў, Г. Вагнер, У. Кандрусевіч, А. Мдывані, аперэт — Ю. Семяняка, Р. Сурус і інш. У песенным жанры актыўна працавалі У. Буднік, Л. Захлеўны, В. Іваноў, І. Лучанок, Э. Ханок, К. Цесакоў і інш.

Значнымі поспехамі было азначана выяўленчае мастацтва. У канцы 50-х -- пачатку 60-х гадоў заявілі аб сабе М. Савіцкі, А. Анікейчык, А. Бараноўскі, В. Грос, В. Грамыка, Л. Гумілеўскі, Г. Вашчанка, М. Данцыг, А. Малішэўскі, У. Стальмашонак, Л. Шчамялёў і інш.

Шырокую вядомасць набылі творы Міхася Савіцкага -- былога вязня фашысцкага канцлагера. Яго палотны "Хлябы", "Партызаны", "Віцебскія вароты", "Партызанская мадонна", серыя карцін "Лічбы на сэрцы", трыптых "Агрэсія" і інш. з'явіліся значным укладам у развіцце беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва. М. Савіцкаму прысвоена званне народнага мастака СССР і БССР, ён лаурэ-

ат Дзяржаўных прэмій СССР і БССР, быў абраны правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР. Званне Героя Сацыялістычнай працы і народнага мастака СССР прысвоена скульптару З. Азгуру. Ён таксама быў абраны правадзейным членам Акадэміі мастацтваў СССР.

Сусветна вядомым стаў мемарыяльна-архітэктурны комплекс "Хатынь", адкрыты у 1969 г. Яго стварылі архітэктары Ю. Градаў, В. Занковіч, Л. Лоўін, скульптар С. Селіханаў. У 1970 г. гэта праца была адзначана Ленінскай прэміяй. Мастацкай выразнасцю вызначаюцца мемарыяльныя комплексы "Брэсцкая крэпасць — герой", Курган Славы каля Мінска, "Прарыў" ва Ушацкім раёне Віцебскай вобласці, савецка-польскай баявой садружнасці у сяле Леніна Магілёўскай вобласці.

У 70-я — пачатку 80-х гадоў у выяўленчае мастацтва прышлі Г. Бураўкін, М. Бушчык, браты У. і М. Басалыгі, А. Даўгяла, А. Кішчанка, Я. Кулік, А. Карачкін, У. Савіч, М. Селяшчук, Ф.Янушкевіч і інш. мастакі і скульптары.

Такім чынам, культурнае жыццё у сярэдзіне 50-х — сярэдзіне 80-х гадоў у Беларусі насіла супярэчлівы характар. Русіфікацыя, празмерная ідэалагізацыя, класавы падыход, агранічэнне правоў творчай інтэлігенцыі на свабоду творчасці зрабілі негатыўны адбітак на развіцці нацыянальнай культуры, зацвярджанне агульначалавечых каштоўнасцей у многіх творах літаратуры і мастацтва. Але у гэты перыяд у выніку пленнай дзейнасці творчай інтэлігенцыі былі дасягнуты вялікія поспехі, якія прызналі ва ўсім свеце. З сярэдзіны 50-х гадоў прымаліся меры па далейшаму развіццю народнай адукацыі. З 1959/60 навучальнага года сямігадовыя школы пачалі ператварацца у васьмігадовыя. Была праведзена рэарганізацыя сярэдніх школ (дзесяцікласных) у агульнаадукацыйныя адзінаццацігадовыя з вытворчым навучаннем. Стваралісь школы-інтэрнаты, мэтай якіх з'яўлялася забеспячэнне больш спрыяльных умоў для усебаковага развіцця дзяцей і іх выхавання. У 1969/70 навучальным годзе у Беларусі працавалі 115 такіх школ. Усяго у гэты час налічвалася 10 983 агульнаадукацыйныя школы, у тым ліку 6183 пачатковыя, 2565 васьмігадовых, 2163 сярэднія, дзе навучалася 1708,6 тыс. вучняў.

У сувязі з пастаўленай XXV з'ездам КПСС (1966 г.) задачай пераходу да усеагульнай сярэдняй адукацыі у БССР за 1966—1970 гг. яе набылі 540 тыс. вучняў, за 1971—1975 гг. 658 тыс. За гэты час у рэспубліцы быў завершаны пераход да усеагульнай сярэдняй аду-

кацыі моладзі, што з'явілася значным поспехам у сацыяльна-палітычным жыцці. Але у рабоце агульнаадукацыйнай школы меліся значныя недахопы. Найбольш сур'ёзнымі з іх з'яўляліся дагматычны характар навучання, шырока распаўсюджаная "камандная педагогіка", маніпуляцыя свядомасцю моладзі. На нізкім узроўні вялося навучанне на грамадскіх дысцыплінах. Дагматызм, замоўчванне многіх падзей, занячаў краязнаўства тармазілі развіццё нацыянальнай свядомасці вучняў, спрыялі фарміраванню нэўтральных адносін знаку і дзяўчат да гісторыі і спадчыны сваёй Бацькаўшчыны. Праводзілася русіфікацыя школы, што прывяло да становішча, калі у сярэдзіне 80-х гадоў толькі 22,1% школ і 19,2% дашкольных дзіцячых устаноў працавалі на беларускай мове.

У 1984 г. былі прыняты "Асноўныя напрамкі рэформы агульнаадукацыйнай і прафесійнай школы". Але па сутнасці школе быў прапанаваны набор выпадковых мер. Адмосфера адбівалася на неправядзенні замаруджванне тэмпаў росту асігнаванняў на развіццё вучэбна-матэрыяльнай базы. У сярэдзіне 60-х гадоў затраты у СССР, і адпаведна у Беларусі, на агульнаадукацыйную школу складалі 6—7% ад валавога нацыянальнага прадукта, у пачатку 80-х — 4,2, а у сярэдзіне 80-х — 5,2%. Па гэтаму паказчыку СССР знаходзіўся на 60-м месцы у свеце.

Праводзілася работа па падрыхтоўцы кадраў праз сярэднія спецыяльныя вучэбныя установы. За 1960—1985 гг. іх колькасць павялічылася з 102 да 139, а навучэнцаў з 62,6 тыс. да 160,4 тыс. чалавек. Гэта сведчыць таму, што колькасць спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй у СССР вырасла з 166 тыс. у 1960 г. да 714 тыс. у 1985 г.

Развівалася сетка вышэйшых навучальных устаноў. Калі у 1960 г. у рэспубліцы іх працавала 24, то у 1985 г. — 33. За гэты час Гродзенскі медыцынскі інстытут (1958 г.), Мінскі радыётэхнічны інстытут (1964 г.), Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці (1965 г.), Брэсцкі інжынерна-будаўнічы (дзіцяр політэхнічны) інстытут (1966 г.), Мінскі інстытут культуры (1975 г.) і інш. У 1969 г. на базе Гомельскага педагагічнага інстытута створаны Гомельскі дзяржаўны універсітэт. У 1977 г. Гродзенскі педагагічны інстытут імя Я. Купалы ператвораны у Гродзенскі дзяржаўны універсітэт. Цэнтрам універсітэцкай адукацыі заставаўся Беларускі дзяржаўны універсітэт. У 80-я гады на яго факультэтах вучылася каля 15 тыс. студэнтаў, працавалі 1,5 тыс. прафесараў і

выкладчыкаў. Агульны лік выпускнікоў ВНУ у рэспубліцы вырас з 10 тыс. у 1960 г. да 31,9 тыс. у 1985 г.

Значныя зрухі былі зроблены у развіцці навукі. Колькасць навуковых устаноў за 1956—1985 гг. выраслa з 76 да 176. Вядучая роля сярод іх належыла інстытутам Акадэміі навук. Колькасць навуковых і навукова-педагагічных работнікаў склала у 1985 г. 42,4 тыс. чалавек, супраць 4,4 тыс. у 1956 г. Колькасць дактароў навук павялічылася з 184 да 1011 чалавек, кандыдатаў — з 1606 да 13,1 тыс.

У гэты перыяд прымаліся некаторыя меры па палепшэнню планавання і кіравання навуковымі даследаваннямі. Укараняўся праграмна-мэтавы метад планавання і фінансавання навукі, які забяспечваў канцэнтрацыю рэсурсаў на прыярытэтных напрамках даследаванняў. Але у цэлым фінансаванне навукі было недастатковым. У сярэдзіне 80-х гадоў доля асігнавання на навуку у нацыянальным даходзе БССР складала 2,2%, у той час, калі па СССР выдаткоўвалася 5,1%. Але і агульнасаюзныя паказчыкі былі значна ніжэй сусветных. Навуковыя установы мелі вялікую патрэбу у сучасных прыборах, матэрыялах, сродках вылічальнай тэхнікі. Разам з тым, па некаторых напрамках навуковых распрацовак былі дасягнуты вынікі, якія атрымалі прызнанне не толькі у СССР, але і за мяжой. Поспехі шэрагу вучоных рэспублікі былі адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі. Ленінская прэмія была прысуджана акадэміку АН БССР і УАСГНІЛ Л. Мацэпуры, акадэмікам АН БССР М. Ельяшэвічу, М. Барысевічу, У. Платонаву і іншым. За 1956—1985 гг. вучоныя Беларусі атрымалі 26 Дзяржаўных прэмій СССР.

Як бачым, у сярэдзіне 50-х — сярэдзіне 80-х гадоў былі зроблены пэўныя крокі у развіцці народнай гаспадаркі, культуры і навукі Беларусі, павышэнні дабрабыту народа. Але у гэты час набіралі моц негатыўныя тэндэнцыі, якія прывялі да неабходнасці глыбокіх перабудоваўчых працэсаў у эканамічным, палітычным і сацыяльным жыцці грамадства.

Тэма 28. ЦЯЖКІ ШЛЯХ РАДЫКАЛЬНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ.

Вучэбныя пытанні. 1. Крызіс народнай гаспадаркі. 2. Чарнобыльская катастрофа і рэзкае абвастрэнне экалагічнай сітуацыі. 3. Развал сацыяльнай сферы. 4. Праблемы дэмакратызацыі грамадскага жыцця. 5. Нацыянальна-культурнае адраджэнне. 6. На шляху незалежнасці.

У сярэдзіне 80-х гадоў партыйна-савецкае кіраўніцтва СССР абвясціла аб карэннай перабудове ўсіх бакоў грамадскага жыцця краіны. Красавіцкі (1985 г.) пленум ЦК КПСС, XXVII з'езд партыі (1986 г.) вызначылі новы палітычны курс, скіраваны на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і выпраўленне дапушчаных у мінулы перыяд сур'ёзных памылак. У наступныя гады гэты курс знайшоў працяг'энне у іншых партыйна-дзяржаўных пастановах і рашэннях.

Неабходнасць радыкальных перамен у грамадстве была выкліканa складаным сацыяльна-эканамічным і палітычным становішчам, у якім апынулася краіна, у тым ліку і Беларусь, на рубяжы 70—80-х гадоў. Існаваўшыя у СССР эканамічныя адносіны, асабліва абсалютызацыя дзяржаўнай і калгасна-кааператыўнай уласнасці, яе манапалізацыя і адсутнасць свабоднай канкурэнцыі, ігнараванне таварна-грашовых рыначных адносін прывялі да абязлічвання уласнасці, падрыву асноў развіцця і матэрыяльнага стымулявання працоўнай дзейнасці чалавека. Застойныя з'явы усе шырэй ахоплівалі сацыяльную і грамадска-палітычную сферы жыцця, абмежаванні дэмакратыі негатыўна уплывалі на духоўны настрой народа.

Новыя напрамкі развіцця краіны былі канкрэтызаваны у рашэннях I—V з'ездаў народных дэпутатаў СССР, Вярхоўнага Савета СССР, што адбыліся у 1989—1991 гг. Прынятыя імі Законы паклалі пачатак радыкальнай эканамічнай рэформе, працэсу дэмакратызацыі грамадства. Усе гэта прывяло да некаторага ажыўлення і пэўных станоўчых зрухаў у жыцці краіны. Спачатку у цэлым паспяхова выконваліся заданні дванаццатай пяцігодкі, расла вытворчасць. Але у далейшым жыццё паказала, што без глыбокіх дэмакратычных пераўтварэнняў, злома адміністрацыйна-камандна-адміністрацыйнай сістэмы, немагчыма забяспечыць радыкальныя змяненні у развіцці грамадства. Перабудова сутыкнулася з вялікімі цяжкасцямі. У краіне, асабліва пасля 1988 г., пачалі хутка узрастаць крызісныя з'явы, запавольваліся тэмпы эканамічнага развіцця, нагарша-

хіся умовы жыцця насельніцтва, што выклікала сацыяльную напружанасць у грамадстве. У рэшце — рэшт аказаўся дэкларатыўным і не быў рэалізаваны абвешчаны палітычны курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця, удасканальванне сацыялізму, адсутнічала навукова абгрунтаваная канцэпцыя перабудовы. На дэстабілізацыю становішча у краіне моцны уплыў аказвала абвастрэнне міжнацыянальных адносін, асабліва у рэспубліках Каўказа, Сярэдняй Азіі, Прыбалтыкі, Малдавіі. Аднак на Беларусі у гэтых адносінах захоўваліся даволі стабільныя абставіны.

Між тым некаторыя рэспублікі, абвясціўшы дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць, пачалі пакідаць СССР, усе больш абвастраласа адкрытая канфрантацыя паміж цэнтрам і рэспублікамі. Ва умовах глыбокага палітычнага і эканамічнага крызісу дзяржавы 8 снежня 1991 г. у Беларусі (Белавежскай пушчы) кіраўнікі Расіі, Украіны і Беларусі падпісалі Пагадненне аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Афіцыйным месцам знаходжання каардынуючых органаў Садружнасці абраны Мінск. 21 снежня на сустрэчы у Алма-Аце была створана Садружнасць адзінацыі незалежных дзяржаў. У прынятай Дэкларацыі удзельнікі сустрэчы падкрэслілі імкненне пабудаваць дэмакратычныя прававыя дзяржавы, адносіны паміж якімі будуць развівацца на аснове узаемнага прызнання і павагі дзяржаўнага суверэнітэту. Было абвешчана, што з утварэннем СНД Савецкі Саюз спыняе сваё існаванне. Далейшы ход падзей у жыцці СНД аднак паказаў, што аптымістычныя спадзяванні не апраўдалі. На хуткае ўмацаванне новай супольнасці аказаліся далекімі ад рэчаіснасці. На шляху станаўлення Садружнасці узнікла шмат цяжкасцей і перашкод, працэс ідзе складана і супярэчліва, асабліва ва узаемаадносінах Расіі і Украіны.

Сацыяльна-эканамічнае становішча у рэспубліках былога СССР абвастрылася у сувязі з пераходам Расіі з пачатку 1992 г. да палітыкі свабодных цэн, іх лібералізацыі. Пад эканамічным націскам Расіі свабоднае цэнаўтварэнне вымушаны былі ўвесці і іншыя рэспублікі СНД, у тым ліку Беларусь. Палітыка "мокавай тэрапіі" выклікала выбуховы рост цэн на тавары, гіперінфляцыю, вялікі дэфіцыт дзяржаўнага бюджэту, далейшы развал гаспадарчых сувязей паміж рэспублікамі, рэгіёнамі і прадпрыемствамі. Непазбежным вынікам гэтай палітыкі стала значнае падзенне вытворчасці, рэальных даходаў працоўных. За мяжой беднасці апынулася вялікая частка насельніцтва.

Калі гаварыць аб Беларусі, то неабходна адзначыць, што да 1990 г. яе эканоміка, знаходзячыся ў складзе народнагаспадарчага комплексу СССР, развівалася адносна высокімі і ўстойлівымі тэмпамі. У 1986--1990 гг. сярэднегадавы прырост нацыянальнага даходу склаў 2,9%, рэспубліка па гэтаму паказчыку займала 4-е месца пасля Расіі, Латвіі і Эстоніі. Калектывы прадпрыемстваў рабілі вялікія намаганні, каб павялічыць выпуск прадукцыі, узняць навукова-тэхнічны ўзровень вытворчасці і прадукцыйнасць працы. Аб"ём прамысловай прадукцыі за ўказанае вышэй пяцігоддзе ўзрос на 29%, у тым ліку сродкаў вытворчасці на 27, прадметаў спажывання -- на 35%. Найбольш значна аб"ём прадукцыі павялічыўся ў машынабудаванні і металургічным комплексе. У 1990 г. на душу насельніцтва было вырабляна тавараў народнага спажывання на 2268 руб. супраць 1958 руб. у цэлым па СССР. Неблагія паказчыкі мела Беларусь і ў развіцці сельскай гаспадаркі, хаця нявырашаных праблем тут заставалася шмат. За 1986--1990 гг. сярэднегадавы ўраджай зерневых склаў 29,7 ц з гектара супраць 21,5 ц у папярэднім пяцігоддзі. У 1990 г. было атрымана мяса на душу насельніцтва 115 кг (у Расіі -- 68 кг., на Украіне -- 84, Літве -- 142 кг), малака -- 727 кг. Інтэнсіўна вялося будаўніцтва, за пяць гадоў было пабудавана і ўведзена ў строй 26 буйных і сярэдніх прамысловых прадпрыемстваў.

З канца 80-х гадоў пачалі ўзнікаць прыкметы надыходзячага эканамічнага крызісу, які пасля развалу СССР і перехода да палітыкі лібералізацыі цэн, ахапіў усе сферы эканамічнага і сацыяльнага жыцця. На эканамічнае становішча Беларусі, як і іншых рэспублік былога СССР, асабліва цяжкі ўплыў аказвае разрыў гаспадарчых сувязей, што фарміраваліся гадамі, аслабленне кіруемасці народнай гаспадаркай, імклівы рост цэн на вырабляемую прадукцыю і паслугі. Гэта прывяло да разбалансаванасці эканомікі, выклікала зніжэнне вытворчасці, шалёны рост інфляцыі.

У 1992 г. да ўзроўню 1990 г. спад прамысловай вытворчасці дасягнуў 10%, не спыніўся ён і ў 1993 годзе. Галоўным чынам гэта адбылося з-за скарачэння пастаўкі нафты ў рэспубліку: калі да 1990 г. яе штогод перапрацоўвалася 38--40 млн.тон, то ў 1992 г. -- 20 млн. тон. У сувязі з нехваткай сыравіны асабліва скараціўся выпуск хімічнай і нафтахімічнай прадукцыі. Зменшылася вытворчасць металарэзных станкоў, кавальска-прэсавых, сельскагаспадарчых і іншых

машын з-за скарачэння заказаў. Але стабілізаваўся і нават некалькі павялічыўся выраб грузавых аўтамабіляў, трактароў, сілавых трансфарматараў, электраручнікоў, тэлевізараў. Больш устойліва працавалі галіны прамысловасці, што выкарыстоўвалі мясцовыя рэсурсы сыравіны.

Крызіс вытворчасці непасрэдна звязаны з пагаршэннем фінансавага становішча многіх прадпрыемстваў і арганізацый Беларусі. Ім не хапае сродкаў на набыццё матэрыялаў, сыравіны і іншых вытворчых мэты, аплату працы, сацыяльнае развіццё, што звязана з высокімі падаткамі, парушэннем узаемаразлікаў паміж спажыўцамі. На 1 красавіка 1993 г. запазычанасць прадпрыемствам рэспублікі склала 117,8 млрд. рублёў, пры гэтым яна на 15,8 млрд. рублёў перавысіла чаму запазычанасць другім дзяржавам. Эканамічнае развіццё Беларусі вельмі ўскладніла неацнаразовае павышэнне цэн на паліўна-энергетычныя рэсурсы, металы, сыравіну, якія паступаюць у асноўным Расія. Цэны на іх павялічыліся у 8--24 разы. У апошні час нярэдкай з'явай стала частковая, ці нават поўнае прыпыненне дзейнасці прадпрыемстваў, іх закаваракне на прычыне рэзкага падарожання кошту прадукцыі і зніжэння попыту.

Шматлікія цяжкасці ад разрыва гаспадарчых сувязяў, неадпаведнасці цэн на прамысловую і сельскагаспадарчую прадукцыю ўвядзе агрэпрамысловы комплекс Беларусі. У асабліва складаных умовах апынулася жывелагадоўля. Па даным на 1 красавіка 1993 г. супраць гэтага ж перыяду папярэдняга года пагалоўе буйной рагатай жывёлы і кароў у калгасах і саўгасах паменшылася на 7%, свіней — на 10, авечак — на 22%. Галоўная прычына тут — рэзкае скарачэнне закупак фуражнага збожжа для вытворчасці камбікармоў. Раней яны дасягалі да 4 млн. тон у год, пераважна па імпарту, што аплацвалася цэнтралізавана урадам былога СССР. Са свайго боку Беларусь пастаўляла у саюзны фонд мяса і малочных прадукты, адпаведна у асобныя гады да 340 тыс. тон і 2 млн. тон.

Крызіснае становішча эканомікі Беларусі і перш за ўсе прамысловасці абумовіла істотнае скарачэнне экспартных магчымасцяў рэспублікі. Знешнегандлевы абарот яе за 1992 г. склаў 1,8 млрд. долараў ЗША і зменшыўся супраць 1991 г. напалову, у тым ліку экспарт — на 36%. Па некаторым відам прадукцыі (мінеральныя угнаенні, тэлевізары, матацыклы, гадзіннікі і г. д.) экспарт усё ж меў прырост. Па імпарту закуплена зерня на 297,8 млн. долараў, цукру — на 44,8, медыкаментаў — на 18,6, абутку скуранога —

на 4,8 млн. долараў ды інш. У рэспубліцы зарэгістравана 716 сумесных прадпрыемстваў з удзелам замежных фірм і арганізацый, з якіх 164 ажыццяўляюць вытворчую дзейнасць. Важнай падзеяй у развіцці міжнародных эканамічных сувязей Беларусі з'явілася яе уступленне у Міжнародны валютны фонд (МВФ), групу сусветнага банка (СБ), Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР). Членства у гэтых арганізацыях адкрывае доступ да льготных крыніц фінансавання, будзе садзейнічаць інтэграцыі у сусветную гаспадарку, умацаванню эканамічнай незалежнасці рэспублікі.

Ва ўнутранай палітыцы Вярхоўны Савет, урад рэспублікі, органы мясцовай улады прымаюць канкрэтныя захады па пераадоленню эканамічнага крызіса, спыненню спаду вытворчасці, стабілізацыі народнай гаспадаркі. Заключаны двухбаковыя дагаворы аб развіцці эканамічнага супрацоўніцтва з Расіяй і іншымі дзяржавамі СНД, асабліва значэнне надаецца забеспячэнню прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў неабходнымі матэрыяльна-тэхнічнымі і сыравіннымі рэсурсамі, вырашэнню праблем фінансавання. У 1992 г. у абарачэнне былі уведзены разліковыя білеты Нацыянальнага банка рэспублікі, што адыграла станоўчую ролю у некаторым змякчэнні плацежнага дэфіцыту.

Важнейшымі накірункамі рэфармавання эканомікі Беларусі на сучасным этапе з'яўляецца забеспячэнне рэальнага эканамічнага суверэнітэта рэспублікі, структурная перабудова народнай гаспадаркі і стварэнне разнастайных форм уласнасці, фарміраванне канкурэнтнага асяроддзя, неабходнага для эфектыўнага выкарыстання рынкавых механізмаў, дэманапалізацыя вытворчасці. Зараз у рэспубліцы ажыццяўляецца першы этап прыватызацыі: 19 студзеня 1993 г. сесія ВС Беларусі прыняла Закон "Аб раздзяржаўленні і прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці у Рэспубліцы Беларусь". Удзельная вага раздзяржаўленых і прыватызаваных прадпрыемстваў у агульнай вартасці асноўных фондаў і агульным аб'ёме вытворчасці прадукцыі складае каля 7%. Неабходна аднак адзначыць, што гэты працэс ідзе марудна. Яго стрымлівае адсутнасць доўгатэрміновых стабільных Законаў, бюракратычныя адносіны многіх службовых асоб, спробы прысваення прыватызуемай дзяржаўнай уласнасці.

У рэспубліцы сфарміравалася дзвюхузроўневая банкаўская сістэма, якая уключае Нацыянальны банк рэспублікі і 27 камерцыйных банкаў. Рэфармірована сістэма Дзяржстраха, ліквідавана яго манаполія. Дазволена стварэнне і ужо дзейнічаюць больш за 30 нота

страхавых кампаній, у тым ліку з замежным удзелам. Паралельна ідзе станаўленне рынка каштоўных папер. Працуюць біржы, шматлікія прадпрыемствы малога бізнесу.

Прадпрымальніцкі рух на Беларусі паступова набірае сілу: на сярэдзіну 1992 г. налічвалася каля 50 тыс. недзяржаўных прадпрыемстваў, дзе працавала больш за паўмільёна чалавек. Але шлях да прадпрымальніцтва застаецца складаным і супярэчлівым, што звязана перш за ўсе з цяжкасцямі матэрыяльна-тэхнічнага і тавараага забеспячэння, высокімі падаткамі, адсутнасцю вопыта вядзення цывілізаванага бізнесу. Да таго ж у асяроддзе прадпрымальнікаў нярэдка пранікаюць несумленныя людзі, якія у пагоні за нажывай парушаюць законы, дапускаюць злоўжыванні.

У рэфармаванні сельскай гаспадаркі прыкметнай з'явай часу стала стварэнне сялянскіх (фермерскіх) гаспадарак. Нягледзячы на сур'ёзныя цяжкасці іх арганізацыі і дзейнасці, колькасць гэтых гаспадарак да вясны 1993 г. дасягнула 2500. Аднак іх уклад у развіццё сельскагаспадарчай вытворчасці пакуль што сціплы. Асноўнымі вытворцамі сельгаспрадукцыі застаюцца калгасы і саўгасы.

Пры канцы красавіка 1986 г. свет абляцела жудасная вестка — адбылася буйная аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі, размешчанай на тэрыторыі Украіны, непадалёку ад паўднёвай граніцы Беларусі. Выбух на чацвертым блоку ЧАЭС выкінуў у атмасферу велізарную колькасць радыеактыўнага рэчыва. Ім забруджана вялікая тэрыторыя у Гомельскай і Магілеўскай абласцях, шмат месц Брэсцкай, Мінскай і Гродзенскай, а таксама на Украіне і Расіі. Адбылася катастрофа планетарнага маштабу. Яна з'явілася злавесным вынікам тэхнічнага адставання былога СССР, сур'ёзных недахопаў у развіцці ядзернай энергетыкі. Фарсіраванае будаўніцтва ЧАЭС, бязлітасныя адносіны да яе абслугоўвання з боку цэнтральных энергетычных ведамстваў, мясцовага кіраўніцтва і непасрэдных выканаўцаў зрабілі сваю трагічную справу.

Аварыя на ЧАЭС прынесла беларускаму народу невымоўныя пакуты, рэальную пагрозу здароўю і жыццю мільёнаў людзей, надзвычай цяжкія матэрыяльныя страты. На тэрыторыю рэспублікі прыпала 70% усяго радыеактыўнага забруджвання. У гэтай зоне апынулася пятая частка насельніцтва рэспублікі — больш за 2 мільёны 100 тыс. чалавек. Усяго у Беларусі ўздоўж граніцы падверглася 54 ра-

ены, але распаўсюджванне радыеактыўнага рэчыва працягваецца, выкуляюцца новыя забруджаныя вяоціны. Са звароту выведзена каля 20% сельскагаспадарчых угоддзяў і амаль 15% лясоў, агульныя матэрыяльныя страты склалі звыш 100 млрд. рублёў.

У выніку рэспубліка апынулася у надзвычайна складаным і цяжкім становішчы. Напачатку работа па пераадоленню вынікаў аварыі праводзілася мярудна і неарганізавана. Насельніцтва не заўсёды атрымлівала своечасовую і належную інфармацыю аб правілах паводзін ва ўзніклых экстрэмальных умовах, разгубленасць і трывога апанавалі сотні тысяч людзей, што ўпершыню у жыцці сутыкнуліся з такой нябачнай і каварнай небяспекай. Са свайго боку органы савецкага кіравання, міністэрствы і ведамствы, адказныя за бяспеку атамнай энергетыкі, своечасова не прынялі неабходных мер для наладжвання хуткай дапамогі жыхарам у зоне аварыі, праявілі неаператыўнасць і безадказнасць. Рабіліся спробы па дэзынфармацыі і замаскіраванню вынікаў катастрофы, не цяжкага ўплыву на здароўе людзей. Тон у гэтай ганебнай дзейнасці задавала аператыўная група палітбюро ЦК КПСС, праду якой накіроўваў фактычна Генеральны сакратар М.С.Гарбачоў. Тое ж неабходна сказаць і аб дзейнасці тагачаснага кіравання Беларусі.

У ліку першых практычных мер па барацьбе з вынікамі аварыі было адсяленне у бяспечныя месцы насельніцтва з раёнаў, што падверглося найбольшаму забруджванню, а таксама абследаванне і дэзактываця тэрыторый, медыцынскі агляд і дапамога пацярпеўшым людзям. З 4 мая 1986 г. першым адсялялася насельніцтва з 30-кіламетровай зоны навокал ЧАЭС, у тым ліку 107 населеных пунктаў Брагінскага, Хойніцкага і Нараўлянскага раёнаў. Але у 1986 г. усяго каля 30 тыс. чалавек пераехалі на пастаяннае месцапражванне у чыстыя ад радыяцыі месцы. За 1986—1989 гг. на гэтыя мэты было выкарыстана толькі 1,1 мільярда рублёў. Шматлікія цяжкасці у барацьбе з вынікамі аварыі стварала непадрыхтаванасць медыцынскіх устаноў, некампетэнтныя і нярэдка безадказныя заявы спецыялістаў, якія супакойвалі людзей, замест таго, каб сказаць ім праду. Да таго ж крытычна не хапала індывідуальных сродкаў абароны насельніцтва ад радыяцыі, асабліва прыбораў для вызначэння узроўню радыяцыйнага фону, неабходных медыкаментаў.

Дзейнасць партыйных, савецкіх і грамадскіх арганізацый па пераадоленню вынікаў чарнобыльскай катастрофы пачала актывізавацца пасля таго, як прыступіў да работы выбраны у 1989 г. новы Вярхоў-

ны Савет Беларусі. Вялікую заклапочанасць лесам ахвяр аварыі праявіла шырокая грамадскасць, узніклыя нефармальныя рухі, дзеячы навукі і культуры, сродкі масавай інфармацыі. У гэтым жа годзе ВС Рэспублікі разгледзеў і адобрыў Доўгатэрміновую праграму па пераадоленню ў Беларусі выніка катастрофы на ЧАЭС на 1990—1995 гг., якую распрацавау ураД Беларусі. Яна так жа была разгледжана на сакрэтным узроўні, дзе вырашаліся пытальні фінансавання праграмы.

У 1989—1990 гг. ураД Беларусі на аснове комплекснага дазіметрычнага абследавання тэрыторыі Гомельскай і Магілеўскай абласцей прыняў дадатковыя меры па ахове здароўя насельніцтва, праду гледзеўшы адсяленне у чыстыя месцы яшчэ звыш 100 тысяч. Пры гэтым першачарговае значэнне надавалася адсяленню і арганізацыі медыцынскага абслугоўвання сем'яў з малымі дзецьмі, цяжарнымі жанчынамі, забеспячэнне насельніцтва чыстымі прадуктамі харчавання. Напачатку 90-х гадоў ВС Рэспублікі прыняў некалькі новых законаў, мэта якіх — стварыць сістэму сацыяльнай і псіхалагічнай падтрымкі людзей, што пацярпелі ад чарнобыльскай навалы, забяспечыць выкананне Дзяржаўнай чарнобыльскай праграмы. Сярод іх законы "Аб сацыяльнай абароне грамадзян, якія пацярпелі ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС", "Аб статуце тэрыторый, якія падверглісЯ радыеактыўнаму забруджванню" і інш.

За перыяд, што прайшоў пасля трагічнага 1986 года, у рэспубліцы зроблена нямала у справе ліквідацыі выніка ядзернай катастрофы. Да 1992 г. на новыя месцы жыхарства пераехалі з забруджанай тэрыторыі больш за 130 тыс. чалавек, на узвядзенне жылля, новых аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры выкарыстана 374,9 млрд. рублеў. 75% гэтых сродкаў асвоена за апошнія тры гады, калі з-за развалу СССР наша рэспубліка фактычна засталася з Чарнобылем сам-насам і фінансавыя магчымасці не зменшыліся. Выдаткі на рэалізацыю Чарнобыльскай праграмы складаюць каля 18% дзяржаўнага бюджэту Беларусі.

Тэрыторыя рэспублікі, што падверглася радыяцыйнаму забруджванню, стала зонай асаблівай увагі. У небяспечных, часта экстрэмальных умовах, тут жывуць і працуюць сотні тысяч людзей. Дзяржава не пакінула іх у сядзе, ажыццяўляюцца меры па забеспячэнню чыстымі прадуктамі, паляпшэнню медыцынскага і іншага абслугоўвання. Прадастаўлены ільготы і тым, хто прымаў непасрэдны удзел у работах па ліквідацыі выніка аварыі. Станоучае значэн-

не адыгрывае гуманітарная дапамога, што паступае з-за мяжы. Штогод шмат дзяцей з забруджаных радыяцыяй раёнаў Беларусі у часе летніх канікул праводзяць свой адпачынак у дзяржавах СНД, а таксама замежных краінах. У арганізацыі гэтага мерапрыемства актыўны удзел прымаюць рэспубліканскі камітэт "Дзеці Чарнобыля", іншыя арганізацыі.

Нельга не адзначыць работу навуковых устаноў рэспублікі, якія разгарнулі распрацоўку шэрагу фундаментальных і прыкладных праблем, звязаных з вынікамі Чарнобыльскай катастрофы. Такія даследаванні вядуць вучоныя Акадэміі навук Беларусі, Беларускага і Гомельскага універсітэтаў, Мінскага медыцынскага інстытута ды іншых устаноў.

І усе ж многае з таго, што вызначана, ажыццяўляецца марудна, становіцца у зоне застаецца трывожным. З боку службовых асоб сустракаецца нямала прыкладаў абыякавых, фармальных адносін да агульнадзяржаўнай справы ліквідацыі вынікаў нацыянальнай трагедыі. Парушаюцца тэрміны уводу у дзеянне жылля і аб'ектаў сацыяльнага абслугоўвання перасяленцаў. Паўсюдна на забруджанай тэрыторыі расце колькасць людзей з цяжкімі хранічнымі захворваннямі. Чарнобыльская катастрофа пакінула на беларускай зямлі цяжкую незагойваючую рану, якую будзе адчуваць не адно пакаленне людзей. Каб яе залячыць, неабходны вялікія намаганні не толькі Беларусі, але і іншых дзяржаў СНД, удзельнасць сусветнага супольніцтва.

Аварыя на ЧАЭС у надзвычайнай ступені ускладніла і без таго цяжкую экалагічную сітуацыю у Беларусі. Разам з тым на яе абвастрэнне аказвае уплыў і шмат іншых фактараў, у тым ліку нерацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, парушэнні правіл і норм аховы навакольнага асяроддзя, адсутнасць адпаведнага эфектыўнага заканадаўства і інш. Складанасць гэтай праблемы у рэспубліцы абумоўлена і высокай канцэнтрацыяй прамысловасці на яе тэрыторыі, у тым ліку буйных хімічных і нафтахімічных прадпрыемстваў, машынабудавання, якія выкідваюць у атмасферу вялікую колькасць шкоднага рэчыва. Разам з прамысловасцю адной з галоўных крыніц забруджвання паветра з'яўляецца развітасць транспарту, перш за ўсе аўтамабільнага. Складанае экалагічнае становішча не абышло бокам і сельскую мясцовасць, абшары палеў і лугоў, рэкі і вадаёмы рэспублікі.

Колькасць адходаў у рэспубліцы павялічваецца штогод на 45 млн.

тон, пераважная большасць іх не перапрацоўваецца, а складуецца на звалках. У паветра выкідваецца каля 3 млн. шкоднага рэчыва. Амаль 10% прамысловых і бытавых адходаў выкідваецца у вадаемы недастаткова ачышчанымі. Усе гэта пагаршае умовы пражывання людзей, вядзе да росту захворванняў, гібелі прыроднага сяроддзя. Каб прадухіліць спаўзанне да экалагічнай катастрофы, даць людзям магчымасць карыстацца чыстай зямлей, паветрам, харчовымі прадуктамі неабходны рашучыя і мэтанакіраваныя дзеянні усяго грамадства і у першую чаргу дзяржаўных і гаспадарчых органаў, палітычных партый і рухаў, сродкаў масавай інфармацыі.

Пэўныя поспехі эканомікі Беларусі у другой палове 80-х гадоў забяспечылі устойлівае развіцце сацыяльнай сферы, стварылі высновы для далейшага паляпшэння матэрыяльна-бытавых умоў жыцця насельніцтва. У рэспубліцы паэтапна павышалася заработная плата працоўных пры захаванні адносна невысокіх і стабільных цэн на тавары і паслугі. За 1986—1990 гг. на новыя умовы аплаты працы было пераведзена 2,8 млн. чалавек, грашовыя даходы насельніцтва павялічыліся у 1,6 раза, спажыванне матэрыяльных даброт і паслуг — на 25%. Узрос аб'ем рознічнага тавараабароту, аднак попыт насельніцтва на некаторыя віды тавараў задавальняуся ня поўнасцю, іх якасць па-ранейшаму адставала ад запатрабаванняў. Важнай сацыяльнай задачай лічылася паскарэнне жыллевага будаўніцтва, развіцце сістэмы камунальна-бытавога абслугоўвання гаражан і вяскоўцаў. За указанае вышэй пяцігоддзе было пабудавана 465,8 тыс. кватэр, на канец 1990 г. колькасць газіфікаваных кватэр перавышла 8 мільёны. Адначасова вырашаліся пытанні медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, фізічнага развіцця, арганізацыі адпачынку дарослых і дзяцей.

Але з 1990 г. у сувязі з эканамічным крызісам становішча сацыяльнай сферы Беларусі пачало пагаршацца. Абвастрыуся дэфіцыт харчовых прадуктаў і некаторых відаў прамысловых тавараў шырокага ужытку. Спробы урада рэспублікі стабілізаваць спажывецкі рынак шляхам увядзення візітных картак, купонаў і талонаў не далі жаданых вынікаў. Ва умовах падзення вытворчасці, паглыблення палітычнай нестабільнасці у СССР працягваўся рост таварнага дэфіцыту, не удалося прыпыніць масавага незаконнага вывазу тавараў з Беларусі у іншыя рэспублікі і за мяжу.

Да крытычнага пагаршэння жыццевага узроўню насельніцтва пры-

вяла палітыка лібералізацыі цэн, якую з пачатку студзеня 1992 г. пачало ажыццяўляць кіраўніцтва Расіі. Пераход да свабоднага цэнаўтварэння пры неабмежаваным манапалізме вытворчасці і адсутнасці канкурэнцыі выклікаў выбуховы рост цэн на тавары і паслугі (у ІСО і больш разоў). Адначасова павышалася і зарплата працоўных, але цэны на тавары значна апярэджвалі яе рост, што прывяло да рэзкага пагаршэння пакупной здольнасці пераважнай часткі насельніцтва. Гіперінфляцыя, абясцэньванне рубля асабліва цяжка адбіліся на становішчы малазабяспечаных сем'яў, пенсіянераў, інвалідаў, студэнтаў. Таму у рэспубліцы прымаецца шэраг мер па сацыяльнай абароне гэтых слаёў насельніцтва. Вельмі адчувальнай стратай абярнулася для насельніцтва абясцэньванне назапашаных грашовых зберажэнняў, рэальная вартасць якіх пасля лібералізацыі цэн стала сімвалічнай.

Пагаршаецца сітуацыя на рынку працы. У выніку развала СССР і разбурэння гаспадарчых сувязяў шэраг прамысловых прадпрыемстваў вымушаны часткова, або поўнасцю спыніць работу, расце беспрацоўе. Напрацягу 1992 г. у прамысловасці дадатковыя выхадныя і водпускі без захавання зарплаты былі прадастаўлены 887 тыс. чалавек. На пачатак сакавіка 1993 г. зарэгістравана 47 тыс. беспрацоўных. Улічваючы становішча і перспектывы развіцця рынку працы ВС Рэспублікі прыняў Закон аб занятасці насельніцтва (1992 г.).

Вострай застаецца жыллёвая праблема, не зніжаюцца чэргі на атрыманне жылля у гарадах і паселках. Да яго будаўніцтва мала прыцягваецца сродкаў грамадзян, прадпрыемстваў, калгасаў і саўгасаў. Вялікае павышэнне цэнаў отварыла сур'ёзную перашкоду у набыцці будаўнічых матэрыялаў. З ліпеня 1992 г. у рэспубліцы дзейнічае Закон аб прыватызацыі жылля. За студзень—сакавік 1993 г. насельніцтва прыватызавала 17,6 тыс. кватэр агульнай плошчай 898,2 тыс. кв. м.

З 1992 г. ускладнілася дзейнасць сістэмы аховы здароўя: зменшыліся магчымасці медыцынскіх устаноў у набыцці лекавых прэпаратаў, матэрыялаў, абсталявання. Узніклі цяжкасці з харчаваннем хворых, што знаходзяцца у стацыянары.

Крызіснае становішча у эканамічным і сацыяльным развіцці Беларусі адмоўна паўплывала на яе дэмаграфічную сітуацыю. Агульны каэфіцыент нараджальнасці (на 1 тыс. насельніцтва) знізіўся з 17,6% у 1983 г. да 12,9% у 1991 г., такая тэндэнцыя захоўваецца і у далейшым. Такой нізкай нараджальнасці у рэспубліцы не было на-

ват у гады мінулай вайны. Працягваецца "старэнне" вескі. У апошнія гады ўзнікла праблема вымушанай міграцыі у Беларусь з рэспублік былога СССР, дзе абвастрыліся міжнацыянальныя адносіны. Сярод бежанцаў 80% беларусаў. Толькі па афіцыйным даным на I сакавіка 1993 г. іх налічвалася у Беларусі II тысяч.

Сказанае вышэй сведчыць, што у пераходны перыяд беларускі народ сутыкнуўся з вялікімі цяжкасцямі у сацыяльным развіцці. Пераважная большасць насельніцтва апынулася за мяжой беднасці, адбываецца беспрэцэндэнтнае падзенне узроўню і якасці яго жыцця. Адначасова у грамадстве паглыбляецца сацыяльнае размежаванне, маемасная няроўнасць. Расце прослойка людзей, якія валодаюць вялікім багаццем, што у значнай частцы набыта шляхам спекуляцыі, ашуканства, нахабнага прысвоення прыватызуемай дзяржаўнай уласнасці.

Адным з галоўных напрамкаў радыкальных пераўтварэнняў з'яўляецца усталяванне дэмакратыі, прыданне на гэтай аснове новага аблічча грамадству. Тэарэтычныя навацыі 70-х гадоў, якія абвясцілі дзяржаву агульнанароднай, не прывялі да дэмакратычных перамен у СССР, у тым ліку у Беларусі, заставалася сістэма улады, уяўляшая сабою зліцце функцый партыйнага і дзяржаўнага апарату.

Дэмакратызацыі грамадства садзейнічалі выбары праведзеныя па абнаўленай выбарчай сістэме у Вярхоўны Савет СССР. Але да канца зрабіць дэмакратычныя выбары не удалося. Трэцюю частку народных дэпутатаў СССР прадугледжвалася выбіраць ад грамадскіх арганізацый, у тым ліку ад КПСС. Вялікімі паўнамоцтвамі надзяляліся акруговыя перадвыбарчыя сходы, якія мелі магчымасць не рэгістраваць непажаданага кандыдата у дэпутаты. Нягледзячы на гэта 26 сакавіка 1989 г. у рэспубліцы у абстаноўцы адкрытай напружанай барацьбы адбыліся выбары народных дэпутатаў СССР. Гэта была першая за многія дзесяцігоддзі свабодная, дэмакратычная, незарэгламентаваная выбарчая кампанія. Ад БССР у вышэйшы орган дзяржаўнай улады было абрана 60 народных дэпутатаў.

4 сакавіка 1990 г. у вострай барацьбе прайшлі выбары у Вярхоўны Савет БССР. З 310 выбарчых акруг на безальтэрнатыўнай аснове яны праходзілі толькі у 20. Усяго было абрана 327 народных дэпутатаў, з іх 277 ад тэрытарыяльных выбарчых акруг і 50 ад грамадскіх арганізацый. Гэта паставіла не у адпаведнасць умовы правядзення барацьбы кандыдатаў у дэпутаты.

Пасля выбараў народных дэпутатаў Беларусі і мясцовых Саветаў былі сфарміраваны іх кіруючыя органы. У маі 1990 г. сесія Вярхоўнага Савета рэспублікі абрала Старшынёй Вярхоўнага Савета БССР М. І. Дзямянцея, яго першым намеснікам С. С. Шушкевіча, намеснікам — В. І. Шаладонава. Былі абраны таксама старшыні пастаянных камісій, іх намеснікі, сакратары.

Пятая ўнечарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР, якая сабралася адразу пасля жнівеньскіх падзей 1991 г., задаволіла просьбу М. І. Дзямянцея аб яго вызваленні ад абавязкаў старшыні Вярхоўнага Савета. У верасні 1991 г. на гэту пасаду на альтэрнатыўнай аснове быў выбраны С. С. Шушкевіч.

У абстаноўцы галоснасці, барацьбы розных поглядаў і пазіцый вырашае адказныя і складаныя задачы жыцця рэспублікі Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Плюралізму думак спрыяе стварэнне апазіцыі з ліку дэпутатаў, прыхільнікаў Беларускага народнага фронту (БНФ).

Важным напрамкам дэмакратызацыі грамадства з'яўляецца фарміраванне прававой дзяржавы, у якой вышэйшым прынцыпам павінна стаць безумоўнае падпарадкаванне ўсіх закону. Гэта паралельнаўча доўгі працэс, на працягу якога будуць складвацца адпаведныя структуры дзяржаўных органаў, сістэма законаў, незапаўнацца традыцыі, гарантуючыя дэмакратычнае развіццё.

Стварэнне прававой дзяржавы звязана з радыкальным пераглядам, кадыфікацыяй і сістэматызацыяй заканадаўства, якое павінна забяспечыць верхавенства закона. Вядома, што абнаўленне заканадаўства праходзіла і раней. Але прававая рэгламентацыя спалучалася з загадна-адміністрацыйнай сістэмай кіравання, часта абапіралася на падзаконныя акты. Шырокае распаўсюджванне атрымалі розныя інструкцыі міністэрстваў і ведамстваў, якія нярэдка не гамацоўвалі, а падрывалі законнасць.

Ва умовах радыкальных пераўтварэнняў паўстала пытанне пераглядзець агульнасаюзныя нарматыўныя акты. Да 1989 г. у краіне было адменена больш 100 тыс. ведамасных інструкцый. Значную законатворчую работу праводзіў Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь. Цэнтрам працы над законапраектамі і іншымі дакументамі сталі у ім камісіі, якіх першапачаткова было 20. Да мая 1992 г. Вярхоўны Савет прыняў 153 новыя законы, у тым ліку такія прынцыповыя, як звязаныя з дзяржаўным суверэнітэтам, Чарнобыльскай катастрофай.

Важнае значэнне маё прыняцце базавых законаў аб уласнасці, арэндзе, непрацаздольнасці і банкруцтве, Нацыянальным банку, зямлі, сялянскай (фермерскай) гаспадарцы, прыярытэтным сацыяльна-культурным і эканамічным развіцці сяла і аграпрамысловага комплексу, а таксама шэраг законаў па пытаннях нацыянальнай бяспекі, барацьбы са злачыннасцю і інш. Робяцца першыя крокі на шляху выканання прынятых законаў.

Вялікая работа праведзена па распрацоўцы Асноўнога Закона — Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Пытанне аб стварэнні новай Канстытуцыі паўстала на першай сесіі Вярхоўнага Савета дванаццатага склікання і 20 ліпеня 1990 г. была утворана адпаведная камісія. У яе склад увайшлі народныя дэпутаты, вучоныя-правазнаўцы. З першых дзён работы камісіі з мэтай больш рацыянальнай арганізацыі працы і з улікам наяўнасці розных падыходаў да стварэння Канстытуцыі ў яе рамках былі сфарміраваны дзве падкамісіі. Адну узначаліў намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета В. Шаладонаў, другую — народны дэпутат, кандыдат юрыдычных навук В. Ганчар. У лютым 1991 г. у Мінску адбылася навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная канстытуцыйнай рэформе. Многія каштоўныя меркаванні і прапановы, выказаныя на канферэнцыі, былі разгледжаны на чарговым пасяджанні канстытуцыйнай камісіі. У выніку крапатлівай работы у лістападзе 1991 г. праект новай Канстытуцыі быў прадстаўлены УШ сесіі Вярхоўнага Савета РБ для абмеркавання у першым чытанні, які у асноўным быў ухвалены. Для народнага абмеркавання праект таксама выразнілі апублікаваць у сродках масавай інфармацыі. Абмеркаванне насіла даволі актыўны характар і дало свой плён: было удакладнена 100 артыкулаў са 171. Гэта дало магчымасць канстытуцыйнай камісіі перайсці да чарговага этапа у сваёй дзейнасці і апублікаваць у жніўні 1992 г. удасканалены праект варыянта Асноўнага Закону, які у лістападзе абмеркавала X сесія Вярхоўнага Савета.

Але толькі дванаццатая сесія Вярхоўнага Савета (май — ліпень 1993 г.) пачала паартыкульнае абмеркаванне праекта Канстытуцыі. З разгледжаных 113 артыкулаў поўнасцю былі прыняты 64, астатнія прыняты часткова ці не адобраны. Сесія даручыла канстытуцыйнай камісіі падрыхтаваць праект Канстытуцыі для чарговага паартыкульнага разгляду на трынаццатай сесіі Вярхоўнага Савета. Напярэдадні дапрацаваны праект з улікам паправак выказаных народнымі дэпута-

тамі. прапаноў грамадзян быў змешчаны ў друку. Прыведзеныя факты сведчаць аб складанасці выпрацоўкі новага Асноўнага Закона Рэспублікі Беларусь.

Пабудова прававой дзяржавы звязана з павышэннем ролі суда ў структуры дзяржаўнай улады і ў грамадстве. Свабодная асоба мае патрэбу ў непрадузятай і кваліфікаванай судовай абароне. Але колькасць работнікаў судовых органаў Беларусі не адпавядае грамадскім патрэбнасцям. На канец 1992 г. у рэспубліцы налічвалася 718 суддзяў. На 1 мільён насельніцтва прыпадае ў сярэднім 72 суддзі, што у 2,5--3 разы менш, чым у развітых краінах з аналагічнай сістэмай права. Напрыклад, у Германіі на 1 мільён насельніцтва маецца 220 суддзяў. У выніку у Беларусі на аднаго суддзю прыходзіцца штомесяц звыш 50 спраў і матэрыялаў. Такая нагрузка перавышае межы дапушчальнага, што прыводзіць да судовых памылак, якія абарочваюцца для людзей вельмі дорага.

З фарміраваннем прававой дзяржавы непарыўна звязана ўзмацненне механізму падтрымкі правапарадку і барацьбы са злачыннасцю. У апошнія гады яна моцна ўзрасла, што звязана перш за ўсе з такімі адмоўнымі з'явамі, як крызіснае становішча эканомікі, нізкі ўзровень жыцця, інфляцыя, дэфіцыт спажывецкіх тавараў. Калі у 1990 годзе у Беларусі было зарэгістравана 75,7 тыс. злачынстваў, то у 1992 г. 96,6 тыс. Насілле, спекуляцыя, замахі на уласнасць і іншыя негатыўныя з'явы прыводзяць да дэстабілізацыі становішча.

Ва умовах рэзкага пагаршэння крымінагеннай абстаноўкі органы унутраных спраў не ў стане у поўнай меры забяспечыць надзейную ахову правоў і свабод грамадзян, дзяржаўных і грамадскіх інтарэсаў ад злачынных замахаў, своечасовае выяўленне злачынстваў і прыцягненне іх да адказнасці. У 1992 г., напрыклад, засталіся не раскрытымі трэцяя частка зарэгістраваных спраў. Звязана гэта не толькі з недастатковым прафесійным узроўнем кадраў, незадавальняючым матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем, празмернай перагружанасцю практычных работнікаў. Становішча ўскладняецца яшчэ і тым, што следчыя знаходзяцца у падпарадкаванні Міністэрства унутраных спраў, пракуратуры і Камітэта дзяржаўнай бяспекі. Наяўнасць паралельных структур следства у розных праваахоўных органах значна зніжае эфектыўнасць работы. Да таго ж меры адміністрацыйнага ўздзеяння на следчага не гарантуюць аб'ектыўнасць расследавання, што прыводзіць да парушэння правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

Такім чынам, сістэма органаў юстыцыі пакуль не у стане выконваць функцыі, неабходныя прававой дзяржаве. У гэтай сувязі камісія Вярхоўнага Савета РБ па заканадаўству распрацавала і прадставіла на абмеркаванне дзевятай сесіі Вярхоўнага Савета (красавік 1992 г.) Канцэпцыю судова-прававой рэформы. Яе правядзенне прызнана важнейшай перадумовай пабудовы у Рэспубліцы Беларусь прававой дзяржавы. Галоўнымі мэтамі судова-прававой рэформы з'яўляюцца: стварэнне прававой сістэмы, здольнай забяспечыць функцыянiраванне законаў; стварэнне самастойнай і незалежнай судовай улады як асноўнага гаранта правоў і свабод грамадзян і іншых удзельнікаў праваадносін; увасабленне у заканадаўстве дэмакратычных прынцыпаў арганізацыі і дзейнасці праваахоўных органаў, якія адпавядаюць агульнапрызнаным нормам міжнароднага права і навуковым рэкамендацыям.

Правядзенне судова-прававой рэформы пачалося з унясення змяненняў у дзеючае заканадаўства, распрацоўкі і прыняцця пакета заканадаўчых актаў. Прымаюцца арганізацыйныя меры па стварэнню асноўных элементаў новай сістэмы органаў юстыцыі, у тым ліку следчага камітэта як самастойнага ведамства у структуры Савета Міністраў РБ.

Важнейшай функцыяй прававой дзяржавы з'яўляецца недапушчэнне парушэння правоў і свабод грамадзян. У сувязі з гэтым праводзіцца работа па выкананню міжнароднай канцэпцыі правоў чалавека, якую дзесяцігоддзямі улады старанна не заўважалі. Дэмакратычныя пераўтварэнні дадатна паўплывалі на ажыццяўленне такіх палітычных правоў і свабод грамадзян, як права уносіць у дзяржаўныя органы і грамадскія арганізацыі прапановы аб паляпшэнні іх дзейнасці, аб'ядноўвацца у партыі, грамадскія арганізацыі, праводзіць мітынгі, вулічныя шэсці, дэманстрацыі, забастоўкі і інш.

Важнае значэнне у справе аднаўлення палітычнай справядлівасці мае работа па рэабілітацыі грамадзян, якія сталі бязвінnымі ахвярамі масавых рэпрэсій дыктатарскага рэжыму. Па стану на 1 ліпеня 1993 г. у рэспубліцы у грамадскіх адносінах было рэабілітавана каля 130 тыс. чалавек. Прымаліся меры па забяспячэнню правоў рэабілітаваных і іх родных, кампенсацыі панесеных матэрыяльных страт. З гэтай мэтай у ліпені 1989 г. пры Вярхоўным Савеце БССР была створана камісія па аказанню садзейнічання у забеспячэнні правоў і інтарэсаў рэабілітаваных і увекавечанні памяці ахвяр рэпрэсій.

меўных месца у перыяд 30--40-х і пачатку 50-х гадоў. І ліставада 1991 г. пастановай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь яна была перайменавана у камісію па аказанню садзейнічання у забеспячэнні правоў ахвяр палітычных рэпрэсій 20--80-х гадоў і увекавечанні іх памяці. Адпаведныя камісіі працуюць пры абласных, Мінскім гарадскім і раённых Саветах народных дэпутатаў.

Для рэабілітацыі у партыйным парадку былі створаны камісіі пры былых ЦК КПБ і іншых партыйных камітэтах рэспублікі. З канца 1988 г. да І студзеня 1991 г. бюро партыйных камітэтаў разгледзелі 685 спраў аб рэабілітацыі у партыйных адносінах. Гэта значна больш таго, што было зроблена у Кампартыі Беларусі пасля XX з'езда КПСС. Па 671 справе былі прыняты станоўчыя рашэнні, у тым ліку па 637 -- пасмяротна. Рэабілітаваны 52 былыя кіруючыя партыйныя работнікі, 72 работнікі савецкіх органаў, 150 рабочых і калгаснікаў, 75 прадстаўнікоў інтэлігенцыі. Сярод іх Д. Ф. Жылуновіч (Цішка Гартны), які ўзначальваў першы часовы рабоча-сялянскі урад БССР, былыя наркомы асветы А. В. Баліцкі і А. С. Дз'якаў. У кастрычніку 1990 г. быў рэабілітаваны акадэмік АН БССР У. М. Ігнатоўскі. Шэсць дзесяцігоддзяў замоўчваліся імя і справы гэтага буйнога дзяржаўнага і грамадскага дзеяча рэспублікі, вядомага вучонага, першага прэзідэнта АН БССР.

У рэспубліцы праведзена работа па расследаванню фактаў масавых растрэлаў людзей у лясным масіве Курапаты каля Мінска. Рашэннем Савета Міністраў БССР ад 14 чэрвеня 1988 г. была створана урадавая камісія. Яна прыйшла да высновы аб знішчэнні у гэтым месцы не менш як 30 тыс. грамадзян. Устанавіць асобы загінуўшых, канкрэтныя матывы пакарання смерцю і асоб, якія выконвалі прыгаворы і рашэнні пазасудовых органаў пакуль не удалося. У студзені 1989 г. Савет Міністраў БССР прыняў пастанову "Аб увекавечанні памяці ахвяр масавых рэпрэсій 1937--1941 гг. у лясным масіве Курапаты". Праводзіцца конкурс на праект помніка ахвярам сталіншчыны.

З развіццём дэмакратыі у грамадстве склаліся умовы для вяртання да шматпартыйнасці, адкрытай формы палітычнага плюралізму, спыненага у пачатку 20-х гадоў. Цяпер грамадзянам прадстаўляецца магчымасць адстойваць свае інтарэсы або сацыяльных груп ці слаёў. Для гэтага могуць быць створаны адпаведныя палітычныя аб'яднанні. Калі у пачатку 1991 г. у рэспубліцы была зарэгістравана адна партыя, то на 10 сакавіка 1993 г. прайшлі рэгістрацыю 11

партыі і 5 грамадска-палітычных рухаў. Іх адрозненне паміж сабою заключаецца у праграмных мэтах, шляхах іх дасягнення і прынцыпах арганізацыйнай пабудовы. У партыях звычайна устанаўліваецца фіксаванае членства, а у грамадска-палітычных рухах гэта адсутнічае, затое у іх склад на правах калектыўных членаў нярэдка уваходзяць нават партыі і установы. Новыя палітычныя фарміраванні ўяўляюць даволі шырокі спектр сіл: ад прыхільнікаў сацыялістычнай ідэі да капіталістычнага развіцця.

Такім чынам, пераход да дэмакратычнага грамадства аказаўся цяжкай справай. Дэмакратызацыя як і эканамічныя рэформы праходзяць складана. Тым не менш, працэсы дэмакратызацыі развіваюцца і папаўняюцца свежымі рысамі. Фарміруюцца новыя інстытуты палітычнай улады, у грамадскае жыццё уваходзіць плюралізм, галоснасць. Але дэмакратычныя тэндэнцыі нярэдка бываюць адарванымі ад эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, што аслабляе іх. Для кансалідацыі грамадства нацыянальная ідэя павінна больш абапірацца на шырокую дэмакратычную ідэю.

На працягу некалькіх апошніх дзесяцігоддзяў адбываўся бязупынны, ідэалагічна абгрунтаваны адпаведнымі установамі працэс асіміляцыі беларускай культуры і мовы. У выніку вырасла не адно пакаленне людзей, цалкам ці ў значнай ступені адарваных ад нацыянальна-культурнай глебы, абыякавых да сваёй гістарычнай і самабытнай спадчыны, роднай зямлі. Нацыянальны нігілізм ахапіў літаральна усе пласты беларускага народа.

Асабліва адчувальныя страты панесла беларуская мова, якая аказалася амаль дазвання выціснутай людзьмі не з усіх сфер грамадскага жыцця рэспублікі. Такая дыскрымінацыя беларускай мовы на яе гістарычнай тэрыторыі парушала самыя элементарныя правы чалавека, годнасць нацыі.

У той час, калі кіруючыя структуры Беларусі, у першую чаргу КПБ, заставаліся абыякавымі да лесу нацыянальнай мовы, у яе абарону выступілі прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі. 15 снежня 1986 г. 28 чалавек, сярод іх вядомыя у рэспубліцы пісьменнікі В. Быкаў, Я. Брыль, Р. Барадулін, В. Вітка, В. Адамчык, накіравалі на імя Генеральнага сакратара ЦК КПСС М. Гарбачова ліст, у якім былі зроблены прапановы па карэнным паляпшэнню становішча роднай мовы і культуры. Але партыйныя вярхі не думалі займацца пераглядам моўнай палітыкі.

Не адмовіўся ад далейшага працягу русіфікацыі і сакавіцкі (1987 г.) пленум ЦК КПБ. Прызнаўшы нарэшце звужэнне выкарыстання беларускай мовы у выніку, як тады модна было гаварыць, свабоднага волевыяўлення працоўных, тагачасны першы сакратар ЦК КПБ Я.Сакалоў даволі рэзка крытыкаваў тых прадстаўнікоў інтэлігенцыі, якія паспяшаліся зрабіць з гэтага вывад аб нібыта няправільных адносінах да культурна-моўнай спадчыны беларускага народа у цэлым. На пленуме беспадстаўна заяўлялася, што у рэспубліцы створана усе для развіцця беларускай мовы, беларускай нацыянальнай культуры, а таму, "хто памыляецца у гэтых пытаннях, трэба дапамагчы разабрацца".

З такой неаб'ектыўнай ацэнкай не пагаджаліся многія прадстаўнікі творчай і навуковай інтэлігенцыі. Таму за подпісам больш ста чалавек у Маскву быў накіраваны яшчэ адзін ліст. Прапагандуючы у масах ідэю нацыянальнага адраджэння, у гэты час пачаўся рух за наданне беларускай мове статуса дзяржаўнай. Але гэтая ідэя не знаходзіла падтрымкі у значнай часткі русіфікаваных беларусаў, якія па-ранейшаму нігілістычна ставіліся да свайго роднага слова, а таксама у афіцыйных партыйных колах, якія бачылі у такой ідэі праяву беларускага нацыяналізму. Узнікла вострая патрэба у арганізацыі планамернай растлумачальнай работы аб ролі беларускай мовы у жыцці яе носьбітаў. Па ініцыятыве пісьменнікаў і навукоўцаў распачаўся рух па стварэнню Таварыства Беларускай Мовы (ТБМ). Яго ўстаноўчы з'езд адбыўся у чэрвені 1989 г. Утворанаму таварыству было нададзена імя Францішка Скарыны. Рэспубліканскую Раду ТБМ узначаліў паэт Н. Гілевіч. З сакавіка 1990 г. Таварыства выдае штотыднёвую газету "Наша слова".

Адзінаццатая сесія Вярхоўнага Савета БССР адзінаццатага склікання (ліпень 1989 г.) утварыла камісію па падрыхтоўцы праекту аб заканадаўчым урэгуляванні статуса беларускай, рускай і іншых моў, якімі карыстаецца насельніцтва рэспублікі. У выніку больш чым чатырохмесячнай працы яна падрыхтавала праект Закона "Аб мовах у Беларускай ССР". Пры яго распрацоўцы камісія выкарыстоўвала вопыт беларусізацыі 20-х гадоў, улічваліся заканадаўчыя акты аб мовах у іншых рэспубліках, міжнародная заканадаўчая практыка.

Пасля разгляду і падтрымкі праекта у трох пастаянных камісіях Вярхоўнага Савета БССР ён быў вынесены на усенароднае абмеркаванне. Больш за 20 тыс. чалавек выказалі свае прапановы і заўвагі.

Усе яны былі уважліва разгледжаны, узважаны і у большасці сваёй улічаны пры канчатковай дапрацоўцы праекта. 26 студзеня 1990 г. чатырнаццатая сесія Вярхоўнага Савета прыняла Закон БССР "Аб мовах у Беларускай ССР", у адпаведнасці з якім беларуская мова прызнана адзінай дзяржаўнай мовай рэспублікі. У той жа час у Законе адзначаецца, што, забяспечваючы усебаковае развіццё і функцыянiраванне беларускай мовы ва ўсіх сферах грамадскага жыцця, рэспубліка праяўляе дзяржаўны клопат аб свабодным развіцці і ужыванні ўсіх нацыянальных моў, якімі карыстаецца насельніцтва Беларусі.

У сувязі з прыняццем Закону аб мовах, Вярхоўны Савет Беларусі даручыў Савету Міністраў БССР распрацаваць Дзяржаўную праграму развіцця беларускай мовы і іншых нацыянальных моў у Беларускай ССР, якая была прынята 20 верасня 1990 г. У ей прадугледжаны шэраг канкрэтных захадаў па адраджэнню і развіццю мовы і культуры беларускага народа, свабоднаму і раўнапраўнаму выкарыстанню моў прадстаўнікамі іншых нацыянальнасцей, якія жывуць на тэрыторыі рэспублікі.

Так завяршылася стварэнне заканадаўчай базы адраджэння беларускай мовы. У адпаведнасці з Законам, Дзяржаўнай праграмай пачаўся складаны шлях па пашырэнню сферы беларускай мовы у службовым справаводстве рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады, на прадпрыемствах і установах. Адным з першых на яе перайшоў апарат Міністэрства культуры, яго мясцовыя структуры. Аднак у цэлым пераход службовага справаводства рэспубліканскіх і мясцовых органаў улады і кіравання, прадпрыемстваў і устаноў на беларускую мову ажыццяўляецца вельмі марудна.

Адметнай прыкметай апошніх гадоў з'яўляецца скарачэнне колькасці рускамоўных школ. У 1992/93 навучальным годзе з агульнай колькасці 4953 школ 3141 (63,4%) працавалі на беларускай мове. На ёй жа атрымлівалі адукацыю 68,5% першакласнікаў, супраць 28,9% у 1990/91 навучальным годзе.

У складаных умовах развіваецца мастацкая культура Беларусі. З кожным усплескам інфляцыі усе большая патрэба адчуваецца у фінансавых сродках, каб падтрымаць творчыя саюзы, прафесійныя калектывы, установы культуры, мастацтва, друк. Нягледзячы на складаныя сацыяльна-эканамічныя і палітычныя умовы у авангардзе нацыянальнага адраджэння знаходзіцца пісьменніцкая арганізацыя. На пачатку 1990 г. яна налічвала у сваіх радах 397 членаў, якія

сваімі мастацкімі і публіцыстычнымі творамі уносяць важкі ўклад у фарміраванне нацыянальнай свядомасці свайго народа. Большасць з іх накіроўвае свае творчыя пошукі на глыбокае асэнсаванне складаных праблем сацыяльна-эканамічнага і духоўнага жыцця Беларусі.

Шэраг лепшых твораў адзначаны дзяржаўнымі узнагародамі. У 1986 г. лаўрэатамі дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы і Якуба Коласа сталі Я. І. Янішчыц за кнігу лірыкі "Пара любові і жалю" і А. П. Кудравец за раман "Сачыненне на вольную тэму". Дзяржаўныя прэміі 1988 г. былі прысуджаны М. Л. Стральцову за кнігу вершаў "Мой свеце ясны" і В. У. Адамчыку за раманы "Чужая бацькаўшчына", "Год нулявы", "І скажа той, хто народзіцца". У 1990 г. лаўрэатамі сталі А. А. Разанаў за кнігу паэзіі "Вастрые стралы", Г. В. Кісялёў за кнігі гісторыка-літаратурных даследванняў "Адшукваецца класік" і "Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча", А.А.Лойка за раман-эсэ "Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае".

Адметнай рысай дзяржаўных прэмій 1992 г. з'явілася тое, што ўпершыню яны прадстаўлялі прэміі незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь. Напярэдадні былі абноўлены палажэнні і склад Камітэта па Дзяржаўных прэміях у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры.

Сярод твораў паэзіі былі адзначаны кнігі С. І. Законнікава "Заклінанне" і Алеся Звонака "Святлацені". У апошнім зборніку старэйшына беларускай паэзіі расказвае аб сваім жыццевым шляху, у тым ліку ва умовах сібірскай катаргі і ссылкі, куды незаслужана папаў паэт. Лаўрэатамі таксама сталі С. І. Грахоўскі і А. А. Жук за кнігі "Споведзь" і "Праклятая любоў". Былы вязень сталінскіх канцлагераў С. Грахоўскі раскрывае жахі ГУЛАГа, уносіць важкі ўклад у распрацоўку беларускай літаратурай гэтай складанай праблемы. В. С. Сёмуха адзначаны прэміяй за пераклад з нямецкай мовы на беларускую рамана Томаса Мана "Доктар Фаўстас".

Важнае месца ў літаратурным жыцці заняліпрацосы знаёмства грамадскасці з творамі незаслужана "забытых" пісьменнікаў і паэтаў. З спецхранаў і сховішчаў былі вернуты чытачам і надрукаваны празаічныя палотны А. Мрыя, М. Гарэцкага, А. Гаруна, Л. Калюгі, П. Галавача, В. Ластоўскага. Убачылі свет творы такіх паэтаў розных часоў, як Т. Зан, Я. Лучына, Я. Чачот, Л. Геніюш, А. Моркаўка, У. Жылка, У. Хадыка, І. Дварчанін, К. Буйло і іншых.

З кожным годам грамадскасць Беларусі усё шырэй знаёміцца з ле-

сам і творчасцю літаратараў, якія па тых ці іншых абставінах аказаліся у эміграцыі. Гэта новы пласт літаратурнай спадчыны, які да гэтуль не быў знаёмы шырокаму колу чытачоў. Неадназначную ацэнку у грамадстве выклікалі публікацыі, прысвечаныя жыццёваму і творчаму шляху паэтэсы Н. Арсенневай. У час фашысцкай акупацыі разам з мужам, які супрацоўнічаў з немцамі, паэтэса жыла у Мінску, працавала у прафашысцкай "Менскай газеце", была узнагароджана гітлераўскім медалем. У 1944 г. разам з мужам выехала у Германію, з 1950 г. жыве у ЗША. Некаторыя вершы Н. Арсенневай былі надрукаваны у зборніку паэзіі беларускай эміграцыі "Туга на радзіме" (1992 г.), многіх часопісах.

Чытачы змаглі пазнаёміцца з творчасцю паэта, былога вязня ГУЛАГа М. Сядзнева, які зараз жыве у гарадку Глен-Кове пад Нью-Йоркам. Сталі таксама вядомы творы паэтаў Р. Крушыны (Казака), У. Дудзіцкага (Гуцько), Х. Ільяшэвіча, У. Клішэвіча, М. Кавыля (Я. Лешчанкі), Я. Юхнаўца, Я. Золака (Антона Данілавіча), С.Ясеня (Янкі Запрудніка), А. Салаўя (А. Радзюка) і іншых.

Грамадскасць Беларусі пазнаёмілася з празаічнымі творамі Кастуся Акулы, які зараз жыве у Канадзе, У. Сядуры (Ул. Глыбіннага), былога члена "Узвышша" Ю. Віцьбіча, І. Рытар (А. Саковіч) і іншых.

У складаных умовах развіваюцца тэатры Беларусі. Не хапае сродкаў, сацыяльна не абароненымі перад рынкавай стыхіяй аказаліся майстры сцэны. У сувязі з падзеннем жыццёвага узроўня людзей зніжаецца наведванне тэатраў: з 3274 тыс. наведаванняў у 1985 г. да 2442 тыс. у 1991 г. Нягледзячы на цяжкасці беларускае тэатральнае мастацтва знаходзіцца на шляху служэння нацыянальна-культурнаму адраджэнню Бацькаўшчыны. За апошнія гады створаны новыя нацыянальныя тэатральныя калектывы, якія працуюць на беларускай мове. Гэта дзяржаўныя тэатры у Мінску (Муніцыпальны драматычны тэатр -- студыя " Дзе--я"), Мазыры (драматычны тэатр), Слоніме (Слонімскі беларускі драмтэатр), Маладзечне (Мінскі абласны тэатр). Новай з'явай з'явілася стварэнне у 1992 г. у Гомелі першага у Беларусі прыватнага тэатра, які называецца "Незалежны тэатр". На сутнасці сёння усе тэатры асвабадзіліся ад манаполіі дзяржавы у арганізацыі тэатральнай справы, цвердага кіравання, цэнзуры, прымусовай ідэалагізацыі.

Першыя крокі па шляху беларускага нацыянальна-культурнага Ад-

раджэння робяць установы культуры. Свае намаганні яны накіроўваюць на адраджэнне забытых святаў, абрадаў, традыцыйных відаў народнай творчасці. Упершыню за ўвесь пасляваенны перыяд пачала расці ўдзельная вага беларускай літаратуры ў фондах бібліятэк рэспублікі. Сярод музеяў пашыраецца сетка ўстаноў фальклорнага і гісторыка-этнаграфічнага накірунку. Пачалі працаваць музей М. Багдановіча ў Мінску, Міёрскі гісторыка-этнаграфічны, Аршанскі музей этнаграфіі і льну, музей кнігадрукавання ў Полацку і інш. Але на працэс беларусізацыі ўстаноў культуры разбуральны ўплыў робіць рынкавая стыхія. Закрываюцца бібліятэкі, сельскія клубы.

У сучасным нацыянальным адраджэнні і выхаванні вялікае значэнне мае разумнае выкарыстанне помнікаў гісторыі і культуры. У 1987 г. на тэрыторыі Беларусі знаходзіліся на уліку 15 210 помнікаў, сярод якіх 10 048 помнікаў гісторыі, 2697 — археалогіі, 1253 — манументальнага мастацтва, 1212 — дойлідства. Нягледзячы на востры недахоп матэрыяльных і фінансавых сродкаў, усе ж праводзіцца пэўная работа па іх рэстаўрацыі, асабліва тых, што маюць непасрэднае дачыненне да гісторыі і культуры беларускай нацыі.

Адраджэнне беларускай нацыянальнай культуры немагчыма без авалодання духоўнымі каштоўнасцямі, якія выпрацаваны усімі папярэднімі пакаленнямі людзей. У многім гэтаму можа дапамагчы і царква, калі яна стаіць на абароне нацыянальных інтарэсаў сваіх прыхаджан. Вось ужо тысячагоддзе на Беларусі існуе хрысціянства. Велічныя храмы, рэлігійны жывапіс, багатыя культурныя, літаратурныя і рэлігійна-філасофскія творы, царкоўныя абрады зрабілі за гэты час значны адбітак на культуру беларускага народа. Але класавы падыход, догмы таталітарнай, камандна-адміністрацыйнай сістэмы, партыйны ўціск прывялі да ганення на рэлігію, вернікаў і рэлігійных дзеячаў, знішчэння храмаў, забыцця народных традыцый і абрадаў, што стала адной з прычын падзення маралі людзей. Пачатак перагляду адносін да царквы быў пакладзены яшчэ ў межах былога Саюза ССР. Прававым актам такой палітыкі з'явіўся Закон СССР "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных аб'яднаннях", прыняты 1 кастрычніка 1990 г.

Карэнная перабудова царкоўна-дзяржаўных адносін пачалася і на Беларусі. Іх замацаваў Закон РБ "Аб свабодзе веравызнанняў і рэлігійных арганізацыях", прыняты сесіяй Вярхоўнага Савета РБ у снежні 1992 г. Стварэнне умоў для забеспячэння поўных прававых гарантый для выказвання верующымі сваіх перакананняў і патрэба-

ванняў знайшло адлюстраванне у росце рэлігійных абшчын. Так, у перыяд з 1986 па 1993 г. колькасць абшчын беларускай праваслаўнай царквы выросла з 370 да 788, рымска-каталіцкай — з 112 да 305, хрысціян веры евангельскай — з 68 да 163. Калі у 1986 г. усяго на Беларусі дзейнічала 804 абшчыны розных канфесій, то у 1992 г.— 1519.

Распачаты з сярэдзіны 80-х гадоў рух на нацыянальна-культурнае адраджэнне, фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа хаця і выклікаў у ім абуджэнне, аднак не прывеў у дзеянне шырокія пласты людзей з-за іх ледзь не пагалоўнай асіміляцыі, не азнаменаваўся прыкметнымі зрухамі па кансалідацыі іх у трывалую самабытную этнічную супольнасць.

Палітычнае развіццё грамадства ва ўмовах радыкальных пераўтварэнняў прывяло да ўзнікнення новых узаемаадносін паміж рэспублікамі і цэнтрам, які на працягу сямі дзесяцігоддзяў трымаў іх у бяспрэчным падпарадкаванні. На месцах, у тым ліку у Беларусі, шырыўся рух за нацыянальную незалежнасць. Але вышэйшае палітычнае кіраўніцтва СССР не ішло насустрач рэспублікам у прадстаўленні ім самастойнасці.

27 ліпеня 1990 г. Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР прыняла сесія Вярхоўнага Савета БССР. Дэкларацыя абвясціла вяршэнства на тэрыторыі рэспублікі Канстытуцыі Беларускай ССР і яе законаў. Гэтым быў пакладзены пачатак шляху да дзяржаўнага суверэнітэту, хаця рэспубліка яшчэ не валодала юрыдычнай, палітычнай і гаспадарчай самастойнасцю.

Правал жнівеньскага путча 1991 г. стварыў спрыяльныя умовы для руху у гэтым накірунку. 25 жніўня 1991 г. пятая унеачарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР прыняла закон "Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі" і пастанову "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР", якімі аб'явіла палітычную і эканамічную незалежнасць Беларускай ССР.

Пачатак суверэннага развіцця азнаменаваўся заменай назвы рэспублікі, а таксама дзяржаўнай сімволікі. 19 верасня 1991 г. шостая унеачарговая сесія Вярхоўнага Савета БССР разгледзіла пытанне "Аб назве Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі". Было прынята рашэнне Беларускую Савецкую Сацыялістычную Рэспубліку

надалей называць Рэспубліка Беларусь, а у скарочаных і састаўных назвах -- Беларусь. У той жа дзень былі прыняты Законы "Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь", "Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь". Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь цяпер уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаецца з трох гарызантальна размешчаных каляровых палос роўнай шырыні верхняй і ніжняй белага, а сярэдняй — чырвонага колеру. Дзяржаўным гербам стаў старажытны беларускі герб "Пагоня", які сімвалізуе даўняе існаванне дзяржаўнасці беларускага народа.

Пасля правалу жнівеньскага перавароту адбылося рэзкае змяненне абстаноўкі у краіне. Саюзная улада аказалася паралізаванай: на месцах ніхто не выконваў прэзідэнцкія указы і законы Вярхоўнага Савета СССР. Фактычна улада на месцах знаходзілася у руках рэспублік. У гэты час прэзідэнт, саюзныя структуры прымалі меры па рэанімацыі старой дзяржавы у межах новаагароўскага працэса. Але глыбокі эканамічны крызіс, сацыяльная неўладкаванасць насельніцтва, бездапаможнасць цэнтра штурхалі рэспублікі на пошук шляхоў канчатковага вызвалення ад цэнтральных улад. 8 снежня 1991 г. у Віскулях (Белавежская пушча) кіраўнікі Беларусі, РСФСР і Украіны падпісалі пагадненне аб стварэнні Садружнасці Незалежных дзяржаў (СНД). Яго ўзнікненне у рэспубліцы, як і у іншых месцах краіны, было ўспрынята неадназначна. Адны палічылі гэты акт неканстытуцыйным, іншыя падтрымалі нараджэнне Садружнасці. 10 снежня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў пагадненне незалежных дзяржаў аб стварэнні Садружнасці. Адначасова была прынята пастанова ад дэнансацыі дагавора 1922 г. аб утварэнні СССР.

Пасля абвяшчэння палітычнай і эканамічнай незалежнасці Беларусі пачалася работа па фарміраванню органаў кіравання. 25 жніўня 1991 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон "Аб некаторых змяненнях у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Беларускай ССР", якім перайменаваў саюзна-рэспубліканскае міністэрства ўнутраных спраў БССР у рэспубліканскае міністэрства ўнутраных спраў, падпарадкаваўшы яму ўнутраныя войскі Міністэрства ўнутраных спраў СССР і навучальныя установы Міністэрства ўнутраных спраў СССР, размешчаныя на тэрыторыі рэспублікі.

У гэты ж дзень саюзна-рэспубліканскі Камітэт дзяржаўнай бяспекі БССР быў перайменаваны у рэспубліканскі Камітэт дзяржаўнай

бяспекі. У кастрычніку 1991 г. Вярхоўны Савет рэспублікі прыняў Закон "Аб змяненні у сістэме органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь", якім падпарадкаваў Камітэт дзяржаўнай бяспекі Вярхоўнаму Савету Рэспублікі Беларусь. Былі перагледжаны функцыянальныя накірункі дзейнасці камітэта, скасавана служба палітычнага вышуку. Такі ж лёс напаткаў і яшчэ тры упраўленні.

У верасні 1991 г. Савету Міністраў Беларусі былі падпарадкаваны пагранічныя войскі Камітэта дзяржаўнай бяспекі СССР. З пачатку 1992 г. пачало дзейнічаць Галоўнае упраўленне пагранічных войскаў пры СМ РБ. За кароткі тэрмін упраўленне правяло работу па умацаванню пагранзастаў. Да верасня 1992 г. у рэспубліку удалося вярнуць 1400 беларусаў-пагранічнікаў.

У мэтах забеспячэння палітычнай і эканамічнай самастойнасці Рэспублікі, удасканалення знешнеэканамічнай дзейнасці 20 верасня 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову "Аб мытнай службе Рэспублікі Беларусь". Згодна з ёй Беларускае упраўленне дзяржаўнага мытнага кантролю СССР было пераўтворана у дзяржаўны мытны камітэт Рэспублікі Беларусь. У яго падпарадкаванне перайшлі мытныя органы СССР, размешчаныя на тэрыторыі рэспублікі.

Станаўленне суверэннай дзяржавы паставіла пытанне аб стварэнні ўласнага войска, што з'яўляецца не толькі атрыбутам дзяржаўнасці, але і гарантам яе бяспекі. 20 верасня 1991 г. VI унеачарговая сесія Вярхоўнага Савета прыняла пастанову "Аб стварэнні Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь". Савету Міністраў Беларусі былі падпарадкаваны мясцовыя органы ваеннага кіравання рэспублікі, чыгуначныя войскі, сістэма грамадзянскай абароны Саюза ССР, дэслацыравання на тэрыторыі рэспублікі. Вышэйшаму органу выканаўчай улады рэспублікі даручалася вызначэнне парадку перадыслакацыі у межах Беларусі, увод і вывад з яе тэрыторыі часцей і злучэнняў Узброеных Сіл СССР, пагранічных, чыгуначных і будаўнічых войск, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі, а таксама матэрыяльна-тэхнічных сродкаў, якія належаць ім. З асенняга прызыву 1991 г. пачалося праходжанне ваенных збораў і абавязковай тэрміновай воінскай службы грамадзянамі Беларусі на тэрыторыі рэспублікі.

У сакавіку 1992 г. пачало дзейнічаць міністэрства абароны РБ. Пачатак непасрэднаму стварэнню ўласных Узброеных Сіл паклала пастанова Савета Міністраў РБ ад 6 мая 1992 г. "Аб перападпарадка-

ванні фарміравання Узброеных Сіл, якія дыслацыруюцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрству абароны". Была скасавана Беларуская ваенная акруга. Усе яе часці і падраздзяленні, а таксама часці цэнтральнага падпарадкавання, не уваходзячыя у склад стратэгічных сіл СНД, перайшлі у падпарадкаванне Міністэрства абароны Рэспублікі.

Дзесятая сесія Вярхоўнага Савета (кастрычнік—лістапад 1992 г.) абмеркавала пытанне "Аб ваеннай дактрыне Рэспублікі Беларусь", дзе падкрэслена неабходнасць быць без'ядзернай, нейтральнай дзяржавай і стварацъ толькі абарончыя узброеныя сілы. Да цяперашняга часу Беларусь з'яўляецца самай мілітарызаванай дзяржавай Еўропы. У рэспубліцы адзін ваеннаслужачы прыходзіцца на 43 чалавекі насельніцтва, на Украіне — на 98, у Казахстане — на 118, Таджыкістане — на 528, Расіі — на 634 чалавекі.

31 снежня 1992 г. адбылося прыняцце ваеннай прысягі асабовым складам Узброеных Сіл РБ, тэкст якой зацвердзіў Вярхоўны Савет рэспублікі. Ва урачыстай абстаноўцы ваеннаслужачыя прысягнулі на вернасць Бацькаўшчыне, яе народу па ахове суверэнітэту, незалежнасці, бяспекі і цэласнасці Рэспублікі Беларусь. Гэтым актам завяршылася юрыдычнае афармленне уласных Узброеных Сіл.

Ахову эканамічных інтарэсаў незалежнай Беларусі праводзіць новая банкаўская сістэма. Каардынацыю знешнеэканамічнай дзейнасці міністэрствау, дзяржаўных камітэтаў і ведамстваў Беларусі і іншых удзельнікаў знешніх эканамічных сувязей, размешчаных на тэрыторыі рэспублікі, незалежна ад іх падпарадкаванасці і форм уласнасці, забеспячэнне правядзення адзінай знешнеэканамічнай палітыкі ажыццяўляе Дзяржаўны Камітэт РБ па знешніх эканамічных сувязях.

Як бачна, працэсы рэфармавання грамадства у Беларусі праходзяць складана. Прадаўжаецца спад вытворчасці, зніжэнне жыццёвага узроўня людзей. Некалькі лепш ажыццяўляюцца працэсы дэмакратызацыі. Але яны нярэдка бываюць адарванымі ад эканамічнай і сацыяльнай палітыкі, што аслабляе іх эфектыўнасць. Для стварэння сапраўды дэмакратычнай, суверэннай дзяржавы Рэспублікі Беларусь неабходна кансалідацыя, згода усяго грамадства, усіх палітычных сіл. У гэтым гарант будучага працвітання нашай Бацькаўшчыны.

ТЭМА 29. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА : ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ.

Вучэбныя пытанні. 1.Ранняя міграцыя з беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага. 2. Пашырэнне перасяленняў у XVI--XVII ст.ст. 3. Асаблівасці міграцыі у першае стагоддзе пасля анексіі беларускіх зямель Расіяй. 4. Першая хваля масавай міграцыі на рубяжы XIX--XX ст.ст. і пачатак фарміравання беларускай дыяспары. 5. Другая міграцыйная хваля і адметнасці беларускай дыяспары у міжваенны перыяд. 6. Дзейнасць беларускай эміграцыі у 40-х -- першай палове 80-х гадоў. 7. Новая дзяржаўная палітыка і сучасны стан беларускай дыяспары.

Перамяшчэнне людзей з аднаго рэгіена у другі, з краіны у краіну і з кантынента на кантынент -- з'ява натуральная і звычайная у гісторыі чалавецтва. У розныя часы міграцыя насельніцтва мела добраахвотны ці прымусовы характар і вынікалася геаграфічнымі, сацыяльна-эканамічнымі, канкрэтна-гістарычнымі фактарамі: спустошальнымі войнамі і эпідэміямі, голадам, ростам насельніцтва і неабходнасцю асваення новых тэрыторый, розным узроўнямі жыцця народаў і фарміраваннем рынку рабочай сілы, рэлігійнымі, нацыянальнымі ўцісканнямі і інш.

У розных гістарычных умовах па эканамічных, палітычных, ваенных, рэлігійных і іншых прычынах насельніцтва беларускіх этнічных зямель перасялялася у іншыя рэгіены дзяржавы і за яе межы, ішло паступовае фарміраванне дыяспары (ад грэчаскага diaspora -- рассейванне) як знаходжанне значнай часткі народа па-за краінай (тэрыторыяй) свайго паходжання.

Ранняя эміграцыя вызначалася, найперш, уцекамі з ВКЛ тых, хто быў незадаволены яго палітыкай ці праследваўся. Полацкі князь Андрэй, які адказваўся прысягнуць Ягайлу, выехаў у 1377 г. у Маскоўскае княства, удзельнічаў у Кулікоўскай бітве. Туды ж падаўся у 1408 г. супернік Вітаўта Северскі князь Свідрыгайла Альгердавіч, многія чарнігаўскія і северскія баяры. Натуральнай эміграцыі з беларускіх зямель спрыялі створаныя у Вялікім княстве Літоўскім прававыя падставы. Князі, рыцары, шляхта і баяры Вялікага княства Літоўскага маглі накідаць яго "для лепшего щастья набытья" і абучэння ваеннаму майстэрству на падставе прывілея вялікага князя Казіміра ад 1447 г., замацаванага за-

тым у Статуце 1529 г. Першымі актамі, якія пацвердзілі права ўсіх вольных людзей на выезд за мяжу, былі Віцебскі (1503 г.) і Полацкі (1547 г.) абласныя прывілеі, вызначыўшы статус гэтых зямель у ВКЛ. Статуты 1566, 1588 г.г. прадугледжвалі магчымасць наведвання іншых зямель (акрамя "непрыяцельскіх") ужо вольнымі людзьмі "всякого стану" (усякага саслоўя) для лячэння, набыцця адукацыі, навучання рамяству, азнаямлення з ваеннай справай. Цяпер незадаволеныя палітыкай вялікага князя беглі з ВКЛ у "непрыяцельскія" краіны. Пасля нядалага загавора 1481 г. супраць вялікага князя Казіміра у Маскоўскае княства перабеглі князі Федар Бельскі, Васількія, Адаеўскія, Варатынскія, Бялеўскія. У 1508 г. туды выехаў князь Міхаіл Глінскі, які падняў бунт супраць вялікага князя Сігізмунда І. Многія з беглых князёў набылі у Маскве значны уплыў, знаходзіліся у блізкім сваяцтве з вялікакняжацкімі, а затым і царскімі родамі. Многія з вольных людзей, якія выязджалі у замежныя краіны пакідалі там добрую спадчыну, спрыялі распаўсюджванню кнігадрукавання і асветы. Так, Францыск Скарына здабыў звание доктара філасофіі у Кракаве і медыцыны у Падуі, першыя кніжкі Бібліі на старабеларускай мове выдаў у 1517--1519 гг. у Чэхіі, дзе жыў ад 1534 г. да смерці і стаў там адным з заснавальнікаў старэйшага ў цэнтральнай Еўропе батанічнага сада. Іван Федаров, друкарскі знак якога дае падстаўы меркаваць аб яго беларускім паходжанні, і беларус Петр Мсціславец выпусцілі першую у Маскоўскай дзяржаве друкаваную кнігу "Апостал" (1564 г.), а затым два выданні "Часоўніка", па якому праводзілася пачатковае навучанне грамаце. Сімяон Полацкі ва ўзросце 34 год пераехаў у Маскву. Тут ён арганізаваў Верхнюю друкарню у Крамлі, дзе пад яго начелам выйшлі "Буквар" (1678 г.) і іншыя кнігі. Па яго ініцыятыве адкрыта першая вышэйшая агульнаадукацыйная установа, якая затым стала знакамітай славяна-грэка-лацінскай акадэміяй. Сімеон Полацкі стаў пачынальнікам рускай сілябічнай паэзіі і драматургіі, выдатным прадстаўніком беларускай і рускай грамадскай -палітычнай і філасофскай думкі свайго часу. Ілля Капіевіч (1651--1714) з Мсціслаўшчыны, зведаўшы ганенні езуітаў, выехаў у Галандыю, дзе адкрыў уласную друкарню. Тут па даручэнню Пятра І ён пераклаў, склаў, падрыхтаваў ці падрыхтаваў да друку каля 20 падручнікаў і кніг для выхавання моладзі. Капіевічам былі складзены і выдадзены першая у Расіі арыфметыка, першыя дапаможнікі па

замежных мовах, першы каляндар. Перакладзеная і выданая ім першая у Расіі кніга па навігацыі служыла дапаможнікам амаль стагоддзе.

Значнае павелічэнне перасяленняў на усход у канцы XVI--XVII-м стагоддзі вызначалася больш раннім узмацненнем феадальнай эксплуатацыі сялян у ВКЛ, нацыянальна-рэлігійнага ўціску у Рэчы Паспалітай. Калі Маскоўская дзяржава пачала барацьбу за усходнеславянскія (і беларускія у тым ліку) землі, абвяшчаючы сябе спадкаемцай "Кіеўскай Русі" (уже Іван III назваў сябе "государем всея Руси"), то яна заахвочвала імігрантаў беларусаў як "исконно русских" для каланізацыі далучаных на усходзе рэгіенаў -- прадастаўляла прытулак беглым (а многім прыгонным і волю), аказвала матэрыяльную падтрымку, прымала іх на службу, як, дарэчы, і захопленых у палон. У XVII--XVIII ст.ст. беларускія землі часта станавіліся арэнай жорсткіх баёў у войнах Расіі з Рэччу Паспалітай і іншымі краінамі, з іх жыхароў масава высялялі ў глыбінныя рэгіены імперыі. Двойчы толькі за адно стагоддзе пад час вайны 1654--1667 гг. і Паўночнай вайны 1700--1721 гг. -- насельніцтва спустошанай Беларусі скарачалася на палову: кожны другі жыхар загінуў ці трапіў у палон, быў выселены у Расію.

Выхадцы з беларускіх зямель і прымусова перасяленыя сяляне, рамеснікі, гандляры, шляхта спрыялі гаспадарчаму асваенню Паволжа і Сібіры, некаторыя з іх займалі значныя пасады на ваеннай і дзяржаўнай службе, сталі заснавальнікамі купецкіх родаў, абагачалі культурнае жыццё у месцах свайго пражывання. Перасяленцы з беларускіх зямель і іх нашчадкі былі у ліку пачынальнікаў геаграфічнага і этнаграфічнага вывучэння новых каланізаваных Расіяй рэгіенаў, карэнных народаў Прыуралля, Сібіры, Чукоткі, Камчаткі (А. Камінскі -- Длужык, І. Сеніцкі і інш.). У другой палове XVII ст. дзесяткі майстроў з Полацка, Віцебска, Оршы, Шклова, Магілева і іншых гарадоў працавалі у Аружэйнай палаце, надабляці цэрквы Крамля, Каломенскі палац, Новадзявочы, Данскі і Нова-Іерусалімскі манастыры. Яны прынеслі у Рускую дзяржаву свой адметны стыль, матывы і тэхніку разьбы па дрэву, вырабу шматкаляровай кафлі. Амаль цалкам калектыў першага рускага (прыдворнага) тэатра, які існаваў у 1672--1676 г.г. складаўся з беларусаў Мяшчанскай сла-

бады, якая была створана з вывезеных у ходзе вайны 1654 г.--1667 г. і знаходзілася пад началам пасольскага прыказа. Вядома, што тут у 1665 г. жыло больш за 600 беларускіх сямей.

Анексія беларускіх зямель Расіяй у ходзе трох падзелаў Рэчы Паспалітай у канцы XVIII ст. выклікала палітычныя прычыны эміграцыі. Пры гэтым перасяленні набылі характар хвалеў у аднаведнасці з развіццем нацыянальна-вызваленчага руху: боязь рэпрэсій царскага урада выштурхнула за межу удзельнікаў паустанняў 1794, 1830--1831, 1863--1864 гг. Гэта былі ужо дзесяткі тысяч эмігрантаў (дзяржаўна-палітычныя дзеячы, афіцэры, салдаты, пераважна шляхта), якія рассеяліся па свеце.

Далучэнне беларускіх зямель да Расійскай імперыі паскорыла перасяленне беларусаў у цэнтральныя і паўднёвыя раёны, Сібір і Далекі Усход. Хаця цяпер гэта была унутрыдзяржаўная міграцыя, але за межы сваёй спрадвечнай тэрыторыі і у інаэтнічныя рэгіены імперыі. Праз стагоддзе, паводле першага расійскага перапісу 1897 г. па-за тэрыторыяй заходніх губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам (Гродзенскай, Віленскай, Мінскай, Віцебскай і Магілеўскай) пражывала амаль што палова мільёна беларусаў. І у гэты час усходняя дыяспара папаўнялася шляхам гвалтоўнага высялення, найперш па палітычных матывах -- удзельнікаў тайных студэнцкіх таварыстваў у Літве і Беларусі, нацыянальна-вызваленчых паустанняў 1794, 1830--1831, 1863--1864 гг., дзесяткі тысяч якіх былі адпраўлены на катаргу і у арыштанцкія роты, сасланы на пасяленне. З улікам нелаяльнасці шляхты да Расійскай імперыі у паўднёвыя губерніі была пераселена пасля паустання 1831 г. значная частка з 10 тыс. дваран, якія не змаглі пацвердзіць сваю прыналежнасць да гэтага саслоўя і былі пераведзены у разрад дзяржаўных сялян -аднадворцаў. Царскімі уладамі гвалтоўна вырываліся з жыцця народа інтэлектуальныя, свабодалюбівыя, патрыятычныя сілы, збядняліся яго творчыя магчымасці на Бацькаўшчыне, што сталася тут адной з прычын запаволення працэса нацыянальнага самаусведамлення.

Затое ўраджэнцы беларускіх зямель аддавалі здольнасці і працу рук сваіх на карысць іншых народаў, пакідалі там добрую памяць аб сабе. Сасланыя у розныя куткі Расіі за удзел у паустаннях, рэвалюцыйным руху праявілі сябе таленавітымі даследчыкамі прыроды, быта, традыцый, мовы народаў Сібіры, Крайняй Поўначы, Далекага Усходу, Казахстана. Працы геолага, географа І. Чэрскага па Сібіры былі адзначаны залатымі медалямі Рускага гео-

графічнага таварыства. Таксама як і фундаментальныя працы па мове і фальклору якутаў ссыльнага рэвалюцыянера-народніка Э. Пякарскага. В. Кавалеускі стаў заснавальнікам у Расіі мангалазнаўства, рэктарам Казанскага універсітэта. І. Гашкевіч -- складальнікам першага руска-японскага слоўніка і першым рускім консулам Японіі.

У замежных краінах эмігранты гэтага часу -- выхадцы з Беларусі -- уключыліся у вызваленчы, рэвалюцыйны рух на еўрапейскім і амерыканскім кантынентах (Т. Касцюшка, В. Урублеускі, М. Судзілоускі, З. Мінейка і іншыя), спрыялі развіццю навукі і культуры у дзяржавах свайго пасялення. І.Дамейка стаў вядомым даследчыкам геалогіі і мінералогіі Чылі, рэктарам сталічнага універсітэта краіны, быў абвешчаны Народным героем Чылі. К. Ельскі даследаваў фаўну мала вывучаных на той час паўднёваамерыканскіх краін -- Гвіяны і Перу, адкрыў і упершыню апісаў не адзін новы від раслін і жывёл. Скульптар В. Дмахоускі у Парыжы стварыў помнік героям-паўстанцам, у ЗША -- бюсты Т. Касцюшкі і Т. Джэферсана для кангрэса у Вашынгтоне. А. Рыпінскі выдаў у Парыжы кніжку "Беларусь" (1840), а у Лондане -- беларускую баладу "Нячысцік" (1853).Ураджэнцы Беларусі сталі заснавальнікамі сельскагаспадарчых калоній у Амерыцы, каталіцкай адукацыйнай сістэмы у ЗША (Ф. Дзеружынскі) і інш.

Першая хваля масавай працоўнай міграцыі беларускага насельніцтва у інаэтнічныя рэгіены Расійскай імперыі (усходняй) і за яе межы (заходняй) паднялася на рубяжы XIX--XX ст.ст., і з гэтага часу набірае моц працэс складвання дыяспары як пражывання значнай часткі народа за межамі сваей Бацькаўшчыны. Міграцыйны рух сялянства набыў сталы характар з 80-х гадоў XIX ст, а масавасць -- пасля рэвалюцыі 1905--1907 гг. у сувязі з тымі зменамі у грамадскім і сацыяльна-эканамічным развіцці, якія яна выклікала. Да першай сусветнай вайны па эканамічных прычынах толькі у Сібір з Беларусі перасялілася больш за 700 тыс., а за межы Расіі -- 500--600 тыс., пераважна у ЗША, Канаду, Бразілію, Аргенціну, заходнееўрапейскія краіны.

Асноўнымі прычынамі рассейвання беларусаў па-за сваімі этнічнымі межамі сталі працэсы больш актыўнага фарміравання новага гаспадарчага ўклада і рынкавых адносін, расслаення і абеззямельвання сялянства, фарміраванне сусветнага рынка працоўнай

сілы, попыт на яе на еўрапейскім і амерыканскім кантынентах, магчымасць там больш высокага заробку. Масаваму выезду сялян у іншыя рэгіёны Расіі у пошуках вольнай ці больш танной зямлі спрыяла хуткае развіццё чыгуначнай сеткі як на тэрыторыі Беларусі, так і імперыі у цэлым.

Палітыка царскай Расіі у адносінах да міграцыі з этнічных беларускіх зямель вынікала з афіцыйнага непрызнання беларусаў як асобнага народа. У сувязі з гэтым захвочваліся перасяленні на усход дзяржавы з мэтай калані:аваць гэтыя абшары шляхам засялення іх "рускім элементам", да якога адносілі беларусаў-праваслаўных (беларусаў-каталікаў звычайна да палякаў). З другога боку, выезд за мяжу разглядаўся як фактар паслаблення "карэннага рускага насельніцтва", павелічэння кошту мясцовай рабочай сілы.. Таму на дзяржаўным узроўні эміграцыя стрымліваецца, адсутнічала адпаведнае заканадаўства, імігранты у новых краінах не мелі прававой, маральнай, матэрыяльнай падтрымкі свайго Радзімы.

За мяжой беларускія перасяленцы папаўнялі шэрагі некваліфікаваных работнікаў. У ЗША яны працавалі пераважна у такіх цяжкіх і небяспечных вытворчасцях як вугальная, сталеліцейная, будаўнічая. У Аргенціне і Бразіліі наймаліся на сезон ці абжывалі малазаселеныя,аддаленыя землі. Дарэчы, у Канадзе, Бразіліі перасяленцы маглі разлічваць на кавалак зямлі. Мелі імігранты цяжкія бытавыя умовы і параўнальна нізкую аплату працы, але якая была у 2--3 разы вышэйшай, чым у Расіі. "За морам можна дайсьці да чагось толькі пры вельмі цяжкай працы, -- папярэджвала віленскае бюро Таварыства апекі над эмігрантамі у сваім выданні "Рады для эмігрантаў, каторые едуць у Амерыку, а также размовы беларуска-англійскіе"(Вільня,1912).-Кожны грош, які там аткладаецца, купляецца толькі вялікай працай, хрэсціцца крывавым потам".

Найбольш характэрнымі асаблівасцямі першай хвалі масавага перасялення беларускага насельніцтва з'явіліся больш позняе (у параўнанні з суседнімі народамі) яго уключэнне у міграцыйны рух як на абсягах імперыі, так і за яе межы, высокая яго інтэнсіўнасць (у 1896--1915 гг. 5 губерняў з пераважна беларускім насельніцтвам далі 85% усіх перасяленцаў з рэнэу нечарназемнай паласы), арыентацыя на рээміграцыю -- звычайна ехалі

за мяжу прыдбаць грошы для пакупкі зямлі, абзавядзення гаспадаркай, да таго ж расійскія законы не прадугледжвалі выхаду з падданства і абавязвалі вяртацца пасяленцаў праз 5 гадоў пад пагрозай пакарання. У сувязі з адмоўным стаўленнем дзяржавы і мясцовага кіраўніцтва да выезду сялян, складанасцю працэдуры і дарагавізнай атрымання пасведчанняў на выезд і афармленне пашпартоў існавала значная нелегальная эміграцыя (асабліва на сезонную працу у бліжэйшыя еўрапейскія краіны).

Нацыянальны уціск беларускага народа у складзе Расійскай імперыі, абумоўлены многімі прычынамі незавершанасць станаўлення беларускай нацыі, вызначалі паскораную асіміляцыю яе міграцыі у параўнанні з суседнімі народамі. Але у сем'ях, кампактных асяродках заходняй дыяспары захоувалася пэўная нацыянальная адметнасць, хоць і слабая. У параўнанні з ей усходняя дыяспара праяўляла бо́льшую устойлівасць у зберажэнні мовы, звычаяў, традыцый, сваей этнічнай адметнасці (у адзенні, побыце, забудове, вядзенні гаспадаркі).

Паскарэнне працэсаў нацыянальнага адраджэння у пачатку XX ст. не паспела ярчэ істотна паўплываць на самаусведамленне мігрантаў першай масавай хвалі. Яны не стварылі сваіх суполак, арганізацый, клубаў, як гэта рабілі іншыя перасяленцы, а уключаліся за мяжой па веравызнанню у рускія (праваслаўныя) і польскія (каталіцкі) калоніі, часам украінскія і літоўскія. У некаторых рускіх асяродках ЗША і Канады беларусы складалі значную частку ці нават большасць, былі актыўнымі удзельнікамі іх грамадска-культурнага жыцця. Толькі у 1914 г. было заснавана першае супольнае таварыства беларусаў і украінцаў (ЗША, штат Мічыган).

Першая сусветная вайна, рэвалюцыі 1917 г. у Расіі, нямецкая і польская акупацыі Беларусі выклікалі значны адток насельніцтва на усход дзяржавы, абумовілі новую хвалю выездаў у замежныя краіны. Ад жніўня 1914 г. да вясны 1915 г. амаль 318 тыс. жыхароў пяці беларускіх губерняў трапілі у палон ці аб іх не было звестак. Пры адступленні царскай арміі у 1915 г. праводзілася тактыка "выпаленай зямлі", прымусовая эвакуацыя насельніцтва. Гісторык У. Ігнатоўскі адзначаў, што каля 2 млн. беларусаў добраахвотна ці прымусова перасяліліся на усход. На думку беларускіх дэмографаў 246 тыс. бежанцаў і эвакуіраваных затым не вярнуліся у родныя мясціны, а яшчэ 122 тыс. чалавек выехалі за мяжу : яны беглі ад ваенных бедстваў, голаду і чырвонага тэрору у Літву, Латвію, Эстонію, Чэхаславакію, Фінляндыю, Тур-

цыю, Германію (тут на пачатку 1919 г. знаходзілася, акрамя таго 30--40 тыс. беларусаў--ваеннапалонных) і інш.

Афіцыйная палітыка устаноўленай савецкай улады вызначыла у многім асаблівасці унутранай і знешняй эміграцыі, яе характар і памеры, стан нацыянальнай свядомасці у міжваенны перыяд. Яна абумовіла першую арганізаваную палітычную эміграцыю (ядро яе склалі Рада, Урад і войсковыя фарміраванні БНР, кіраўніцтва партыі беларускіх эсераў і інш.). Гэта вызначыла новую з'яву у сацыяльным складзе эміграцыі -- пэўную прысутнасць інтэлігенцыі. Аднаўленне БССР пасля польскай акупацыі на тэрыторыі толькі 6 паветаў Мінскай губерні (з насельніцтвам 1,6 млн. чалавек), далучэнне па Рыжскаму дагавору 1921 г. Заходняй Беларусі да Польшчы прывялі да праживання мільёнаў беларусаў за межамі нацыянальна-дзяржаўнага утварэння. Вызначэнне тэрыторыі БССР без уліку этнічных межаў і кардынальных жыццёвых інтарэсаў беларускага народа абумовілі знаходжанне пераважнай часткі нацыі на сваіх этнічных землях у складзе суседніх дзяржаў. Падзел тэрыторыі Беларусі у міжваенны перыяд і знаходжанне частак нацыі у дзяржавах з процілеглым грамадскім ладам аслаблялі эканамічную базу і духоўныя сувязі беларускага этнаса.

Другая плынь міжваеннай эміграцыі -- працоўная -- вызначалася выездам на амерыканскі кантынент і у еўрапейскія краіны насельніцтва Заходняй Беларусі, абумоўленым яго цяжкім сацыяльна-эканамічным становішчам, нацыянальным і рэлігійным уціскам у складзе Польшчы, яе палітыкай спрыяння эміграцыі (дзеля памяншэння беспрацоўя, а разам з тым і долі беларускага насельніцтва на гэтых землях). З 1921 па 1939 г. перасялілася пераважна у Канаду, ЗША, Францыю, Аргенціну ад 180 да 250 тыс. чалавек, пераважна сялян.

Трэцяй крыніцай папаўнення дыяспары у гэты час была міграцыя з Савецкай Беларусі. У 20-я гады назіраўся, праўда даволі абмежаваны, выезд у замежныя дзяржавы. Так, замежным аддзелам НКУС у 1924 і 1925 г. было выдана адпаведна 1658 і 1784 пашпартоў на выезд. Дзве трэці з гэтага ліку ехалі на сталае жыццё у ЗША, Польшчу, Германію, Латвію, Палесціну, пры гэтым беларусы складалі 10--15% эмігрантаў (астатнія яўрэі, рускія, палякі і інш.). У 30-я гады выезд практычна прыпыніўся: памкненне стала жыць у другой дзяржаве успрымалася як варожасць да новага ладу і улады. Затое дзяржаўная палітыка СССР спрыяла рассяленню беларусаў па абшарах краіны. З 1926 па 1938 г. з БССР, насельніцтва якой налічвала каля 5 млн. жыхароў, у

іншаэтнічныя рэгіены СССР выехала 617 тыс. чалавек, пераважна з сельскай мясцовасці. Такі неапраўдана вялікі адток тлумачыцца адсутнасцю у рэспубліцы палітыкі замацавання жыхароў ва умовах аграрнай перанаселенасці, арганізацыяй планавага набору рабочай сілы на дзяржаўным узроўні у аддаленыя і цяжкія для жыцця і працы рэгіены, уцёкамі сялян у ходзе гвалтоўнай калектывізацыі, дэпартацыяй "раскулачаных", неабгрунтавана рэпрэсіраваных у 30-я гады, найперш нацыянальна-свядомых людзей. Гэ абяскроўлівала народ, аслабляла яго патэнцыял і нацыянальную свядомасць. Далучэнне у 1939 г. Заходняй Беларусі наблізіла тэрыторыю рэспублікі да этнічных межаў, узнавіла працэсы кансалідацыі, але яны зноў былі абцяжараны перадачай Віленскага краю Літве і дэпартацыямі у 1939--1940 гг. з заходняй часткі рэспублікі. За гэты час І млн. 170 тыс. палякаў, беларусаў, украінцаў, прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны былі арыштаваны, вывезены у паўночныя і усходнія рэгіены Саюза.

Рассеянныя па абсягах Саюза беларусы пачалі ствараць у 20-я гады свае згуртаванні. Нацыянальна-культурную дзейнасць ажыццяўлялі Беларускае цэнтральнае бюро пры Народным камісарыяце асветы РСФСР (1921--1930 гг.), беларускія секцыі пры губернскім аддзеле народнай асветы Адэсы (1918--1923) і Смаленска (1922 - 1923, 1925--1927). Беларускія студэнцкія зямляцтвы існавалі у Смаленску, Казані, Варонежы, Сараташе, Томску. Растове-на-Доне, Кіеве, Тыфлісе. Беларускі клуб у Маскве дзейнічаў ад 1922 г. па 1936 г. Ва умовах 30-х гадоў, калі нішчылася усе нацыянальна-адметнае, беларускія арганізацыі у іншаэтнічных рэгіенах СССР зніклі, а нацыянальныя асяродкі у краіне не мелі ні маральнай, ні матэрыяльнай падтрымкі з боку БССР.

На эміграцыі найбольшая палітычная актыўнасць і нацыянальна-культурная дзейнасць у міжваенны перыяд праяўлялася у Літве, Латвіі, Чэхаславакіі, дзе былі створаны беларускія арганізацыі, аб'яднанні, выдаваліся газеты і часопісы.

Значнымі акцыямі па згуртаванню замежных беларускіх палітычных партый і нацыянальных арганізацый сталі канферэнцыя у Рызе (кастрычнік 1920 г.) і нацыянальна-палітычная нарада у Празе (верасень 1921 г.). Лідэры палітычнай эміграцыі рабілі захады,

каб "беларускае пытанне" станавілася "не мясцовага, а агульнаеўрапейскага зместу". Яны дабіваліся абмеркавання праблемы беларускай дзяржаўнасці на Парыжскай канферэнцыі па выпрацоўцы умоў міру з Германіяй і яе саюзнікамі (студзень 1919--студзень 1920 г.). Іх намаганні на гэтым форуме спрыялі азнаямленню сусветнай грамадскасці са становішчам Беларусі, фактычнаму прызнанню БНР шэрагам краін, а некаторымі дзяржавамі -- і юрыдычнаму.

Каб прадухіліць падзел Беларусі па Рыжскаму дагавору, кіраўніцтва БНР звярнулася з заклікамі да Лігі нацый, урадаў Фінляндыі, Эстоніі, Латвіі і Літвы, Польшчы падтрымаць незалежнасць і непадзельнасць Беларусі. Пасля падпісання гэтага грабежніцкага трактату апеліравалі да урадаў і сусветнай грамадскасці аб яго скасаванні, у прыватнасці, на Генуэзскай канферэнцыі (1922 г.). Паміж рознымі палітычнымі плынямі беларускай эміграцыі існавалі разыходжанні па шляхах барацьбы за незалежную Беларусь, арыентацыі у гатым на тую ці іншую дзяржаву (Літву, Польшчу, краіны Антанты), адносінах да Савецкай Беларусі.

Палітыка савецкай улады, кіраўніцтва БССР у дачыненні да заходняй дыяспары вызначалася найперш ідэалагічнымі, палітычнымі матывамі -- зарыентаванасцю на сусветную рэвалюцыю у першыя гады, а затым -- на пашырэнне камуністычных ідэй, лаяльнасці да савецкага ладу. Савецкія партыйна-дзяржаўныя органы менш за усе дбалі аб правах нацыянальна-культурнага жыцця замежных суродзічаў, а сувязі з імі разглядалі пераважна як сродак у ідэалагічнай барацьбе. Такая палітыка сфарміравалася у першыя паслярэвалюцыйныя гады і найбольш дакладна сфармулявана у тэзісах ЦК КП(б)Б "Белорусское движение за кордонами" ад 16 кастрычніка 1925 г. Гэтая пастанова раскрывае сутнасць савецкай партыйна-дзяржаўнай палітыкі, якая праводзілася у адносінах да эміграцыі амаль што да канца 80-х гадоў. У ей прызнавалася неабходным з улікам прысутнасці значнай працоўнай эміграцыі у Паўночнай Амерыцы устанаўленне з ей кантакта і "ажыццяўленне свайго кіраўніцтва праз мясцовую кампартыю і спецыяльна пасланых работнікаў". Адносна палітычнай эміграцыі вызначаліся меры па пашырэнню у яе асяроддзі савецкага уплыву, прыцягненню да супрацоўніцтва асобных груп і лідэраў. Была пастаўлена задача "працягваць работу па разлажэнню і дрэбленню беларускай эміграцыі", ні у якім разе не дапусціць стварэння якіх бы там ні было беларускіх аб'яднанняў, бо гэта затармозіць развіццё бе-

ларускага руху савецкай арыентацыі". Гэтыя высілкі далі пэўныя вынікі, але найбольш істотна на пазіцыі тагачаснай палітычнай эміграцыі паўплывалі працэсы беларусізацыі, паспяховыя крокі па адраджэнню нацыянальнай культуры, ажыццяўленню палітыкі НЭПа, пашырэнне у 1924 г. тэрыторыі БССР, прынятае у ліпені 1923 г. рашэння Прэзідыумаў ЦВК СССР і БССР аб амністыі, якое ахоплівала не толькі сялян і "паходзячых з працоўнага асяроддзя" удзельнікаў антысавецкіх фарміраванняў 1918--1920 гг., але і беларускіх палітычных і культурных дзеячоў, членаў ураду БНР і розных палітычных партый. Пры умове лаяльных адносін да савецкай улады гарантаваліся палітычныя правы і свабоды тым, хто жадаў вярнуцца у БССР. З улікам усіх гэтых абставін некаторыя лідэры палічылі савецкую уладу здольнай здзейсніць нацыянальна-дзяржаўнае адраджэнне і аб'яднанне Беларусі, пайшлі на кантакты з кіраўніцтвам БССР і КП(б)Б, якое згаджалася на супрацоўніцтва толькі пры умове ліквідацыі урада на эміграцыі. Частка урада БНР на чале з А. Цвікевічам пачала перамовы з адпаведнымі органамі Савецкай Беларусі аб роспуску гэтага урада. ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове ад 14 жніўня 1925 г. прызнаў магчымым правядзенне з гэтай мэтай канферэнцыі у Берліне пры выкананні шэрагу умоў: папярэдняй, яшчэ да канферэнцыі, перадачы паўнамоцтваў БНР ураду БССР у форме дэкларацыі; прызнанні Мінска адзіным культурным і палітычным цэнтрам, на які павінен арыентавацца беларускі рух за мяжой; адмове ад арыентацыі на Лігу Нацый. На Берлінскай канферэнцыі (25 кастрычніка 1925 г.) частка урада БНР прызнала Мінск цэнтрам нацыянальна-дзяржаўнага адраджэння Беларусі, аб'явіла аб роспуску урада на эміграцыі. Але другая яго частка палічыла гэтыя рашэнні "здрадай незалежнасці Беларусі" і засталася за мяжой. Раскол быў адной з многіх прычын затухання палітычнай дзейнасці беларускай эміграцыі, якой у далейшым так і не удалося пераадолець разнагалоссі, супярэчнасці паміж рознымі групамі, плынямі.

Працоўная эміграцыя другой хвалі вызначалася больш актыўнай нацыянальна-культурнай дзейнасцю, стварэннем беларускіх арганізацый у ЗША, Францыі, Аргенціне. Заснаваны у Чыкага Беларуска-амерыканскі нацыянальны саюз (1923 г.) пры якім працавау беларускі клуб, бібліятэка, камітэт помачы працоўным Заходняй Беларусі, існаваў да пачатку 40-х гадоў. У 1928 г. створана першае у ЗША (Чыкага) беларускае палітычнае аб'яднанне -- Беларуска-амерыканскі грамадскі клуб, які на выбарах 1928, 1932 і 1936 гг падтрымліваў кандыдатаў дэмакратычнай партыі. У ходзе выбараў

1936 г. дзейнічаў ужо і беларуска-украінскі рэспубліканскі клуб. Згуртаванню суродзічаў у Францыі спрыяў "Хаурус беларускай працоўнай эміграцыі" (з 1930 г.). У Аргенціне дзейнічалі культурна-асветныя таварыствы -- "Грамада" (з 1934 г.), "Культура" (з 1936 г.), "Белавежа (з 1938 г.), бібліятэка імя Івана Луцкевіча (з 1937 г.) Гэтыя арганізацыі, а таксама згуртаванні "Якуба Коласа", "Мінск" і іншыя у 1939 г. аб'ядналіся у Федэрацыю беларускіх таварыстваў, якая склікала канферэнцыі, выдавала гістарычна-літаратурны альманах. Дзейнасць яе вызначалася прасавецкімі настроямі і у значнай ступені арыентавалася на рускую культуру. Многія з заходнебеларускіх перасяленцаў далучыліся да прафсаюзнага руху і Камуністычнай партыі Аргенціны.

Значная частка эмігрантаў міжваеннага часу, як і папярэдняй хвалі трапіла пад уплыў рускіх і польскіх асяродкаў, далучылася да украінскіх. У канцы 30-х гадоў дзейнічалі Саюз украінскіх і беларускіх работніцкіх арганізацый у Аргенціне, Беларуска-украінскі саюз у Бразіліі. Менавіта выхадцы з Заходняй Беларусі складалі большасць рускіх рабочых клубаў у Канадзе. Таму культурнае жыццё гэтых і іншых аб'яднанняў несла пэўную беларускую нацыянальную адметнасць, хоць і слабую.

Другая сусветная вайна паглыбіла палітычнае размежаванне эмігрантаў, у яе асяроддзі павялічылася колькасць патрыятычна настроеных людзей, спачуваючых СССР, які нес асноўны цяжар змагання з фашызмам. На хвалі антыфашысцкага ўздыму у розных краінах пачалі стварацца камітэты у падтрымку СССР. У Аргенціне дзейнічаў Беларускі дэмакратычны камітэт дапамогі сіротам вайны, які налічва, 5 тыс. членаў. Актывізавалася дзейнасць нацыянальных таварыстваў, пачалі стварацца новыя. У 1941 г. заснавана Беларуска-амерыканская нацыянальная рада у Чыкага. У Аргенціне паўсталі "Беларускае таварыства імя Скарыны"(1941), імя Янкі Купалы, Беларускі культурны цэнтр. У 1943 г. многія з іх былі закрыты, але праз некаторы час аднавіліся, пачалі аб'ядноўвацца і русіфікавацца

Выхадцы з Заходняй Беларусі склалі большасць створанай у 1942 г. Федэрацыі рускіх канадцаў. На амерыканскім кантыненце беларуская эміграцыя уключалася у агульнаславянскія акцыі маральнай і матэрыяльнай падтрымкі саюзнікаў антыгітлераўскай кааліцыі. Яе прадстаўнікі удзельнічалі у мерапрыемствах арганізацыі "Славяне Амерыкі у барацьбе за перамогу і мір". "Амерыканц

-славянскага канграса", яго першага з'езда у Дэтройце(1942). Беларускія арганізацыі былі прадстаулены 50 дэлегатамі на першым славянскім канграсе Лацінскай Амерыкі (Аргенціна, Уругвай, Чылі). Па яго рашэнню быў створаны Славянскі Саюз у Аргенціне, членамі якога сталі практычна усе беларускія арганізацыі.

Складаныя міжнародныя абставіны напярэдадні другой сусветнай вайны, пачатак яе і захоп Германіяй Польшчы, далучэнне Заходняй Беларусі да БССР абумовілі актывізацыю палітычнага жыцця беларускай эміграцыі у заходнееурапейскіх краінах. Да таго ж яна папоўнілася палітычнымі дзеячамі, якія прыехалі з Заходняй Беларусі, калі на яе тэрыторыю увайшлі савецкія войскі. У выніку ваенных дзеянняў супраць Польшчы у нямецкім палоне аказалася 70 тыс. беларусаў, якія ваявалі у складзе польскага войска. У сувязі з гэтымі акалічнасцямі павялічылася зацікауленасць нямецкіх уладау да беларускага пытання. З удзелам прадстаўніка Міністэрства замежных спрау Германіі у Данцыгу у 1939 г. адбылася канферэнцыя беларускіх эмігранцкіх цэнтрау шэрагу еурапейскіх краін. У лістападзе таго ж года створана Беларускае прадстаўніцтва пры Міністэрстве унутраных спрау Германіі. З лета 1940 г. у Берліне пачау дзейнічаць на грамадскай аснове Беларускі камітэт самапомашчы, а пазней яго філіялы былі арганізаваны у Варшаве, Празе, Лодзі, Вене і інш. Адпаведныя нямецкія службы рабілі захады для выкарыстання у сваіх мэтах пэунай часткі беларускай эміграцыі, якая звязвала свае надзеі з ажыццяўленнем нацыянальна-культурнага жыцця пад пратэктаратам Германіі.

Другая сусветная вайна, у ходзе якой Беларусь стала арэнай жорсткіх баеу і працяглай акупацыі яе тэрыторыі, абумовіла трэцюю хвалю масавай унутранай і знешняй міграцыі. Амаль 1,5 млн. чалавек былі эвакуіраваны на усход дзяржавы і толькі кожны трэці потым вярнуўся у рэспубліку. У ліку савецкіх ваеннапалонных за мяжой аказаліся сотні тысяч беларусаў. 400 тыс. жыхароў Беларусі (па некаторых крыніцах да 700 тыс.) былі вывезены акупантамі на працу у Германію. У адпаведнасці з рашэннем СНК СССР (кастрычнік 1944 г.)аб абавязковай рэпатрыяцыі савецкіх грамадзян да сакавіка 1946 г. у краіну вярнуліся 520 тыс.беларусаў.

Але нягледзячы на прымусовы характар рэпатрыяцыі, якога СССР дамагаўся да сярэдзіны 50-х гадоў ад саюзнікаў і міжнародных арганізацый, сотні тысяч беларусаў апынуліся на эміграцыі. Пашукаць лепшай долі у чужых краях многіх падштурхнула антынародная палітыка таталітарнай сістэмы напярэдадні вайны (прымусовая ка-

лектывізацыя, дэпартацыя "раскулачаных", злачынныя рэпрэсіі 30-х гадоў), а таксама адносіны да ваеннапалонных, якія агулам лічыліся здраднікамі (з'ява немагчымая у другіх дзяржавах) і баяліся жорсткай кары нават за прымусовае супрацоўніцтва з немцамі. Гэта быў небеспадстаўны недавер, бо практычна усялякая дзейнасць на акупіраванай тэрыторыі лічылася супрацоўніцтвам з ворагам. Да тых, хто аказаўся пад нямецкай акупацыяй ці вярнуўся з лагераў для перамешчаных асоб у Германіі і Аўстрыі, доўгія пасляваенныя гады улады адносіліся з падазронасцю, а многія з іх прайшлі праз сталінскія лагеры.

Пасля другой сусветнай вайны на захадзе склалася самая вялікая у гісторыі беларускай эміграцыі палітычная плынь. Туды выехалі беларускія арганізацыі, установы і ваенныя фарміраванні, створаныя на акупіраванай тэрыторыі -- Беларуская цэнтральная рада, галоўны штаб Саюза Беларускай моладзі, Сабор епіскапаў Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы, ваенныя атрады Беларускай краевай абароны, а таксама частка інтэлігенцыі, святароў. Гэтая хваля і складае аснову сучаснай нацыянальнай заходняй дыяспары, якая практычна не папаўнялася да апошняга часу у сувязі з адсутнасцю права на выезд з СССР. Захавалі усведамленне сваіх нацыянальных каранёў многія нашчадкі (дзеці і ўнукі) папярэдніх эмігрантскіх хваляў.

Пасля вайны у ЗША і Канадзе пасялілася прыкладна па 50 тыс. імігрантаў беларускага паходжання. Дзесяткі тысяч іх асела у Францыі, Бельгіі, Германіі, а таксама новых цэнтрах -- Англіі і Аўстраліі. Ад 250 да 400 тыс. беларусаў Беласточчыны на сваіх этнічных землях аказаліся у Польшчы у выніку палітычных гульняў савецкага кіраўніцтва пры вызначэнні пасляваеннай дзяржаўнай граніцы СССР.

У сацыяльным складзе пасляваеннага беларускага замежжа пераважалі сельскія працаўнікі. Хоць у параўнанні з папярэднімі хвалямі павялічылася колькасць рабочых і асабліва інтэлігенцыі.

Пасля нялегкага прыстасавання у новых краінах большасць беларусаў працавалі рабочымі у прамысловасці, частка іх абзавялася фермерскімі гаспадаркамі. З цягам часу сацыяльны статус многіх беларусаў памяняўся: павялічылася колькасць інтэлігенцыі, прадстаўнікоў сярэдняга класа -- уладальнікаў невялікіх фірм, майстэрняў, іншых прадпрыймальнікаў, фермераў. У новым пакаленні беларусаў ЗША (дзеці і ўнукі эмігрантаў) працэнт людзей з вышэйшай адукацыяй вышэйшы за сярэднеамерыканскі. У месцах кампактнага рассялення беларусаў з цягам часу павялічыўся іх уп-

лу на сацыяльна-эканамічныя, палітычныя працэсы гэтых рэгіенау (штатау Каліфорнія, Нью-Джэрсі, Мічыган у ЗША, шэрагу правінцый Канады).

Значная частка трэцяй эміграцыйнай хвалі інтэгравалася у рускія і польскія асяродкі, асімілявалася. Але менавіта яе прадстаўнікі (насуперак штучнай адлучанасці ад Бацькаўшчыны і калі там заахвочваўся і пашыраўся нацыянальны нігілізм) далі прыклады арганізацыі грамадска-культурнага, рэлігійнага жыцця на нацыянальнай аснове, сцвярджэння беларусаў у якасці самастойнай этнічнай супольнасці у замежжы. Зберажэнню традыцый садзейнічае Беларуская аутакефальная праваслаўная царква, Беларуская праваслаўная царква у канстанцінопальскай юрысдыкцыі, Беларуская каталіцкая місія, дзейнасць якіх грунтуецца на нацыянальнай аснове (служба на беларускай мове, рэлігійнае навучанне і выданне рэлігійнай літаратуры і часопісаў для вернікаў на ей). Існуе больш 20 праваслаўных прыходаў у Канадзе, ЗША, Вялікабрытаніі, Аўстраліі, беларускія каталіцкія (уніяцкія) місіі у Чыкага, Лондане, Парыжы.

Сваю жыццяздольнасць праявілі створаныя у канцы 40-х --пачатку 50-х гадоў і дзеючыя цяпер Згуртаванне беларусаў у Вялікабрытаніі (I946 г.), Беларуска-амерыканскае задзіночанне (I949 г.), Беларускае нацыянальнае аб'яднанне у Канадзе (I950 г.), Беларускае аб'яднанне у Аўстраліі (I95I г.), жаночыя, маладзежныя і іншыя арганізацыі; пасля вайны аднавіў працу Беларускі хаўрус у Францыі, створаны Саюз беларусаў Бельгіі, якія існуюць і цяпер. Узгадненню дзеянняў замежных суродзічаў і іх гуртаванню спрыяюць сустрэчы беларусаў Паўночнай Амерыкі з I952 г. і Аўстраліі з I976 г. (адбылося адпаведна 20 і 9 сустрэч).

Захаванню нацыянальнай свядомасці, пашырэнню звестак пра Беларусь у краінах пасялення спрыяе перыядычны друк. У даведніку этнічных выданняў ЗША у 70-я гады адзначана I4 беларускіх газет і часопісаў. Газета "Беларус", якая выходзіць у Нью-Йорку з I950 г., мае чытачоў-беларусаў у многіх краінах свету, а цяпер стала даступнай і на Бацькаўшчыне (размнажае прадпрыемства "Тэхналогія" і распаўсюджваюць кіескі Таварыства беларускай мовы). Цэнтрамі навукова-культурнага жыцця сталі Беларускі інстытут навукі і мастацтва у Нью-Йорку (з I95I г.) і такі ж інстытут у Таронта (з I967 г.), Беларуская бібліятэка і музей імя Ф. Скарыны у Лондане (з I97I г.). Англа-беларускае таварыства, Інстытут беларусаведы у г.Ляймене (ФРГ) і Беларускі музей, які

адкрыуся тут жа у 1983 г. Гэтыя высілкі спрыялі зберажэнню традыцый, роднай мовы, памнажэнню культурных набыткаў. Асяроддзе замежных беларусаў вылучыла сваіх паэтаў і празаікаў, кампазітараў і спевакоў, навукоўцаў. Вядомы у свеце як буйны спецыяліст у галіне ракетнай тэхнікі Барыс Кіт, абраны акадэмікам Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, членам Амерыканскага астранаўтычнага таварыства, Брытанскага міжнароднага таварыства, дырэктарыяту Нямецкага астранаўтычнага таварыства, прафесарам Мэрылендскага універсітэта (ЗША), узнагароджаны залатым медалем нямецкага таварыства імя Германа Обэрта. У працах У. Сядуры (Ул. Глыбіннага), А. Адамовіча, С. Станкевіча, І. Любачкі, В. Тумаша, П. Урбана, Я. Запрудніка, В. Кіпеля, З. Кіпель і іншых асэнсоўваюцца праблемы нацыянальнай гісторыі і культуры. Беларускія песні гучаць у рэпертуары вядомых у замежных краінах спевакоў П. Конюха і М. Стрэчаня. З эміграцкім лесам звязана значная частка творчай спадчыны знакамітага спевака М. Забэйды-Суміцкага (1900--1981), кампазітараў М. Равенскага (1886--1952) і М. Шчаглова-Куліковіча (1843--1969), паэткі Л. Геніюш (1910--1983). Вядомасць у беларускім замежжы набылі пісьменнікі Н. Арсеннева, М. Сяднеў, А.Салавей, У. Клішэвіч і іншыя. Бедарускія мастакі В. Жаўняровіч, З. Чайкоўскі, У. Шыманец экспаніравалі свае карціны на розных выстаўках у ЗША і Еўропе. Беларускія тэма гучыць у працах такіх мастакоў як І. Шыманец-Сурвіла, П. Мірановіч, І. Рагалевіч-Дудко, Г. Русак, М. Наумовіч, Н. Кудасава. У розных штатах ЗША прайшло больш сотні выставак карцін Т. Стагаловіч-Кольба. Нас суродзіч А. Ахола-Вало вядомы у Швецыі і Фінляндыі як графік і стваральнік інтэр'ераў грамадскіх будынкаў.

Нацыянальна-свядомая беларуская эміграцыя на Захадзе неаднародная. У яе асяроддзі назіраецца супрацьстаянне розных груплыняў, існуюць два палітычныя цэнтры -- Рада БНР і БЦР, якія аднак у галоўным ніколі не мелі разыходжанняў: аднолькава не прымалі "сацыялістычны"лад, савецкую уладу, выступалі за незалежнасць Беларусі.

У Польшчы намаганнямі суродзічаў у 50-я гады створаны і дзейнічаюць Беларускае грамадска-культурнае таварыства (з 1956 г.), літаратурнае аб'яднанне "Белавежа" (з 1958) і інш. Вядомасць не толькі у асяроддзі беларусаў набылі пісьменнікі С. Яновіч, А. Барскі (Баршчэўскі), В. Швед, Я. Чыквін, мастак Л. Тарасевіч, М. Давідзюк, навукоўцы Ю. Туронак, Б. Бяказовіч, У. Юзвюк, А. і Я. Мірановічы і інш.

Вышце беларускага замежжа нясе адбітак усіх тых праблем, якія вынікаюць з гістарычнага развіцця нацыі і яе сучаснага стану. Аслабленая нацыянальная свядомасць значнай часткі імігрантаў, поўная раз'яднанасць па канфесійнай прыналежнасці, адсутнасць доўгія дзесяцігоддзі духоўнай і маральнай падтрымкі Бацькаўшчыны паскаралі працэсы асіміляцыі. Менавіта у адносінах да нацыянальных эрганізацый эміграцыі партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам СССР і БССР праводзілася палітыка ізаляцыі ад гістарычнай Радзімы, раскола па ідэалагічных адзнаках розных яе пакаленняў, плыняў. Ігнаравалася нацыянальна-культурныя патрэбы суродзічаў і у іншаэтнічных рэгіенах Саюза, колькасць якіх па-за тэрыторыяй БССР павялічылася з 17,6% у 1959 г. да 21,2 у 1989 г. Гэта сталася вынікам партыйна-дзяржаўнай палітыкі стымулявання унутрыдзяржаўнай міграцыі (праз вярбоўкі працоўных, грамадскія заклікі на новабудоўлі, планавае размеркаванне выпускнікоў вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, перавод спецыялістаў з аднаго рэгіена у другі і інш. У выніку распада СССР, набыцця суверэнітэта былымі рэспублікамі гэтая унутрыдзяржаўная міграцыя ператварылася у міжнародную і у новых незалежных дзяржавах аказалася 2 млн. 130 тыс. беларусаў.

Афіцыйная статыстыка пакуль не дае падстаў дакладна вызначыць лік беларусаў у свеце. На цяперашні час у Рэспубліцы Беларусь іх жыве каля 8 млн. (прыкладна 79% усяго насельніцтва) і мяркуецца, што за яе межамі яшчэ 3--3,5 млн. (прыводзіцца лічба нават у 4 млн.). Гэта складае амаль што трэцюю частку нацыі.

Дык дзе сення у свеце жывуць беларусы? Найбольш сканцэнтраваны яны у суседніх дзяржавах, пры гэтым на памежных з рэспублікай тэрыторыях -- на сваіх спрадвечных, гістарычных землях, якія у выніку барацьбы і палітычных гульняў больш моцных суседзяў былі адарваны ад Беларусі. Найбольш кампактна пражываюць беларусы у Польшчы, пераважна на сваіх этнічных землях Беласточчыны і Падляшша. У Расійскай Федэрацыі іх асела І млн. 200 тыс. Найбольш кампактна яны пасяліліся у Маскве і вобласці -- 129 тыс., Санкт-Пецярбургу і вобласці -- 127 тыс., Калінінградскай вобласці -- 74 тыс., Карэліі - 55 тыс., Цюменскай вобласці -- 49 тыс.І іншых рэгіенах. Сярод жыхароў Украіны -- 440 тыс. беларусаў, Казахстана --183 тыс., Літвы -- 63 тыс., Эстоніі і Узбекістана -- па 29 тыс., Малдовы -- 20 тыс. Устой-

лівыя беларускія асяродкі склаліся на амерыканскім і аўстралійскім кантынентах, шэрагу еўрапейскіх краін. У ЗША беларусы пасяліліся пераважна ў штатах Нью-Йорк, Нью-Джэрсі, Агае, Мічыган, Каліфорнія, Канадзе -- правінцыях Квебек, Антарыа, Саскачаван, Альберта; Аргенціне -- правінцыі Буэнас-Айрэс. На аўстралійскім кантыненце найбольш значныя беларускія асяродкі склаліся ў штатах Заходняя Аўстралія (Перт), Паўднёвая Аўстралія (Адэлаіда), Вікторыя (Мельбурн). У Вялікабрытаніі беларусы пасяліліся галоўным чынам у Лондане, Брэдфардзе, Манчэстэры, Нотынгеме, у Францыі -- вакол Парыжа, ФРГ -- каля Мюнхена, Бельгіі -- Льежа, Лювена і іншых месцах.

Нацыянальна-культурную і грамадскую дзейнасць ажыццяўляюць шматлікія арганізацыі суродзічаў. Акрамя ужо названых у ЗША дзейнічаюць Беларускі кангрэсавы камітэт, Беларускі каардынацыйны камітэт у Чыкага, Беларуска-амерыканская нацыянальная Рада у Чыкага, грамадска-культурныя цэнтры у Саут-Рывэры, Чыкага і каля Кліўленда ("Полацак") і інш. У 1992 г. створана беларуска-амерыканская інфармацыйная служба і яе прадстаўніцтва у Мінску. У ЗША размяшчаецца Рада Беларускай Народнай Рэспублікі.

У Канадзе функцыянірусць арганізацыі -- Беларускае задзіночанне у Квебеку, Беларускі грамадскі цэнтр у Таронта, Беларускі саюз моладзі, Беларуска-канадскі каардынацыйны камітэт і інш. Нягледзячы на значную прысутнасць выхадцаў з Беларусі у Аргенціне, арганізаванае нацыянальна-культурнае жыццё тут адсутнічае. Беларускія эмігранты і іх нашчадкі гуртуюцца у культурна-спартыўных клубах, якія аб'ядноўваюць славянскіх перасяленцаў з краін былога СССР -- клубах імя В. Бялінскага, М. Горкага, У. Маякоўскага, "Дніпро" у Буэнас-Айрэсе, "Аўрора" у Мар дэль Плата, "Івана Франко" у Санта-Фе і інш.

Федэральная Рада беларускіх арганізацый у Аўстраліі каардынуе дзейнасць больш дзесяці нацыянальных фарміравання, у тым ліку Беларускага аб'яднання Аўстраліі, Беларускага аб'яднання у Заходняй Аўстраліі (Пэрт), Беларускага цэнтральнага камітэта у Вікторыі і інш. Тут размяшчаецца Беларуская цэнтральная Рада. Нацыянальна-культурныя, палітычныя, сацыяльныя інтарэсы беларусаў Польшчы выражае палітычная партыя--Беларускае дэмакратычнае аб'яднанне, Беларускае аб'яднанне студэнтаў, Звязь беларускай моладзі, Клуб беларускай інтэлігенцыі і інш.

Ідзе працэс гуртавання беларусаў у новых незалежных дзяржавах на тэрыторыі былога СССР, у інтэгратычных рэгіенах якога

з 30-х гадоў і да канца 80-х адсутнічалі якія-небудзь праявы арганізаванага нацыянальнага жыцця. У Расійскай Федэрацыі цяпер ладзяць грамадска-культурныя мерапрыемствы нацыянальныя таварыствы, суполкі у Маскве, Санкт-Пецярбургу, Калінінградзе, Петразаводску, Ніжнім Ноўгарадзе, Новасібірску, Ноўгарадзе, Якуцку, Саснагорску, Калузе, Цверы і інш. На Украіне грамадска-культурныя таварыствы працуюць у Кіеве, Львове, Ялце, Чарнаўцах; Малдове -- Кішыневе і Бендэрах; Казахстане -- Алма-Аце і Прыазерску. Актыўна дзейнічаюць згуртаванні беларусаў у Літве (Вільні, Шальчынінкаі), Латвіі (Рызе, Даўгаўпілсе), Эстоніі (Таліне, Кохтла-Ярве). Не так даўно створаны суполкі у Кыргызстане (Бішкеку) і Узбекістане (Фергана), пачынаецца аб'яднанне суродзічаў і у іншых краінах. Паявіліся і першыя прафесійныя згуртаванні -- Асацыяцыя прадпрымальнікаў Латвіі "Беларускі шлях", аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балты "Маю гонар" (Эстоніі, Літвы, Латвіі, Санкт-Пецярбургу).

Працэсы дэмакратызацыі, нацыянальнага адраджэння, палітычныя і эканамічныя рэформы пасля красавіка 1985 г. стварылі умовы для пераасэнсавання ролі дыяспары у жыцці народа, фармавання прынцыпова новай дзяржаўнай палітыкі у дачыненні да яе. З канца 80-х гадоў новыя грамадскія рухі і фарміраванні (БНФ, ТБІ і інш.) сталі ініцыятарамі усталявання сталых стасункаў з нацыянальнымі арганізацыямі эміграцыі, а такраме суполкамі, таварыствамі суродзічаў, якія толькі у гэты час паявіліся на абшарах Саюза. Але партыйна-дзяржаўныя структуры БССР да канца 80-х гадоў не рэагавалі на гэтыя новыя з'явы, спазняючыся у параўнанні з народамі-суседзямі у фармаванні прынцыпова новай дзяржаўнай палітыкі у адносінах да суродзічаў за межамі рэспублікі. Найбольш відавочныя прычыны гэтага -- глыбокія працэсы дэнацыяналізацыі, якія выпікаюць з гістарычнага лесу беларусаў і савецкай палітыкі збліжэння і зліцця нацый, агрэсіўны нацыянальны нігілізм кіраўніцтва БССР.

Устойлівыя істотныя змены на дзяржаўным узроўні да нацыянальнай дыяспары пачаліся н толькі у сувязі з працэсам набыцця незалежнасці Беларусі -- пасля прыняцця Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце (ліпень 1990 г.) і надання ей канстытуцыйнага статуса (жнівень 1991 г.), дэнансацыі дагавора аб стварэнні СССР (снежань 1991 г.). Гэтыя гістарычна-вызначальныя падзеі абумовілі пераход ад канфрантацыі да узаемадзеяння з заходняй эміграцыяй і ад грэбавання патрэбамі усходняй дыяспары да пошукаў шляхоў абароны правоў і за-

конных інтарэсаў суродзічаў на абсягах Саюза, а затым у новых незалежных дзяржавах на яго тэрыторыі.

Праявамі новага стаўлення сталі непасрэдныя кантакты замежных суродзічаў з кіраўніцтвам рэспублікі (што было немагчымым увесь пасляваенны час). Зроблены першыя крокі па супольным вызначэнні з заходняй дыяспарай сфер узаемадзеяння, у тым ліку і у час знаходжання у ЗША і Францыі (1991, 1992) дэпутатаў ад апазіцыі у Вярхоўным Савеце Беларусі па запрашэнню беларускіх арганізацый у гэтых краінах.

Пачаўся працэс вяртання на Бацькаўшчыну культурных набыткаў эмігрантаў, азнаямлення з імі грамадскасці Беларусі: сталі даступнымі эмігранцкія выданні, перададзеныя са спецсховішчаў у агульнае карыстанне, фонды бібліятэк папоўніліся новымі паступленнямі ад суродзічаў, з поспехам прайшлі выступленні выканаўцы беларускіх песень Данчыка (Багдана Андрусішына), танцавальнага калектыву амерыканскіх беларусаў "Васілек", выставы карцін такіх вядомых мастакоў беларускага замежжа як Анатоль Чайкоўскі (ФРГ) і Лявон Тарасевіч (Польшча), Галіна Русак (ЗША). Цікавасць выклікалі публікацыі у перыядычным друку твораў найбольш вядомых у замежжы літаратараў. Асобнымі выданнямі выйшлі зборнікі паэзіі беларускай эмігрантыі "Туга па Радзіме"(1992) і вершаў М. Сяднева "Патушаныя зоры" (1992), факсімільнае выданне кнігі Н. Арсенневай "Пад сінім небам" (1991), творы беларускіх пісьменнікаў у Польшчы — В. Шведа "Мая зяленая Зубровія" (1990), М. Гайдука "Трызна" (1991), С. Яновіча "Самасей" (1992), А. Барскага (А. Баршчэўскага) "З пабачанага і перажытага" (1992).

Упершыню раза беларускія вучоныя з рэспублікі і эмігрантыі удзельнічалі у Рымскай (1990), Люблінскай (1991), Камянец-Падольскай (1992), Гродзенскай (1993 г.) канферэнцыях, прысвечаных гістарычнаму і культурнаму развіццю чатырох славянскіх народаў былой Рэчы Паспалітай, іх сучасным узаемадачыненням.Навукоўцы Бацькаўшчыны і дыяспары супольна абмяркоўвалі пытанні гісторыі свайго народа на першым Міжнародным канграсе беларусістаў (Мінск, май 1991).

Адлюстраваннем змен на Беларусі, адносін да нацыянальнай дыяспары стала прысутнасць у верасні 1990 г. упершыню каля 60 прадстаўнікоў рэспублікі у 19-й сустрэчы Пауночнай Амерыкі (у ліку амаль што 700 яе удзельнікаў), а таксама значнай групы на 20-й сустрэчы (верасень 1992). Намаганнямі грамадскасці у верасні 1990 г. створана і дзейнічае Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына".

Апошнім часам падтрымку ўрада атрымалі яго ініцыятывы агульнанацыянальнага маштаба -- першы сход беларусаў блізкага замежжа (снежань 1992 г.) і першы з'езд беларусаў свету (ліпень 1993 г.). Яны далі важкія імпульсы для яднання беларусаў у свеце: прадстаўнікі нацыянальных арганізацый і земляцтваў з розных краін і рэспублікі абмеркавалі праблемы адраджэння беларускай нацыі, гуртавання беларусаў замежжа між сабой і ўзаемадзеяння з Айчынай, сумеснай працы на яе карысць. Свае разуменне шляхоў адраджэння беларускай дзяржаўнасці, першачарговых мер па ўсталяванню сувязей з беларусамі ў замежных краінах яны выклалі у заявах, зваротах да народа Беларусі, беларусаў свету, парламента і ўрада Рэспублікі Беларусі і інш.

Пэўныя захады па актывізацыі і рэарганізацыі дзейнасці з замежнымі суайчыннікамі зрабіла Беларускае таварыства "Радзіма", якое на канферэнцыі у кастрычніку 1991 г. прыняло рашэнне аб пашырэнні сферы сваіх сувязей і перайменаванні у адпаведнасці з гэтым у таварыства па сувязях з суайчыннікамі за мяжой.

З улікам міжнароднага вопыту пачаўся працэс замацавання правоў замежных суродзічаў у шэрагу заканадаўчых актаў рэспублікі і міжнародных пагадненняў (Закон аб мовах, Закон аб грамадзянстве). Упершыню дзяржава пачала вырашаць пытанні забяспячэння суродзічам магчымасцей у краінах пражывання для свабоднага развіцця роднай мовы, культуры, захавання традыцый, выканання рэлігійных абрадаў (Дагавор аб добрасуседстве і дружалюбным супрацоўніцтве з Польшчай (1992 г.), Пагадненне аб стварэнні СНД (1991г.). Грунтоўны крок у вырашэнні праблем нацыянальнай дыяспары -- пачатак распрацоўкі дзяржаўнай праграмы "Беларусы у свеце". У ліпені 1992 г. прынята пастанова ўрада аб стварэнні Дзяржаўнай міграцыйнай службы пры Дзяржкамітэце па працы і сацыяльнай абароне насельніцтва. Больш грунтоўнаму падыходу да праблем беларускай дыяспары будзе спрыяць і пераўтварэнне у снежні 1992 г. Камісіі Вярхоўнага Савета па нацыянальнай палітыцы і міжнародных адносінах у Камісію па нацыянальнай палітыцы і пытаннях Садружнасці Незалежных дзяржаў. Дзяржаўная падтрымка ўсей працы з нацыянальнай дыяспарай, спалучэнне у ей дзяржаўнага і грамадскага пачаткаў, нацыянальная аснова культурнага, духоўнага ўзаемадзеяння, адказ ад яго палітызацыі створаць магчымасць кансалідацыі беларускага народа, павелічэння ролі дыяспары у жыцці Бацькаўшчыны, пашырэнне яе міжнародных сувязей, запавольвання працэсаў асіміляцыі суродзічаў, павелічэння культурнай і іншай прысутнасці у свеце беларускай замежнай супольнасці.

ТЭМА № 30. МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСІ

Вучэбныя пытанні. 1. З гісторыі. 2. Першы выхад Беларусі на міжнародную арэну (БНР, БССР, 1918-1922). 3. Замежныя сувязі БССР у складзе Саюза ССР (1923-1944 гг.). 4. Другі выхад БССР на міжнародную арэну і яе знешнепалітычная дзейнасць (1944-1990). 5. Міжнародныя адносіны і знешняя палітыка суверэннай Рэспублікі Беларусь.

Беларуская знешняя палітыка і дыпламатыя бяруць свой пачатак з першых дзяржаўных утварэнняў на беларускай зямлі — Полацкага, Турава-Пінскага, Смаленскага княстваў, якія з'яўляліся моцнымі раннефеадальнымі усходнеславянскімі утварэннямі. Займаючы выгаднае геапалітычнае становішча на перакрыжаванні старадаўніх гандлевых шляхоў з варагаў у грэкі, яны падтрымлівалі цесныя адносіны з суседнімі і больш аддаленымі народамі і дзяржавамі.

У XI ст. Полацкае княства па сваёй тэрыторыі было роўнае такім буйным тагачасным заходнееўрапейскім дзяржавам, як герцагства Баварскае і каралеўства Партугальскае. Полацк і Смаленск удзельнічалі у паходах кіеўскага князя Алега на Візантыю у 907 і 911 гг., у выніку якіх атрымалі свае асобныя ўклады, г. зн. ваенны здабытак. Васаламі Полацка былі размешчаныя у балцкіх землях гарады Герцыка і Кукенойс. Даніну яму плацілі плямены ліваў і летаў, якія жылі ніжэй па Дзвіне.

Дыпламатыя і ваенная палітыка Полацка вытрымлівалі сур'ёзныя выпрабаванні ў ходзе упартай барацьбы і змагання з Кіевам і крыжакамі. Адметнай рысай дыпламатыі Усяслаў Полацкага ці Усяслава Чарадзея (1044 -1101), якога лічаць заснавальнікам беларускай дзяржаўнасці, была верацярпімасць да сваіх даннікаў-язычнікаў з балцкіх земляў, паступовае і мірнае распаўсюджванне хрысціянства. Першымі дакументамі міжнароднай дзейнасці беларускіх земляў з'яўляліся граматы і дагаворы, заключаныя у XII--XIV ст., якія датычылі адносін Полацка, Віцебска і Смаленска з Рыгай, нямецкімі купцамі і Лівонскім ордэнам. Яны сведчаць, што паміх старажытнымі беларускімі дзяржаўнымі адзінкамі, з аднаго боку, і насельніцтвам Прыбалтыкі і нямецкімі купцамі, з другога, існавалі устойлівыя гандлевыя і дыпламатычныя адносіны, заснаваныя на раўнапраўных пачатках.

У часы Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага на міжнародную арэну выйшла новая плеяда беларускіх дзяржаўных дзеячоў, якія праводзілі знешнюю палітыку і дыпламатыю ў інтарэсах сваей дзяржавы. Беларуска-Літоўскай дзяржаве, якая ў эпоху свайго росквіту была буйнейшай па тэрыторыі дзяржавай Усходняй Еўропы, даводзілася адстойваць свой суверэнітэт і незалежнасць у барацьбе на трох франтах: на захадзе -- з крыжацкай агрэсіяй і Польшчай, на усходзе -- з Маскоўскай дзяржавай і на поўдні -- з Крымскім ханствам. Каб выжыць і абараніць абшары краіны ад моцных і ваяўнічых суседзяў, трэба было разлічваць не толькі на гераічнасць насельніцтва і ваенную сілу, але і на дыпламатыю. Прыклады спалучэння сілы мяча з майстэрствам перамоў даюць вялікія князі Міндаўг, Гедымін, Альгерд, Кейстут, Вітаўт. Абапіраючыся на актыўную ваенную палітыку, дыпламатыя Беларуска-Літоўскай дзяржавы выяўляла сваю здольнасць замацоўваць на міжнароднай арэне вынікі ваенных перамог. Так, дзякуючы перамозе Канстанціна Астрожскага над маскоўскім войскам пад Оршай у 1514 г. удалося падарваць ваенную кааліцыю Маскоўскага царства са Свяшчэннай Рымскай імперыяй і 5-ю іншымі заходнееўрапейскімі краінамі, накіраваную супраць ВКЛ і Кароны Польскай.

У канцы XVI ст. сапраўднае майстэрства дыпламаты дэманстравалі выдатныя палітычныя дзеячы сярэднявечнай Беларусі: Астафей Валовіч і Леў Сапега. У 1584 г. 27-гадовы Леў Сапега, які ўзначальваў рэчпаспалітае пасольства у Маскву, дабіўся падпісання "вечнага міру" паміж Рэччу Паспалітай і Маскоўскай Руссю. Удалыя перамовы у Маскве прынеслі Сапегу славу выдатнага дыпламата. Кароль Рэчы Паспалітай Стэфан Баторы ўзнагародзіў яго за гэта Слонімскім старостваи і пасадай падканцлера, а потым і канцлера Вялікага княства. На пасадзе канцлера Сапега выступаў у міжнародных справах як прадстаўнік усей федэрацыі -- Рэчы Паспалітай, але ен пры гэтым заўседы выходзіў найперш з інтарэсаў ВКЛ, прыкладаючы шмат намаганняў, каб княства заставалася незалежным ад саюзнай Польшчы.

У розныя перыяды свайго існавання ВКЛ падтрымлівала дыпламатычныя сувязі з шэрагам еўрапейскіх і азіяцкіх краін: асманскай Турцыяй, Крымскім ханствам, Венгрыяй, Румыніяй, Швецыяй, Даніяй, Францыяй, Свяшчэннай Рымскай імперыяй і асобнымі яе землямі, Маскоўскай Руссю, Прусіяй і Інфлянцкім Ордэнам. Сродкам дыпла-

матычных зносін БКД з суседнімі краінамі была дзяржаўная беларуская мова.

Падзелы Рэчы Паспалітай і далучэнне Беларусі да Расійскай імперыі у канцы ХУШ ст. больш чым на стагоддзе спынілі існаванне беларускай дзяржаўнасці. Яе адраджэнне у 1918 -- 1919 гг. у выглядзе БНР і БССР прывяло да аднаўлення міжнароднай дзейнасці Беларусі. У гэтыя гады пачынаецца фарміраванне і ажыццяўленне новай знешняй палітыкі Беларусі ХХ-га стагоддзя. Адным з асноўных накірункаў дзейнасці БНР была дыпламатычная праца па міжнароднаму прызнанню незалежнасці Беларусі. У гэтай справе удалося дасягнуць пэўных поспехаў. БНР была прызнана Эстоніяй, Латвіяй, Грузіяй, Арменіяй, Фінляндыяй, Украінай, Чэхаславакіяй. У сталіцах еўрапейскіх краін быў створаны шэраг беларускіх прадстаўніцтваў. Прадстаўнікі БНР прымалі удзел (праўда не у якасці правадзейных і поунамоцных дэлегатаў) у Парыжскай мірнай канферэнцыі 1919 -- 1920 гг., Генуэзкай канферэнцыі 1922 г., выступалі на асамблеі Лігі Нацый у Жэневе, патрабавалі дапусціць іх на савецка-польскія мірныя перамовы 1920 г. і выступалі супраць несправядлівага для Беларусі Рыжскага мірнага дагавора 1921 г. Аднак вялікія дзяржавы адмовіліся юрыдычна прызнаць БНР. Кароткачасовы тэрмін дзейнасці БНР на беларускай зямлі (з лютага 1918 г. па снежань 1919 г.), які саўпаў з перыядам нямецкай і польскай акупацыі, не дазволіў першай беларускай дзяржаве ХХ ст. разгарнуць сапраўдную унутраную і знешнюю палітыку. Урад БНР на эміграцыі працягваў адстойваць беларускія інтарэсы і прыкладаў намаганні для пастаноўкі беларускага пытання на міжнароднай арэне.

Другая беларуская дзяржава -- БССР у першыя гады свайго існавання праводзіла даволі актыўную знешнепалітычную дзейнасць, цесна каардынуючы яе з РСФСР. Сумесна з РСФСР і УССР яна падпісала некалькі пагадненняў з замежнымі краінамі. Разам з тым бальшавіцкае кіраўніцтва БССР праяўляла нацыянальны нігілізм, ігнаравала гісторыка-этнаграфічныя межы рассялення беларусаў. Гэта неаднаразова праяўлялася у адносінах з суседнімі дзяржавамі: Савецкай Расіяй, Польшчай, Літвой, Латвіяй, калі камуністычны ўрад БССР ахвяраваў беларускімі тэрыторыямі і інтарэсамі.

Асабліва яскрава гэта выявілася пры заключэнні мірнага дагавора паміж Савецкай Расіяй і Польшчай. Восенню 1920 г. Ваенна-

рэвалюцыйны камітэт БССР у якасці вышэйшага часовага органа улады выдаў РСФСР "самы шырокі мандат на вядзенне мірных перагавораў з Польшчай па пытанню галоўным чынам вызначэння межаў Беларусі". Гэты крок фактычна развязваў рукі аб'яднанай расійска-украінскай дэлегацыі на перамовах з польскай дэлегацыяй у Рызе і дазваляў Маскве па свайму разуменню вырашаць лес Беларусі. У выніку быў падпісаны ганебны Рыжскі мір у сакавіку 1921 г. З аднаго боку, ен зафіксаваў прызнанне Польшчай незалежнасці Украіны і Беларусі і стаў першым актам юрыдычнага прызнання (прызнання дэ юрэ) БССР замежнай дзяржавай. Аднак куплены ен быў занадта дарагой цаной, бо дагавор прадугледжваў пераход пад уладу Польшчы значнай часткі тэрыторыі рэспублікі (каля 108 тыс.кв.) з насельніцтвам больш 4 млн.чалавек. Рыжскі мірны дагавор, заключаны памiж РСФСР (і па упаўнаважанню урада БССР) і УССР, з аднаго боку, і Польшчай — з другога разарваў Беларусь на дзве часткі і замацаваў пераход Заходняй Беларусі да Польшчы.

Двойчы: у 1918 г. у выніку Брэсцкага міра з Германіяй і у 1921 г. — Рыжскага міра з Польшчай, маючых грабежніцкі і несправядлівы характар, заключаных Савецкай Расіяй пад прымусам знешніх абставін, значная частка тэрыторыі і насельніцтва Беларусі перайшла пад юрысдыкцыю іншаземных дзяржаў. У абодвух выпадках пры падпісанні гэтых важнейшых для вырашэння лесу беларускага народа дакументаў адсутнічалі яго правадзейныя прадстаўнікі. Характэрна, што Украінская ССР была прадстаўлена у Рызе сваей уласнай дэлегацыяй. Пры заключэнні Рыжскага дагавора нацыянальныя інтарэсы і годнасць беларусаў былі у поўным сэнсе ўлічэмлены. Брэсцкі дагавор з'явіўся у выніку гістарычных акалічнасцей недаўгавечным і ўжо праз паўгода пасля яго падпісання нямецкія войскі вымушаны былі пакінуць Беларусь, што і адкрывала шлях да утварэння БССР. Аднак Рыжскі мір амаль што на 20 год аддаў Заходнюю Беларусь пад уладу іншаземнай дзяржавы.

Нацыянальны нігілізм і зневажэнне гісторыка-этнаграфічных межаў рассялення беларусаў і іх нацыянальнага гонару з боку кіраўнікоў толькі што народжанай БССР праявіліся і у тым, што 3 з 5 губерняў, складаўшых БССР, былі пераданы РСФСР перад уваходжаннем БССР у склад ЛітБел. Пасля другога абвяшчэння незалежнасці БССР у 1920 г. і да 1924 г. яе тэрыторыя скла-

далася толькі з 6 паветаў (1,6 млн. чалавек). Беларусь знаходзілася ў такіх умовах, калі рэальнай падставы існавання суверэннай рэспублікі не было. Але паступова беларуская савецкая дзяржава выходзіла на еўрапейскую арэну. У 1922 г. пасля падпісання пагаднення у Рапала паміж РСФСР і Германіяй апошняя прызнала БССР дэ юрэ. Беларусь усталявала дыпламатычныя адносіны з Польшчай і Германіяй. Гэта было значнае дасягненне беларускай дыпламатыі, якое сведчыла аб прызнанні БССР замежнымі краінамі ў якасці суб'екта міжнароднага права. Адносіны дэ факта у гэты час рэспубліка падтрымлівала з Літвой, Эстоніяй, Латвіяй, Аўстрыяй, Чэхаславакіяй, Турцыяй, Італіяй і Англіяй.

Уступленне БССР у састаў Саюза ССР вызначыла новы этап у гісторыі беларускай дзяржаўнасці, істотна мяняла месца і ролю знешнепалітычных функцый БССР. Знешнепалітычныя паўнамоцтвы рэспублікі былі перададзены саюзным цэнтральным органам, што вяло да абмежавання суверэнітэта Беларускай ССР, як і іншых рэспублік, у галіне знешніх зносін. У 1923 г. ліквідаваны рэспубканскія народныя камісарыяты па знешніх справах (у тым ліку і у БССР), створана адзінае знешнепалітычнае ведамства -- народны камісарыят замежных спраў СССР. БССР, як і іншыя рэспублікі, магла удзельнічаць у міжнароднай дзейнасці СССР праз сваіх прадстаўнікоў на агульнасаюзных з'ездах Саветаў, у вярхоўных і цэнтральных органах улады, а таксама праз пастаяннае прадстаўніцтва урада БССР пры СНК краіны, упраўленні ўпаўнаважаных агульнасаюзных народных камісарыятаў па замежных справах і знешнім гандлі заснаваныя пры СНК БССР.

Ажыццяўленне беларусізацыі і новай эканамічнай палітыкі у другой палове 20-х гадоў абумовілі даволі значны для гэтага часу ўзровень гандлевых і культурных сувязей рэспублікі. З улікам новых умоў гаспадарання у маі 1926 г. пачаў функцыяніраваць народны камісарыят знешняга і унутранага гандлю. У Германіі, Польшчы, Англіі, Латвіі дзейнічалі гандлевыя прадстаўніцтвы Белзнешгандлю і народнага камісарыята гандлю БССР, а таксама прадстаўніцтвы, канторы, бюро лесаэкспартных трэстаў Беларусі. Развіваліся грамадска-палітычныя і навуковыя сувязі з замежнымі краінамі.

Аднак у канцы 20-х -- пачатку 30-х гадоў міжнародныя кан-

такты БССР рэзка пайшлі на спад. Гэта было звязана з сур'ёзнымі дэфармацыямі нацыянальнай палітыкі, з боку усталяваўшагася ў СССР сталінскага таталітарнага рэжыму, звышцэнтралізацыяй улады ў саюзных органах і ведамствах. Адносіны паміж рэспублікамі і цэнтрам набываюць усе больш характар падначаленасці, залежнасці ад саюзных партыйных і дзяржаўных органаў. Дыктат цэнтра вызначаў дэкларатыўнасць суверэнітэта БССР як у галіне унутранага, так і знешнепалітычнага жыцця, што пацвердзілі і асноўныя палажэнні Канстытуцыі СССР 1936 г., Канстытуцыі БССР 1937 г. Канстытуцыя СССР прадугледжвала, што саюз прадстаўляе краіну ў міжнародных зносінах, падпісвае, ратыфікуе ці дэнансуе дагаворы з другімі дзяржавамі. Ні саюзная, ні рэспубліканская канстытуцыі, другія дзяржаўныя акты не размяжоўвалі знешнепалітычную кампетэнцыю федэрацыі і яе членаў. У гэтых умовах зацвердзілася практыка, калі ні адна знешнепалітычная ці знешнеэканамічная акцыя не магла ажыццяўляцца без рашэння адпаведных саюзных органаў.

З другой палавіны 30-х гадоў міжнародныя сувязі БССР ва умовах распаўсюджвання фашызма і ўзмацнення пагрозы вайны, нарастання ў краіне атмасферы усеагульнай падазронасці і страху, рэпрэсій, адарванасці савецкага народа ад знешняга свету, ледзьве цяпліліся. Спыніла сваю дзейнасць Беларускае таварыства культурнай сувязі з загранічай, створанае у 1926 г. Навуковыя кантакты звяліся у асноўным да кнігаабмену. Гандлева-эканамічныя сувязі практычна абарваліся. Падтрымка міжнародных антыфашысцкіх мерапрыемстваў, акты салідарнасці з класавай барацьбой замежнага пралетарыята і удзел у дзейнасці Міжнароднай арганізацыі дапамогі барацьбітам рэвалюцыі -- вось галоўныя напрамкі сувязі з замежнай грамадкасцю.

У складаных міжнародных умовах канца 30-х гадоў сталінскае кіраўніцтва працягвала практыку падзелаў Беларусі і ігнаравання яе інтарэсаў, робячы гэта за спіной кіраўніцтва БССР. Савецка-германскія дамоўленасці 1939-1940 гг., у тым ліку сакрэтная здзелка аб размежаванні сфер уплыву у Польшчы (якая датычылася Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны), былі вялізным сакрэтам і для беларускага кіраўніцтва, а не толькі народа. А сам па сабе гістарычна справядлівы акт далучэння Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны быў ажыццёўлены 17 верасня 1939 г. непрыгоднымі сродкамі: на падставе тайнай змовы Сталіна і Гітлера,

шляхам узброенага ўварвання Чырвонай Арміі на тэрыторыю польскай дзяржавы, якая гінула ад нямецка-фашысцкага нашэсця.

Без парады з беларускім народам і вышэйшымі органамі яго дзяржаўнай улады, без іх згоды, без уліку этнічных межаў сталінска-молатаўская дыпламатыя у 1939--1940 г. перадала Літве Віленскі край (за выключэннем паласы ад Гродна да Маладзечна), а таксама Свянцянскі і часткі пяці другіх раёнаў Баранавіцкай і Вілейскай абласцей БССР. Такую страту панёс беларускі народ за падпісанне дагавора ад 10 кастрычніка 1939 г. паміж СССР і Літвой (згодна якога там размяшчаліся чырвонаармейскія гарнізоны) і далучэння Літвы 3 жніўня 1940 г. да Саюза ССР. Свае імперскія памкненні сталінскае кіраўніцтва задавальняла за кошт тэрыторыі і другіх інтарэсаў беларускага народа, зневажаючы яго суверэнныя правы і годнасць.

Новая ступень арганізацыі і ажыццяўлення знешнепалітычных сувязей БССР звязаны з прыняццем Вярхоўным Саветам СССР у лютым 1944 г. закона "Аб прадстаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваў у галіне знешніх зносін і аб пераўтварэнні ў сувязі з гэтым Народнага камісарыята замежных спраў з агульнасаюзнага у саюзна-рэспубліканскі Народны камісарыят". На сесіі Вярхоўнага Савета рэспублікі (сакавік 1944 г.) адпаведныя змены былі замацаваны у Канстытуцыі БССР. Артыкул 16а зафіксаваў, што "Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка мае права ўступаць у непасрэдныя зносіны з замежнымі дзяржавамі, заключаць з імі пагадненні і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі". Сесія прыняла закон аб стварэнні народнага камісарыята замежных спраў (з 1946 г. -- Міністэрства замежных спраў БССР).

Гэтае пашырэнне знешнепалітычнай кампетэнцыі рэспублік аб'ектыўна стварала больш спрыяльныя ўмовы для вырашэння імі сваіх спецыфічных гаспадарчых, культурных і другіх задач у галіне міжнародных адносін, садзейнічала і пашырэнню зарубежных сувязей усяго Саюза. Аднак рэалізаваць дадзеныя паўнамоцтвы ва умовах сталінскага рэжыму (а у значнай ступені і у наступны час) аказалася надзвычай цяжкай справай, бо уся знешнепалітычная дзейнасць была сканцэнтравана у саюзных органах і манапалізіравана імі, адсутнічала размежаванне функцый паміж рэспублікамі і цэнтрам. Дзеля аб'ектыўнасці трэба прызнаць,

што і рэспублікі не мелі падрыхтаваных кадраў дыпламатаў, для іх нечаканасцю было і само прадастаўленне знешнепалітычных паўнамоцтваў у ходзе Вялікай Айчыннай вайны, час не самы спрыяльны для пашырэння самастойнасці рэспублік на міжнароднай арэне.

Рашаючай акалічнасцю прыняцця закона у 1944 г. быў перш за усе палітычны разлік савецкага партыйнага і дзяржаўнага кіраўніцтва, які вынікаў з хода міжнародных абставін. Вядома, што на Маскоўскай канферэнцыі міністраў замежных спраў СССР, ЗША і Вялікабрытаніі (кастрычнік 1943 г.), на Тэгеранскай канферэнцыі (лістапад-снежань 1943 г.) кіраўнікоў трох саюзных дзяржаў абмяркоўваліся пытанні пасляваеннага ўладжвання свету і бяспекі народаў, у тым ліку і стварэння міжнароднай арганізацыі для падтрымання міру. Закон аб прадастаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтваўугаліне знешніх зносін стаў юрыдычнай асновай пастаноўкі пытання аб іх членстве у гэтай арганізацыі. Такая прапанова была выказана СССР на папярэдніх перагаворах аб стварэнні ААН, якія праходзілі у жніўні — кастрычніку 1944 г. у Думбартон-Оксе (ЗША). Аднак яна не атрымала падтрымкі заходніх дзяржаў, якія кваліфікавалі гэта як памкненні да "множественного членства" з мэтай забеспячэння сабе пэўных пераваг у гэтай арганізацыі. Безумоўна, СССР меў намер такім чынам павялічыць свой уплыў на яе дзейнасць.

На Крымскай канферэнцыі кіраўнікоў Англіі, ЗША і СССР (люты 1945 г.) пасля вострых дыскусій і дасягнення згоды паміж яе удзельнікамі па шэрагу узаемазвязаных складаных міжнародных праблем была дасягнута прынцыповая дамоўленасць аб прадстаўніцтве у арганізацыі міжнароднай бяспекі адначасова з СССР дзвюх з шаснаццаці рэспублік — Беларусі і Украіны. Рашэнне ўстаноўчай канферэнцыі (Сан-Францыска, 1945) аб уключэнні БССР і УССР у лік заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый стала вызначальным для выхада гэтых рэспублік на міжнародную арэну у якасці суб'ектаў міжнароднага права. Пры гэтым падставай да прыняцця БССР і УССР у ААН з'явіўся іх фармальна суверэнны характар, а таксама прызнанне міжнародным супольніцтвам укладу беларускага і украінскага народаў у разгром гітлераўскай Германіі, іх велізарныя ахвяры у барацьбе з фашызмам. 26 чэрвеня 1945 г. БССР падпісала Статут ААН, які Прэзідыум

Вярхоўнага Савета БССР ратыфікаваў у жніўні таго ж года.

Вядома, што савецкая дыпламатыя, намагаючыся запрашэння рэспублікі да членства ў міжнароднай арганізацыі, абгрунтоўвала гэта памерамі тэрыторыі і насельніцтва гэтых, па выразу Сталіна, "двух асноўных савецкіх рэспублік", іх гераічным укладам і вялізнымі ахвярамі ў барацьбе з фашызмам. Гэта менавіта так, але слушнымі былі і довады заходняй дыпламатыі, Рузвельта і Чэрчыля, якія адносілі да галоўных прычын такой пастаноўкі пытання намаганні СССР мець два дадатковых галасы ў Генеральнай Асамблеі ААН, а таксама спробу Сталіна задаволіць такім чынам нацыянальны гонар беларусаў і украінцаў, сярод якіх (асабліва на Украіне) за гады вайны вызначаўся апазіцыйны ўладзе рух. Актам уключэння БССР і УССР у склад ААН партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР хацела паказаць сябе ў вачах сусветнай грамадскасці прыхільнікам суверэннасці савецкіх народаў, умацаваць міжнародныя пазіцыі дзяржавы, затушаваць яе таталітарную і ўнітарную сутнасць. Гэта пацвярджае і характар знешнепалітычнай дзейнасці тых рэспублік, які не сталі членамі ААН, іх нязначная ўключанасць (асабліва да XX з'езда КпСС, 1956 г.) у міжнародныя адносіны краіны, пры гэтым выключна праз саюзныя органы знешніх зносін. Сфера ж знешнепалітычнай дзейнасці БССР і УССР была значна шырэйшай, пазіцыя іх прадстаўнікоў гучала ў ААН і другіх міжнародных арганізацыях, пашыралася практыка заключэння двух - і шматбаковых дагавораў. Аднак, было б вялікім спрашчэннем гаварыць аб суверэнітэце рэспублікі ў знешніх справах, аб самастойнасці яе дзеянняў і пазіцыі на міжнароднай арэне.

Адзін з галоўных крытэрыяў суверэнітэта, самастойнасці ў міжнародных справах -- права на устанаўленне дыпламатычных зносін, абмен пасальствамі і консульствамі з замежнымі дзяржавамі. Як жа рэалізоўвалася гэтая права, якое рэспублікі атрымалі па закону 1944 г. (замацаванае затым і канстытуцыямі СССР і БССР 1977 г. і 1978 г.)? На сваіх першых канферэнцыях (май 1945 г., Сан-Францыска) міністры замежных спраў БССР і УССР К.В.Кісялеў і Д.З.Мануільскі гаварылі аб хуткім устанаўленні дыпламатычных зносін рэспублік з замежнымі дзяржавамі. Хутчэй за усе яны шчыра верылі ў магчымасць гэтага. Але саюзнае кіраніцтва не намеравалася даваць рэспублікам такі важны інструмент

знешняй палітыкі як абмен пасольствамі нават з пагранічнымі дзяржавамі, дзе, як правіла, рэспублікі мелі свае спецыфічныя інтарэсы. Англія у 1947 г. і 1949 г. звярнулася да савецкага урада з прапановай аб устанаўленні дыпламатычных адносін з Украінай, але так і не атрымала афіцыйнага адказу. На пачатку 50-х гадоў кангрэс ЗША абмяркоўваў пытанне аб устанаўленні дыпламатычных адносін з Украінай і Беларуссю, аднак дзяржаўны дэпартамент палічыў гэта безперспектыўнай справай. Пасля гэтага, наколькі вядома, другіх спроб не было (своеасаблівай кампенсацыяй сталі консульствы ГДР (1972), Польшчы (1972), Балгарыі (1990) у БССР, шэрагу еўрапейскіх краін -- членаў СЭУ, ЗША і Канады на Украіне).

Членства рэспублікі у А'Н адкрыла перспектыву яе ўдзелу (праўда, толькі у рамках саюзных ініцыятыў) у абмеркаванні і вырашэнні міжнародным супольніцтвам важных праблем, далучэння да дзейнасці шэрагу спецыялізаваных устаноў: у тым ліку Міжнароднага саюза электрасувязі і Сусветнага паштовага саюза (з 1947 г.), Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (з 1948 г.) Сусветнай арганізацыі аховы здароўя (1948 -- 1949 гг.), Міжнароднай арганізацыі працы (МАП, з 1954 г.), ААН па справах адукацыі, навукі і культуры (ЮНЕСКО, з 1954 г.). Па ініцыятыве беларускай дэлегацыі І сесія Генеральнай Асамблеі ААН (1946 г.) прыняла рэзалюцыю аб выдачы і пакаранні ваенных злачынцаў. Прадстаўнікі БССР у міжнародных арганізацыях выступалі у падтрымку савецкіх прапаноў па разбраенню, умацаванню міжнароднай бяспекі, супраць пагрозы новай вайны. Падтрымліваючы барацьбу народаў за незалежнасць, яны дамагаліся стварэння сістэмы міжнароднай апекі, якая б забяспечвала шлях да незалежнасці каланіяльным народам. З 1954 г. БССР пачала ўдзельнічаць у праграмах тэхнічнай дапамогі ААН краінам, якія сталі на шлях развіцця. БССР пашырыла практыку заключэння дагавораў, пагадненняў, канвенцый на двух-і шматбаковай аснове. Адным з першых актаў на гэтым шляху было падпісанне прадстаўнікамі БССР і Польшчы у 1944 -- 1945 гг. пагаднення і дадатковага пратаколу для яго аб парадку дабраахвотнай рэпатрыяцыі беларускага і польскага насельніцтва у сувязі са зменамі савецка-польскай дзяржаўнай граніцы. У цяжкіх умовах ваеннай разрухі ўрад рэспублікі у студзені 1945 г. выдзеліў Польшчы з сваіх запасаў 10 тыс.тон хлеба. Гэта было несумненна палітычна-прапагандысцкае рашэнне,

паколькі сам беларускі народ галадаў.

Як удзельніца Парыжскай мірнай канферэнцыі (ліпень--кастрычнік 1946 г.) БССР далучылася да ўрэгулявання пасляваенных еўрапейскіх праблем. Яна садзейнічала выпрацоўцы і падпісала мірныя дагаворы з Балгарыяй, Венгрыяй, Румыніяй, Італіяй, Фінляндыяй, якія ваявалі на баку гітлераўскай Германіі. У снежні 1945 г. заключана пагадненне паміж урадам БССР і Адміністрацыяй дапамогі і аднаўлення Аб'яднаных Нацый (ЮНРРА), якая была створана міжнародным супольніцтвам для аказання дапамогі найбольш пацярпелым у вайне краінам. На падставе яго рэспубліка атрымала да канца 1947 г. тавараў і абсталявання на 61 млн. долараў, у тым ліку для адраджэння прамысловасці і сельскай гаспадаркі -- на 23,5 млн. долараў. Дэлегацыі Беларускай ССР удзельнічалі у падтрыхтоўцы і падпісанні 4 канвенцый аб паляшэнні лесу ахвяр вайны (1949 г.) і Канвенцыі аб ахове культурных каштоўнасцей у выпадку ўзброенага канфлікту (1954 г.). Усяго з 1944 па 1955 гг. рэспубліка падпісала больш 30 дагавораў, пагадненняў і канвенцый па палітычных, прававых і іншых пытаннях.

Але у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе як знешнепалітычны курс краўны, так і канкрэтныя ініцыятывы БССР вызначаліся саюзным партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам. Рэспубліка практычна не удзельнічала у вырашэнні гэтых праблем, а беларускія дэлегацыі у міжнародных арганізацыях былі абавязаны выступаць у падтрымку савецкіх прапаноў. Без узгаднення з адпаведнымі органамі рэспублікі саюзным кіраўніцтвам усталёўвалася дзяржаўная граніца з суседняй Польшчай, ставілася пытанне аб членстве БССР у ААН і спыненні яе дзейнасці ў Сусветнай арганізацыі аховы здароў'я.

Ва умовах дыктатарскага сталінскага рэжыму адсутнічала рэальная самастойнасць савецкіх рэспублік у міжнародных справах, што абумовіла пасіўнасць вышэйшых органаў улады БССР у гэтых пытаннях, адсутнасць адпаведных структур у іх складзе і прадстаўніцтваў за мяжой, нават пры ААН і у суседніх краінах. У прыватнасці, не была рэалізавана прапанова Часовага польскага урада аб адкрыцці консульскага гэтай краіны у Мінску мятлядзячы на тое, што згода з ёй савецкага боку была замацавана пастановай СНК СССР ад 6 ліпеня 1945 г. Цяжкасці аднаўлення і

развіцця у пасляваенны час гаспадаркі, навукі і культуры, халодная вайна паміж дзяржавамі процілеглых сістэм, партыйна-дзяржаўная палітыка адмежаванасці савецкага грамадства ад знешняга свету абумовілі нязначнасць грамадска-палітычных, эканамічных, культурных сувязей рэспублікі з замежнымі краінамі. Яны былі эпізадычнымі нават з краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, у большасці якіх устанаўлівалася сталінская мадэль сацыялізму.

Негатыўны адбітак на развіцце замежных сувязей аказала падазронасць да ўсіх, хто меў кантакты з іншаземцамі, а таксама разгорнутая у другой палове 40-х -- пачатку 50-х гадоў кампанія па барацьбе з касмапалітызмам і нізкапаклонствам перад Захадам. Да такіх праяў старанныя выканаўцы часта адносілі натуральную цікавасць да замежнага вопыту грамадскага жыцця, развіцця навукі і іншых сфер культуры. У гэтых умовах пастанова Савета Міністраў БССР і ЦК КП(б)Б ад 1946 г. аб арганізацыі Беларускага таварыства культурнай сувязі з замежжам была рэалізавана толькі у 1952 г., пры гэтым яго кантакты да сярэдзіны 50-х гадоў былі нязначнымі.

Толькі пасля смерці Сталіна з'явіліся першыя прыкметы станоўчых змен у адносінах да міжнародных кантактаў. Пры Савеце Міністраў БССР у 1953 г. было створана Упраўленне па замежнаму турызму, а у 1955 г. Беларусь наведалі першыя групы іншаземных турыстаў і больш за 100 замежных дэлегацый пабывалі за мяжой. Пачала функцыянаваць Беларускае аддзяленне Усесаюзнай гандлевай палаты. Аднак гандлевыя сувязі былі невялікімі па памерах і асартыменту. Экспартныя пастаўкі з Беларусі у гэты час уключалі 15--18 тавараў, большасць якіх прыпадала на сыравіну. Толькі з сярэдзіны 50-х гадоў у экспарце павялічылася доля машын і абсталявання. У 1955 г. Фінляндыя, напрыклад, набыла 25 трактароў мінскага завода.

У сярэдзіне 50-х гадоў "жалезная заслона" была крыху прыпаднята, што пашырыла магчымасці ўдзелу Беларускай ССР у міжнародным жыцці. Калі у канцы 50-х гадоў рэспубліка была ўдзельніцай 54 міжнародных дагавораў, канвенцый і пагадненняў, то у сярэдзіне 80-х гадоў -- больш як 160 міжнародных актаў. У гэты прамежак часу яна прымала удзел у рабоце 60--70 міжнародных арганізацый і іх органаў. Для падтрымання рэгулярных кантактаў з імі былі створаны пастаянныя прадстаўніцтвы БССР пры ААН у Нью-Йорку (1958 г.), Еўрапейскім аддзяленні ААН у

Жэневе, пры ЮНЕСКА у Парыжы (1962), міжнародных арганізацыях у Вене.

Па ініцыятыве і пры актыўным удзеле дэлегацый БССР у міжнародных арганізацыях прынята нямала канструктыўных рашэнняў, якія спрыялі недапушчэнню новай вайны, паслабленню міжнароднай напружанасці, пашырэнню ўзаемаразумення паміж народамі. БССР стала удзельніцай важных дагавораў, якія стрымлівалі гонку узбраенняў: аб забароне выпрабаванняў ядзернай зброі у атмасферы, касмічнай прасторы і пад вадой (1963), аб прынцыпах дзейнасці дзяржаў па даследаванню і выкарыстанню касмічнай прасторы (1967), аб забароне размяшчэння на дне мораў і акіянаў і у яго нетрах ядзернай зброі (1971), аб забароне распрацоўкі, вытворчасці і назапашвання бактэрыялагічнай (біялагічнай) і таксіннай зброі і іх знішчэння (1972).

Выступаючы за сацыяльны прагрэс і захаванне правоў чалавека, БССР стала саўтарам Дэкларацыі сацыяльнага развіцця (1969 г.), Дэкларацыі аб выкарыстанні навукова-тэхнічнага прагрэсу у інтарэсах міру і на карысць чалавецтва (1975). Яна падпісала і ратыфікавала канвенцыю аб непрымяненні тэрмінаў даўнасці да ваенных злачынстваў і злачынстваў супраць чалавецтва (1969). Па прапанове БССР Генеральная Асамблея ААН ухваліла з некаторымі папраўкамі прынцыпы міжнароднага супрацоўніцтва у адносінах аддукання, арышту, выдачы і пакарання асоб, вінаватых у ваенных злачынствах і злачынствах супраць чалавецтва (1973). БССР стала удзельніцай Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах, Міжнароднага пакта аб эканамічных, сацыяльных і культурных правах, Міжнароднай канвенцыі аб ліквідацыі усіх форм расавай дыскрымінацыі. Беларуская ССР падтрымала Дэкларацыю аб прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам (1960 г.), а у наступныя гады рашуча выступала за яе поўнае выкананне. Рэспубліка стала саўтарам рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН аб забароне выкарыстання замежных наймітаў супраць нацыянальна-вызваленчага руху і барацьбы народаў за незалежнасць (1968). Па прапанове дэлегацыі БССР Генеральная Асамблея ААН прыняла рэзалюцыю аб абароне асоб, якія затрыманы ці пазбаўлены волі за барацьбу супраць апартэіда, расізму і расавай дыскрымінацыі, каланіялізму, агрэсіі і замежнай акупацыі (1977).

У якасці члена Міжнароднай арганізацыі працы, ЮНЕСКА, МАГАТЭ і іншых міжнародных арганізацый рэспубліка удзельнічала у выз-

начэнні напрамкаў іх дзейнасці, прыняцці важных рашэнняў па паглыбленню раўнапраўнага супрацоўніцтва ва ўсіх сферах жыцця, а таксама далучалася праз іх да сусветнага вопыту. Але выкарыстоўваўся ен ва ўмовах загадна-адміністрацыйнай сістэмы далека не у поўную меру.

Аглядаючы набыткі знешнепалітычнай дзейнасці, нельга абмінуць і такія хібы, як прамаруджванне у далучэнні да асобных міжнародных актаў ці іх ратыфікацыі, неадпаведнасць рэспубліканскага заканадаўства некаторым палажэннем міжнародных пактаў (асабліва па правах чалавека), падпісаних Беларускай ССР. Так, стаўшы членам Міжнароднай арганізацыі працы у 1954 г., рэспубліка толькі у 1965 г. ратыфікавала канвенцыю адносна забароны працы жанчын на падземных работах. Толькі у 1988 г. яна далучылася да канвенцыі аб ахове сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны чалавецтва, распрацаванай ЮНЕСКА у 1972 г. Парушэннем міжнародных пактаў стала адсутнасць у краіне і рэспубліцы заканадаўчага замацавання права свабоднага перамяшчэння грамадзян, іх выезда за мяжу і вяртання.

Хоць сфера знешнепалітычнай дзейнасці БССР (як і УССР) была шырэй, чым іншых саюзных рэспублік, але практычна усе пытанні адносін рэспублікі з замежнымі дзяржавамі, міжнароднымі арганізацыямі вырашаліся Савецкім урадам і саюзнымі органамі. Дыктат цэнтра вынікаў з палажэння Канстытуцыі СССР аб адносінах да кампетэнцыі Саюза устанаўленне агульнага парадку ва ўзаемаадносінах рэспублік з замежнымі дзяржавамі, неразмежаванасці функцый саюзных і рэспубліканскіх органаў, пасіўнасці партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва БССР. Спробы пашырыць правы саюзных рэспублік у сярэдзіне 50-х і 60-х гадоў, другой палове 70-х гадоў (пераважна у галіне гаспадарчай дзейнасці) былі абмежаванымі, непаслядоўнымі, супярэчылі інтарэсам камандна-адміністратыўнай сістэмы і практычна не паўплывалі на міжнародныя зносіны рэспублік. Знешнепалітычная дзейнасць БССР развівалася у агульным рэчышчы міжнароднай дзейнасці СССР, скардынаванай палітыкі краін--членаў Варшаўскага Дагавора і СЭУ. У прыватнасці, разам з дэлегацыямі СССР, УССР прадстаўнікі БССР выказвалі свае меркаванні і узгаднялі пазіцыі з саюзнікамі на рэгулярных нарадах напярэдадні сесій Генеральнай Асамлеі ААН, Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА, якія затым супольна адстойваліся.

Характар і маштабы знешнепалітычнаі дзейнасці рэспублікі вызначаліся агульнымі працэсамі развіцця міжнароднай абстаноў-

кі, процістарствам двух сістэм і іх ваенна-палітычных саюзаў. У разгарнуўшайся халоднай вайне з Захадам СССР аказаўся ўцягнутым у знясільваючую гонку ўзбраенняў, рэгіянальныя канфлікты (Карэя, Блізкі Усход, Індакітай, Куба, Афрыка, Камбоджа, Афганістан). Пазіцыі СССР і усяго "савецкага блоку" пагоршыліся ў сувязі з уводам савецкіх войск у Венгрыю (1956 г.) і Чэхаславакію (1968 г.), Афганістан (1979 г.). Гэтыя дзеянні, якія навіна была апраўдываць беларуская дэлегацыя у ААН, выклікалі негатыўны адбітак на вобраз Беларусі у свеце.

Пасля XX з'езда КПСС (1956 г.) Беларуская ССР, як і усе іншыя саюзныя рэспублікі, атрымала больш спрыяльныя магчымасці для пашырэння кантактаў у сферы грамадска-палітычнай і эканамічнай. З сярэдзіны 50-х гадоў атрымалі развіцце сувязі прыгранічных, а у далейшым -- і унутраных абласцей, краёў, гарадоў, раёнаў на аснове дагавораў аб супрацоўніцтве з аналагічнымі адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі краін-- членаў СЭУ. Пачынаючы з сярэдзіны 50-х гадоў зацвердзілася практыка заключэння дагавораў і пагадненняў аб узаемадзеянні паміж вну, навукова-даследчымі інстытутамі, установамі культуры, прадпрыемствамі, гэта значыць вытворчымі калектывамі рэспублік і краін-членаў СЭУ. Пераход ад аднаўленння сувязей пераважна цэнтральнымі органамі да ўключэння у гэтыя працэсы працоўных калектываў стымулявау больш грунтоўна, чым раней, абмен вопытам арганізацыі грамадскага жыцця, развіцця вытворчасці, культуры, пашырэння зносін новых пластоў насельніцтва. Геаграфічнае палажэнне Беларускай ССР, блізасць да еўрапейскіх краін, зручныя транспартныя зносіны з імі, а у пэўнай ступені і культурная супольнасць славянскіх народаў выклікалі значны аб'ем сувязей з Польшчай, Балгарыяй, Чэхаславакіяй, ГДР у грамадска-палітычнай, эканамічнай і культурнай сферах. Па лініі мясцовых органаў улады новы імпульс атрымалі сувязі парадненых гарадоў краіны, у тым ліку і БССР, і зарубежных дзяржаў. Першымі былі Мінск і Натынгем, якія сталі пабратымамі у 1957 г., а у 1989 г. ужо 12 гарадоў Беларусі мелі кантакты з 17 гарадамі 11 краін.

Парадненне абласцей рэспублікі і адпаведных тэрытарыяльна-адміністрацыйных адзінак Балгарыі, ГДР, Польшчы, Чэхаславакіі значна павысіла узровень іх узаемадзеяння ва усіх сферах. У 1956 г. Гродзенская і Брэсцкая вобласці першымі заключылі пагадненні з прыгранічнымі Беластоцкім і Люблінскім ваяводствамі. У 1985 г. ужо усе вобласці мелі сістэматычныя сувязі на

асновe дагавораў з 10 ваяводствамі Польшчы, 2 акругамі ГДР, акругай Балгарыі і вобласцю Чэхаславакіі. Пашыраўся абмен вопытам з дзяржаўнымі органамі, грамадскімі арганізацыямі і іншых краін--членаў СЭУ і Варшаўскага дагавору. З 1979 г. БССР і Славеніі (СФРЮ) сталі рэгулярна абменьвацца урадавымі і парламенцкімі дэлегацыямі, пераключаў рэспублік заключылі дагаворы аб супрацоўніцтве. Наладжэнне сувязі спрыяла пашырэнню абмену вопытам работы дзяржаўных органаў, грамадскіх арганізацый, вытворчых калектываў, установ культуры і адукацыі, пашырэнню зносін паміж больш шырокімі колавымі насельніцтва. Але практычнае выкарыстанне узаемных набыткаў абмяжоўвалася існаваннем загадна-адміністрацыйнай сістэмы у СССР і краінах--членах СЭУ, а у некаторай ступені служыла і яе кансервацыі.

Актывізацыі міжнародных кантактаў насельніцтва садзейнічала стварэнне новых грамадскіх арганізацый. Заснаваны у 1958 г. Камітэт маладзежных арганізацый БССР наладзіў сувязі з саюзамі і аб'яднаннямі моладзі больш як 20 краін свету. З 1964 г. пачало функцыяніраваць Беларускае таварыства па культурных сувязях з суайчыннікамі за рубяжом. Падтрымліваючы міжнародны рух прыхільнікаў міру, працоўныя рэспублікі, Беларускі камітэт абароны міру (заснаваны у 1951 г.) сталі ўдзельнікамі многіх яго акцый, якія праводзіліся на тэрыторыі рэспублікі,-- мітынгаў, міжнародных сустрэч, канграсаў. Пашырыліся функцыі і сацыяльная база Беларускага таварыства культурнай сувязі з загранічай, якое было у 1958 г. рэарганізавана у Беларускае таварыства дружбы і культурнай сувязі з зарубежнымі краінамі.

Разам з гэтым у арганізацыі грамадска-палітычных сувязей праявіліся і негатыўныя тэндэнцыі. Жорсткая цэнтралізацыя міжнародных адносін, фактычная манаполія партыі на кіраўніцтва усімі справамі грамадства абумовілі іх ідэалагічную зададзенасць, заарганізаванасць, фармалізм, абмежаванасць кола удзельнікаў замежных сувязей. У прыватнасці, не ставіліся і не абмяркоўваліся складаныя пытанні беларуска-польскіх адносін, у тым ліку становішча беларускай меншасці у Польшчы і польскай -- на Беларусі, спрашчэнне працэдуры зносін прыгранічных жыхароў, абмену паміж рэспублікамі групамі турыстаў, спецыялістаў, арганізацыі вытворчага, навукова-тэхнічнага, культурнага супрацоўніцтва. Не вырашалася і праблема сувязей з беларускім замежжам.

Маштабы знешнеэканамічных сувязей рэспублікі вызначаліся яе

прамысловым і навукова-тэхнічным патэнцыялам як часткі народнагаспадарчага комплекса СССР, зручным транспартна-геаграфічным палажэннем Беларусі, а таксама агульным станам эканамічных адносін СССР з замежнымі дзяржавамі, іх сістэмай арганізацыі і кіравання. Уключанасць народнай гаспадаркі краіны ў сусветны эканамічны і тэхналагічны абмен хоць і павысілася ў параўнанні з першымі пасляваеннымі гадамі, але ў целым была нязначнай і не адпавядала патэнцыялу і палітычнай вазе Савецкага Саюзу ў свеце. Гэта безумоўна адбівалася на знешнеэканамічных сувязях рэспублікі, хаця яна ў гаспадарчым развіцці мела лепшыя чым у сярэднім па краіне паказчыкі, у прыватнасці па росту валавога грамадскага прадукта і нацыянальнага даходу, прадукцыйнасці працы. Больш высокай была і удзельная вага тавараў, якія па сваей якасці адпавядалі сусветнаму узроўню ці былі блізкімі да яго. Доля Беларусі ў саюзным экспарце прамысловых вырабаў складала 2--2,3%. Калі у I956 г. больш I00 прадпрыемстваў рэспублікі пастаўлялі сваю прадукцыю 47 краінам, то у I985 г. -- 300 прадпрыемстваў больш чым I00 дзяржавам, у тым ліку трактары, грузавыя аўтамабілі, сіласаўборачныя камбайны, калійныя ўгнаенні, тавары шырокага ўжытку. Аднак удзельная вага машын і абсталявання у экспарце, хоць і была большай, чым па краіне у цэлым, але усе ж заставалася невысокай -- каля 30%. Асноўная частка прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў накіроўвалася краінам--членам СЭУ, прыкладна трэць яе -- усім астатнім дзяржавам.

Імпартныя паступленні ў рэспубліку садзейнічалі аснашчэнню многіх прадпрыемстваў, пэўнаму задавальненню патрэб насельніцтва на тавары шырокага ужытку. Амаль палова з іх прыходзілася на краіны СЭУ і СФРЮ, каля 40% -- прамыслова развітыя дзяржавы Захаду і I0% -- на астатнія.

Больш актыўнаму ўдзелу рэспублікі у міжнародным гандлевым абмене перашкаджалі адсутнасць самастойнага выхаду прадпрыемстваў на сусветны рынак і сістэмы іх матэрыяльнага стымулявання па нарошчванню экспарту. Ведамасная манаполія прыводзіла і да таго, што пры закупцы імпартнага абсталявання і тэхналогій для прадпрыемстваў не заўседы улічваліся іх эксплуатацыйныя якасці і адпаведнасць сусветнаму узроўню, парушаліся вызначаныя тэрміны устаноўкі абсталявання, набытага за валюту.

Здабыткі беларускай літаратуры і мастацтва абумовілі пашырэнне міжнародных сувязей у гэтай галіне. За 40 год (I946--I985) за мяжой надрукаваны 342 асобныя кніжкі 55 беларускіх

пісьменнікаў, якія знаемілі чытача з духоўнымі набыткамі і сацыяльным вопытам беларускага народа. Значную вядомасць там набылі творы Я.Купалы, Я.Коласа, В.Быкава, А.Адамовіча, Я.Брыля, І.Мележа, У.Караткевіча, М.Танка і інш. Так, пераклады твораў В.Быкава аб трагедыі чалавека на вайне (да канца 1985 г. 99 выданняў на 25 мовах) паўплывалі на гуманізацыю еўрапейскай грамадска-палітычнай думкі. Папулярызацыі твораў пісьменнікаў замежных краін садзейнічала публікацыя выдавецтвамі рэспублікі з 1918 па 1985 гг. 880 асобных кніжак іх перакладаў, у тым ліку на беларускай мове -- 507.

Нягледзячы на пашырэнне міжнародных сувязей рэспублікі у другой палове 50-х -- 80-х гадах, пэўную эвалюцыю зместу і форм, яны не падняліся на якасна новую ступень, а іх узровень, практычная вынікі не адпавядалі эканамічнаму, навукова-тэхнічнаму і культурнаму патэнцыялу, запатрабаванням сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі. Пасля 1944 г. размеркаванне кампетэнцыі у сферы міжнародных адносін паміж рэспублікамі і саюзам не зведала значных змен. У Канстытуцыі СССР 1977 г. і прынятых затым канстытуцыях саюзных рэспублік артыкул аб праве саюзных рэспублік мець зносіны з зарубежнымі дзяржавамі, заключаць з імі дагаворы і абменьвацца дыпламатычнымі і консульскімі прадстаўнікамі быў дапоўнены правам удзельнічаць у дзейнасц. міжнародных арганізацый. БССР практычна мела гэта права пасля падпісання Статута ААН і канстытуцыйныя змены практычна не умацавалі юрыдычную базу міжнародных зносін рэспублікі. Тым больш, што вызначэнне асноў міжнароднай дзейнасці было даручана цэнтру. Артыкул 28 Канстытуцыі БССР 1978 г. зацвердзіў, што рэспубліка "у знешнепалітычнай дзейнасці кіруецца мэтамі, задачамі і прынцыпамі знешней палітыкі СССР, вызначанымі Канстытуцыяй СССР". Прававыя асновы нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва СССР у галіне міжнароднай дзейнасці, закладзеныя ў сталінскія часы, закансерваваліся, акасцянелі у гады застою, не былі дапоўнены неабходнымі юрыдычнымі, палітыка-дыпламатычнымі і арганізацыйна-практычнымі мерапрыемствамі.

Распачатыя у 1985 г. працэсы дэмакратызацыі усіх сфер жыццядзейнасці грамадства адкрылі новыя магчымасці ажыццяўлення рэспублікамі міжнароднай дзейнасці. Палітычныя і эканамічныя рэформы, пашырэнне правоў рэспублік вызначылі новы ўзровень іх самастойнасці у міжнародных справах. Аднак, аж да 1990 г. размова ішла менавіта аб пашырэнні правоў рэспублік за кошт некато-

рацы эмяркавання эвышцэнтралізацыі ў дзейнасці саюзных органаў і ведамстваў, а не аб радыкальным перамеркаванні паўнамоцтваў паміж федэрацыяй і рэспублікамі.

Новы этап знешнепалітычнай і міжнароднай дзейнасці Беларусі абумоўлены працэсам суверэнізацыі былых рэспублік СССР, яго распадам. 27 ліпеня 1990 г. Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі. Яна засведчыла права на свабоду і незалежнасць беларускага народа, заявіла перад усім светам аб суверэннасці Беларусі, упершыню вызначыла яе знешнепалітычны курс, які вынікае з нацыянальных патрэб і грунтуецца на міжнародна-прававых актах. У жніўні 1991 г. Вярхоўны Савет БССР надаў канстытуцыйны статус Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, абвясціў аб эканамічнай і палітычнай незалежнасці Беларусі.

Далейшы працэс суверэнізацыі рэспублік, бяссілле саюзных форм улады прывялі ў снежні 1991 г. да стварэння Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД) і спыненню існавання СССР як суб'екта міжнароднага права. Рэспубліка Беларусь прыступіла да адбудовы незалежнай дзяржавы, правядзення самастойнай нацыянальнай палітыкі.

У кастрычніку 1991 г. на 46-й сесіі Генеральнай Асамблеі ААН міністр замежных спраў Рэспублікі Беларусь выклаў знешнепалітычныя прынцыпы і прыярытэты Беларускай дзяржавы: дасягненне рэальнай незалежнасці і суверэнітэту; узаемадзеянне ў стварэнні адзінай эканамічнай прасторы, новага Саюза суверэнных дзяржаў; мабілізацыя міжнароднай падтрымкі ў вырашэнні чарнобыльскай праблемы; ператварэнне Беларусі у безъядзерную зону і нейтральную дзяржаву; яе уключэнне ў агульнаеўрапейскі працэс; стварэнне умоў для фарміравання рынкавай эканомікі у рэспубліцы; забеспячэнне экалагічнай бяспекі; забеспячэнне свабоднага ўзаемадзеяння культур. З трыбуны ААН было заяўлена, што асновай знешнепалітычнага курсу дзяржавы будуць з'яўляцца жыццёвыя інтарэсы беларускага народа.

У праекце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь адзначаецца, што яна з'яўляецца суверэннай дзяржавай, якая самастойна ажыццяўляе ўнутраную і знешнюю палітыку. Згодна з праектам Асноўнага Закона рэспубліка дзейнічае як паўнапраўны суб'ект міжнародных адносін і сусветнага супольніцтва. У сваёй знешняй палітыцы яна выходзіць з агульнапрызнаных прынцыпаў і норм

міжнароднага права, якія маюць прыярытэт над унутрыдзяржаўным правам. У кастрычніку 1991 г. Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў заяву "Аб прынцыпах знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь", у якой пацвердзіў прыхільнасць да прынцыпаў Статута ААН, Усеагульнай Дэкларацыі правоў чалавека, міжнародных пактаў аб правах чалавека. Згодна з гэтай заявай рэспубліка далучылася да Факультатыўнага пратакола да Міжнароднага пакта аб грамадзянскіх і палітычных правах і прызнала кампетэнцыі Камітэта па правах чалавека. За кароткачасовы тэрмін -- ад жніўня 1991 г. да канца 1992 г. -- адбылося дыпламатычнае прызнанне Беларусі. Па стану на 1 студзеня 1993 г. яе прызналі 108 дзяржаў, 68 з іх устанавілі з ей дыпламатычныя адносіны. Рэспубліка Беларусь стала поўнаправным удзельнікам Нарады па бяспецы і супрацоўніцтву у Еўропе. Сярод дзяржаў СНД яна першай падпісала Парыжскую хартыю для новай Еўропы, першай (за выключэннем Расіі) увайшла у Міжнародны валютны фонд і Сусветны банк рэканструкцыі і развіцця, першай адкрыла у сябе аддзяленне ААН/ПРААН.

У лютым 1992 г. Вярхоўны Савет РБ ратыфікаваў Дагавор аб стратэгічных наступальных узбраеннях (СНУ-1), дадатак да яго--так званы Лісабонскі дагавор аб тыпах узбраенняў, Дагавор аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі. Беларусь абавязалася у 1992г. на працягу 7 год вывезці і стратэгічныя узбраенні, часова размешчаныя на беларускай тэрыторыі. У 1992 г. ядзерная тактычная зброя была поўнасцю вывезена за межы рэспублікі. Паслядоўная пазіцыя Беларусі па ядзерных пытаннях атрымала высокую ацэнку міжнароднага супольніцтва.

Новы статус Беларусі як суверэннай дзяржавы абумовіў і новыя патрабаванні да яе знешнеэканамічнай дзейнасці, забеспячэнню эканамічнай бяспекі і развіццю экспартнага патэнцыялу. Таварная наменклатура экспарта рэспублікі уключае каля 1 тыс. найменаванняў, а пастаўкі ажыццяўляюцца больш чым у 80 краін свету. Аднак у экспарце тавараў на сусветныя рынкі больш 50% складаюць бартэрныя пастаўкі. Агульная сума замежных крэдытаў на пачатак 1993г. складала каля 1,5 млрд. долараў. Асноўнымі знешнеэканамічнымі партнерамі Беларусі з'яўляюцца еўрапейскія краіны, на долю якіх прыходзіцца 78% знешнегандлевага абароту. Самыя актыўныя гандлевыя сувязі падтрымліваюцца з Германіяй, Польшчай, Аўстрыяй, ЗША, Вялікабрытаніяй, Кітаям, Швейцарыяй, Даніяй, Італіяй, Турцыяй.

Уключэнне Беларусі у еўрапейскае і сусветнае супольніцтва адбываецца на фоне ўзрастання інтарэсу грамадскіх колаў, палітычных арганізацый і партый да міжнародных адносін, знешняй палітыкі рэспублікі. У беларускім грамадстве існуюць розныя, падчас супрацьлеглыя думкі адносна знешнепалітычных саюзнікаў (на Захадзе ці на Усходзе), прыярытэтаў і накірункаў дзейнасці беларускай дыпламатыі. Пакуль не выпрацавана знешнепалітычная дактрына Рэспублікі Беларусь, не акрэслены яе нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы і мэты. Гэтую працу трэба рабіць сумеснымі намаганнямі заканадаўчай улады, ураду, Міністэрства замежных спраў, палітычных партый і грамадскіх арганізацый, навукоўцаў і, безумоўна, з улікам грамадскай думкі. Дасягненне нацыянальнага кансэнсуса па генеральных напрамках беларускай знешняй палітыкі з'яўляецца гарантыяй захавання стабільнай і трывалай базы яе ажыццяўлення.

ХРАНАЛОГІЯ

1941 г., 22 чэрвеня.	Бераломны напад фашысцкай Германіі на СССР. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны.
1941 г., 28 чэрвеня.	Захоп г.Мінска нямецка-фашысцкімі войскамі.
1941 г., 30 чэрвеня.	Пастанова Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, СНК СССР і ЦК ВКП(б) "Аб утварэнні Дзяржаўнага Камітэта Абароны" (дзейнічаў да 4.9.1945 г.)
1941 г., 18 ліпеня.	Пастанова ЦК ВКП(б) "Аб арганізацыі барацьбы ў тыле германскіх войск".
1942 г., 30 мая.	Пастанова Дзяржаўнага Камітэта Абароны аб стварэнні пры Стаўцы Вярхоўнага Галоўнакамандавання Цэнтральнага штаба партызанскага руху (ЦШПР) на чале з П.К.Панамаронкам.
17 ліпеня 1942 -- 2 лютага 1943 г.	Бітва пад Сталінградам.
9 верасня 1942 г. -- 14 лістапада 1944 г.	Дзейнасць Беларускага штаба партызанскага руху (БШПР) на чале з П.З.Калініным.
1943 г., 26 -- 28 лютага.	У Пленум ЦК КП(б)Б (у Маскве); Адзіны за ўвесь час акупацыі. Абмеркаванне пытання аб становішчы і задачах партыйных органаў і партыйных арганізацый у акупіраваных раёнах Беларусі.
22 чэрвеня 1943 г. -- ліпень 1944 г.	Дзейнасць на Беларусі антысавецкай маладзёжнай арганізацыі "Саюз беларускай моладзі" ("СБМ").

1943 г., 26 лістапада.	Вызваленне войскамі Беларускага фронта першага абласнога цэнтра Беларусі -- г. Гомеля.
1943 г., 21 снежня.	Абвяшчэнне нямецка-фашысцкімі захопнікамі на Беларусі марыянетачнага ўрада -- "Беларускай Цэнтральнай Рады".
1944 г., 1 лютага.	Прыняцце Закона СССР аб прадстаўленні саюзным рэспублікам паўнамоцтва ў галіне знешніх зносін.
1944 г., 3 кастрычніка.	Пастанова СНК СССР "Аб неадкладных мерах па аднаўленню сельскай гаспадаркі Беларускай ССР".
1945 г., 25 красавіка -- 26 чэрвеня	Канферэнцыя Аб"яднаных Нацый у Сан-Францыска, у якой удзельнічалі дэлегацыі СССР, УССР і БССР.
1945 г., 27 красавіка.	Прыняцце БССР у склад членаў-заснавальнікаў Арганізацыі Аб"яднаных Нацый.
1945 г., 8 мая.	Падпісанне Акта аб безагаворачнай капітуляцыі германскіх узброеных сіл.
1945 г., 9 мая.	Дзень Перамогі над фашысцкай Германіяй.
1946 г. снежань.	Пастанова Савета Міністраў СССР і ЦК УКП(б) "Аб мерах дапамогі ў аднаўленні раёнаў Беларускай ССР, якія асабліва пацярпелі ад акупацыі".
1953 г., 5 сакавіка.	Памёр Сталін.

1954 г., 12 мая.	Уступленне БССР у Арганізацыю Аб"яднаных Нацый па пытаннях асветы, навукі і культуры (ЮНЕСКО).
1956 г., 14--25 лютага	XX з"езд КПСС.
1956 г , 30 чэрвеня.	Пастанова ЦК КПСС "Аб пераадоленні культу асобы і яго вынікаў".
1959 г., 15 студзеня.	Усесаюзны перапіс насельніцтва: у БССР налічвалася 8 054 548 чалавек.
1964 г., жнівень.	Атрымана першая прамысловая нафта на Рэчыцкім месцанараджэнні.
1986 г., 26 красавіка.	Адбылася аварыя на Чарнобыльскай АЭС.
1989 г., 22 студзеня.	Пастанова Савета Міністраў БССР "Аб увекавечанні памяці ахвяр масавых рэпрэсій 1937--1941 гг. у лясным масіве Курапаты".
1989 г., 4 чэрвеня.	У Мінску адбыўся ўстаноўчы з"езд Таварыства беларускай мовы (ТБМ), прыняўшы рашэнне надаць яму імя Францыска Скарыны.
1989 г., кастрычнік.	Вярхоўны Савет БССР прыняў Дзяржаўную праграму па ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на 1990--1995 гг.
1990 г., 26 студзеня	Вярхоўны Савет Беларусі прыняў Закон "Аб мовах у Беларускай ССР".
1990 г., 4 сакавіка	Адбыліся выбары народных дэпутатаў БССР і мясцовых Саветаў.

1990 г., 27 ліпеня	Вярхоўны Савет БССР прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР.
1991 г., 25--27 мая	Міжнародны кангрэс беларусістаў.
1991 г., 19--21 жніўня	Спроба дзяржаўнага перавароту ў Маскве.
1991 г., 25 жніўня	Вярхоўны Савет БССР прыняў Закон "Аб наданні статуса канстытуцыйнага закона Дэкларацыі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі".
1991 г., 25 жніўня	Вярхоўны Савет БССР прыняў пастанову "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці Беларускай ССР".
1991 г., 19 верасня	Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон "Аб дзяржаўным сцягу Рэспублікі Беларусь", "Аб дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь". Бела-чырвона-белы сцяг і "Пагоня" сталі сімваламі адраджэння Беларусі.
1991 г., 18 кастрычніка	Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў Закон "Аб грамадзянстве Рэспублікі Беларусь".
1991 г., 8 снежня	Рэспубліка Беларусь, Расійская Федэрацыя і Украіна падпісалі пагадненне аб утварэнні Садружнасці Незалежных Дзяржаў".
1991 г., 10 снежня	Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь ратыфікаваў Пагадненне Незалежных Дзяржаў аб стварэнні Садружнасці.

1991 г., 10 снежня	Вярхоўны Савет Рэспублікі Беларусь прыняў пастанову "Аб дэнансацыі дагавора 1922г. аб утварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік".
1991 г., 21 снежня	У Алма-Аце кіраўнікі 11 суверэнных рэспублік на роўных умовах падпісалі Пратакол да мінскага Пагаднення аб утварэнні Садружнасці незалежных Дзяржаў.

З М Е С Т

23. БЕЛАРУСЬ У ПЕРШЫ ГОД ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
(А.М.Літвін, Я.С.Паулау) 3

24. БЕЛАРУСЬ У ПЕРШЫЯ ДВА ГАДЫ АКУПАЦЫІ
(А.М.Літвін, Я.С.Паулау) 23

25. БЕЛАРУСЬ У АПОШНІ ПЕРЫЯД ВАЙНЫ. ВЫЗВАЛЕННЕ БЕЛАРУСІ. УКЛАД БЕЛАРУСКАГА НАРОДА Ў РАЗГРОМ ВОРАГА. (А.М.Літвін, Я.С.Паулау). 45

26. ПАСЛЯВАЕННАЕ АДНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ БЕЛАРУСІ. ЦЯЖКАСЦІ І НАБЫТКІ.
(І.Я.Марчанка, У.І.Навіцкі). 66

27. АД РЭФОРМ ДА КРЫЗІСУ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-КАМАНДНАЙ СІСТЭМЫ (І.Я.Марчанка, У.І.Навіцкі) 87

28. ЦЯЖКІ ШЛЯХ РАДЫКАЛЬНЫХ ПЕРАЎТВАРЭННЯЎ.
(І.Я.Марчанка, У.І.Навіцкі) 110

29. БЕЛАРУСКАЯ ДЫЯСПАРА:ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ.
(Г.Г.Сяргеева) 137

30. МІЖНАРОДНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСІ.
(У.Е.Снапкоўскі, Г.Г.Сяргеева). 158

ХРАНАЛОГІЯ (В.В.Банько). 179

Падпісана да друку 5.01.94г. Аб'ём 11,5 др.л.
БЯСПЛАТНА Зак. 1 МО

Друкарня МВВКВ

БЕСПЛАТНО